Маладняк

9

1931

МЕНСК

Беларская Кніжная Палата
Архіў друку БССР

БЕЛДАП

ЗЬМЕСТ

Стар.

Сымон Баранавых. Два канцы (*аповесьць*) 3
Юлі Таўбін. Два вершы 29
Цімох Зарэчны. Эльбрусы чалавечага шчасьця (*аповесьць*) 34
Андрэй Ушакоў. Людзі вялікіх спраў (*верш*) 72
Драмгрупа Белтраму. Першы штандар (*п'еса*) 80
Оскар Канэль. Strasse frei (*верш*) 109
Эрнст Толер. Салдаты (*верш*) 110
Алесь Жаўрук. Колёцаважаты (*верш*) 111
Юрка Лявонны. Вясна 1931 г. (*верш*) 113

Артыкулы

Л. Авербах. Баявыя задачы пролетарскай літаратуры СССР 117
А. Бэндэ. Творчыя задачы пролетарскай літаратуры 155
Даніель Окалі. Першы зьезд славацкіх пісьменьнікаў 175
Л. Кучар. Творчасьць Васіля Каваля 183

Бібліографія

А. Бабуноў. Беллачаф 192
Ю. Дворкіна. Матэ Залка „У гасьцёх у бесьсьмяротных“ 196
Ю. Д. Зіна Бандарына „Веснацьвет“ 198

Хроніка 201

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

30к.1
6382

МАЛАДНЯК

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЯ і ГРАМАДЗКА-ПОЛІТЫЧНАЯ ЧАСОПІСЬ—ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ АСОЦЫЯЦЫІ ПРОЛЕТАРСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ

ПАД РЭДАКЦЫЯЙ
ІЛ. БАРАШКІ, П. ГАЛАВАЧА, А. ЗВОНАКА, В. КАВАЛЯ, Я. ЛІМАНОЎСКАГА, А. МОРКАЎКІ, А. СЯНЬКЕВІЧА

Инв. 1953 г. БА 1256 хр

ГОД ВЫДАНЬНЯ ДЗЕВЯТЫ

КНІЖКА
ДЗЕВЯТАЯ

МЕНСК ■ БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА ■ 1931

Надрукавана ў друкарні
„ПАЛЕСДРУК“, Гомель.
Зак. № 2980—3000 экз.
Галоўлітбел № 2317

Сымон Баранавых

Два канцы

Аповесьць

Частка першая

I.

„Здароў Цупрыян!

Пасылаям цябе бялізну і жыроў. Дома жывёцца ўсё па стараму. Бацька палучыў з калгазу вочэнь мала: 5 пудоў ячменю і 5 пудоў пшаніцы, і 5 пудоў аўса, 60 пудоў картоплі; 23 пуды сена. І гэта ўсе, і гэтым трэба жыць год. Гэта воні із Мікалаем заработалі за ўсё лета. І вось тут пусьця адзенуцца і абуюцца. Вось какая жызьня ў колгосе. Арцём па сібе заработаў—ня знаю колькі. Я, Сьцёпа—нічыго не палучылі, так як не работалі. І за грошы не даюць. І бацька-жэ аддаў і гной з хлявоў і ўвесь інвертар, і насеньні. Хоць нізьвесна чым пражывай. Хлеб самі ізжалі—дасталася 70 пудоў. Арцём вочэнь піянствуець і фуліганіць. Праз его срамна на вуліцу выйсьці. Ву концыляры колхазной пабіў вакно і піяны разорался. Напісалі пратакол і яму тут пападзець. Давай яму настаўленя, пастарайся яго справіць пісьмом“...

(*З ліста ад брата*)

Дарога пылам зацярушана, а па ёй Даніла Шчупак дадому едзе. Узьбіваюць Данілавы колы пыл, не даюць яму пад спакоем паляжаць. Злуецца пыл—сівымі дымнымі камякамі сыпле злосныя пырскі, а Данілу Шчупаку ўсёроўна: быў на кірмашы.

Кожным месяцам, як толькі настае маладзік перад нядзеляю—маладзіковаю празываецца тая нядзеля. У маладзіковую нядзелю Луцішча коньмі кішыць. Хто мае якую-небудзь зручнасьць і купляе, і прадае і перапрадае.

Даніла Шчупак меў ахвоту некалі паглядзець здароўя конскіх зубоў. Некалі... А цяпер?—Не без таго. Калі напарачыцца вартае што-небудзь, і цяпер не прамаргне. Толькі ня тыя цяпер часы пайшлі. Злосныя цяпер часы, неспакойныя... на шчот перапрадажы.

„Было ды сплыло“.

СЫМОН БАРАНАВЫХ

І коні дробныя па кірмашах водзяць... Данілу на ўспамінак вярзецца:

— Былі... на адным табе кані, а якую можна бывала выгнаць цыпру. Пастаяць толькі трэ' было на сваём—і выганіш. Грошы кошт свой мелі. Жызьня, называецца, была.

Сёньня Даніла на кірмаш ехаў—ня трымаў пра коні думак. Мала што лезьлі думкі ў галаву пішчаніцаю. Адганяў іх.

— Цяперака і за думкі можна,—казаў,—а ня то што, заплаціць штрапам.

Але адно ў думках жыць хоча, а другое, спрытнейшае, займае месца. Таксама і ў Данілы Шчупака: ня думаў, што каня купіць, а стрэўся па свайму густу—кроў зайздросная апанавала. Ды якраз і Ёсель Луціцкі... (Даніла і даўней з Ёселем трымаў хэўру):

— Купім... казаў Ёсель,—на папалам. Тут у мяне чалавек з Доўгага Поля:—усучым.

І купілі. І так гладка таму доўгапольскаму чалавеку...

Конь той крыжысты, разложысты, а толькі адно вока цьмянае, мутою налітае. За палавіну цаны, калі-б з мутным вокам продаж ладзіць. Ды толькі-ж навошта чалавека таго палохаць, калі мута гэта—прыгледзецца трэба добра.

Ад таго і радасьць адбылася сягоньня з Данілавым сэрцам.

Рэдкім госьцем бывае радасьць у Данілы. Занятая яна гэтымі гадамі—клопат праз гэтыя гады ў сабе носіць. Таму то і часу ня бывае радасьці пахадзіць каля сэрца, пастрапацца па Данілавых вуснах.

А сягоньня:

— Яно крыху неякавата,—едучы на сваёй драбінцы, варушыць Даніла думкамі, як таракан вусамі,—ня так-та... ашукаць чалавека. Але... другім ходам пускае вусастыя думкі,—хай чалавек ня быў-бы бабаю. Купляў—глядзець трэба-б... Н-но...

Конь Данілаў з гары трушок раскідае. Лёсткі ў драбінцы, на дзеравяным хаду, трасуцца. Ззаду адна нейдзе вельмі-ж моцным лёскатам разьлягаецца. Вушы ажно закладае руплівасьцю. Даніла сядзеньне падпіхае к задку, каб заткнуць яе прыкрае лапатаньне.

А сьмех ізноў з лясістага гушчару вусоў тышчыцца на Данілавы вусны.

Нават ажно пець хочацца едучы.

Ой звалiўся ды камар з дубу,
Ды пабіў камар свае косьці.
Ой ды чуе камар сваю згубу,
Ды шкадуе сваёй маладосьці...

— Ня мы прадалі, другі нехта прадаў-бы. Хоць хто прадаў-бы сьлепавокага за відавокага. Жызьня, брат, усялякаму ліху навучыць Хэ-э. Н-но!

І зноў говарам лапатлівым разьлягаюцца лёсткі.

Драбінка нашчэнт разьнітавалася за гэтыя гады. Зьезьдзілася. Лячыць трэба-б, а толькі на гэта Даніла рукою махае, як камароў адганяе.

— Нельга будзе ехаць—падмайструецца. А каб майстраваць яе для чалавечага вока—не... На гібель яе майстраваць. Цяпер чалавечае вока... вока зьвера ліхога таней варта. Дык на што яе ладаваць?— Хай глядзіць тое вока ды лепей беднасьцю цябе празывае—Хэ-э? А ўсёроўна-ж ехаць.

Дома Данілаў хлеў у леташнім годзе папрасіў падпораў. Не пашкадаваў іх Даніла. Нават на самым відавочным месцы, у рад, як для якога хараства навыстаўляў. Хата шчытам сваім скарабацілася. Як нехта, шчыт гэты моцнаю паганятаю перабіў. З таго часу і чэўрае шчыт пакамечаною кастрыцаю. На гэтых днёх на страху лазіў. Даніла, комін праціраць. Без драбіны лез па страсе. Нагою быў упёрся ў паплеціну, а яна ўзяла ды зубы, Данілу, выставіла. Дык неяк як імгою абдалося ўсё ў сярэдзіне: узяў адламаны канец ды так і пакінуў на відавоку.

Колы Данілавых калёс даганяюць адно другое. Грукатам коцяцца, злуюцца, што дагнаць ня могуць. А каню-Мышаку—усё роўна: ідзе ён, як мерае ўспыленую дарогу, як наматвае яе зрэбнае палатно на адзін мэтр без адрэзу. На сваё здароўе часамі чхае конь, галавою матае—паслабляе лейцы, каб уздыхнуць вольнасьцю.

Хацелася-б гэтак Данілу ехаць аж да самага вечара... Нават і не да самага вечара, а да заўтрага... і нават не да заўтрага, а ехаць і ехаць. От так сядзець—ляжаць на ўзлокатках, а конь-мышак хай падносіць адну за другою, як на паказ свае ногі. І сам будзе наперадзе, і Даніла будзе наперадзе.

—Но-о...

Але што-ж гэта? Засароміліся конскія ногі—у лукаткі пайшлі. Капытамі моцна зямлю пацалавалі. Пыл сухі аж да болю прыціснулі. Колы Данілавай драбінкі пайшлі бокам, выплываючы жытам. Лёсткі засакаталі на ўвесь голас.

А Даніла на каня:

— Дурніца... Чаго ты... адкуль ты гэты страх убачыў?..

І дарэмна зьнявагу паслаў Даніла на свайго каня. Бо з-за востраносага, бязвусага, выплываючага жыта выйшаў чалавек.

У руках чалавека чамаданчык, а на чамаданчыку каньцікі бліскучыя пад сонца.

Як толькі ўбачыў Даніла чалавека з бліскучымі каньцікамі на чамадане, кемлівасьці даўся:

— Захоча, каб пад'ехаць...

Ня любіць Даніла Шчупак падвозіць чалавека па дарозе. Едзеш сабе адзін, і ногі можна на ўсю драбінку выпрастаць, можна калені разамкнуць ад адной да другой білы... Драмаць, праяжджаючы, думкі

вязаць можна ў галаве якімі хочаш вузламі. А сядзе чалавек—сам свайму каню не гаспадар. Над сабою волю сваю разьлейцаную страціш...

Убачыў конь, што чалавек, а ня хто, паміж жыта ўстаў і страх свой скінуў. Зноў да конскай сьцежкі, з калесамі хацеў ісьці. Даніла пагнаць хацеў каня рысьсю: „хай сабе ідзе чалавек з бліскучымі кантамі".

З усяго размаху шмаргануў каня за пянчаныя лейцы, прыціснутым языком сказаў „н-но". Але здарэньне трапілася: правая ляйчына ўзяла дый рассмарганулася.

— Каб цябе агонь...—выкінуў як для сябе Даніла раззлаваныя словы.

А чалавек той каля самай драбінкі:

— Ці не падвезьлі-б...—сказаў чалавек.

І каб сумненьня ня было пра далячыню дадаў:

— Да Чырвонага. (Я, колькі скажаце, заплачу).

— Да Чырво-о-онага...—ня пытаў у чалавека Даніла, бо чуў, а так пераказаў словы.—Кажаце, да Чырвонага...

Данілавы вочы ад гэтага слова жвавасьцю лупнулі. Як сядзеў з выпрастанымі нагамі, падкурчыў за адзін раз, да сябе забраў. Усім сваім целам сьціснуўся ў жменю—месца даў чалавеку.

— Сядайце... садзецеся...—сказаў Даніла.—Чамаданчык ваш дайце сюды: вот так—паложым яго ў перадок. Дарога цяпер сухая, лёгкая: як кажу і заедзем.

II.

Стары Нічыпар коні саўгасаўскія на выган выправіў з Адамам. Хамуты баранавалочныя разьвесіў у канюшніку на кручкох. А да іх на дзьвярах прыставіў замочную варту.

— Замкнуў—пацягнуў, праверыў Нічыпар за замочную дужку жалезнага замка-пута.

Ды сваёю думкаю скінуў:

— Схаджу да Вялікага Каменю... прайдуся.

Некалькімі крокамі ўжо быў зьмераў ад канюшніка, як вырашыў нанава.

— Вазьму вуду. Мо' што ўдасца злавіць каля рэчкі. Надвячорак здаецца што бяз ветру. Вада карабаціцца ня будзе.

Глянуў з-пад брывей на неба, на лісьце раскінутых кляноў, ліп.

— Ціха. Не страпаецца вецер паміж лісьця.

Калі ні калі ходзіць Нічыпар да Вялікага Каменю, што над рэчкаю за саўгаскімі будынкамі. Там ён садзіцца на зялёную мураву і, ашчарэпіўшы свае калені жылістымі рукамі, глядзіць тупым няміргаючым зіркам. Бровы яго калматыя, як ветрам разьцярушаныя, насупліваюцца, а твар—маршчынамі пакрэмзаны—робіцца глыбокім, задумёным. Доўга часамі сядзіць стары, глядзіць аж за сьлязьлівую рэчку.

А яна, калі глядзіць з гары Нічыпар, і ўпраўду сьлязьлівая, як і яго старэчыя вочы. Тышчыцца рэчка, праціскаецца, пралазіць пішчаніцаю, абгінае—як падымае на сваім шкляным целе—саўгас Чырвонае.

Стаіць саўгас на высокай узгорыстай мясьціне. За чатырнаццаць кілёмэтраў укругавую відаць ён. Як на далонь паставіў нехта ды трымае, каб глядзелі, каб бачылі.

Едзеш на Клінкі—відаць, на Пярэкуль едзеш—відаць. Далёка, далёка ад'едзешся, а ён як і тутака каля цябе, разам з табою. Як і не ад'ехаўся ты.

Аж добра, што ты і заехаў і бачыш адкуль ты выехаў.

Вясною, калі дрэвы абрастаюць лісьцямі, ня відаць з-за іх чырвонаўскіх будынкаў. Яны зелянівом, як паводкаю веснавою, затоплены. Па восені-ж, калі ліст жоўтаю фарбаю састарыцца, здалёк як апырскана Чырвонае залатым друзам. Вельмі-ж перад тым, кал сонца, як шахцёр той, зьбіраецца пад зямлю пралезьці, залаты друз тады, на лісьцях агнём гарыць. Тады саўгас Чырвонае як і ў сапраўды афарбаваны ў чырвоны колер.

Калі сядзіць Нічыпар пад рэчкаю, думкі ў старога чаўнаком соўгаюцца—вытыкаюць цэлае палатнянае поле.

Чаго заходзіць Нічыпар да Вялікага Каменю?—А ад гэтуль добра відаць, лепш як адкуль, чырвонаўская ваколіца. І Муравейнікі, і Бярчукі відаць і хутары малінаўскія.

Хутары распуджаным стадкам разьбегліся, не сабраць іх па полі.

Стары Нічыпар бывае цэлы вечар, калі ціхі ён, прасядзіць над рэчкаю. У ціхія такія вечары добра чуваць шум кола бярчукоўскага млыну.

Слухае Нічыпар, і ў гэтым шуме чуе гаворку свайго Максіма-мельніка.

У мінулым годзе колам млынарскім, што чатыры камні круціць, калі вады хапае, падхапіла Нічыпарава сына Максіма.

Рраз, два... страсянула на хаду, падняло яго на высокае свае месца—прапусьціла праз верх і ўніз галавою апусьціла...

Не спазнаў Нічыпар твару свайго сына, калі зірнуў. Толькі і спазнаў па камякох салдацкай ватоўкі, што прышоў ён у ёй з чырвонай службы.

Стары гаварыў:

— І на Ўрангеля хадзіў, і на Шкуру; і ў Пецярбурзе на лёдзе біліся, а цэлым прышоў, а тут на табе—нягода стрэла.

Чуткі спатайка пасьля хадзілі па ваколіцы пра Максіма...

А Максім членам быў выбраны, сельсаветчыкам. У Муравейніках зямлю знайшоў, што была ў кнігі сельсавецкія ня прыпісана.

Чуткі на ціхіх нагах, на кончыках пальцаў хадзілі. Было ў тых чутках, што Максім стаяў перад млынавым колам разам з муравейнікаўскім завозьнікам, з Танцулькам.

... Потым Танцульку бачылі, як ён трапяткімі крокамі ішоў на двор. А калі млын застанавілі—з двара прыбег з вялікаю бядою, з горам пра Максімава здарэньне.

З нейкім часам пра здарэньне на бярчукоўскім млыне чуткі тыя ні то прытаіліся дзе, ні то ўтаміліся ходзячы: ня чутно было іхняга шораху. А жыцьцё ізноў колам тым млынавым пайшло ўкругавую.

Цяжка забыцца Нічыпару пра свайго сына. Вельмі-ж добрым быў яго Максім. Дзе ні быў, пра бацьку памятаў: люльку-файку прыслаў а-ж са службы.

Ня плакаў стары ні разу па свайму сыну. Нічыпар і ў жыцьці сваім ня плакаў: моцныя ў Нічыпара сьлёзы.

— Навошта іх разьліваць,—жартуе Нічыпар,—выльлеш, другія трэба набываць. Сьлёзы заўсёды павінны каб былі ў чалавека напашэве. Мала што ў жыцьці можа стрэць, дык ня будзе чым і абараніцца. Сьлёзы—чалавечая абарона

Доўга будзе часамі сядзець Нічыпар каля Вялікага Каменю над рэчкаю, затакаваны мінулымі днямі.

Праходзяць у старога думкі адна за другою чародамі. Ідуць і больш трапяткія і больш жвавейшыя—адна другую абганяюць. А з імі ідзе сам Нічыпар. Пабывае ён з думкамі, з пакамечанаю шапкаю пад пахаю, у Калечыца, у чалавека, што любіў пераганяць чужую работу на чырвоныя бліскучыя гузікі. Пабывае і ў маладога Калечыца перад пакамечанымі кулакамі:—жарабец, што белымі рублямі сьвеціцца, вырваўся з рук Нічыпара.

Кажа Нічыпар:

— Стары Калечыц быў лепшым за маладога.

І ізноў на тое-ж самае мейсца прыходзіць, да свайго сына Максіма.

А калі хто падсядзе да старога Нічыпара, кажа ён сваім думкам—„пачакайце".

Рад Нічыпар чалавеку, рад пагаварыць...

Ён можа расказаць шмат чаго, бо жыцьцё перайшоў—ня поле пераківуў вокам.

Пра зямлю, на якой стаіць колгас Чырвонае, паданьне старымі гадамі ходзіць. Нічыпар і пра паданьне раскажа.

— „Дзе цяпер гара, а на гары Чырвонае,—была некалі, кажуць, лагчына. А на лагчыне дзікім мохам зросшае было балота. Непраходным было тое балота. Нага чалавека ніколі ня ступала на яго дзікі мох. На ём расла невядомая трава, што празывалася Балацянкаю. Трава гэта на Новы год зацьвітала. Маразы на дварэ, сьнег... а з-пад сьнегу прабівалася і зацьвітала белым цьветам Балацянка.

— Кажуць, трава гэта так цьвіла, як на Івана Купала цьвіце папараць: ноччу і адзін раз на Новы год. Цьвет бачылі сваімі вачыма. Ён гарэў на сьнезе лупаючымі агоньчыкамі, як сьвечкамі...

— А яшчэ апавядаюць, як тут зрабілася гэта балота. Кажуць, раней было тут цьвёрдае дно. Яно было ўсё зялёнае, жывучае. Крыніца была на тым цьвёрдым дне. Вада як дзень, як ноч уздымалася ўверх. Вада крынічная тая людзей жывіла ад усялякіх хвароб. Здалёк прыходзілі,—прыяжджалі, каб набраць лекаў. Усякаму было можна падступіцца да той крыніцы. І от аднойчы прышоў да жыватворчай вады злачынец з усяго сьвету. Ён праз усё сваё жыцьцё жыў аднымі зьдзекамі над людзьмі. Шмат людзей праз яго загінула. Дык злачынец той хацеў у жыватворчай крыніцы выкупіць свае грахі. Але калі дакрануўся ён да тэй вады, правалілася скрозь зямлю ўсё зялёнае дно і тое крынічнае месца, і людзі што былі там, разам з злачынцам. От з таго часу і было тут непраходнае балоцца з травою Балацянкаю.

— З таго часу, як загінула крыніца жыватворчая, на палёх пайшоў недарод, пайшла па людзях пошасьць. Розныя хваробы хадзілі па людзях—забіралі з сабою людзей у зямлю. Апавядаюць, што гэтак было доўга, цэлыя вякі. Людзі нават пайшлі на недарод.

— А над гэтым балотцам жыў вялікі ваявода. Уся краіна дрыжала перад сярдзітым ваяводам. Палацы яго стаялі якраз на тым курганчыку, што налева цяпер ад Чырвонага. Палацы ваяводы былі пабудаваны вокнамі на затопленае зялёнае дно. Кожную ноч, кажуць, як затанула дно крынічнае, калі клаўся ваявода спаць, прыходзілі да яго ў палацы мерцьвякі—тыя людзі, што загінулі разам з крыніцаю. Яны адчынялі дзьверы, вокны насьцеж.... Іх было так шмат... Яны гразіліся ваяводу, што нібы-та ў іх пагібелі вінаваты ён. Праз яго не маглі жыць яны на такім аздобным сьвеце.

— Тады ліхі ваявода расьсярчаў на тое балотца і загадаў сваім людзям засыпаць яго пяском. І людзі, падняволныя таго ваяводы, насыпалі вялікі курган.

— Яшчэ вышэй сыпце,—загадваў ваявода сваім людзям,—яшчэ вышэй, каб ніколі ня вылезьлі тыя, што пайшлі на дно. А каб ніякага ўспаміну не засталося пра гэта месца, ваявода загадаў перанесьці на насып свае палацы. Ото-ж з таго часу і ня зводзіліся палацы з узгорку. З таго часу і відаць ён за чатырнаццаць вёрст...“

Што толькі людзкімі гаворкамі ня ходзіць па сьвеце. А даўніна, яна і нагатоў—вельмі любіць хадзіць. Яна і няўміручая—часу ў яе колькі хочаш. Ходзіць яна ад адных людзей да другіх бабаю-сплетніцаю.

... Шанцавала Нічыпару гэтым вечарам на рыбу. Добра зрабіў, што ўзяў з сабою вуду, ды з гары сыйшоў. Абы ткнуў хлебным кручком у ваду, і пачнае хадзіць вуда па вадзе як жывая. Спраўляйся толькі падымаць з асьцярогаю вудзілішча: глядзі, каб стрывала вуда, пакуль скончыць плотка свой танец.

Але змрок насупіўся вожыкам, і ад рэчкі вільгацьцю дыхнула. Жабкі—квактухі загаманілі ярчэй, байчэй. Слонка сьмелымі крыльлямі разрэзала надвячорак у старога над галавою. Жукі гойсалі на выперадкі адзін за другім, як нечага шукалі згубленага... Тады зматаў Нічыпар сваю вуду.

Цяжка ўзыходзіць да Вялікага Каменя ад рэчкі: крутаватая, старчма ўзьнятая сьцежка. Ды і старасьць Нічыпарава большым старчаком узьнята за самую сьцежку: у абход пайшоў стары, каля ўзгорку.

І ўжо ў прысады выйшаў,..

У руках нёс кацялок з плоткамі. Яны трапяталіся ў вадзе, плёхаліся, як малыя дзеці.

— Та-ат-ка...—разьляглося раптоўнае рэха па ваколіцы. Та-ат-ка!..

Нічыпар спазнаў голас сваёй дачкі Манечкі. Гэта яна прышла з палявой работы. Дома не застала бацькі, дык голасам сваім вобыск зрабіла сярод надыходзячага вечару.

— Я тутака... —адгукнуўся стары.

А яна ведала, што ён бывае каля Каменя—туды і пайшла клікаць. Не застала старога і дрыжачы голас апанаваў.

Праз хвіліну Манечка стаяла каля бацькі з засопшыміся грудзьмі. Яна была босая, у руках трымала белую хустку. Успацеўшым быў твар—наліты заірдзеўшымі бурнэлькамі-шчокамі. Не магла адсапнуцца, слова не магла вымавіць. Дыхала хутка, хутка: усёроўна як баялася, што ня хопіць у яе часу.

— Татка...—сказала Манечка ўрэшце,—а я вас шукаю...

— Навошта?—Я і сам ужо іду дахаты,—глядзеў Нічыпар на ўзьнятую імпэтную маладосьць сваёй дачкі.

— Да нас прыехаў з гораду,—сказала Манечка,—Такарскі Вацік.

— Які Вацік?—запытаўся Нічыпар.

— Вацікам завуць яго, а па прозьвішчу Такарскі,—адказала Манечка.

— Ну дык што... Чаго ён прыехаў?

— Ах, якія вы, татка: „чаго прыехаў"—жыць прыехаў у наш саўгас. Яго прыслалі, каб Ляксандру памагаў. Ён у нас будзе жыць: Ляксандра яго прызначыў у нашу тую хату.

Узяла бацьку за руку.

— Ідзем, татка, хутчэй. Чаго-ж вы стаіце?

Нічыпар гульлівы сьмех рассыпаў па мякіністай барадзе. Змрок яшчэ больш насупіўся калматымі бровамі: пачаў уваходзіць у сваю сілу. Манечка ня прыкмеціла ў змроку бацькавай радаснай усьмешкі над яе маладою нявіннасьцю.

III.

Раніца расьцьвіла півоністаю кветкаю, вялікаю, ружоваю.

Ужо даўно каровы саўгасаўскія пайшлі зьбіраць канюшыну. Коні пайшлі сартыраваць на полі баронамі трактарную ральлю. Кляўко з сваім сынам з Муравейнікаў прыйшлі—прыпушчалі драчкаю другое бервяно на новай сырабойні.

Меркавалася, што харaство ранішняга цьвету пратрымаецца цэлым днём. Не паказвала неба, каб зьмінтрэжыць дзень у яго пагодзе-красе.

І Ляксандра, чалавек, што трымае саўгас пад сваім вокам, рад быў: і гэтай ранішняй красе і гэтаму яркаму стуку тапароў на зрубе і гэтаму чалавеку—Такарскаму Ваціку, што ўчора прыехаў з гораду да яго ў памочнікі.

Ляксандра вёў Такарскага да новага зрубу: здалёк хваліўся яго веліччу, пакоўнасьцю.

Яны толькі што былі агледзелі саўгасную школку.

У гэтым годзе школка шмат узяла верху. Атожылкамі далася на цэлую пядзю. А яшчэ-ж усё лета ўперадзе.

Ляксандра гаварыў:

— Зімою сьнегу было вельмі шмат. Роўна з плотам намяло. Цераз верх плоту, па сьнезе, лазілі зайцы. Шмат—страх колькі—папсавалі шчэпаў.

— Ідучы, застанавіліся яны каля старадаўняй, мураванымі слупамі ў зямлю ўросшай аборы. Адгэтуль добра відаць усе чырвонаўскія будынкі.

— Той будынак пойдзе на знос,—казаў Ляксандра пра будынак, што пазіраў некалі злоснымі вокнамі на дваровых людзей.—Шашаль падтачыў падрубы. А калі ўжо завёўся шашаль—можа ўсю будыніну зьвесьці да шчэнту. Тутака, у ім, праходзяць нашы вечары...

— Няма каму ладзіць вечары,—глядзеў Ляксандра на маўклівы твар Такарскага,—маладыя нашы людзі пражываюць самапасам. Прыдзецца табе напутраваць нашу маладзёж. Расчапалася, брат, яна. Стасюк ня ўмее над ёю сакратарыць. Паліцікі не хапае. На ўсе чатыры нагі кульгае іхняя спаняласьць пра паліціку. Табе, брат, прыдзецца выганяць з гэтых ног усю курч.

Каля зрубу новай сырабойні Вацік Такарскі ўбачыў васьмёх мужчын, што стукалі тапарамі, калупалі пазавую трэску. Пажаваная трэска спрытка ўцякала зьверху ад тапара, каб хаця не хапіў ён яе лішні раз сваім вострым зубам.

Гледзячы ўверх на мужчын, Вацік запытаў Ляксандру:

— Адны саўгасаўскія ці наймаеце?

Той нібы сорам пусьціў па твары, нагу перамяніў стоячы, ды:

— Наймаем. Ня абыйдзешся бяз чужанца.

Вацік жарт састроіў:

— А нас за гэта кулакамі не палічаць?

Абодвы засьмяяліся. Ляксандра гаварыў:

— Куды ні ткніся, усюды трэба людзі. У нас шмат трэба людзей, а на будоўлю і пагатоў: ня кожны зможа быць на зрубе з тапаром. Дый наняць цяжка. Няма людзей.

Яны ўвайшлі ў сярэдзіну зрубу.

Вацік Такарскі прыехаў ад самых формаў, што туга набіваюцца прасеяным пяском, ад жалезнага малака, што льлецца ў тыя формы, каб застываць густа аж да яркага звону.

Калі ўвайшоў у зруб, глянуў з канца ў канец—на ўспамінку стаў іхні цэх. Такі-ж самы даўжынёю расьцягнуты, шырынёю распасьцёрты. Толькі іхні цэх замурзаны сажаю, а сырабойня сьценамі, як белым сырам, сьвеціцца. Дый няма тут, пасярэдзіне, мачыхі-печы, што глытае жалезныя нежаваныя абрэзкі, што закусвае чорным хлебам-вугольлем.

Застанавіліся на ападках-трэсках. Вацік глядзеў на цесьлярскі спрыт у рабоце.

— Гэтыя з Муравейнікаў,—сказаў Ляксандра на Вацікаву пільнасьць.—Сын з бацькам... па прозьвішчу Кляўко. А гэта Жур Лаўрэн... таксама з Муравейніку. А гэта нашы, саўгаскія... Мамчыц вунь. Сын яго Харытон за старшыню ў сельсавеце.

Стоячы недалёка ад Лаўрэна Жура, Ляксандра наўмысьня сказаў у моцны слух:

— Таварыш, дзядзька Лаўрэн, ніколі не адмовіць. Абзавешся яму і калі ё ў яго часу ў запасе і пазычыць нам свайго часу дзянёк-два..

Жур счуў, што гутарку трымаюць пра яго, і тапор свой патарчакаю ўткнуў у бервяно. Нагу перанёс з таго боку сьцяны на гэты бок ды:

— Што гэта, таварыш, да іх прыехалі на пражываньне?

Ваціка цікавасьць узяла, гледзячы на гэтага чалавека твар, валасамі заросшы нараўне з яго барадою.

— Да іх...—адказаў Вацік Лаўрэну, а потым дадаў:—і да вас.

— Так, так... Канечне,—гаварыў Лаўрэн,—у іх шмат работы. Яны наймаюць, наймаюць—і рады мала. Ім бы яшчэ чалавек з дзесяць...

— А чаму-ж вы тут, гуртам, вёскаю, не памагаеце свайму саўгасу?—сказаў Вацік.

— Лаўрэн унурыў свой валасасты твар: вытрасаў пальцамі трэскі з пазу—гаварыў:

— Свая работа. Кожны заняты сваім, як кажуць па-нашаму, разгарненьнем. Думаеце: у нас тэж шмат работы. Але от як папросіць заведуючы Ляксандра... ну-у раз трэба, дык і трэба... Бугайчыка пусьціць... тое-сёе: у іх-жа свой каваль... ды чалавек ён ня дрэнны: бывае жывёліна прыпрэцца да збожжыны...

Ня ўцяміў Вацік апошніх слоў пра бугайчыка, але запытаць не хацеў: баяўся каб не перапыніць Лаўрэнавай думкі, а ён скідаў трэскі і гаварыў:

— ...пуд жыта, бывае, ні ўцяць, ні ўзяць—Ляксандра і адважыць...

І падняўшы вочы на Ваціка:

— Дык вы, мусіць тут, кажуць, будзеце цэлае лета?

— Буду,— нехаця адказаў Вацік.

А каб сьцерці гэтую сухасьць, сілаю дадаў:

— Будзем знаёмымі суседзямі.

Хацеў ісьці: Ляксандра стаяў аж у канцы зрубу.

Скрануўся з месца: глядзеў перад сабою, каб не спатыкнуцца аб трэскі.

А Лаўрэн:

— Мо маеце газэтку?...

Мацнуў Вацік рукамі па кішэні:

— Старая,—сказаў дастаючы з кішэні.

— О тож і добра... Курыць, ведаеце, хочацца, а паперы,—хоць запалі—ня трэсьне.

Вацік ішоў ад Лаўрэна і нёс у сваіх думках:

— „Кажуць“ прабуду цэлае лета... Як у іх скора ведаюць? Не пасьпеў пераначаваць, як ужо...

Ішоў, а сэрца яго нібы то падтрымлівала аберучкамі цьвітучая раніца. Тады было лёгка радасна. Але надыходзілі моманты, што як бы выпускала раніца з сваіх аберучак яго сэрца:—тады цяжкім каменем вісела ні то сэрца само, ні то адзін на сэрцы камень.

І от гэтак яно з Вацікам каторы ўжо год: абы надыйшла радасьць, трывога крадзецца, каб яе адсунуць. Тады робіцца цяжка ўсяму целу. Вацік ведае, што гэта за трывога і ён баіцца яе.

... К вечару ўсе ваколіцы ладамі-пераладамі разьлягаліся пра новага чалавека ў Чырвоным.

У Муравейніках гаварылі:

— Калякцівы прыехаў рабіць. Горад цяперака людзей такіх рассылае на калякцівы...

— У сябе хай горад робіць калякцівы. Чаго яму да нас. Мы ня езьдзім, каб у іхніх заводах, хвабрыках рабіць калякцівы. Мы іх не чапаем.

На Малінаўках гаварылі:

— Ён прыехаў, каб нас выведаць... Каб прачуць, хто што будзе гаварыць на ўласьць. Ён прыехаў пераадзетым...

А саўгаскія жанкі, Юзічыха да Дзям'яніхі:

— Відаць спанятлівы чалавек. Я зайшла да Нічыпара, дык ён еў. Сам вышаў на кухню, сам і хлеб узяў, і адрэзаў, і лыжку ўзяў з заложніку...

Нічыпарава дачка, Манечка, учора, як разьмясьціўся Вацік за сьцяною, казала Юрчыкавай Анюце:

— Круглаліцы, але худашчавы. Бараду голіць. Адразу, як прыехаў дык і пабрыціўся. У яго свая брытва. Вельмі-ж валасы... русыя і вялікія. Ён іх усё назад рукою... Усё назад рукою... захінае. Каб ты Анютка, бачыла, якія ў яго валасы... Толькі на шчацэ ад нечага шрам. Можа як малы быў, дык дзе-небудзь аб кант разьбіў? У нашага Максіма конь некалі, гэтаксама ў малога, капытом ударыў. Потым як зраслося, дык і застаўся на шчацэ рубец.

Нічыпар Ваціка ўбачыў з свайго вока:

— Як і мой Максім: рупны.

Булгак з Трэцяй Малінаўкі гаварыў на Другой Малінаўцы Данілу Шчупаку:

— Кажуць, што яго прыслала ячэйка, як чалавека спраўнага на язык. Па-мойму, калі язык ходарам ходзіць—розум у таго чалавека ляжыць пад замком.

IV

Маці-вясна параскіданыя свае дні пазьбірала: ад людзей ісьці сабралася ўпрочкі.

І нішто да старой маткі-вясны не адклікнулася павагаю. Забыліся людзі, што жыла вясна для іх птушынымі галасамі ды яркім рэхам трубы пастуха Аўдзея.

Перад высядаючымі вусікамі маладога лета даставала цяпер, клала ўсю сваю павагу.

Гонарам рассыпалася перад людзкой павагаю маладое лета. Шырокім аўсяным пяром, ды шырокім кляновым лістком насіла на сабе ўцеху. Травою-асакою высокаю, ды краскамі на сенажацях адбівала лета людзям уклоны. Як юнак той, цешылася яно выплываючымі вусамі каласамі.

І каму не давала лета, толькі, сваіх падарункаў: і добрым людзям, і сярдзітым; і дзікай зьвярыне ў лясох, у балотах і свойскай—на дварох, на палёх.

„Наце, бярэце мяне,—гаварыла сваімі зялёнымі днямі,—пацеху маю трымайце, а я за вас буду рада. Не сварэцеся толькі паміж сабою".

Дні яго маладыя, зялёныя, адзін за другім, як і дні вясны, злодзеем краліся з падцішка. Вадзяною хадою ішлі дні. Не хацелі пастаяць на стойле. Ня то сьпяшыліся яны, каб хто не нагнаў, ня то яны наганялі, каго, самі.

Хадзе гэтай жыцьцё людзкое патурала. Апантаным імчалася людзкое жыцьцё, з днямі наўзавадкі.

З таго і сварка сярод людзей не ўгамавалася. Кожны сьпяшаўся перад другім, каб даць яму свае выперадкі. А лета не магло зразу мець, праз сваю моладасьць, людзкой гэтай заядласьці.

. . . . . .

Над Муравейнікамі распасьцер вечар сваю сівую посьцілку Трымаў яе за канцы аж каля самага неба. Чакаў, пакуль сонца пад зямлю ня пойдзе.

Сонца і ў праўду, выгарала цэлы дзень сьвецячы. І вісела яно цяпер над зямлёю тлеючым фанаром-блінам. Зьбіралася пад зямлю на ўзгольле лезьці.

Туман ужо падымаў з рэчкі свае плечы, рэха налілося празрыстаю яркасьцю, калі Аўдзей пусьціў з выгана ў пагонкі свой статак.

Самае што ні важнае—пусьціць чараду. А калі яна—адно за другім пойдзе:—будзе падганяць ззаду адно другога.

Далёка застаўся Аўдзей ад сваёй чарады—словы пусьціў у свае думкі:

— Цяпер v бок не саб'ецца чарада. Не наробіць шкоды.

Сьледам за чарадою не хацелася Аўдзею ісьці, каб не напаролося адно на другое.

— Самі хай ідуць, ды павольна разыходзяцца па дварох.

Цэлым, непачатым днём на выгане Аўдзей са сваім статкам. Мог агарнуць надакучлівасьцю выган старога, аж не: статак пайшоў вуліцаю, а Аўдзею закарцела на часіну застацца ў канцы выгану.

Ні то сілу сваю, хадою раскіданую, хацеў сабраць ды зважыць, ні то для старой пацехі-вокам акінуць сходжанае за дзень. А мо' і так:—ад чарады захацелася ўздыхнуць свежаю вольнасьцю: краскамі тымі ўздыхнуць, што ня відаць, а пахнуць на ўвесь надвячорак.

Надвячорак і ўпраўне не шкадаваў ні паху красак, ні той шчакатлівай лагоднасьці, што туманом слалася, сельцерскаю вадою пырскала.

... Хацелася ўсімі грудзьмі, увесь вечар забраць з сабою.

— „Хай будзе гэты вечар для аднаго чалавека. Тады хопіць гэтага вечару на доўгі час"...

Аўдзей падняўся ў канцы выгану на плот. Наўкол сябе, на прытуленыя адна да другой будыніны Муравейнікаў зірнуў. І ўсё ў гэтых будынках ціхім спакоем апавіта. Паміж сабою жыве дружнай ахвотаю. Здаецца, адно за другога моцна трымаецца і не адарвеш абцугамі.

Узяў з плеч свой крывы, самадзелкавы, бяростаю абкружаны рог. Вусы разгладзіў у бакі і прылажыў губы да муштучка-шпулькі. Моцна ўперся—з усяго цела кроў сабраў да свайго твару—ускалыхнуў яркае рэха.

„Чаго-ж яму дарэмна маўчаць, калі яно такое яркае...“

І доўга іграў на самадзельным ражку, тонкімі струнамі. Як на сход, на які, людзей клікаў: „хаця-ж каб учулі ражок пастуха, каб прышлі“.

... А ў Муравейніках і ўпраўду гэтым часам на сход загадваў каравульны Антось Блізьнец.

У Бродзе колектыў зрабілі да Вацікава прыезду. Калі дазнаў Вацік, уцеха брала хлопца. Аматарам гэтай работы быў Харытон, старшыня сельсавецкі. Дык чаму-ж не пагаварыць сходам пра гэтую работу ў самых Муравейніках.

На другі дзень, ці што, з Нічыпарам гаварыў Вацік:

— У Кацягах зробім калгас...

— У Прыстані зробім калгас...

— У Муравейніках зробім... Гэта будзе адзін вялікі потым калгас. Цэлы калгас-куст,

Сам з сабою трымаў Вацік развагу:

—... Канцэлярыя калгасная будзе ў кожным калгасе. Потым як злучацца тры калгасы, адна будзе, у Муравейніках. Тут самы асяродак, калі ўзяць наўкруг.

—... Старшынёю... я з нашага заводу вазьму Уронскага. Ён добра ведае гаспадарку, ды і пабываў на сьвеце—бачыў чалавек жыцьцё.

—... Прывязем плугоў перш-на-перш штук з дзесяць... хаця, з дзесяць штук—малавата. Перш-на-перш трэ‘ штук з дваццаць. Каб адразу дзіву даліся як мы—нашы ідуць на сустрэчу. Барон дастану, таксама. Наш завод, калі скажу дырэктару Стэльмаху...

„Лаўрык, скажу яму, дай брат штук сорак...“ Спалохаецца і адпусьціць дваццаць. Гэту норму хлопцы нашы як возьмуцца—у зьверх норму дадуць. Так што і заданьне будзе цэлае, і козы будуць сытыя.

Вацік сустракаўся ў Чырвоным з Харытонам, гаварыў з ім пра думку новай работы ў Муравейніках. Але Харытон Ваціку:

— Тугія ў Муравейніках людзі. Ня тое, гэта, што ў Бродзе. Адным словам, натурыстыя. Як урэпіцца каторы ў што, ані ты яго з месца. Канешне, трэба спрабаваць.

Вацік сам-на-сам гаварыў з некаторымі. І здаецца зусім ня тое, што Харытон казаў пра Муравейнікі.

Кажуць:

— Трэ‘ будзе.

— Паглядзім.

— Памяркуем.

— Уступім.

На полі быў з трактарам. Убачыў каля мяжы чалавека з Муравейнікаў, жартаваў да яго:

— Будзь, дзядзька Кузёмка, калгасьнікам, пераеду цераз мяжу да цябе: ураз размахаю тваю цаліну.

Кузёмка муравейнікаўскі нічога: сьмех толькі пускае з-пад вусоў, як і ўсе кажа тое самае—„паглядзім, памяркуем".

Сход у Муравейнікаў сходзіўся ў Банадысеву хату.

Харытон за сталом сядзеў, Вацік у парозе стаяў паміж мужчын.

Хата Банадысева адчыненымі дзьвярыма звала.

„Заходзьце, калі ласка. Праходзьце далей. Садзецеся".

І праходзілі ў хату Муравейнікі і месцы займалі, дзе хто пасьпеў. Жанчыны на ложку расьселіся-згрудзіліся. Мужчыны на лавах. І яшчэ ішлі.

Ад хады шумам гаманілі сьцены. Горача ў хаце было ціхім тым надвячоркам. Вокны зеўралі; гарачыню абедзьвюма форткамі прапускалі. Але ўсё роўна не хапала стрэчнага ветру для Банадысевай хаты.

Харытон перад сабою на стол палажыў белую паперу. „Хай зьбіраюцца... бачаць, што ўжо можна пачын рабіць".

Не на гадзіны мераецца дзень у Муравейніках, а на сонца. Ступіць сонца толькі-то крокаў і ведаюць пару Муравейнікі. Яшчэ ступіць і другую пару ведаюць. І аж пакуль ня зойдзе яно, не сядзе на седала за гальлём лесу.

„Няма сонца, а бяз сонца безработнае поле. Тады можна ісьці і на сход.

Вацік меркаваў—перастаўляў у сваіх думках:

„Уступяць ці не?.. Уступяць—то, канешне, але колькі чалавек?. Хто з іх паперадзе ўступіць?"

Глядзеў каля вушака дзьвярынага стоячы і бачыў; то гаманілі паміж сабою, то маўкліваць у некаторых вачох трымцела.

Дзяўчаты сьмяяліся: пад бок адна другую штурхалі маладосьцю.

Падышоў да Ваціка Брус Петрык:

— На шчот чаго гэта будзеце праводзіць сход?

Вацік на яго словы аж сумеўся:

А вы-ж хіба ня ведаеце?

— Я то чуў,—адказаў Петрык,—калгас, калгас...—паўтарыў двума словамі.

Пачаў крупіць з самаросьліку ў тоўстую паперу папяросу. Вацік дастаў тонкую, папяросную кніжачку:

— Калі ласка, бярэце тонкую. Грубая ды яшчэ газэтная—вельмі-ж урэдна. Тут у вас усе газэтную кураць. Хіба-ж не хапае тонкіх кніжачак?

— Дзякую,—адказаў Петрык.—Хапае, але мы прывычныя. Нам нават і лепей у тоўстую. Як цюцюнь крапок удасца, дык тоўстая папера паслабляе. Ды калі яе яшчэ некалькі разоў абкруціць...

Харытон рукою шум хаты асадзіў—сказаў:

Инв. 1953 г. 69 1256

— Пачнем...

А Вацік пад Харытонава слова, каб перайсьці на другую гаворку:

— Пачнем... новае жыцьцё ўстанаўляць.

— Канечне,—адказаў Петрык.

— Ня будзеце галець-ліпець на сваіх палосках.

— Зьвесна, ня будзем.

Вацік гаварыў:

— Зробіце сваю норму і будзеце гуляць.

— І ў вус ня дуць,—цэлымі камякамі папяросны дым выпускаючы, дадаў Петрык.

— Ня то, што як цяпер за ўсім клопат: і за канём, і за парасём, і за кароваю...

А нехта з боку пад Вацікавы словы:

— І за гусём...

Ня ведаў, хто падаў яму пабочныя словы. Шум, здаецца, асядаючы, другім наваратам узьняўся, большым колам усплыў. Гэта Харытон сход палічыў адчыненым. Кожны ад Харытонавых слоў зварухнуўся—праверыў, ці стаіць ён на сваім месцы. Некаторыя прайшлі з свайго месца: мо лепшае каля лавы, ці каля Банадысевай печы, чымся ў парозе.

Тады Вацік пайшоў да стала.

— Таварышы,—сказаў Вацік,—дазвольце гаварыць вам пра новую жызьню. Дазвольце гаварыць пра тую жызьню, якая збаўляе людзей ад беднасьці...

З парогу, з натоўпу нехта ізноў:

— Дазваляем...

Азірнуўся сход, але не спазнаць між цэлага людзкога таўбуну, хто абазваўся. Харытон супакоіў, як у кішэню забраў шорах сходу, а Вацік:

... Дазвольце гаварыць пра калгасы. Але пакуль пра калгасы, я скажу вам, таварышы, пра нашу жызьню на заводах, на фабрыках.

— Некалі мой бацька,—казаў Вацік, працаваў чатырнаццаць—шаснаццаць гадзін, а я цяпер працую—сем-восем...

— Некалі мой бацька словам ня мог абазвацца, калі цяжка было яму справіцца з жызьняю, а я цяпер сто слоў тысячу, магу гаварыць, даходзіць, дабівацца свайго рабочага права.

— Што трэ' было мець, на гэтыя правы? Што трэ' было мець, каб перамагчы нашых ворагаў?—Адно мець трэ' было: адзіную рабочую нашу хэўру.

Голас абазваўся ў парозе. Але не спазнаць было, пра што абазваўся. А Вацік гаварыў:

— Уся сіла, уся наша ахвота,—казаў далей,—у нашай гэтай дружбе. Калі мы захочам што зрабіць—толькі нашым хаўрусам

зробім. Ахвота аднаго чалавека, адна ахвота, а яна ў гурце—дзесяць ахвот. Дык вот: рабочыя хаўрусам сваім для вас робяць, дык і вы, таксама вашым сялянскім хаўрусам, давайце будзем рабіць для рабочых.

Пот выступіў буйнымі кроплямі на твары. Кудзеліліся пасмы доўгіх валасоў. Закінуў рукою назад валасы, у кулак палажыў лёгкі кашаль, далонямі назад абапёрся аб рубец стала:

— Мы, рабочыя, пры гарачым жорале домны, скажам, набіраем стопленае жалеза. Набіраем і нясём яго і выліваем у формы. Для каго вы, таварышы, думаеце мы выліваем жалеза ў тыя формы?— Для вас. Мы робім колцы для сячкарань, для малатарань... падвалкі, розныя валікі. Плугі робім параконныя, бароны жалезныя.

І зноў нехта ўслух з парогу, з натоўпу:

— Жалезнымі баронамі цяжка баранаваць: хопіць у нас і дзеравяных.

І ня чуў Вацік, а гаварыў ізноў:

— От жа, таварышы, мы для вас робім, кажу, а вы трэба каб для нас рабілі. Будзем абменьваць наш хаўрус, жыць будзем нашымі. братамі. А каб хаўрусам жыць, я хачу сказаць, трэба ў калгас ісьці. Нашу фабрыку, завод можна зваць калгасам; вашу гаспадарку трэба зрабіць так, каб можна было называць заводам.

Калі загаварыў пра калгасы, уварваўся ў хату праз адчыненыя дзьверы разбойнік-шорах. Сьмела пайшоў ён па хаце цэлым валам, бяз сораму.

Заварушылася Банадысева хата. З аднае нагі на другую пераступіла. Некаторыя чухацца пачалі ў патыліцах, некаторыя ўсім сваім тварам пазяхнулі.

Нехта дзьвярыма ў сенцах скрыпнуў на ўвесь голас. Нехта загаварыў наўмысьля двума галасамі.

Тады разбоінік-шорах гушкаўся як на гушкалцы: то мацнеўшым шумам-гоманам уздымаўся, то прыціскаўся дзьвярыным скрыпам.

— Не разыходзьцеся, таварышы!—устаў Харытон з-за стала.— Будзем запісваць хто ўвойдзе з такога важнага сходу. Ці-ы-хх-ха.

А дзьверы як і ня чулі: тым самым скрыпам адзываліся на Харытонавы словы.

Вацік скончыў, а Харытон ад сябе пачаў гаварыць.

— Як відаць, таварышы,—акідаючы вокам парадзеўшую хату казаў Харытон,—як відаць тутака нейдзе разьвялося кулацкае гняздо. Мы гэта гняздо выкарчуем з карэньнем. Гэта гняздо перашкаджае нам праводзіць калгасы. Мы ведаем, хто ў гэта гняздо ўваходзіць. Наша Савецкая ўласьць бязьлітасна да кулака і, як вядома, прыяцель бедняку, серадняку. Мы ведаем, што кулаку няма ахвоты лішыцца сваёй гаспадаркі, яму калгасы як нож у грудзі. Ён прывык, каб чужымі рукамі заграбаць жар, і ён ня можа адвыкнуць. Таварышы...

Хацеў гаварыць яшчэ, але вочы ўзьняў на хату і сьціх. Засталося было ў хаце Муравейнікаў адна жменя. Бладзік ня то з кепікамі, ня то і ўпраўду, стоячы пасярэдзіне хаты, сказаў:

— Дык і мы пойдзем.

Харытон усім сваім тварам паглядзеў на Бладзіка Янушку:

— Будзеце адвячаць. Хто з сходу ўцёк, будзе абкладацца штрафам. Сход—дзяржаўная работа. Сход—гэта ўласьць. З сходу ўцякаеш—ідзеш супроць дзяржавы і супроць калгасу.

Вацік аж дзіву даўся перад сабою:

„Чаму яны не дабылі да канца сходу? Іх-жа ніхто сілком ня цягне ў калгас".

Падышоў да стала Міхась Кляўко.

Гэты канец Муравейнікаў дражніць Міхася смактуном, а той канец—сьлемзаком.

— Паглядзі ў вакно, хто там пайшоў?

— Сьлемзак у сваім рызьняку.

— Хто гэта да вас надвечар заходзіў?

— Сьлемзак прыходзіў, каб пазычылі пуд мукі.

— Хто гэта на кульгавым кані паехаў?

— Хто-ж паехаў: Сьлямзак.

— Чые-ж гэта дзеці голымі пупамі сьвецяць?

— Зьвесна-ж чые:—Сьлемзаковы.

Звыкся Міхась з хадзячым прозьвішчам. Як так яно і трэба і нават як-бы па кнігах праведзена, прашнуравана.

Некаторыя з Муравейнікаў сорам свой страцілі, дый у вочы Міхасю, ня жмурачы сваіх вачэй:

— Дай, Сьлямзак, закурыць.

А Міхась Кляўко і нічога:

— Шукай, кажа, паперы. Цюцюнь ёсьціка, а паперы ў мяне няма.

Вацік глядзеў на чалавека, што да стала падышоў. Бачыў, як замахнуў ён крысьсі ў сваёй суконнай, рукавамі выбрызганай, жакетцы. Палажыў крысьсі адно на другое, каб ня было відаць конскага пута.

Конскім путам былі падпяразаны Міхасёвы зрэбныя штаны: сорам схаваў крысьсямі перад чужым чалавекам.

— Нашы ў калгас ня пойдуць,—сьвідруючы сваімі вачыма Вацікаў твар, сказаў ён.—Вы можаце ісьці сабе, таварыш, дадому і класьціся спаць. І нямашака чаго нам галовы, як той сказаў, марочаньнем затуманіваць.

І да Банадыся:

— Ты, Банадысь, тушы лямпу. Хай дарэмна не гарыць газа.

Не пасьпеў Вацік сказаць Міхасю слова. Павярнуўся той ад стала і пайшоў да дзьвярэй. На хаду паправіў сваю шапку, што шротам было зьдзіркована ўсё яе дно. Гэта Дзіма, сын Булгака з Малінавак на тым тыдні праз заклад з Міхасём: ці пападзе ён у падкінутую, ці не пападзе, усадзіў у яе ўвесь набой птушынага шроту.

V

Маладзіковая нядзеля выдарылася пагодлівым днём. Зранку раса была буйная і туманом разьядала траву. Потым вылезла з зямлі сонца; кулакамі ўцерла аж дачырвана свае вочы, сьмехам прыснула на Малінаўскія хутары.

Тады Даніла Шчупак ушчаміў у аглоблі Мышака і выехаў у Луцішчы на кірмаш.

З таго часу, як падвозіў Даніла Шчупак Ваціка, трэцяя ішла маладзіковая нядзеля. Ніводнай не прамінуў Даніла. Ня было чаго прадаваць, купляць, а ехаў. Паходзіць па мястэчку, там вокам кіне, туды падойдзе—зірне і як і зробіць невашта—купіць або прадасьць

У тую маладзіковую нядзелю, як Ёселя стрэў аж скаргаю загаварыў:

— Усё, ліха іх матары, прыбралі да сваіх рук. Мясападрыхтоўкі прыдумалі. Куды ні ткніся, як насланьнё. І ты думаеш што?— Самі яны спэкуляцу разводзяць, а на другога складаюць. І коняй ня хопіць для гэтых падрыхтовак. Усяго ім мала з іх горла.

Думкі скінуў быў Даніла, вочы свае на варту паставіў, голасу ўзяў, крадучы ў сябе, ды:

— А з каго сьвет гарыць?—запытаў.—З гарадзкіх. Прыедзе от безгалоўе, як гэты Такарскі, ды арудуе табою. Тутака табе і падрыхтоўкі, тутака табе і калгасы... і ўсё з гэтых супчыкаў гарыць, што празываюцца табе рабочымі.

Перад самым Луцішчам нагнаў Даніла Харытона з Вацікам. Дрыжыкі брыжастыя прабеглі па целе, як убачыў, што ідуць. Не даяжджаючы некалькі яшчэ крокаў, з правай рукі на левую перадаў лейцы. А як побач даехаў—шапку сваю на казырок узяў:

— Дзіндобры,—з ветлівым уклонам сказаў ім.

Уяжджаў у самае Луцішча: няма навошта зваць, каб пад'ехалі. Вільнуў пугаю каню пад жывот—„Н-оо.“—І яны засталіся ззаду.

Як падвозіў яшчэ першым разам Даніла Ваціка, сшэрхла было цела. І каб ніколі, сказаць, ня бачыў гарадзкіх людзей, ці што?—Дык не: і бачыў і гаварыў. І нават, як з Рыпсам, што бацька Данілаў некалі нанач заяжджаў, мелі хаўрус у горадзе.

Некалькімі разамі, пасьля таго, сустракаўся Даніла з Такарскім. І з кожнаю стрэчаю от гэтак, як і сягоньня, бег дрыжасты холад

па яго целе. Ня тое, што баіцца Даніла гэтага чалавека, а от так само сабою: усёроўна як ускочыць ён у халодную рэчку купацца, ды адразу яго абшыбе холадам.

Потым і нічога яно. Толькі ў Данілавых думках карцела:

— ...прыехаўшы ў саўгас за помоцніка ці за якога трактарыстага і будзь ім. Цябе ніхто ня будзе чапаць, і ты нікому ня будзеш патрэбен. Будзь, як той казаў, чалавекам,

Калі ўзьехаў Даніла на Луціцкае мястэчка—кірмаш варамварыўся. Вэрхал кірмашны вісеў над мястэчкам, як на нітцы. Шмат назьяжджалася з ваколічных вёсак, і хто з чым: хто з парасячым піскам, хто з куранятным цыўканьнем у клетках, хто з звонам касы, а хто і з адным сваім сварлівым голасам.

І от адразу, як узьехаў на мястэчка, гароха-чарвівая нуда ўстала.

Ня то ад таго, што дробным піскам, а ня тым конскім іржаньнем гандлявала мястэчка. Ня то ад таго, што гаманілі ня ў меру сюды сабраныя людзі. А мо' і ад таго, што, праяжджаючы паміж людзей, незнарок штурхнуў у плячо нейкай кабеціне.

— Су-унь-нецца... як назаўтрае трэба,—злосна сказаў Даніла.

Тады яна ўсклала на яго плечы цэлую буру лаянкі. Усё мястэчка рынулася на збор. Каб не пасьпяшыўся ад'ехаць, дык усе яго-б убачылі-б, што гэта ён штурхнуў аглаблёю ў плячо чалавека.

Хадзіў сягоньня па мястэчку сонны, нераскатурханы, як паспытаўшы ўсмажанай мухаморы.

— Усё ўздаражала...—бурчэў думкамі.—Цаны за ўсё ня прыставіш.

У коопэратыў зайшоў—не пратышчышся: як бітком людзей наштурхана. Ад духаты зварыцца можна. Нават не дайшоў да прылаўку. Злосьці толькі і набраў, заместа тавараў.

З коопэратыву сярдзітым яшчэ больш выйшаў на цэлы сьвет. йшоў да с вайго воза.

Здалёк убачыў, ідучы, каля Пархвенавага воза Міхася Кляўко. Тады захацелася з ім пагаварыць не таму, што ён Міхась Кляўко, а што Муравейнікаўскі ён чалавек.

Падыходзіў і нёс у думках:

— Лоўка яны адпрэчылі сваіх калякціўшчыкаў... хвацка адпрэчылі. Дзесятаму, бадай, закажуць.

Як дачуўся быў Даніла, што Муравейнікі на сходзе ні белага ні чорнага не абялілі—разышліся са сходу, аж сьмехам пырснуў:

— І каб гэтак кожнага наезжага,—казаў да сваёй Насты,—нябось-бы, не рабілі нідзе гэтых калгасаў. А то дадуць яму каторама патолю, і ён сабе раскашэльваецца. Думае, што ён дома, сам сабе. Малайчыны Муравейнікі. Гэта ня тое, што Астраўскія, альбо Бродаўскія...

людзі тут усе гаспадары па сабе, калі ня лічыць гэтага канца. Але што, гэты канец?—Як зробіць той канец, так будзе рабіць і гэты.

Міхась ня прыкмеціў Данілу, калі падышоў ён да воза. Нагу паставіў Міхась на калёсную сьпіцу, рукою ўсьпёрся на калена—трымаў у зубах саломінку. Саломінка з парожнім коласам на канцы і ён варушыў гэтым коласам—ціснуў яе дупло пярэднімі зубамі. А вочы трымаў уперад, цераз вазы, немігаючым зіркам.

Калі так вочы трымаць, чалавек бяз думак застаецца на гэты час. Толькі і бывае ў чалавека гэты час, калі ён ні аб чым ня думае.

— Аб чым ты задумаўся?—палажыў Даніла руку на Міхасёў плячук.

— Ні аб чым...

— Здароў быў,

— Добрае здароўе.

— Што прадаеш, ці купляеш?

Даніла гаворку распачаў пра дрэнны кірмаш на сягоньняшнім дні. Гаварыў пра духату ў коопэратыве. Глянуў быў на чмысікі Пархвенішынага каня: рупіла агледзець яго зубы.

А потым:

— Я чуў, што ў вас калгас хацелі спартачыць?

— І спартачылі...—як заневашта хацеў дапячы Міхась Данілу: сказаў кароткім словам, адрывістым.

Даніла думаў, што не дачуў Міхасёвага слова і другім наваратам:

— Добра, ах як добра вы зрабілі, што іх адпрэчылі! Нечага яны цяпер дзесятаму закажуць. Я казаў-гаварыў ужо са сваёю Настаю...

Міхась зьняў нагу з калёснай сьпіцы, руку прыняў з калена, саломіну скусаную выкінуў з зубоў. А Даніла гаварыў як бобам сыпаў у асьміну:

— Я казаў ужо:—увесь сьвет гарыць з гэтых гарадзкіх. Ён, каторы, ня жыўшы на зямлі, ды хоча камандваць. Хоча прысьці і гаспадарыць, пане мой, маім дабром. Яны папрывыкалі як даўней—жыць сабе, як за горадам.

Міхась хацеў перапыніць Данілу, слова сваё выказанае паўтарыць. Але ён як і ня чуў, а адным звагам:

— Не, ты, ліха тваёй матары, паглядзі, як мы пражываем. Мы цябе не чапаем, і ты нас не мароч. Я хачу пражываць, як мой бацька жыў быў і мне вялеў жыць. І ня трэба мне тваіх гарадзкіх штукенцыяў-калгасаў. Усе яны гарадзкія збродам жывуць, дык ім абы стварыць хоць-якую выдумку. Даволі ўжо таго, што савецкую ўласьць зрабілі.

Міхася апанавала, агарнула найбольшая злосьць за гэтыя апошнія словы.

„Што ты мне, дрэнь, чапаеш савецкую ўласьць,—хацелася сказаць у самыя вочы.—Я на франтох быў за савецкую ўласьць і ведаю, колькі важыць яна, чаго яна варта. Ты дома, як тая казяўка, сядзеў. Жаба ты старая,—губамі быў паварушыў. Але толькі хрыплым голасам сказаў:

— Ды што-ж ты, мо' белых палякаў хочаш да сябе ў госьці?

І яшчэ большая злосьць падскочыла. Вочы заблішчэлі, як хто запаліў у яго вачох драцяныя агні.

— Навошта мне тыя палякі,—сказаў Даніла зьмінтрэжаным голасам,—мне нікога ня трэба. Я на шчот кажу калгасу...

— Дык я-ж табе кажу, на шчот тваіх казалаў,—казаў Міхась,—зрабілі ў нас калгас.

Даніла атрос свае бровы, паглядзеў на Міхася.

— Як зрабілі? У вас-жа быў сход, а калякціву не рабілі-ж?

— Быў і не рабілі. А ўчора наш канец увесь уступіў: самі падалі заяўленьне.

Быў рады, што хоць гэтымі словамі дапёк Шчупаку. Хацелася Міхасю хваліцца Муравейнікаўскім колгасам перад ім. „Хай ведае, як гаварыць на савецкую ўласьць". Але на ўспамінак набегла, што ён...

А Даніла вочы жмурыў, твар глыбокімі маршчынамі сабраў ды як угадаў Міхасёву задзірку:

— І ты ўступіў?—запытаўся ён.

— А якое тваё дзела?—сваім наваротам запытаў Міхась і дадаў:

— А ўласьці перада мною ты не чапай!

Да воза падыходзіла сама Пархвеніха. У руках несла паліваную міску. Пахвалілася, падыходзячы да воза:

— Тры злотых... Вот. Як звон!

Пастукала шчыкалаткамі пальцаў аб паліваны бок. Міска нутром глыбока загаманіла: адгукнулася, зьвялася на тонкі волас.

— Моцная,—сказала Пархвеніха,—ня трупціць.

VI.

Муравейнікі ўзрасьлі і выгадаваліся на лагчыністым дне зямлі.

Невядома чаму дзяды-прадзеды выбралі, аблюбавалі гэты лагчыністы кавалак. Можа, што зацішнейшае месца... Калі вятры дзьмуць—усё паўзьверх Муравейнікаў. Можа, што рэчка пад бокам коціцца для пажарных здарэньняў. Мо' што лес кожным днём з дрывамі просіцца. А мо' і так: выбраў нехта першы, аблюбаваў лужкі шырокія, палі блізкія ды і пачаў будынкі для чалавечай ахвоты ўзводзіць. За першым—другі пайшоў... Потым паншчынаю жылі людзі: блізка на „гвалты" хадзіць да Калечыцавага дзеда. А потым само „аслабаждэньне" прышло: тут людзям самастойную зямлю далі.

Муравейнікі з аднаго боку абведзены лесам, як чалавечае вока брывёю. З другога боку—узгорысты вал праміком цягнецца. Калі

глядзець з гэтага валу—Муравейнікі як запрэжаныя ў дугу. Калі-б рассмаргнуць узгорак—дуга лясная распырхнулася-б...

Такою выгнутаю дугою, як і лес, працякае рэчка Муравейка. Яна цісьнецца па лужку—водшыбам ад лесу—крыху не да яго канца. Яна падкладышом служыць лесу:—каб не надламаўся ён туга нацягнуты ўзгорыстым канатам.

Даходзячы да лясного канца, вужакаю ўдараецца Муравейка ў яго гушчар і прападае... цяністая, халодная—нідзе яе ня зловіш. Толькі раўчук-адростак ідзе вузенькім дном ад гэтай рэчкі. Ён праходзіць упапярок Муравейнікаў і падзяляе іх на два канцы: на той канец, і на гэты канец.

Шмат у чым, гэты раўчук правініўся перад Муравейнікамі: падзяліў іх на два канцы і правініўся.

Як воласьць была раней, і як саветы цяпер пайшлі, усюды па кнігах па запісах можна стрэць Муравейнікі.

Невядома, з чаго паходзіць, пэўна, празваньне вёскі. Кажуць, што некалі за рэчкаю, у лесе, вялося шмат мурашчыных гнёздаў. А ў дварэ жыў сярдзіты па сваёй натуры панскі намесьнік. Пана якраз ня было дома, дык той намесьнік самавольна прывязаў да дрэва ў муравейніку голага кухара. Кухар той падаў нібы-то намесьніку да стала прытухлага цецярука. Кажуць, што той намесьнік панскі даўно ня меў на кухара свайго вока за маладую чорнабрывую ахмістрыню. І цецярук той быў намесьнікава адна прыдзірка.

Зранку і да вечара дратавалі мурашкі ды камары голае цела кухара. А калі загадаў адвязаць, чуць жывым быў кухар. Вельмі-ж шмат іх у нос у кухараў налезла, у вочы, у вушы.

Пан потым, кажуць, сварыўся на свайго намесьніка. Нават хацеў спрэчыць з намесьнікаў за самавольнасьць. Бо праз тыдзень, ці што, кухар ня вытрымаў—памёр.

Кажуць, што памёр ён ня так ад мурашчынага болю, як ад іх шчокату. Мурашкі, як хадзілі па голым целе, дык вельмі-ж дрэпалі ножкамі. І яшчэ кажуць, што слабае было кухарава сэрца.

Той канец Муравейнікаў, што напаўночаад раўчука, што ў бярозах стаіць, мае яшчэ і хадзячае нялюбае прозьвішча—Смактуны. Міхась Кляўко, што Сьлямзаком празываецца, вымышліў гэта прозьвішча. Ня рад быў потым, што вымышліў, і вось чаму ня рад быў Міхась:

... Калі прышла ад цара Аляксандры папера, на якой было друкаванымі літарамі напісана „Освобождение крестьян", калі гэтаю папераю зямлю дзялілі на выкуп, тады і зрабілася два няроўныя канцы вёскі. Бацьком тых людзей, што жывуць у Муравейніках, на той бок раўчука, што хадзілі на адработак за тую сваю жызьню да старога Калечыца, нарэзалі паўвалочныя надзелы. Бацьком тых людзей, што жывуць каля выгану, напоўдзень ад раўчука, што не хадзілі на ад-

работак да Калечыца, а ўвесь час жылі пры яго двары парабкамі, надзялілі па дзьве дзесяціны. Гэта былі зьбеглыя людзі ад другіх паноў. Таму і страцілі права на паўвалоку надзелу Калечыцавай зямлі.

І ўсёроўна, лічылася гэта жыцьцём чалавека. У тых на паўва лоцы, а ў гэтых на дзьвёх дзесяцінах.

Некаторыя паўвалочнікі, як Міхасёў бацька, не маглі справіцца самі з сваёю надзеленаю „асвабаджэньнем" зямлёю. Куды лепей было жыць-хадзіць да старога Калечыца на адработак за сваё пражыцьцё. Тамака непатрэбна было за пашу адрабляць, непатрэбна было сенажаць Калечыцаву трэцяком касіць (бо сваёй надзельнай сенажаці на гэта поле цяпер не хапала). І самае што ня важнае—ня ведаў ніхто пры Калечыцу пра зямельны выкуп. Цяпер, як вясна, як восень, ня зводзіўся з хаты стараста.

Міхасёў бацька аддаў быў тады частку сваёй зямлі Танцулькаваму бацьку ў арэнду.

— Хай... Пакуль хоць з большага ня выплаціцца пазямельны выкуп,—казаў Міхасеў бацька. А сам хадзіў у двор на падзёншчыну.

Стары Танцулька ўсё жыцьцё абціраўся агароднікам у Калечыца—меў капейку, каб чужака наняць. Арандаваў зямлю перш на шэсьць год, потым зноў на шэсьць год узяў.

Сам Кляўко быў нездаравякам; усё кашлям чэўраў. Дзеці былі драбнатою пракінуліся. Маці работаю, адна за ўсіх у сям'і, надарвала сваю сілу. Так яно і зьмінтрэжылася жыцьцё Кляўковых.

Калі пачаў жыць Міхась без бацькоў, ішоў яму шаснаццаты год. Якраз сыйшоў і тэрмін Танцулькавай арэндзе на іх зямлю. Сам Міхась пачаў за зямлю брацца, але ўся яна была вычуцьвяраўшая, спустошаная: насеньня не варочала. Сын старога Танцулькі, Ахрэм, ад свайго бацькі цяпер гаспадаром над ёю. Ведаў ён, што сходзяць гады; ня даў ёй ані кроплі гною, а ўсё з яе, клапаціўся, каб высмактаць да магулінкі.

Сваімі маладымі гадамі ня ведаў Міхась, як справіцца з голаю зямлёю. А яшчэ брат яго старшы, Клемус, жыў пры ім—не даваў у гаспадарцы ладу.

Клемус усё хадзіў з вялікім ракітавым кашалём па людзях, зьбіраў у гэты кашель розныя транты. Ён усё зьбіраўся хату новую будаваць за гасьцінцам у лесе, ды зьбіраўся каб жаніцца ў той хаце.

Шмат набраўся клопату Міхась з сваім братам. Бывала што ні зарве цягне Клемус з дому.

— Дзе ты, Клемус, тапор падзеў?—пытае Міхась.

А ён:

— У лесе схаваў. На што табе тапор?—карчы дзерці ці тупіць карчамі? Вытупіш—хату мне ня будзе чым рубіць.

— Дзе ты касу, Клемус, дзеў?

— Я яе пасек:—нараблю сьцізорыкаў. Буду продаць, будуць на хату грошы. Унь колькі мне нагаварылі ў Сьвіталаўцы, каб я прынёс ім ножыкаў-сьцізорыкаў.

Па вёсцы пачалі хадзіць чуткі, што Міхась праганяе неразумнага Клемуса з хаты, есьці яму не дае. Тады Танцулька Ахрэм узяўся за Міхася.

— Ён ня вінен, што яму бог розуму ня даў,—казаў Ахрэм,—усім трэба жыць, усе хочуць жыць. Няма чаго брату над братам зьдзекавацца.

Раз зазваў Ахрэм да сябе Клемуса, другі раз зазваў... Есьці даў яму, а потым сказаў:

— Крыўдзіць цябе брат?

— Ага.

— Есьці не дае?

— Ага.

— З хаты праганяе?

— Ага.

— Мы яму пакажам, як зьдекавацца над бедным чалавекам. Ты толькі, як будзе суд, як будуць у цябе пытацца, ці крыўдзіць брат, і кажы ім: „Крыўдзіць", і кажы ім „ага". Я цябе да сябе вазьму, зямлю—часьць тваю—забяром ад твайго брата. Ты захочаш, у мяне будзеш жыць, захочаш пойдзеш сабе ножыкі прадаваць. Я цябе няволіць ня буду гэтак, як твой брат.

Адсудзіў Танцулька Ахрэм на Клемуса частку зямлі: узяў яго пад сваю апеку за зямлю.

— Хай бярэ гэты смактун,—казаў Міхась.—Бацька яго смактаў з нашай зямлі, а цяпер ён захацеў і назаўсім прыгарнуць яе да сваіх рук.

Каб ужо вельмі хацеў ня даць зямлі Міхась і ня даў бы можа: мала што ён дурнога брата падбухторыў. Але надакучыў яму Клемус, думаў, што пазбавіцца ад яго шальмоўства. Аж не: пасьля суду са скаргаю прыходзіў да Міхася на Ахрэма. Рад быў Міхась, што хоць суседзі ўбачылі вагу чыстай праўды.

... З таго часу ўкаранілася на Ахрэма слова Міхасёва—Смактун. Пасьля яно нраз сьвінную сварку на ўвесь той канец перакінулася і на самога Міхася абухам лягло.

Зеўралі, аднойчы, вароты дзіркаю расчыненаю ў Міхася. Дзеці бегалі ды і пакінулі іх насьцеж. Сьвінчо Міхасёва рудзенькае—Рудчык—як звала яго Міхасіха, узяло ды праз тыя вароты, ды праз раўчук—у Скрыпунішыны грады... Нават і ня згледзела Міхасіха, дзе кануў яе Рудчык.

— Рудчык, Рудчык...—кліча Міхасіха.

А Скрыпуніха, што жыве ў гэтым канцы, ішла ў свае грады. Бачыць здалёк, што шавеліцца жывым цяўнікам яе маркоўнік, бруч-

коўнік і сьцяміла: „Палоць прышло нейчае сьвінчо сваім адумам грады". Падкралася Скрыпуніха спатайка да сьвінчаці, ды як скропіць паганякаю...—На адным перадку пайшоў Міхасішын Рудчык з няпрошанага поліва. Тады от і пачалася „сьвінная" сварка двох Муравейнікаўскіх канцоў.

— На што ты сьвінчоці крыж перабіла?—пыталася Міхасіха.

А Скрыпуніха:

— Ня трэ' было пускаць твайго сьвінчоці.

— Каб цябе немач ня пусьціла,—скляла Міхасіха,—хто-ж яго пускаў: само-ж яно вылезла.

— Хай цябе і ня пусьціць... Сьвінчо грады ганошыць, а я пазіраць на яго буду? Смактуніха ты. Сьлемзачыха.

— А ты—брыдота... На цябе людзі глядзець ня хочуць. Нос твой шырокі. Бяззубая ты, старая немач.

Скрыпуніха спанатрыла, што не спадабалася Міхасіхе новае празваньне і на ўвесь голас:

— На... На... на... Смактуніха, Смактуніха... я цябе не баюся, ты супраціў мяне—ноль. Галетра ты! Бязхлебніца!

На крык жанчын Міхась Кляўко выбег з-пад паветкі. Майстраваў катушачку-дубовачку для маласольных агуркоу і счуў.

Калі на агарод прыбег—плойма дзяцей, была зьбеглася з усіх Муравейнікаў.

— Смактун ідзе...

— Сьмяктун будзе сьвярыцца...

— Унь дзе яго жонка—Сьмяктуніха—перагаварваліся дзеці.

Заняў Міхась з паўмежка Рудчыка і жонку з месца зрушыў:

Не сьмяшы людзей,—упікнуў жонку сорамам.—Сьвету не калацеце лямантам.

На двор узагнаў кульгавага Рудчыка, а галасы тых дзяцей выразна тышчыліся ў вушы:

„... ты Сьмяктун...

„... бацька Сьмяктун...

„... жонка Сьмяктун...

Вялікая крыўда мутою прайшлася па яго сярэдзіне. Потым у пякучы клубок зьвілася крыўда, ды болем-каменем асела нейдзе аж пад самым Міхасёвым сэрцам.

(*Далей будзе*).

Юлі Таўбін

Два вершы

Так яно застанецца...

Паравоз парываецца пругкі,
захліпаецца парай шаленства...
Песьня бароў беларускіх
пачынаецца блізка Смаленска.

... І заходзіць яна, таварыш,
аж пад рог краёў беластоцкіх,
дзе бярэ прогрэсыўны паляруш
ваявод, харунжых і соцкіх.

Паравоз разагнаўся гонкі,
і сьпяшаецца дыхаць поршань...
Непарушна стаяць сасонкі
ля станцыйных будынкаў Воршы.

... І заходзяць яны, таварыш,
аж пад рог нябёс беластоцкіх,
на якіх яны натавалі
свае крыўды агнямі ў столках.

І заходзяць яны, таварыш,
аж пад краты турмаў пазнанскіх,
дзе катуюць, як катавалі,
абяздоленых сёстраў наскіх.

Паравоз—прагавіты скнара,
ён глытае паветра з парай,
ён праходзіць
глухое
Коханава,
аглушыўшы хлапца запалоханага,
што згадаў мне маё маленства
і..
спыняецца каля Менска.
Але мы прамінем заставы і хмары,—
Чуў ты гоман менскіх ваколіц заводзкіх?

Гэты гоман заходзіць, таварыш,
аж за віленскае ваяводства.

І покуль

пан прэм'ер Прыстар
абяцае мядовыя рэкі ды птушынае малако,—
тэкстыльнікі Лодзі кажуць:

„М ы с у п р о ц ь
фашыстаў
і з а
бальшавікоў".

І покуль поліцыя ветла
разганяе натоўпаў гурмы
і вызваляе з рэек трамвайных
гнуткія
абцасы
чаравікаў
прыстойных жанчын,—

Пачынаюць шумець паветы...
Недахоп рабочае сілы ў турмах...
Труцяцца простытуткі
і закусваюць гора з гарэлкай—гуркамі—валожынскія
жанцы.

Выходзяць часопісі —
з голымі балонкамі.

Акінчыц гадае,
„чаму гэтак сталася";
Служыць імшу беларускі ксёндз (у газэтах—портрэт);
Арсеньнева піша романсы пра „слонка"..
Яшчэ існуе фабрыка талэсаў
і Булак-Булаховіч—
чулы лірычны поэт.

Параходы-ж заходзяць у Gdan'sk.
а не ў Danzig,

Ёсьць кавалачак польскага мора і лялечны польскі
флёт

І начальнік кобрынскае дэфэнзывы
пан Адамчак.

Зьмітрака Кавалевіча б'е ў жывот.

Так яно застанецца
на гісторыі шалях,—
не знайсьці ім спакою ў іхных гулях і шалах...

Так яно застанецца
ў іхных гімнах узьнёслых,—
і на сто вякоў пройдзе пра Адамчака прослых...
Ды, браты нашы,
памяць аб нядолях і жалях
цяжкай гіраю стане на гісторыі шалях.
Так яно застанецца
ў нашых песьнях і покі...
Так яно застанецца
разам з пахам эпохі,—
разам з копамі „Slowa“
і комплектам „Зьвязды“,
разам з новымі песьнямі, з Асінстанам,—
каторыя
можа ў тысячах будуць тады...
Так яно застанецца на шалях гісторыі,—
а нам яшчэ многа хады.

Тут зрываем прарыў.
Тут праходзіць сяўба—
і турбуецца Белкалгасцэнтр,
і кур'еры зьбіваюцца з ног,
і лятуць тэлеграмы
пра атакі на фронце кармовых культур.
Сотні рыфм.
Сотні тэм.
Пачынаецца новы вянок.
Наліваецца новы атрамант,
Пачынаецца верш
пра юнгштурм,
пра дзяўчыну ў юнгштурмаўскай блюзе,
з залатою капой валасоў,
пра вясну ў Савецкім саюзе
і пра шолах аршанскіх лясоў.

14, 15.—VI. 1931
Смаленск-Менск

Узышоўшы на новы жанр

Засыналі трамваі ў парку...
Запаліўшы сваю цыгарку,
я паціху ішоў дамоў
праз яе сіняваты дымок...

Млява сплюшчвала ноч павекі...
Усе мы людзі, усе чалавекі...
На падставе вядомых падстаў
да пары ў нас жыве Фальстаф.

...У яе валасы былі сьветлыя
быццам косы ў жняі з-пад Амсьціслава,
там-жа неба—
я таму сьведкаю—
шырынёю дарогі сьціскала.

І далей дарогі ўцякалі—
там пачаўся мой шлях цікавы,
ён злучаецца ў думках з вясной
і праз доўгі час—не таю,—
я адтуль дайшоў да высноў,
на якіх сягодня стаю.

Дзяўчына ў юнгштурмаўскай блюзе
з Рабфаку БДУ!
Па свойму нас час габлюе,
іначыць нашу хаду.

І самі сябе мы зьмяняем,
ці мала пуцін мінаем
і з кожным з нас так бывае—
звычайная, праўда, рэч,—
мы новае набываем,
а даўняе кідаем прэч.
Тут нашага росту падстава—
каб потым падняцца—
ляжаць...

І мне эпоха паўстала
такая, як ты—
і дні.
Вачэй тваіх глыбіні—
тады я паклікаў сталасьць.

... Я стомлены ад хадні...
Я выхадзіў сто кварталаў...
(Тут нашага росту падстава)!
... А золак разьдзьмухваў пажар,
і я перамог Фальстафа,
ўзышоўшы на новы жанр.

16-VI 1931
Менск.

Цім. Зарэчны

Эльбрусы чалавечага шчасьця

Аповесьць

Думы

I

Бываюць думы—што волава: важкія. цягучыя. І не страхануць іх, не аслабаніцца ад іх: блытаюцца пад нагамі—што дзераза, спавіваюць галаву—што сон пасьля цяжкой працы,—думы ахмяляючыя, алавяныя,—думы—што бронза: пры чатырохзначных градусах распадаюцца яны на мільёны молекул, пры нулі—злучаюцца ў камок з шчыльнасьцю, якой ня бывае на зямлі, з вагою, якой, напэўна, ня мае зямля (каб можна было ўзьняць яе на рукі).

Думы—што бронза, а бронза—што мільёны молекул. Не працаваць тады: плаваць у сваіх думах—і не ў чаўне—душагубцы, і не на караблі—плаваць у самім сабе, у штормах і сьмерчах сваіх дум: дадзена-ж думаць чалавеку! І часам тоне ён у сваіх думах—ня вытрымліваюць плечы, і падае галава на жвір, у домну, у градусы ўзбунтаванае лявы.

II

Пакой Насты—небагаты: ложак—за шторамі яго ня відаць; стол, пакрыты абрусам,—у самым куту, каля вакна; на стале—бюст Леніна, кніжкі; кніжкамі абкладзены паліцы; здаецца—няма сьцяны з дрэва, сьцяна складаецца з кніжак. Абкружаная кніжкамі і думамі,—сама ў думах,—на канапе сідзіць Наста,—і кніжка вывалілася з яе рук—на падлогу, пад ногі. Глядзець на Насту—у чорным адзеньні, стройную, пругкую, з сінімі кругамі пад вачыма—і думаць—яе-ж думамі:

„...Ёсьць людзі, на якіх няма пылу вякоў,—ім няма чаго страсаць з сябе,—яны з прагнасьцю ўсмактваюць жывіцельныя думы; гэтыя думы не ляжаць на іх грузам: людзі сыстэматызуюць, падпарадкоўваюць сабе гэты груз; груз раскладаецца на пэўныя месцы—паліцы;—і ня цісьне людзей пыл вякоў, як другіх, патонутых у гэтым пыле.

„...Пыл і думы!—Гінуць людзі ад залішніх дум, і думы—ад пылу, але-ж дадзена чалавеку думаць! Ёсьць людзі, якія ўмеюць падпарад-

каваць думы, яны зьяўляюцца іх гаспадарамі, а таму і лёгка ім з думамі і, напэўна, радасна, бо радасьць—сястра вясны, а ўвесну—у хмельным красавіку—думы з крыльлямі, і ляцяць яны—у маладосьць.

„...Дадзена-ж думаць чалавеку: аднаму—думамі, што бронза, другому—лёгкакрыласьцю, што пух, трэцяму—чужы груз несьці на сваіх плячох, чацьвёртаму—ніяк ня думаць: ні ўласнаю бронзаю, ні чужадумнасьцю,—жыць, што казла даіць—абыякавасьцю, абыяталем.

„...Чужы груз несьці на сваіх плячох, ісьці ў бездараж сьцежкаю без пуцявін, узьлескам, лясамі, хмызьнякамі,—прысьці да возера ў завірухах, узьняць высока груз над галавою к сонцу і кінуць—у беспрадоньне, у глыбіню—назаўсёды!—цяжкі і мулкі груз спадчыны.

„...Думаць чалавеку—думамі, што бронза...

(І няма яму часу думаць: стук-стук у дзьверы: „Хто-ж гэта можа ў такі позьні час?").

Наста ўсхапілася, падняла кніжку з падлогі і пашла да дзьвярэй.

— Хто там?

III

Восень—самы лепшы час году. Увосень дні перапоўнены поўнакроўнасьцю, а палі—сьпелаю пазалотаю сонца; увосень-жа нарадзілася вясна: у кастрычніку, у суровыя ночы семнаццатага году—у цемені, у дажджох, у навальніцах рэволюцыі.

Увосень памірае прырода—у ціхай задуме, у пажоўклых лістох клёну, бяз енку, бяз крыкаў. Так умее паміраць толькі прырода.

Падаюць лісты, кружацца на вятру; павуціньне плыве па празрыстым паветры, косы апушчае на зямлю і спавівае імі палі,—і па гасьцінцу, таксама спавітым павуціньнем, ідзе чалавек—бяз дум—парожняя скрынка ад запалак. Чалавек не заўважае празрыстасьці восені, яе пераліваў колераў: з сіняга ў жоўты, з жоўтага ў бялёсы; берагі яго старога цела—яшчэ пругкага, як іржаўлены дрот і дзябёлага, як выцягненая з дна возера гняціна—перапоўнены атрутай зласьлівасьці, горкай, як палын, і калючай, як перасьпелы дзяжоўнік.

Чалавека—парожнюю скрынку ад запалак—завуць Раманам Корбутам. Ідзе ён з мястэчка Яравога: быў у райкоме партыі, у райвыканкоме, і ніхто не задаволіў яго хадатайнічаньне. З прычыны зласьлі, васьці на сьвет божы зайшоў Корбут да былога шынкара Хвядоса, заказаў самагону з тытунём, з перцам, з гарчыцаю,—выпіў гэта залпам з бутэлькі,—па целе разьліліся муць і туманнасьць, Хвядос стаў на галаву—угару нагамі! А потым усё неяк правалілася, засталася парожнасьць і злосьць.

Здавалася, дарога—на выбоінах і карэньнях. Цяжка ступалі ногі па зямлі, лісты шамацелі пад нагамі,—і ад гэтага павялічвалася злосьць. Калі падышоў блізка да сваёй мясцовасьці, не павярнуў, як

звычайна, на зарослую муравою сьцежку да свайго хутара, а пайшоў шырокай дарогай, міма гуты—яна гудзела і ўздрыгвала (і старое цела пранізвала вострымі голкамі, і з іголак капала іскрыстымі кроплямі злосьць), пайшоў у рабочы пасёлак, у дом тэхнічна-адміністрацыйнага пэрсоналу.

Кватэра Сакалоўскага была даўно знаёма Корбуту,—мела яна два вакны—у прасторы, у бязьмежнасьць, мела ідэальную акуратнасьць—ні пылінкі, ні паперкі на падлозе, хоць і ня было ў Сакалоўскага жанчыны—жыў адзін, трыццаціпяцігадовы бабыль,—сам прыбіраў, зьмятаў, раскладаў,—сам, адзін—і з ім—адзіноцтва мужчыны, нявыразнае і захаванае. Корбут падышоў да дзьвярэй, пастукаў,—ніхто не адказаў. Другі раз пастукаў, трэці,—адно гулкае рэха заставалася ад стуку. Падумаў: „Напэўна дома няма",—і ціха, з паніклай галавой пашоў назад.

— Раман Лявонавіч! Якім чынам? адкуль?..—Прад вачыма вырас Сакалоўскі—у акулярах, у скураной куртцы, з портфэлем,—і Корбут замяшаўся, ня то ўсьмешка, ня то расчараваньне пакрывіла яму вусны, і смутная цень прамільгнула на твары Корбута, хоць і не заўважыў яе Сакалоўскі.—Адкуль-жа, старына? Чаго ты маўчыш?—здаецца сьмяяўся, здаецца насьміхаўся Сакалоўскі, і Корбут адчуў сябе ніякавата, як быццам абарвалася нешта ці адпусьціў нехта туга нацягненую струну. І невядома было: ці добра гэта, ці дрэнна, ці проста сярэдняе нешта між гэтымі двума полюсамі. А потым устрапянуўся, ажывіўся,—твар ператварыўся ў шырокавяшчальную ўхмылку,—загаварыў:

— Браніслаў Віктаравіч! я так шукаў вас, так шукаў... Ведаеце, я быў сёньня ў Яравым, хадзіў па гэтых райкомах, райвыканкомах, яшчэ па нейкіх установах з прыстаўкаю „рай",—а раю-ж, ведаеце, і кот наплакаў... Вось хадзіў, нічога ня выхадзіў, прыбіўся да вас. Скажэце, вы не заняты сёньня? Мы-ж ня бачыліся з вамі цэлых два дні...

— Два дні,—перабіў Сакалоўскі,—у нашых умовах, у наш бурны час—тэрмін вялікі... Мы жывем гадзінамі, хвілінамі, часам сэкунда вырашае лёс гадоў, а то, калі хочаце, вечнасьці (вядома, пры пэўнай адноснасьці), мы ў тэмпах, у буры, і два дні—тэрмін вялікі: за два дні на месцы Карпатаў могуць быць акіяны... Але пра гэта пасьля... Давайце цяпер зойдзем да мяне, да бабыля, як плявузгаюць злыя языкі...—Кажучы гэта, Сакалоўскі адмыкаў дзьверы.—Ключы зьвінелі, і лязг іх здаваўся іржаўленым, хрусткім, быццам па целе шкляного страшыдлы вадзілі жорсткім дыямантам.

— А ключыкі, бачыце, скрыгочуць зубамі,—усьміхнуўся Корбут.

— Як жыцьцё наша!—зусім сур'ёзна адказаў Сакалоўскі.

IV.

Сакалоўскі дасканала не ўладаў таемнасьцю стыляў, але груба—навобмацак—адчуваў, што, пішучы заяву ад імя Корбута, неабходна апрасьціцца, наблізіцца да прымітыву (каб Корбут здагадаўся пра гэта—вядома, пакрыўдзіўся-б), а таму і выходзілі ў яго нарачыта куцыя сказы, няправільна пастаўленыя словы:

У раёнавы камітэт Яраўскай компартыі
ад гр-на *Корбута Рамана*

Заява

Як ёсьць я працоўны алімэнт, то жадаю апісаць усё па парадку сваё жыцьцё, ад самых першых маіх часоў да апошняе гадзіны, калі я жыву тут, у вёсцы Круча, Брызгалаўскага сельсавету.

Бацька мой быў прыгоньнік, ня прыгонам кіраваў, а сам падначальваўся пану Вялікабрытанскаму Восіпу Вітаўтаву, як звалі яго ў той час. Бацьку майго секлі бізунамі і лазою на панскай стайні, сам пан прыходзіў і любаваўся зьдзекамі над чалавекам. Я гэтага ня бачыў, мне расказвалі пра гэта суседзі. Канешна, каб жыў пан тады, калі я быў дужы і здаровы, я яму адпомсьціў-бы за бацьку, але ён памёр, бацька мой таксама аддаў богу душу, як тады казалі, бо былі ўсе цёмныя і верылі ў дурман рэлігіі. Мяне аддалі ў горад да купца Бургунава, хлопчыкам у яго краму. Многа гора і няшчасьцяй я перанёс у купца Бургунава, але я там навучыўся, як трэба жыць па-людзку, як трэба перамагаць усялякія цяжкасьці, што сустракаюцца на шляху кожнага і ня кожны можа іх перамагчы. Калі мне было дваццаць тры гады, я кінуў купца Бургунава і адчыніў свой магазын. Купец Бургунаў прасіў мяне пайсьці да яго кампаньёнам, але я палічыў, што кожнаму свая дарога, і не пашоў да яго, пачаў сам сабе жыць. Гандляваў я толькі пяць год, абрыдла мне гэта справа, і я кінуў яе.

Тады ў гэтай мясцовасьці праводзілі чыгунку; я прыехаў сюды, арганізаваў арцель возчыкаў жвіру і каменьняў. У той-жа час, бачачы беднасьць гэтай мясцовасьці і забітасьць людзей, якія жывуць на балотах, я пачаў будаваць гуту. Людзі, канешна, узрадваліся, дзякавалі мне, што асьвяціў я іхняе беспрасьветнае жыцьцё, і ішлі да мяне цэлымі гуртамі. Гута была невялікая, прыняць усіх я ня мог, а таму былі каторыя і зласьлівыя на мяне. Калі-ж прышла рэволюцыя, я сам аддаў гуту рабочым, і яны нават і ня думалі праганяць мяне. Але па асабістых справах мне тут нельга было быць, і я выехаў на Украіну, у Харкаў. Калі-ж я прыехаў зноў сюды ў дваццатым годзе, гута стаяла разламаная, спаленая, і мне было жалка на яе глядзець. Я памог рабочым адрамантаваць яе, паставіць на поўны ход, і гута пачала выпушчаць продукцыю. Але ніякая справа ня бывае

гладкай. Так і тут. У маёй сям'і вышла бязладзіца: дачка мая Наста пасварылася са мною, кінула мяне, і гэта яна зрабіла, каб мяне прагналі з гуты. Чалавек—ня жывёліна, ён усюды павінен браць верх, інакш ён пойдзе ўніз, у зямлю. Я верху браць не хацеў, я хацеў толькі спакойна дажыць свой няшчасны век, і я з Кулінаю, гэта значыць са сваёю жонкаю, парашыў заарандаваць хутар Сымона Гака, які выяжджаў тады ў Сібір. Але калі пачне крышыць чалавека, то і крышыць і крышыць,—і няма яму нідзе збавеньня. Мяне залічылі кулаком і пастанавілі выселіць. Кулаком я ніколі ня быў і не хацеў быць, я працоўны алімэнт, і няхай мне ніхто не перашкаджае. На сходах я заўсёды быў актыўны, і мяне нават абіралі членам сельсавету. Я заўсёды абараняў працоўных сялян і за іх хварэў душою, хоць словам цяпер ніхто ня верыць. Дык прыедзьце, паважаныя таварышы, агледзьце маю гаспадарку, запытайце сялян, і вы ўпэўніцеся, што тут здарылася вялікая памылка. Тут вінавата дачка мая, і ніхто больш. Гэта яна помсьціць мне няма ведама за што. Я магу пайсьці ў калгас, які організаваўся ў нашай вёсцы, буду там рабіць усё, што мне загадаюць, буду радзець усім, як свайму дому. Я магу пайсьці на гуту, я добра ведаю гэту справу, буду ўзьнімаць эканоміку і продукцыйнасьць працы, пайду ва ўдарнікі і соцспаборніцтва, бо я заўсёды, калі праходжу каля гуты, думаю, што мог-бы вельмі многа зрабіць там.

Прашу не адмовіць маёй просьбы.

Раман Корбут

Сакалоўскі быў задаволены: заява напісана вельмі ўдала, пераканаўча, у тоне непасрэднае шчырасьці і прызнаньня сваіх ранейшых памылак. Цяпер-жа такія заявы—ходкі тавар: мода на бальшавіцкае прызнаньне памылак!

Корбут бесьперапынку набіваў тытуном сваю піпку з доўгім, як кіёк, цыбуком і безнадзейна ківаў галавой; згаджаўся з думкамі Сакалоўскага. Яму, Корбуту, цяпер усё адно:—магіла! Ён гэта памятае заўсёды і кожнага незнаёмага чалавека сустракае з апаскаю: ці не па яго, Рамана Корбута, ідзе ён, ці не яго, былога ўласьніка гуты, пагоніць гэты чалавек на далёкую поўнач—у марозы, у сумёты сьнягоў, да белых мядзьведзяў... А заява—адна мішура: усё адно магіла! Гэта толькі пыл у вочы, заслона, каб адцягнуць на некалькі хвілін надыходзячае, каб пры знадворнай спакойнасьці бушаваць усімі адчуваньнямі: сьмерць, сьмерць, сьмерць!

V

Ніхто не адгукаўся, ціха і спакойна было за дзьвярыма.

— Хто там?

— Гэта я, Сакалоўскі.

— Чаму ў такі позьні час?

— Яшчэ толькі адзінаццаць, зусім ня позна... У мяне пільная справа.

— Ніякіх пільных спраў—убачыце заўтра на гуце.

— Наста Раманаўна, я не магу... Пільная справа патрабуе...

— ... патрабуе таго, каб вы зараз-жа пашлі спаць...

— Наста Раманаўна...

— Я магу адчыніць. Што ў вас за справа?

Адамкнула дзьверы, адчыніла. Сакалоўскі ў бліскучай куртцы—дождж, што з цэбара на вуліцы!—прайшоў у пакой і, не распранаючыся, сеў на канапе. Твар яго быў стомлены, цьмяны, і сам ён увесь—сярэдняга росту, паджары—трымаў на плячох стопудовы цяжар бяскрылай заморанасьці. Вынуў папяроску, закурыў; дым лёгкімі ўзьвівамі ўзьняўся да столі.

Сакалоўскі маўчаў, маўчала і Наста. Яна ведала, што ў яго ніякай пільнай справы няма, што ён прышоў зусім з іншае прычыны, і пра гэту прычыну, такую-ж цьмяную і замораную, як і Сакалоўскі,—думаць Насьце не хацелася. Заўсёды, калі яна сустракала Сакалоўскага, акуратнага і, здавалася ёй, сухаватага, бяскроўнага, з нечым смуглым і захаваным, у яе зьяўлялася нездавальненьне на некага ці на нешта, недзе ў глыбіні трапяталі смутныя, без абрысаў і формы, адчуваньні, і яна абрывала яго, калі ён пачынаў гаварыць.

— Наста Раманаўна...

— Ну, ведаю, ведаю...

— Нічога ня ведаеш. Наста!—Сакалоўскі ўзьняўся, на твары яго зьявілася чырвань—не малодасьці, а перасьпеласьці—плямамі, з цьмяна-сінімі жылкамі, і ён усхвалявана, з абрывамі, з новымі, дасюль ня чутымі інтонацыямі, загаварыў, замахаў рукамі (і ў словах, і ў гэстах, здавалася, ён тоне, блытаецца і губіць сябе):—нічога ня ведаеш, Наста! і ведаць ня будзеш! Пра тое-ж, што ведаеш, ня будзем гаварыць. Ты маеш адчуваньне да мяне, блізкае да нянавісьці, пра гэта мы ведаем абодвы, і нам цяжка пра гэта гаварыць. Але-ж ты павінна паверыць, што я... (тут Сакалоўскі замяшаўся, нэрвова хруснуў пальцамі...)—Глупства, глупства кажу... Ты гэта ніколі ня зробіш, бо няма ў цябе веры, згубіла ты яе, і шкада цябе за гэта, хочацца дапамагчы, а ты... адштурхваеш, гоніш... Шкада цябе, Наста...

— Шкадуюць жывёлу, сабаку,—я-ж чалавек!—і прашу цябе пра гэта не гаварыць,—твая дапамога мне не патрэбна...—скарагаворкай, спачатку высока, а потым ніжэй і ніжэй адказала Наста, і Сакалоўскі—у цьмянасьці і ценях ад шторы—адчуў непатрэбнасьць далейшае гутаркі. Але разгон быў вялікі, думы важкія, і Сакалоўскі—па інэрцыі—з крутаяру ляцеў уніз, магчыма, у бездань, магчыма (па інэрцыі)—зноў на гару, на кручу,—гаварыў:

— Толькі што быў у мяне твой бацька. Даўно яго ня бачыў, думаў, што выехаў куды,—а сёньня,увечары сустрэў яго ў калідоры,—

зайшлі да мяне. Ён быў у мяне гадзіны паўтары, і за гэты час шмат чаго расказаў. Бацьку свайго, Наста, ня ведаеш ты. Ён такі няшчасны і прыбіты,— выратуй яго, затрымай,—ты ўсё можаш,—а то позна будзе, Наста... Бацька твой—што сокал з падрэзанымі крыльлямі... Яму дапамога цяпер патрэбна. Ты-ж яго дачка, дапамажы... Ну, было ў вас там нешта,—гэта-ж даўно, Наста, пра гэта забыта...

Наста стаяла каля сьцяны, рукамі абапёршыся аб брыж стала, глядзела ў вакно на дожджам залітую вуліцу, на ліхтар, што вісеў у цемені, успамінала:

... У дваццатым, у дні голаду і тыфусу, дзяўчынай, дзіцянём яшчэ кінула бацьку, з партызанамі пашла ў лес; варыла ім страву, зьбірала грыбы, перавязвала раны параненым; прывыкла да крыві, да гулу гармат; дні былі асьвістаны кулямі, забалочаны багавіньнем, паглынуты пушчаю, і людзі былі—у суровасьці і небясьпецы, не падобныя да гэрояў і—гэроі. Былі там сяляне з вакольных вёсак—у растаптаных лапцях, у падраных анучах, босыя; былі і рабочыя гуты, задымленыя, абветраныя, у лахмоцьцях. Жыла ў лясох і балотах з вясны да сярэдзіны лета. Пасьля, калі адгрымелі гарматы, на гуце, у гулах і пераборах, каля тапільнае печы. Бацька быў тады на гуце за галоўнага інжынэра. Нешта раз прышоў да яе, сказаў, каб зьвярнулася дамоў. Не пашла, бо помніла: дома—у роднай хаце—злаславасьць бацькі: на ўсіх, на ўсё, на ўсякага,—і хмурасьць, і душу выядаючы сум,—бег-бы ад іх вуліцамі, гародамі, у трясяніну балот!—хоць-бы ў апошні раз, хоць-бы назаўсёды!—абы ня бачыць навіслай у хаце варожасьці, абы ня дыхаць аблітым жоўцю паветрам, абы ня быць на гэтым кавалку зямлі!—(маці шкада—маці ў сьлязох і няшчасьці). Не пашла назад у хату, хоць бацька прасіў, загадваў, пагражаў звальненьнем з гуты. Праўда, на другі дзень не далі работы: плакала і ня ведала што рабіць. Заступіліся рабочыя, тыя, што партызанілі; зноў пачала працаваць;—бацьку-ж прагналі, і больш з ім, хоць і сустракалася, не гаварыла. Потым паехала вучыцца,—сем год ня была на гуце: лябараторыям і кнігам аддала маладосьць, і зноў прыехала сюды, у глуш, у балоты, хоць і ня пушчалі, пасылалі на вялікую гуту у горад.

І яшчэ ўспамінала Наста (на вуліцы дождж—пасярэбраным пылам—скрозь сьвятло ліхтара—падае на гразкую зямлю, і зямля здаецца застыглаю ляваю, грудастай, нярухомаю):

... Быў хлапчук—сінія вочы, нос курносы, шпаркія ногі,—пабяжыць—не дагоніш. Хлапчук парабкам служыў у бацькі; трушком, угрунь, з усяе сілы бегаў, куды пашлюць: з гуты да хаты, з хаты на гуту. Ня любіў ён Насьцінага бацьку, дзеркачом яго за вочы называў. Дружыла з ім Наста: у цуркі гуляла, за кацелкай па дарозе бегала (а ён як катне, дык ня ўглёніш, як ляціць кацелка), па грыбы разам у лес хадзілі. Бацька не дазваляў нават гаманіць з хлапчуком,

але дзе там паслухаеш яго,—ён заўсёды толькі і выдумляе што-небудзь нядобрае. Звалі хлапчука Астапам (дзіўнае імя, зусім падобнае на Насьціна: пасьля, калі падрасьлі. пісалі свае імёны на паперы і сьмяяліся:—Нашы імёны—брат і сястра, толькі адна літара не такая... яе можна пераставіць...). Хлапчук той ператварыўся ў дарослага мужчыну, але вочы яго засталіся ранейшыя: сінія—колеру неба ў пагодлівы дзень.

... Наста нярухома стаяла, рукамі абапершыся аб брыж стала, з ледзь прыкметнай ухмылкай на тонкіх вуснах. Яна аддалася ва ўладу цяжкіх успамінаў і нярадасных дум. З гэтага забыцьця яе вывеў устрывожаны голас Сакалоўскага.

— Ну, Наста, дапамажы бацьку... Ён просіцца на гуту...

Яна маўчала, ён зноў праказаў:

— Чаму ты маўчыш, Наста?—Бацька гіне твой...

— Прэч адсюль, прэч!—ускрынула Наста, і ў яе закружылася галава; сінія, чырвоныя, цьмяна-ружовыя кругі засланілі Сакалоўскага,—ён праваліўся ў туманах балот, у багавіньні; няма яго—парожнасьць і лёгкасьць у целе, і словы:—прэч адсюль, прэч!.. адыйдзіце!.. —і сінія—колеру неба ў пагодлівы дзень—вочы хлапчука,—у іх сьвеціцца радасьць і збавеньне, і шчасьце першых дзіцячых дзён.

Сакалоўскі вінавата стаяў каля дзьвярэй, Наста ніцма ляжала на канапе і плакала наўзрыд. Сакалоўскі ведаў: падыйдзі да яе, пачні ўгаварваць—прагоніць, задушыць (так яму здавалася); ён перамінаўся з нагі на нагу, адчуваў сваю дробнасьць, нязначнасьць для Насты, і ненавідзеў сябе; здавалася—сам задушыў-бы сябе:—„К чаму жыць? для чаго?“ Стаяў каля парогу, глядзеў на Насту, потым сказаў:

— Я пайду, Наста .. Ня буду пра гэта гаварыць...

Наста нічога не адказала. Ён зьнік за дзьвярыма. Кватэра яго была ў гэтым-жа доме, на першым паверсе (кватэра Насты—другі паверх, пакой № 5), але Сакалоўскі пашоў на вуліцу. Хадзіў па невядомых завулках, па крутагор'і і равох, выбіўся нават у балота—гэта на пасёлак, пад гуту; дождж марусіў—дробны, восенскі, як і тысячу год таму назад, магчыма—на такой-жа самай зямлі, магчыма—у гэтую самую восенскую ноч. Перад золкам прышоў на кватэру, не распранаючыся—першы раз у жыцьці—брудзьнымі ботамі лёг на белую шаўковасьць коўдры.

VI.

Думы—што бронза, і Наста ў думах: дадзена-ж думаць чалавеку. За вакном, на вуліцы—вецер і дождж, і ў дажджы, у завірусе—вясна! суровая, хмельная, буяная, ідзе яна праз балоты, сьнегапады, марозы бурнымі патокамі—у шуме, у сонцы—вясна!

За вясну можна памерці, можна рынуцца ў вір галавой,—у бездань, у домну, у ляву!—страляць і расстрэльваць!—зіму на штыхі ўзьнімаць—высока, к сонцу! каб спаліла сонечнасьць яе, ператварыла

ў сізасьць—сізую, як галубы! -у мільёны молекул, і каб молекулы бунтавалі мільёнамі кілёват энэргіі— у маразох, сьнегападах, вятрох!

Думы—што бронза, і абвалы дум—жудасны, што лява з крутаяру: які Гэркулес затрымае абвалы?—Ні ўцячы, ні схавацца: дагоняць, зломяць, ператвораць у тую-ж ляву: будзем мільёнамі молекул ламаць, крышыць, руйнаваць!—і ня ты ўжо, а мільёны молекул тваіх; ты ператворышся ў кавалак растопленае лявы. Лява застыгне, кавалак закапаецца ў зямлі; на паверхні, на зямлі—вырасьце куст жымаласьці.

Наста на канапе, ніцма, у думах, у сонечнасьці і вятрох, у маразох і вясьне: дадзена-ж думаць чалавеку! І калі чалавек моцны, адзінка магутнейшай, узыходзячай па ганках барацьбы да вышынь жыцьця масы—ён не загіне, плячо ў плячо будзе ісьці разам з усімі—праз ірвы, крутаяры, балоты,—на гару, на горы, на Эльбрусы чалавечага шчасьця—усё вышэй і вышэй—к сонцу!—у сонечнасьць і вясну.

Гулы гуты

I.

Гулам гудзіць гута.

Труба-ветрагон завірухаю шугае печ.

У печы—у растопленым яе нутры—ляваю Вэзувія булькаціць маса. Глянеш у нутро печы, у тысячы сонц—і міжвольна зачыніш вочы: праменьні праніжуць твар,—адыйдзеш у бок,—пераможаны сьпякотай. Возьмеш сінія акуляры ў рабочага, і сьмела глядзіш у прорву растопленай лявы, у модэль жарала Вэзувія: вадкасьць хвалюецца спакойнымі грабянямі, цёмна-сінімі хвалямі, і ў грабянёх, у хвалях—пругкія зморшчыкі старасьці, памяраньня; пругкія таму, што лява, маса—вялізарны камок энэргіі, старасьці, памяраньня з тае прычыны, што камок распадзецца на сотні і тысячы застыглых бутэлек, шклянак, талерак, банак, і гэты памяраючы камок энэргіі будзе служыць жыцьцю, маладосьці, людзям.

Гулам гудзіць гута.

Вакол печы рухаюцца дзесяткі людзей.

Выдувальшчыкі—фантастычныя асобы ў фантастычных рухах (як можа падумаць выпадкова трапіўшы сюды чалавек) ня стройна, але шпарка, рухава макаюць у печ кіякамі, доўгімі, як цыбук Рамана Корбута, і, як у цыбуку, на кіякох у адным канцы—дзюрка, на другім—воўчае вока—градусы з чатырохзначных лічбаў; воўчае вока—агонь—апушчаюць у форму, вагаром заціскаюць яго—ціснуць, націскаюць, бясформенасьць ператвараюць у форму—з граніцамі, контурамі, пэўнымі памерамі.

Гулы гуты—трывожныя, з надрывам. Пра гэта ведае—ня вылічэньнямі, ня формулай—выдувальшчык Сьцяпан Гарбуз; для яго гута—

дом, нават больш зразумела, чым родная хата: пятнаццаць год аддадзена гуце, гэтай растопленай печы, шкламасе, асфальтаванай зямлёю і падэшвамі падлозе, гулу ветрагоннай трубы. Гута—жывы арганізм, пакрыты шатром з дошак і гонты, гудзіць хваравіта, з надрывам, пераборамі, і ў гэтым гуле—перасьцярога, трывожнасьць, захаваная ў глыбіню растопленай лявы, небясьпека, аброслая рытмам разьмернасьці і звычайнай спакойнасьці, сыгнал, закіданы нормамі і процантамі браку. Выдувальшчык Сьцяпан Гарбуз,—ня формулай—ловіць сыгналы небясьпекі,—яны плавяцца, падвышаюць тэмпэратуру цела—не градусамі, а нейкай новай невядомай адзінкай, і сыгналы рассыпаюцца іскрамі ўваччу—не схапіць іх вокам, не разгледзець: чырванацьмянымі кругамі зьнікаюць яны. Але ўсёроўна выдувальшчык Сьцяпан Гарбуз падыходзіць да майстара Калакалухі, гаворыць яму:

— Слухай, нешта ня тое... Скажы, як ты думаеш. Па мойму, труба падавілася, ці горла ў яе падарвала... Бачыш, верхняя кара шкламасы пацямнела,—ёй не хапае тэмпэратуры. І зноў-жа—брак... Бачыш, колькі бутэлек...

Майстар Калакалуха цьвіціць пралескаю, яго ўхмылка жартуе вусамі, ён трымаецца за клінок бародкі, у яго вачох, бліскучых ад растопленай шкламасы, бегаюць чорцікі, і словы яго, вёрткія, коўзкія, быццам гарох, рассыпаны па ільду:

— Як сказаць, Сьцяпан... Брак—штука паганая. Памятаеш, у дваццаць першым? увесь двор быў завалены бракам? Гэты брак мы зноў кідалі ў печ, і зноў выраблялі брак. Вывезьлі, ўсётакі, брат! Калі будуецца дом, заўсёды многа трэсак. Трэскі—сьведкі вялікае будоўлі. Так і тут: узрастае продукцыя—павялічваецца брак. Гэта ня страшна, Сьцяпан. Труба зусім не падавілася, нагрузка ў яе вялікая, яна вельмі па многа глытае паветра...

Калакалуха цьвіў ухмылкай і трымаўся за плячо Сьцяпана. Рука яго, старэйшага майстара на гуце, заўсёды цьвёрдая і ўпэўненая, уздрыгвала, і кроў у ёй пульсавала мацней. Сьцяпан моўчкі пайшоў на свае месца, з левага боку печы, пятае ад сьцяны. І не стаялася на месцы, работа вывальвалася з рук, ледзь дачакаўся перапынку. Калі пазванілі на перапынак, рабочыя пашлі ў сталоўку пасілкавацца хлебам, выпіць шклянку гарбаты. Сьцяпан кінуўся шукаць Калакалуху: хацелася давесьці, што майстар памыляецца, што на гуце сапраўды ёсьць небясьпека. Майстра не знайшоў: усе яго бачылі, восьвось, толькі што, але некуды зьнік, пропадам прапаў. Але ўсё такі адшукаў: ён ішоў па заводзкім двары разам з інжынэрам Сакалоўскім, нешта нашэптваў яму на самае вуха, падазрона паглядваючы на бакі. Інжынэр Сакалоўскі, заўважыўшы Сьцяпана, з нейкай весялосьці праказаў:

— Здароў, ударнік, вэтэран корбуцкае гуты!

І Сьцяпан ня стрымаўся, каб не адказаць з такой-жа весялосьцю на прывітаньне Сакалоўскага:

— Здароў, інжынэр, галава ўдарнае гуты!

Галоўны інжынэр гуты меў звычку цярпліва выслухваць кожнага рабочага і на ўсялякія заўвагі адказваць: „Так, так, зразумела!" І кожны рабочы заўсёды зварачваўся да яго—ці з прапановаю ці з вынаходніцтвам, ці проста з заўвагаю наконт чаго небудзь, і кожны рабочы заўсёды атрымліваў мэталёвае і падбадзёрваючае: „Так, так, зразумела!" Браніслаў Віктаравіч быў папулярны сярод рабочых, здаецца, карэньнямі ўрослы ў гуту: у яе шумы, гулы, пераборы, і, галоўнае, падтрымліваючы ўсюды рабочых. На вытворчай нарадзе, калі выступаў хто-небудзь з рабочых, Браніслаў Віктаравіч горача, з энтузыязмам падтрымліваў яго думкі, прапановы, і тут-жа не забываў напомніць прысутным аб невычарпальным багацьці ініцыятывы і энэргіі ў нетрах рабочае клясы. І цяпер, калі Сьцяпан расказаў яму пра свае смутныя адчуваньні, Браніслаў Віктаравіч высока ўзьняў чарнявыя свае бровы, схапіў руку Сьцяпанаву, моцна паціснуў яе і ўсхваляваным голасам праказаў:

— Правільна, Сьцяпан!... Я сам адчуваю—нешта ёсьць... нешта ня тое... Вось, быццам ідзеш па зялёнай мураўцы і ня ведаеш, што пад табою трасяніна... Ідзеш, хоць-бы што, а потым раптам правальваешся па вушы. Вось і ў нас так можа быць. У цябе нутро чулае, Сьцяпан. Я дакладу... Мы прымем меры...

Клетчатая кепка Браніслава Віктаравіча, акуляры ў бляску сонца, скураная жоўтая тужурка, гетры на нагах хвалявaліся, нэрвова рухаліся, і сам ён, галоўны інжынэр гуты, быў ахоплены трывогаю і шчырай удзячнасьцю Сьцяпану, радавому рабочаму, аднаму з пяцісоцен, які першы заўважыў надыходзячую небясьпеку.

Падышла да іх Наста Корбут, памоцнік дырэктара, задымленая, з крупінкамі сажы на твары (была ў кузьні, глядзела, як ладзяць форму), сама маладая і сакавітая. Ёй можа было даць ня больш дваццаці трох год, і можна сказаць было пра яе: маладосьць, памножаная на ўпартасьць, і ўпартасьць, памножаная на дзелавітасьць: такая яна была суровая ў сваёй маладосьці і сакавітая ў сваёй суровасьці. Наста распытала, у чым справа, задумалася і ціха, у задуме, адыйшла.

Зазванілі на работу,—замітусіліся рабочыя, ідучы да сваіх варштатаў, зарухаліся выдувальшчыкі каля печы—фантастычныя, у фантастычных рухах (як можа падумаць выпадкова трапіўшы сюды чалавек), і гулы гуты пераборамі, з надрывам загудзелі надыходзячую небясьпеку, блізкую трывогу.

II.

Гулам гудзіць гута.

Сотні выдувальшчыкаў, зусім не фантастычных і не ў фантастычных рухах, задымленыя і чумазыя, трубкамі набіраюць у ботах шкломасу, дзьмухаюць лёгкімі, духасьцю сваёю—у трубкі, камкі шкломасы надуваюць вугляродам, азотам і кіслародам; трубкі качаюць, раскачваюць, апушчаюць у формы, у сталь: нараджаецца бутэлька—плаўкая і чырвоная; горла ей абразаюць, раўнуюць і нясуць яе—жывую бутэльку—у каляніцу да соцен і тысяч другіх такіх-жа бутэлек.

Каля печы, каля ботаў выдувальшчыкі рухаюцца нястройна, але ў гэтай нястройнасьці—рытм упартае працы і барацьбы, настойлівасьці і дакладнасьці, рытм ператварэньня бясформенасьці ў контуры і граніцы. Сотні выдувальшчыкаў, сотні людзей, сотні, здаецца, нічым ня злучаных індывідуальнасьцяй, але паміж імі—схаваная залежнасьць, падпарадкаванасьць аднаго ўсім і ўсіх аднаму; і яны—сотні людзей—нястройна, але ў рытме, у рухах, падначаленых пэўным законам, злучаны ў адзін магутны колектыў.

Гулам трывогі гудзіць гута.

Выдувальшчыку Сьцяпану здаецца: — трывога! — небясьпека! — прарыў!—у цёмных плямах растопленай лявы, у надрыўным гуле ветрагоннай трубы, у рухах таварышоў, ударнікаў трох варштатаў. Пала трывога некуды ў глыбіню, і не прагнаць яе, не пазбавіцца ад яе: точыць, падтачвае, крадзецца падземнымі хадамі, цёмнымі пячорамі.

І яшчэ яму здаецца: яго таварышы, ударнікі трох варштатаў, напэўна працяты той-жа трывожнасьцю, што і ён. Вось, Ляксей Буры, сэкратар комсамольскага колектыву, выдзьмухвае бутэльку; рукі яго наліваюцца крывёю і твар робіцца земляным,—і няма ў яго, у лепшага ўдарніка гуты, смаку ў рабоце, ён падобен на машыну, якая бярэ, выкідвае, заціскае. Вось ён, Ляксей Буры, гаворыць Пятрусю Гарушку, белавалосаму, са сьветлымі вачыма хлапчуку:

— Эх, Пятрусь, бачыш, цьвіль якая ў ванне...

— Цьвіль—ня гніль: пераварыцца—шкло будзе!—адказвае Гарушка, і трубка яго спрытна апушчаецца ў бот.

— А як не пераварыцца?

— Вон выкінем!...

— А прамфінплян?

— І маўчыць Гарушка, не адказвае; адчувае, што ня так сказаў, што ў думках было зусім іншае: „Што цьвіль, што каменьне?.. Націсьнем, ударым, глядзі—і перагонім! Дружнасьць толькі патрэбна, організаванасьць, астатняе само прыкладзецца. Я ды Ляксей, ды Сьцяпан, ды Антось—бачыш, сіла якая вырастае. А калі ўсю гэту гуту ўзяць, усіх рабочых, гару ўзьнімем, ня то што прамфінплян!.. Го-о-о, мы моцныя, хто з намі можа раўнацца?!“.

...Гарушка ўспомніў учарашні вечар, калі ён ішоў з работы ў свой інтэрнат. На дварэ была асеньняя азызласьць, марусіў дробны дождж. Ішоў Гарушка замораны, апоркамі вязнучы ў гразь, ледзь пераступаючы нагамі. Хацелася хутчэй пайсьці ў інтэрнат, скінуць вопратку, падсунуць бліжэй столік з лямпай, захавацца пад коўдру і пад завываньне ветру за акеніцамі чытаць кніжку: хадзіць па невядомых краёх, сустракацца з невядомымі людзьмі, упартымі і заўсёды дасягаючымі мэты, бо і ў Гарушкі, у нядаўняга вясковага хлапчука, была затоеная мэта, глыбокае жаданьне вучыцца, вучыцца і вучыцца, ісьці па лесьніцы ведаў на самую гару, каб відаць была ва ўсёй неабсяжнай шырыні разгоністая роўнядзь, з ірвамі, з крутаярамі, вазёрамі і рэчкамі, і на ёй, на ўзгорках і нізінах, строгія карпусы фабрык, заводаў, абрысы вялікай будоўлі, узьнятыя да неба трубы, гулы гуты, гордыя і магутныя... І хацелася Гарушку бегчы да заводу, узяць у рукі вагар—кіраваць вялікай , складанай машынай, да якой цяпер нават боязна падыйсьці (быў на экскурсіі ў горадзе, бачыў такую машыну—турбінаю звалі яе)...

Не даходзячы да інтэрнату, Гарушка пачуў нейкія дзікія выгукі; ішлі яны з цемені, з азызлае ночы, ад інтэрнату. Падышоў бліжэй, убачыў і зьдзівіўся. Пры самай дарозе, на склоне ўзгорку стаяла старая, зарослая сінім мохам хата. Некалі, яшчэ да Корбута, дажываў у ёй свае апошнія дні званар Тарас, усімі пакінуты, усімі забыты, з сваім адзіноцтвам, з ветрам і з балотнымі туманамі,—за вёскай, за ваколіцай, на адшыбе. Памёр ён, але хата перажыла сваю старасьць: стаяла, як помнік старасьвецкіны,—бяз вокнаў, бяз коміну, з зямляной падлогай. І цяпер ёй прышла сьмерць: нехта моцнымі рукамі, з вухканьнем, с дзікімі выгукамі, выцягваў яе з зямлі, узьнімаў на кольле, і яна, адчуваючы сваю пагібель, скрыпела трухласьцю і чраваточынай, але не здавалася, моцна ўхапіўшыся за зямлю. Калі Пятрусь падышоў бліжэй, то заўважыў чалавечыя цені,—яны павольна рухаліся, згібаліся і выпрастваліся, а хата скрыпела, нахіляючыся на бок, вось-вось рухнецца з узгорку на гразкую дарогу.

— Што-ж гэта вы, хлопцы, робіце?..—зьдзіўлена і трывожна запытаў Гарушка.

Словы Пятруся ніколькі не падзейнічалі на іх,—чалавечыя цені з такімі-ж выгукамі і вухканьнем узьнімалі старасьвецкую хату, і яна з такім-жа паміраючым скрыпам нахілялася на дарогу, у нябытнасьць.

— Хлопцы, хіба вы звар'яцелі?!.—гучней крыкнуў Гарушка.

У гэты момант чалавечыя цені напружылі апошнія свае сілы, запелі дубінушку, і хата, махнуўшы застрэшынамі, быццам крыллямі, рухнула з абрыва на дарогу, распласталася гнілымі касьцьмі на зямлі.

— Што-ж вы зрабілі, сабачыя сыны?..—не сьцярпеў Гарушка і кінуўся да чалавечых ценяў.

— І ў дзярузе не зьбярэш!—ня то яму, ня то сябрам сваім адказала аднак чалавечая цень, і ў гэтай цені Гарушка апазнаў Касавокіна Янку, па прозьвішчу Вышыбайла, празванага так за свой буйны нораў.

Пятрусь падышоў зусім блізка, і тут апазнаў ужо ўсіх: Петрыкава Рыгора, Ляшча Піліпа, Зайца Лукаша і Калупаенку Рывона.

— Эх, ты, а казаў ударнікам будзеш?!..—сказаў Гарушка, гледзячы на Касавокіна.

— А-а-а, ёлкі, палкі, адкуль-жа гэта цябе?..—зьдзівіўся Касавокі, і ад яго павеяла перагарам гарэлкі, ня то з цыбуляю, ня то з часнаком.

— Гарушка-а-а!.. Го-о-о-о, наш Гарушка!.. Здароў, братка!—сьмяючыся і махаючы рукамі ішоў да Пятруся Заяц, запявала на ўсю акругу і першы скакун у суседніх вёсках.

— Ты што, гніда, пра ўдарнікаў мелеш?—хмура буркнуў Калупаенка і падышоў блізка да Пятруся, высокі, крыху згорблены, разлаваны.

Гарушка апынуўся ў коле з чалавечых фігур. Мільганула думка, што гэтая п'яная кампанія можа пабіць. Хацеў выйсьці з кола, стаць з боку, каб на выпадак чаго кінуцца на ўцекі, але Калупаенка стаў насупроць і, узяўшы за грудзік у паліто, сказаў:

— Ты, малакасос, пра якіх ударнікаў кажаш?

— Пра цябе ён, пра каго-ж больш?—падказаў Лешч Піліп, драбненькі, у сьвітцы да пятаў, „поп у рызе", як дражнілі яго рабочыя.

— Я пытаю ў цябе,—ня ўнімаўся Калупаенка,—пра мяне ты ці наогул?

— Ён-жа комсамолец,—чаго ты лезеш? зноў падгарачыў Калупаенку Лешч.

Калупаенка выпусьціў грудзік у паліто Гарушкі, узяўся за грудзік Лешчавага паліто. Рука Калупаенкі здавалася наэлектрызаванай, а фігура—хісткай і слабай, вось-вось паваліцца на зямлю;—трымаўся за Ляшча, казаў:

— Комсамолец, ну—і што-ж? Я, брат, ведаю, брат, комсамольцаў гэтых... Бегаюць па сходах, таўкуць ваду ў ступе, а толк які? карысьць якая? пытаю. Так сабе, для пацехі... Маладыя ды зялёныя... Пастаў ражон перад імі—на ражон узапнуцца... Так сабе толькі маладосьць сваю топчуць. Трэба-ж куды-небудзь сілу дзець, а то прэ яна з іх, буяная, як сьпелае яблыка, ды крамяная, як шчокі ў маладой дзеўкі... Вось і таўкуць ваду ў ступе, сілу сваю глушаць... У-у-х, брат, ведаю іх... як пяць пальцаў сваіх... Так вашу, так!.. Я таксама зяваць ня буду... На бярэма яе, ды на дарогу: ляці, ядзяць цябе мухі, не мазоль вока!.. А то распасьцёрлася, як ведзьма, раскупырылася як баба-яга,—глядзіце на яе, абыходзьце...

— А скажы, Калупаенка, на работу чаму ня прышоў?—запытаў нехта з яго кампаніі, здаецца, Петрыкаў Рыгор.

— На работу?—Калупаенка няўклюда абярнуўся, ледзь не паваліўся на зямлю,—падтрымаў яго вёрткі Заяц.

— А што такое работа? Рукі мае. А што такое рукі? Частка цела майго. А хто ўладар цела? Канешна, я. А хто камандаваць мною будзе—работа ці я? Вось тут і адгадка. Зразумеў?

— Так точна, капітан Калупаенка!—засьмяяўся нехта, а за ім—компанія ня сьмехам, а рогатам ад гуты, ад балотных туманоў, ад гулу ветрагоннай трубы:—го-го-го... га-га-га... гы-гы-гы... Ад гэтага рогату ўздрыгвала вільготная восенская ноч, і людзі здаваліся машынамі рогату, гулу, гагатаньня; у цемені азызлае ночы—жудаснай, напоўненай зданямі—яны надыходзілі адна на адну, зьліваліся, губячы формы, расплываліся ў начной цішыні. Калупаенка, высокі і нязграбны, махаў рукамі, бегаў па натаўпе, крычаў:

— Дайце мне яго сюды, дайце! Расьцярушу ў парашок, у гразь затапчу!

— Ды яго-ж няма, змыўся некуды!

Гэта было сказана па адрасу Гарушкі. І сапраўды, покуль кампанія слухала патэтычныя разважаньні Калупаенкі, Гарушка адышоў у бок і сачыў за далейшым ходам падзей.

— Куды-ж ён мог дзецца?

— Як ён увільнуў?

— Вось табе, Калупаенка, і Юр'еў дзень!

Калупаенка ня ўнімаўся, хадзіў разьюшаны, бы зьвер, ад якога ўцякла прышоўшая сама ў рукі здабыча.

— Дайце мне яго сюды, комсамольца гэтага,—у тры пагібелі скручу!

Але Гарушкі ня было. Калупаенка, углядаючыся ў цемень, пасьлізнуўся і пакаціўся ўніз, на дарогу, на абломкі рэбраў хаты. Кампанія зарагатала і пайшла вызваляць свайго таварыша. З дарогі чуліся енкі Калупаенкі:

— Я-ж, чорт вас пабяры, на самай справе, а вы ў рогат. Не адзін-жа я не пайшоў на работу... Разам гулялі... Эх, каб бутэльку!..

— Ладна, ладна,—унімаў нехта п'яным голасам п'янага Калупаенку

III.

— А прамфінплян?—у другі раз запытаў Ляксей Буры.

— Вось табе і прамфінплян!—не сьцярпеў Гарушка і расказаў Ляксею пра ўчарашні выпадак.

— На што-ж яны пераклідвалі хату?—зьдзівіўся Ляксей.

— Запытай у іх; сілы ім дзець некуды.

— Сілы, кажаш?..—І нічога больш не адказаў Ляксей. Як гэта можа быць—сілы некуды дзець? Над гэтым ніколі ня думаў Буры,

сэкратар комсамольскага колектыву гуты. Ён—па горла ў нагрузках, у паседжаньнях, у сходах—папалуднаваць некалі, заснуць няма часу. Тое-ж самае і з іншымі комсамольцамі і партыйцамі. Ён дужасьць сваю, маладосьць сваю аддае працы, гуце, а поплеч з ім, у некалькіх кроках, людзям некуды дзець сілу, яны кідаюць яе на разбурэньне дзеля зьнішчэньня. А разбураць, ня будуючы,—гэта ганьба, шкодніцтва, контррэволюцыя. Разбураць у імя зьнішчэньня могуць людзі, або вывіхнутыя жыцьця, або не ўвайшоўшыя ў жыцьцё, або з глыбокімі ранамі на магутным целе. У гэтых людзей цякуць цёмныя гольштромы,—яны часам прабіваюцца праз таўшчэзную сьцяну сьвядомасьці, падхопліваюць чалавека і нясуць яго сілай свайго разгону—наперад ці назад, чалавеку ня ведаць—выкідваюць на бераг, на апалены сонцам жвір. Будаваць чалавеку ці зьнішчаць, тварыць ці разбураць?—адказы—глыбока ў гольштромах, гольштромы—у бездані акіянаў чалавечае псыхікі.

Што прымусіла кампанію п'яных рабочых разбурыць старасьвецкую хату? Мэты ў іх ня было ніякай. Разбуралі ў імя разбурэньня. У іх жывуць яшчэ адчуваньні чалавека найдаўнейшай старасьветчыны, драўлянае ці каменнае эпохі.

Калі заглянуць на чалавека за глыбокімі пластамі гісторыі, то можна, напэўна, убачыць разбурэньне: рвуць расьліны, забіваюць зьвярэй, паляць на вогнішчах людзей. Але ў тым разбурэньні была пэўная мэта: жыць, захоўваць жыцьцё, перамагаць, і ў гэтым, па сутнасьці, былі першыя расткі сучаснае цывілізацыі. Цяпер-жа, у бурнасьці і тэмпах вялікай будоўлі, разбурэньне, хоць-бы ў дзесяць крат чырвонае, зьяўляецца рэакцыяй, сьмерцю, адцягненьнем назад, у першабытнасьць. Але часам людзі, закліканыя гісторыяй перайначваць жыцьцё, трапляюць у ціну балота,—багавіньне цягне іх у нетры бездані—і тут (зусім ня дзіўна і не парадаксальна) першабытнасьць перагукваецца з дваццатым векам,—адчуваньне праходзіць праз напластаньні сталецьцяў і душыць чалавека сваім атавістычным цяжарам.

Але гулы гуты—у трывожнасьці і небясьпецы. Ляксей адчуў, што ступіў на зыбкую глебу адшукваньняў і здагадак, а таму, каб зусім не заблудзіцца ў гіпотэзах і меркаваньнях, з новай спрытнасьцю пачаў трубкамі набіраць шкломасу, разьдзьмухваць яе, апушчаць у форму. Але нельга было ўвайсьці ў такт, нельга было знайсьці сярэднюю пропорцыянальнасьць у рухах, тую мерку, тыя пэўныя суадносіны паміж прыладамі і чалавекам, без якіх нельга спакойна і роўнамерна працаваць. Работа вывальвалася з рук. Бутэлькі выходзілі з плямамі ці зусім ня выходзілі: замест іх—бясформеныя ласкуцьці шкла. Павялічваўся брак.

„Што за чорт?—запытаў сам сябе Ляксей.—Бывала, работа работай, гоніш бутэльку за бутэлькай, і часу нават не заўважаеш...

Неяк само атрымліваецца... А цяпер... У чым-жа прычына? Чаму горшая зрабілася шкломаса? Трэба даведацца. Цікава, што думае пра гэта наш вынаходца?".

Вынаходца Шалы Антось—крыху сутулы, сярэдняга росту, з мяккімі абрысамі твару (глядзець на яго ў профіль і думаць: эскіз портрэта, накіданы падатлівым алоўкам мастака), з бялёсымі вусамі і рэдкай бародкай—чалавек-дзівак: са старымі ня дружыць, больш з моладзьдзю, з комсамольцамі; за гэта яго многія дзяды і бабулі не далюбліваюць, хоць і ня выказваюць гэтага нікому; за тое-ж у комсамольцаў ён першы госьць: ва ўдарнай брыгадзе—плячо ў плячо з маладымі, на сходзе ці нарадзе—у прэзыдыуме за сталом.

Шалы Антось—у вынаходніцтвах і вылічэньнях. Так і завуць яго жартам: „Мудрая галава". Летась ён даў прапанову пабудаваць дапаможную печ. Спачатку спужаліся вялікіх выдаткаў, але, калі агледзіліся, выслухалі довады Шалага, згадзіліся, што печ пабудаваць неабходна. Цяпер у час рамонту галоўнай печы гута ня спыняецца, як гэта было раней, працуе бесьперабойна. Але ўсёроўна частка рабочых засталася нездаволенай выдумкай Шалага, даводзіла, што гута пацярпела больш страт, чым атрымала прыбытку. Гэту частку, як ні дзіўна было для многіх рабочых, падтрымліваў інжынэр гуты Браніслаў Віктаравіч.

Пачуўся званок, прышла другая зьмена. Ляксей злавіў Шалага пры самым выхадзе. Рабочыя ішлі ў сталоўку. Дзень быў вільготны, у тумане. Здавалася, што ўгоракапушчаецца не да балота, а падэшвамі абапёрся на хмары і вісіць так—у тумане і воблаках. Сталоўка стаяла ўправа ад гуты, на невялікай роўніцы, недалёка ад балота. У ёй было шумна і накурана. Ляксей з Антосем адшукалі вольны стол, селі. Да іх далучыліся Пятрусь Гарушка і Паркан Астап, студэнт практыкант, некалі рабочы гэтай-жа гуты, да рэволюцыі парабак Рамана Корбута.

— Ты што-ж гэта,—гледзячы на Паркана, пачаў Ляксей,—у такую цясноту лезеш? Пасьля ня можаш папалуднаваць? Ты-ж на халодным рублі...

— Цябе хацеў пабачыць!—сьмяючыся сказаў Астап.—Даўно ня бачыў, давай, думаю, загляну! Дзе-ж гэта ты прападаеш?

Паркан прыжмурыў вочы і, быццам ведаючы нешта таемнае пра Ляксея, чакаў адказу. Але Ляксей, замест адказу, у сваю чаргу запытаў:

— Вось ты скажы, дзе прападаеш? Я ведаю, брат...

Нідзе не прападаў Астап, але пытаньне Ляксея ці тон, якім гаварыў ён, ці проста так нешта каланула ў сэрца, і сьцюдзёнасьць прайшла па целе, халадэча ахапіла твар. Такое адчуваньне бывае тады, калі, думаючы, што ніхто ня сочыць за табой, робіш штонебудзь захаванае ад усіх, і... раптам заўважаеш, што за табой

сочаць, над табой насьміхаюцца. У той момант, здаецца, праваліўся-б наскрозьдоньне, каб толькі ня бачыць наглядчыка за табой, не апраўдвацца перад ім, не ўваходзіць пры пастароньнім чалавеку ў прынятыя рамкі ўмоўнасьці, толькі што пакінутыя на некалькі мгненьняў. Магчыма, за табой нікто і не наглядаў, так толькі здалося табе, але ўжо не ўвайсьці спакойна ў натуральнасьць: будуць прыкметны вонкавыя адзнакі тваёй захаванасьці, ты сам расчыніш сябе нараспашку. Тое самае было і тут, у гэтым хітраватым ляксеевым: „Я ведаю, брат".

— Глядзіце, а ён чырванее!—ня ўнімаўся Ляксей.

І сапраўды, твар Астапа, заўсёды энэргічны, мужны, бяз крывінкі, страціў выразную акрэсьленасьць і пачырванеў. Што з ім? Што такое? Адкуль гэта? Нельга злавіць тысячы ўцякаючых у розныя бакі нітак, нельга зматаць іх у адзін клубок, нельга цьвяроза разгледзець, прасачыць, вывучыць, што к чаму? што да чаго? дзе прычына?

— Ды кіньце, хлопцы! Чаго прыкасаліся?

— Вось, вось, бачыш, як разьбірае!—сьмяяўся Ляксей.—Бачыш, у самае сэрца запала .. і, агледзеўшыся, напаўголаса запеў:

— Эх, кручынушка мая
ды-ы-ы чорнаво-о-о-кая...

У гэты час прынесьлі капусту, хоць нішчымную, але гарачую (і тое добра), і напад на Астапа спыніўся. Пачалася гутарка зусім пра іншае: гута, прамфінплян, брак. Гарушка расказаў пра ўчарашнюю сваю сустрэчу з компаніяй п'яных рабочых. Выявілася, што іх у той-жа вечар бачыў і Астап Паркан на вуліцы пасёлка, недалёка ад канторы гуты: яны дручкамі кідалі ў цемень вуліцы, прымушаючы рабочых гародамі абыходзіць тое месца.

— Яны самыя злосныя прагульшчыкі. Колькі разоў ня прыходзілі на работу! Тут трэба, хлопцы, нешта зрабіць...

— Правільна, Пятро,—адсоўваючы талерку, сказаў Антось Шалы,—тут нешта трэба зрабіць. І каб гэта нешта было моцным ударам па іх... Шурамі—мурамі,—гледзячы на Ляксея, сказаў Антось,—не дапаможаш...

— Канешна, быццам апраўдваючыся, пачаў Ляксей,—тут трэба мобілізаваць увагу рабочых вакол гэтых адмоўных бакоў... Ня шуры-муры,—гледзячы ў сваю чаргу на Астапа—а форсаваны ўдар, як зазначыў дзядзька Антось, па гультайству, па аслабленьню дысцыпліны на нашым заводзе. Мы павінны ўзьняць моладзь, каб яна была прыкладам для ўсіх, і ў першую чаргу комсамольцаў...

— Па-е-хаў!—перабіў Ляксея Астап.—Ня шуры-муры, як вы кажаце (тут ён усьміхнуўся), а рашучы ўдар па абломаўшчыне, па нявольніцкіх адносінах да працы, па ўсім старым, што нам пакінула

спадчына. Трэба ўзяцца за гэта, хлопцы, і ўзяцца так, каб вынікі відаць былі, каб гэта было урокам для астатніх.

— Хлопцы, сыны мае,—жартам загаварыў Шалы Антось,—ды не паседжаньне-ж вам тут, а толькі няшчасны полудзень. Вось нясуць другое, бярыце. Трымай дзьве катлеціны, Пятрусь... смачныя, бульбовыя... будзеш есьці ды аблізвацца. Бяры бістрогану, Ляксей... слаўная якая, проста любата. І табе, Астап, бістрогану... пышная, што аўсяны хлеб... сакавітая, што сухар... А мне ўжо сама падасі,—зьвярнуўся ён да офіцыянткі, маладухі год трыццаці, ружавай і крамянай, і яна, ставячы на стол талерку, звонка засьмяялася.

Пасьля полудню, калі ўсе ў чатырох па гразкай дарозе ішлі да хаты, Антось прапанаваў арганізаваць грамадзкі суд над компаніяй п'яніц прагульшчыкаў. Усе згадзіліся. Гарушка, ахоплены радасным уздымам, казаў, гледзячы то на Антося, то на Астапа:

—І я выступлю на судзе... Я ўсё раскажу... Я буду патрабаваць...

— Мы ведаем, што ты выступіш,—з усьмешкаю сказаў Астап.— Глядзі, толькі сам ня сядзь на лаву падсудных.

— Як гэта?—зьдзівіўся Гарушка.

— А вось спазьнішся на заняткі—там цябе вывесяць на чорную дошку, а потым і ў грамадзкі суд...

— Ты пра рабфак гэта?

— Пра што-ж больш?

— А-а-а,—голасна засьмяяўся Гарушка,—чорт пра сваё, а поп пра сваё: аддай маю малітву!... Вось яно што... Вось чаму ты чырванеў за абедам... Ведаю цяпер... Усё, брат, ведаю... Наста Раманаўна непакоіць цябе. Вось чаму ты ўспомніў пра рабфак. А заўтра якраз яна выкладае...

Усе засьмяяліся і глянулі на Астапа. Твар яго ў момант пакрыўся чырваньню, і ён ня ведаў, што адказаць. Мармытаў:

— Што вы, хлопцы... Ну што за сьмех? Гэта-ж глупства... Гэта-ж проста... ну, ні к чорту ня варта!..

Але сам у гэты час думаў: „хлопцы праўду кажуць—нешта ёсьць... Я ніколі ня думаў столькі пра яе... Але якім-жа чынам яны ведаюць думкі мае? Як яны заглянулі ў мяне? Казаць—не казаў, думаю, нават, упатайку... Якім-жа чынам?..“

Ішоў па гразкай дарозе разам з хлапцамі, з таварышамі сваімі па дзяцінству, і з Антосем Шалым, з гэтым добрым і рахманым чалавекам; пераскакваў цераз канавы, цераз лужыны лёгка, прунжыністым рыўком—цела маладое і здаровае, рухаў просіць і работы непасільнае; гутарыў з імі, сьмяяўся, слухаў іхнія жарты; а ў дум-

ках, у марах быў далёка адгэтуль, у віхуры новых, невядомых дасюль, адчуваньняў, у бурнасьці завірух, у напружанасьці нямой цішыні, калі частата такту сэрца ўзводзіцца ў квадрат, і такт яго здаецца чужым, ня свойскім: выскачыць, сэрца і пабяжыць,—не дагнаць яго, не злавіць,—і калі верыцца, што ёсьць, ёсьць на сьвеце Эльбрусы чалавечага шчасьця, высокія, за грамадамі хмар, да самага неба—к сонцу!—у золаце сонечнасьці і ў сіняй каляровасьці вясны.

Трывога

I.

На гуце расла небясьпека: узьнімалася ўгару крывая браку, зьнімалася якасьць выпускаемай продукцыі, падала дысцыпліна. Лепшая ўдарная брыгада пачала здаваць: якасьць працы нельга было параўнаць з ранейшай, і колькасьць была куды меншая.

Па зьменах праходзілі лятучыя мітынгі. На начной зьмене мітынгам кіравалі сэкратар партколектыву Шаганскі Лявон, старшыня заўкому Кулага Рыгор і ад бюро комсамольскага колектыву Паркан Астап.

На дварэ гуты, шырокім, гразкім, з дошкамі пад нагамі, з гарою жвіру каля сьцяны і з ярусамі бутэлек пад павецьцю, сабралася за сотню рабочых начной зьмены, толькі што зыйшоўшых з работы, каб даць месца ранішнікам. Раніца была хмарная, па-асеньняму азызлая, з пранізваючым паўночна-усходнім ветрам. Мітынг адчынілі пад адкрытым небам, на дварэ.

Шаганскі Лявон, высокага росту, з буйнымі рысамі твару, размашыстай паходкай узыйшоў на ўзгорак жвіру, папрасіў супакоіцца і адразу-ж, ня трацячы часу на выбары прэзыдыуму, як гэта звычайна бывае на кожным сходзе, пачаў гаварыць. Словы яго здаваліся акруглёнымі, важкімі, намагнітызаванымі, хоць і гаварыў ён ціха, спакойна, гэстамі рукі падкрэсьліваючы асабліва важныя месцы. Прамова яго ня была ўзьнятай, перапоўненай патосам: ён проста, па-дзелавому браў адзін, два, тры факты і, падаючы іх сходу, рабіў кароткі вывад, сумнявацца ў якім ці супярэчыць якому ні ў якім разе нельга было: такі ён быў лёгічны, сам вынікаючы з пададзеных фактаў.

— Колькі сярэдняя норма выпрацоўкі паўлітраў на варштат?— запытваў сам у сябе Шаганскі. І тут-жа адказваў: тысяча дзьвесьці пяцьдзесят. А колькі мы даем? Дзевяцьсот восемдзесят тры. Мы можам, гэта даведзена, даць тысяча трыста бутэлек, а то і больш. Сярэдняя норма выпрацоўкі на варштат ланінскай бутэлькі складае тысячу трыста штук. У нас-жа, таварышы, былі выпадкі, калі лепшыя ўдарнікі ўзьнімалі гэту лічбу да тысячы чатырыста пяцьдзесяці. Цяпера-жа мы маем усяго толькі тысячу дваццаць пяць, ды і гэта лічба з кожным днём зьмяншаецца. Узяць яшчэ бутэлькі для сітра. Сярэд-

няя норма на варштат—тысяча сто пяцьдзесят штук, максымум—тысяча дзьвесьці пяцьдзесят, у нас-жа цяпер ёсьць толькі дзевяцьсот дзевяноста. Ці, урэшце, возьмем варштат Калакалухі, які выпрацоўвае пэнэкспэльлеры. Сярэдняя норма на гэты варштат—дзьве тысячы чатырыста штук, максымум—дзьве тысячы шэсьцьсот, на самай-жа справе ёсьць толькі тысяча восемсот чатыры штукі.

Калакалуха, які стаяў воддаль, з боку, і гутарыў нешта з Нупрэем Перапечкам, сваім суседам па рабоце і хаце, пачуўшы сваё прозьвішча, устрапянуўся, падышоў бліжэй да Шаганскага і запытаў у аднаго з рабочых.

— Што ён там пра мяне?

— Ды нічога: пра варштат твой,—адказаў рабочы.

— А што яму мой варштат ражном у глотцы перасеў?

— Ды нічога, ён пра ўсіх.

— Як гэта пра ўсіх?

— Усіх крые.

— А сам ён працаваў?

Кулага Рыгор, заўважыўшы, што майстар Калакалуха перашкаджае гаварыць Шаганскаму, голасна папрасіў:

— Таварышы... ды цішэй там!

— Якое „ці-шэ-й?"—агрызнуўся Калакалуха.—Я-ж кажу: няхайбы ён сам папрацаваў!

— Цішэй, таварышы,—пасьля выкажацеся!—заспакойваў старшыня заўкому, і вецер разьдзьмухаў яго бараду на дзьве паловы—генэральская барада!—і ён лавіў яе левай рукой, правай махаючы на натоўп:—Цішэй там, галганы! Разыйшліся, як пеўні, не сьціхамірыць вас!..

— Цішэй вады, ніжэй травы, га?...—нагінаючыся да старшыні заўкому, крычаў Калакалуха.—І гэта завецца ў вас самакрытыкай?

— Таварышы!..

Шаганскі Лявон, быццам не заўважыўшы выкрыкаў Калакалухі, казаў, што гута ў другім квартале выканала заданьне на сто дзевяць процантаў, у трэцім—на сто пяць процантаў, а ў першы месяц чацьвертага—усяго на восемдзесят чатыры проценты. Шаганскі казаў, што калі ўзяць, прыкладам, выкананьне на семнаццатае за сто, дык дваццаць чацьвертага яно складзе толькі семдзесят тры проценты. Факт—паступовае зьніжэньне, з тэндэнцыяй на далейшае няўхільнае паглыбленьне...

— Гэта, таварышы, гучней казаў Шаганскі,—найвялікшы прарыў, які з няўхільнасьцю ўсё шырэй і шырэй ахапляе нашу гуту. Толькі рашучы контрудар, бязьлітасная лабавая атака, сустрэчная сіла можа спыніць насоўваньне прарыву, можа яго ліквідаваць.

— Вайна табе ці што?—падышоўшы зусім блізка, буркнуў Калакалуха.

— Мобілізацыі толькі не хапала!—падтрымаў яго Нупрэй Перапечка.

— І вайна, і мобілізацыя!—горача, паказваючы рукой на Перапечку і Калакалуху,—загаварыў Шаганскі.

— І вайна, і мобілізацыя, паўтараю, на нашы нявольніцкія тэмпы, на вас, падрыўшчыкаў прамфінпляну! Хто ня верыць у нашы магчымасьці, хто ня хоча дапамагаць нам, адыходзь, ня блытайся!

Воплескі і выкрыкі заглушылі прамову Шаганскага. Ён некалькі разоў намагаўся дагаварыць, але зрабіць гэта не дазваляў шум натоўпу.

— Правільна, Шаганскі!

— Даёш тэмп!

— Далоў опортуністаў!

— Замаўчы, Калакалуха!

— Такія сьлюньцяі нам не патрэбны!

— З такімі прусакоў на печы лавіць, а не на гуце працаваць

— Братцы, я-ж ня супроць,—апраўдваўся Калакалуха, хоць яго ніхто ня слухаў.— Я падтрымліваю таварыша Шаганскага... Я за лінію генэральнае партыі...

Доўгі час ня мог уціхамірыцца сход. Толькі пачынаў гаварыць Шаганскі, шум узьнімаўся, і словы Шаганскага губляліся ў гаме галасоў. Урэшце, калі шум зусім сьціх, Шаганскі пачаў гаварыць далей:

— ...Капіталісты ўсіх краін шалёна рыхтуюцца да вайны супроць Савецкага саюзу. Яны куюць зброю, пры дапамозе якой хочуць задушыць першую рабочую краіну ў сьвеце. Адчуваючы сваю блізкую пагібель, яны з ліхаманкавай пасьпешнасьцю зьбіраюць сілы, арганізоўваюцца, умаўляюцца, калі зручней зрабіць напад на ненавісную ім дзяржаву, зрабіць напад для таго, каб жалезам і сталлю разбурыць соцыялістычнае будаўніцтва, зьмесьці з твару зямлі ўладу рабочых і сялян, крывавым мячом аднавіць капіталізм у СССР. Замежным капіталістам дапамагаюць нашы ўнутраныя ворагі. Яны яшчэ ня зьнішчаны, яны яшчэ чапляюцца сваімі капцюрамі за нас, прабуюць сарваць тэмпы соцыялістычнае рэконструкцыі, затармазіць наш пераможны наступ.

— Адпор ворагу!—выкрыкнуў нехта з задніх радоў.

— Не адпор, а наступ, таварышы!—падхапіў Шаганскі, глянуўшы ў той бок, адкуль пачуўся выклік. Наступ на ворага, таварышы! Наш колектыў—разьдзел у агульнай арміі пролетарыяту. Наша ўдарная задача—весьці соцыялістычны наступ, узрываць акопы ворага, перамагаць цяжкасьці на шляху будаўніцтва соцыялізму. Што-ж мы можам сказаць пра сябе, пра свой невялікі разьдзел? Ні к чорту ня варты, таварышы! Так не працуюць! Мы ад сябе можам патрабаваць большага. Як мы выконваем умову на соцыялістычнае спаборніцтва? Як працуюць нашы ўдарныя брыгады? Нам сорамна, таварышы, мы адстаем ад іншых заводаў. Што-ж мы можам сказаць рабочым гуты імя Кастрычніка,

якія неўзабаве прыедуць да нас правяраць, як мы выконваем соцыялістычную ўмову? Як мы можам глядзець ім у вочы, калі яны склалі сустрэчны прамфінплян і перавыканалі заданьні па асноўных паказчыках? Скажаце: матэрыял падаецца дрэнны. Правільна! Давайце палепшым якасьць сыравіны! Скажаце: ванная печ папсавалася. Правільна! Давайце адрамантуем яе! Шмат прычын ёсьць, але для прарыву няма ніякіх прычын: заданьне партыі мы павінны выканаць.

Астап Паркан запытаў, хто жадае выказацца. Рабочыя маўчалі. Была цішыня, якая магла перарасьці ў напружанасьць. З неба марусіла рось—дробная, нябачная, сьцюдзёная. Час-ад-часу па двару шугаў вецер. Недзе на страсе барабаніла бляха. Была звычайная восеньская раніца, азызлая, гразкая, з мутнымі далягляда мі і нізкай, да самай зямлі, павалокаю хмар. Пад самымі хмарамі ляцелі журавы; людзі ўзьнімалі галавы, глядзелі на іхні стройны кут у сорак пяць градусаў, лічылі падарожнікаў у далёкую, у сонцы і сьпякоце, краіну.

— Дазвольце мне!—пачуўся голас з натоўпу.

— Калі ласка,—адказаў Паркан.

На ўзгорак узышоў Гарбуз Сьцяпан—у ватоўцы, у грубых ботах, замораны. Ён аглянуўся на ўсіх прысутных, спыніў погляд на Шаганскім, які гутарыў з групай рабочых, кашлянуў і, успомніўшы пра сёньняшнюю ноч, зусім няўдарную, расстроеную, як стары рояль у заводзкім клюбе, запытаў ва ўсіх рабочых:

— Хлопцы, што мы робім? да чаго мы дойдзем? што нам скажуць рабочыя гуты імя Кастрычніка?

— Куды мы ідзем, куды мы заварачваем!...—засьмяяўся нехта

— Вось табе, Заяц, хі-хі-хі ды ха-ха-ха!—узлаваўся Сьцяпан вачыма ловячы Зайца гуляку з гуляк і запявалу на ўсю акругу.— Ты сам сябе прахіхікаеш і другіх яшчэ саб'еш з дарогі. Табе нішто ўсе рабочыя, ты сам для сябе жывеш. Дрэнна накормяць у сталоўцы—ты бузу ўзьнімаеш, на работу ня ідзеш. Ня хопіць папярос у коопэратыве—п'янствуеш усю ноч. Шкодны ты чалавек!

— А што я за твае? Шкода табе?

— А за чые-ж, ты думаў?—разьвёў рукамі Сьцяпан.—Ты ня выйдзеш на работу, значыць, наша гута менш выпрацуе продукцыі. Менш будзе продукцыі—будзе недавыкананы прамфінплян. Раз так, значыць, мы скатваемся да прарыву... А прарыў на нашым заводзе—прарыў усёй гаспадаркі. Вось табе, Заяц, што значыць твой прагул, тваё п'янства. Калі ты надалей будзеш так рабіць, дык не рабочым будзеш, а паразытам. Гэта ня толькі я кажу, гэта скажуць табе ўсе рабочыя. Правільна я кажу?

— Правільна, Сьцяпан!—падтрымала некалькі галасоў.

— Кожнаму зразумела!

— Калі ўсе пачнуць прагулы рабіць і п'янстваваць, што-ж тады будзе?

— А што, рвацтвам займацца, як вы?—злосьліва пакрывіўшы твар, закрычаў Заяц.—Гнаць бутэльку за бутэлькай загадаеце, каб яны рассыпаліся на другі дзень? Грошыкі зашыбаць прымусіце? Няхай згараць грошы ды і той, хто іх выдумаў!

Зноў рабочыя захвалявaліся, закрычалі. Сьцяпан стаяў, разьвёўшы рукамі, ня ведаў, што рабіць. Калакалуха нешта горача растлумачваў Перапечку. Заяц, б'ючы сябе ў грудзі, напружваў усе сілы, каб перакрычаць другіх; на яго чырвоным карку сіняю крывёю набухалі жылы, і з рота пырскала сьліна.

З натоўпу вынырнуў Шаганскі і голасна папрасіў супакоіцца.

— Мы-ж так ня скончым сход да полудня... Трэба цішэй, таварышы... Дайце выказацца Сьцяпану... І жанчыны няхай скажуць што-небудзь, а то быццам іх няма: маўчаць, што ў рот вады набраўшы

Некалькі жанчын, якіх да гэтага часу ніхто не заўважаў, заварушыліся і загаманілі. Пёкла Сазонава, перабіральшчыца на гуце, сьмяючыся і паглядаючы на сваіх таварышак, сказала:

— Ды мы калі выступім, дык і вам моташна стане... мы справу скажам...

— Вось, вось!—падтрымаў Шаганскі,—менш слоў—больш справы..

— Яна скажа пра бабскія справы!—зарагатаў нехта з натоўпу.

— .. І як да яе хадзіў Кастусь Кавалёнак..—дадаў другі голас

— А вам што да гэтага?—агрызнулася Пёкла.—Калі вы ласы да баб, дык, думаеце, і мы такія?

— Ды цішэй, таварышы!—перабіў яе Шаганскі.—Нельга так...

— Хлопцы,—не сьцярпеў і Сьцяпан,—нас біць трэба, а мы на хаханках выяжджаем... Мы-ж ня дзеці, урэшце, не блазьнюкі..,

— Ну, і што ты прапануеш?—ліслівa падаў голас Калакалуха.

— Я прапаную гуту абвясьціць ударнай, наладзіць вытворчыя манэўры, працаваць усім як належыць. І яшчэ прапаную: над прагульшчыкамі, хуліганамі і п'яніцамі наладзіць грамадзкі суд.

— Я падтрымліваю рукамі і нагамі!—закрычаў Калакалуха, аскаліўшы ў вясёлай усьмешцы смуглыя, працятыя нікатынам, зубы.

— Дайце мне слова!—папрасіла Пёкла, і ўсе глянулі на яе. Ня выходзячы з натоўпу, яна пачала, зьбіваючыся і пераблытваючы словы, чырванеючы і саромячыся; пачала ня то гаварыць, ня то чытаць з паперкі:—Мая справа будзе такая, каб тут пастанавіць не пазьніцца на работу. А то, вось, учора спазьнілася ажно пяць чалавек. Гэта тыя, якіх я бачыла. Спазьняюцца-ж у нас, самі добра ведаеце, вельмі многія. І яшчэ пастанавіць, каб не рабіць прагулаў. А калі хто ня прышоў на работу—давай заметку, ці ты хварэў, ці ты нагу зламаў, ці ты проста п'янстваваў. Таксама трэба акуратна сачыць за работай і не рабіць браку. І яшчэ ў нас вельмі многа гутараць з майстрамі і рабочымі, а таксама кураць у час работы. Ёсьць і такія, якія... нувось, як гэта завуць... якія ашукваюць дактароў, корчаць з сябе хворых...

— Сымулянты!—падхапіў нехта з рабочых.

— Вось, вось, гэтыя самыя сымулянты... Іх трэба за вуха падцягнуць бліжэй да ваннае печы ды разгледзець, на што яны хварэюць. Канешна, тут нам доктар павінен дапамагчы. Ну, і яшчэ трэба пастанавіць, каб акуратна наведваць усе школы і агульныя сходы. А то што-ж гэта такое? Сход склікаецца—чакай дзьве гадзіны, пакуль усе зьбяруцца, а то і зусім ня прыдуць; заняткі ў школе—той спозьніцца, той зусім ня прыдзе. А гэта адбіваецца на вучобе, перашкаджае вучыцца астатнім. Вось і ўсё, што я хацела сказаць. Гаварыце цяпер самі.

— Самі з вусамі, а вось ты пахваліся чым-небудзь,—усьміхнуўся, гледзячы на Пёклу, малады хлапец.

— Хто хваліўся-б, а ты маўчаў-бы, што ў рот вады набраўшы!—адказала яму Надзя, таварышка Пёклы.

— А ты бачыла?—з такой-жа ўсьмешкай адказаў хлапец.

— Ёсьць на што глядзець?... Ты-ж шчанё яшчэ, блазьнюк матчын.

— Я матчын, а ты што... сучкіна?

Далей спрачацца нельга было: са ўзгорку гаварыў стары рабочы, у акулярах, з вялікай барадой, сутулы. Пёкла ўшчыпнула сваю таварышку, сказала:—„Кінь, а то лаяцца пачнеш!"—і тая не адказала маладому хлапцу, чыя яна і хто яна. А сказаць яна мела што, і даўно зьбіралася сказаць гэтаму хлапцу—Гаваронку Дзянісу—рабочаму той-жа зьмены, на якой працавала сама.

Але Гаваронак Дзяніс—зусім не хлапец, зусім не блазьнюк: ён жанаты чалавек, нават бацька; Праксэда, жонка яго, напэўна, прыгатавала сьнеданьне і з нецярплівасьцю чакае мужа, забаўляючы двухгадовага Кіма і думаючы-гадаючы: „Што магло стацца? чаму позьніцца? Прашло ўжо цэлае паўгадзіны"... Гаваронак Дзяніс—вытрыманы рабочы, пра яго ніхто худога слова сказаць ня можа. На рабоце ён акуратны і шпаркі, на чорнай дошцы ніколі ня быў, прагулаў ня робіць, не п'янствуе, не хуліганіць, з жонкай жыве ў ладу і згодзе,—ну, што яшчэ—вучыцца на рабфаку, хоча быць чырвоным інжынэрам (дваццаць чатыры гады мае толькі, часу на перадзе—горы вышэй хмар, глянеш у будучыню—галава кружыцца ад ахвоты жыць).

Так, Гаваронак Дзяніс зусім не хлапец, ён сталы мужчына, але-ж якая загана ў гэтым? Калі прышла Надзя на гуту з далёкіх, загубленых у бяскрайніх балотах і пушчах, спавітых малачавымі туманамі палёў (хілкае жыта ня клоніць каласоў да долу, стаіць выпрастаным, быццам на корані абмалочаным, і маці гледзячы на сваю палоску, раняе сьлёзы на зямлю: „Як-жа нам жыць? як век векаваць? А ні коніка ў маёй пунячцы, а ні бацькі ў маіх дзетачак... На што-ж ты памёр, мой Нікіпарка, на каго-ж ты нас пакінуў, мой роднень-кі?...) прышла на гуту, пачала працаваць, і першы ёй кінуўся ў вочы

Дзяніс Гаваронак малады хлапец, з радаснымі вачыма, вясёлы. Ну, дык і што з таго, калі ён мужчына, калі ён бацька? Пёкла нешта раз, ідучы на сход, казала Надзі:

— Якая ты дзіўная, быццам трынаццацігадовая дзяўчынка! Ты кажаш, што ніколі-б не пайшла за мужчыну. А я наадварот... Хлопцы—што: куды вецер,—туды яны... Падабаецца дзяўчына—ну, і накінуцца на яе... Маладыя, напралом ідуць у жыцьцё... Ну, і памыляюцца... Падружаць троху з дзяўчынай, а потым кідаюць яе, пачынаюць з другой. А там, глядзі, трэцюю знойдуць, чацьвертую... А жэняцца, думаюць, як? Выпадкова, ніякай падрыхтоўкі да гэтага... А пасьля за голавы хапаюцца, б'юць сябе ў грудзі: „Што я нарабіў, куды я зайшоў? Ну, канешна, там і да разводу блізка. Вось тады перараджаецца чалавек, вобмацкам пачынае жыць, асьцярожна, і калі жэніцца, то ня з бухты-барахты, а падумаўшы. І жыве ён тады з другой жонкай, як голуб з галубкай...

— Хіба гэта праўда?—запытвала Надзя.

— Я-ж табе кажу!—адказвала Пёкла.

— Ты з сябе бярэш прыклад?

— А што, не?—сьмяялася Пёкла і чырванела, успамінаючы Кастуся Каваленка.—Толькі са мной так ня будзе. Кастусь зьвернецца. Вось адчуваю, галаву мне адсячэце, а зьвернецца! Пакруціцца з аднэй стараны ў другую, ды і прыедзе на сваю гуту.

Ва ўяўленьні Надзі паўставаў тады Кастусь Кавалёнак, высокі, з шырокімі плячыма, з добрай усьмешкай на вуснах, і яго дружба з Пёклай—не зразумелая для Надзі, чужая дружба. Жыла Пёкла з Кастусём два гады, дружылі, кожны вечар сустракаліся, і думалася, што гэта дружба перарасла ў нешта вечнае, усягдашняе; але ўсё абарвалася, загінула, засталася Пёкла адзінотнай, сама з сабой. А здарылася гэта ростань так: напярэдадні чырвонага вясельля, калі ўсё было абгаворана і падрыхтавана, і маладыя, Пёкла з Кастусём, хадзілі ў радасьці і весялосьці, Кастусь зьнік, пакінуўшы для Пёклы кароценькі ліст: „Не сярдуй, але інакш не магло быць. Я еду, сам ня ведаючы куды. Я хацеў для цябе толькі лепшага. Бывай".

Успамінала так Надзя, запамятаўшы на сход. Выступалі рабочыя, адзін за адным, чалавек пяць, але яна ня чула іншых слоў, уся была ва ўспамінах. І толькі тады, калі старшыня заўкому голасна запытаў: хто за? Надзя ўстрапянулася і разам з усімі ўзьняла руку.

— За што-ж галасуюць?—запытала ў Пёклы, трымаючы ўзьнятую руку.

— Каб зьнізіць расцэнкі!—адказала тая.—Хіба ты ня чула?

Рука Надзі ўздрыгнула і пачала апушчацца.

— Што ты? што ты?—засароміла Пёкла таварышку:

— Што ты думаеш?

— Як-жа гэта зьніжаць?...

— Пасьля раскажу, а цяпер узьнімай руку,—адказала Пёкла.— Надумалася апушчаць...

— Я-ж нічога...

— Маўчы, маўчы ўжо, зараз сход скончыцца..

І сапраўды, старшыня заўкому, прагаласаваўшы новыя дадаткі да ўмовы на соцыялістычнае спаборніцтва паміж варштатамі, брыгадамі і зьменамі, абвясьціў сход закрытым (хоць і быў ён пад адкрытым небам). Рабочыя, шумна гамонячы і спрачаючыся, адзін за адным пачалі разыходзіцца па хатах.

Пёкла, кажучы пра зьніжэньне расцэнак, хацела толькі запужаць Надзю:—на самай справе ніякага зьніжэньня ня было.

— А ты паверыла ўжо,—сьмяялася яна з Надзі.

— На што-ж пужаць людзей сярод белага дня,—праказаў Астап Паркан, які ішоў усьлед за дзяўчатамі і падслухаў іхнюю гаворку.

— Не з баязьлівых яна,—адказала Пёкла, аглядваючы Астапа з ног да галавы.—Гэта ты за апошнія дні нечага баяцца пачаў, нават з твару зьмяніўся...

— Здалося табе... Я нават паправіўся...

— Паправіўся—ажно жах глядзець... Дух ды... ажно сорамна казаць...

Тут дзяўчаты засьмяяліся і пашлі шпарчэй. Астапа дагнаў старшыня заўкому,—бараду яго вецер разьдзьмухаў на дзьве палавіны, і ён лавіў яе рукой, быццам баяўся, каб вецер не сарваў яе зусім.

— Нічога ня прыдумаю, галава ходарам ходзіць,—скардзіўся старшыня заўкому:—проста бяда, напасьць нейкая на нас... Ну, што будзе? ад прарыву не адкараскаешся, а тады пішы, што пропадам прапалі...

„Вось хто з баязьлівых, падумаў Астап, слухаючы скаргі Кулагі:—„з такімі, канешна, пропадам прападзеш. Гэта опортуніст не з пляката, а з жыцьця... Як толькі што-небудзь праводзіць—ён—„ах!"—ды—„пропадам прапалі"!... Як толькі непарадкі якія, ухопіцца за сваю шырокую бараду ды енчыць на ўвесь голас: „загінулі, браццы, загінулі!"... Так вось цяпер... І хто яго толькі абіраў старшынёй заўкому? Гэта-ж двайнік дырэктара, гэтага няўклюдага Таратуя!" Астап у момант перадумаў гэта, а потым спакойна, з адценьнем нездавальненьня ў голасе, праказаў:

— Слухай, Рыгор, ня будзь камісарам панікі... Праўда, на гуце трывога, але-ж ня ў паніку падаць з-за гэтага. Трывога—трывогай, а да прарыву нельга дапусьціць гуту. Дзе-ж будзем мы? дзе нашы сілы? дзе партыйцы і комсамольцы будуць?

І Кулага Рыгор, нічога не сказаўшы Астапу, з паніклай галавой пашоў у кантору гуты. Яму ў апошні час здавалася, што ўсе на яго насядаюць: і адміністрацыя, і бюро партколектыву, і рабочыя. Спадзяваўся, што спачувае яму гэты студэнт-практыкант, бяз дню

ў пяцідзёнцы чырвоны інжынэр, аказалася, і ён таго-ж духу. Цяпер Кулага Рыгор—адзінотны: калі ня вытрымае гута, будуць вінаваты яны: і адміністрацыя, і бюро партколектыву, і рабочыя,—ён будзе ў старане. З гэтымі думкамі ён і пайшоў у кантору да дырэктара гуты Таратуя („От гэта, здаецца, яшчэ нічога чалавек, але на яго таксама насядаюць",—думалася Кулагу, калі ён адчыніў дзьверы ў кантору). На парозе сустрэў памочніка дырэктара—Насту Корбут, але з прычыны раззлаванасьці і адзінотнасьці сваёй нават не прывітаўся з ёй.

Астап заўважыў Насту тады ўжо, калі яна была каля варот на двор гуты. Адлегласьць была да яе—за гоні. Яна шпарка ішла на заводзкі двор. Хацелася крыкнуць, спыніць яе. Але Астап злавіў сябе на гэтым падсьвядомым жаданьні і паскорыў хаду ў адваротны бок, на вуліцу рабочага пасёлку. „Мы разышліся, як у моры караблі", мільганула ў галаве пачутае ці прачытанае некалі, і захацелася бегчы, бегчы ўгрунь—без усялякае мэты, без астаноўкі...

Наста зьнікла за варотамі ў гуту, але Астап ня сьцішаў хады. Ён ішоў сам ня ведаючы куды. Яго як быццам гнала нейкая чужая сіла, адмовіцца падначальвацца якой не хапала адвагі, хоць і быў нейкі позыў да гэтага, неакрэсьлены, падсьвядомы. Працівіцца—чужая сіла зламае, скрышыць; не падначаліцца—чужая сіла скамечыць, скрамсае, зраўнуе з зямлёй—будзеш енчыць і прасіць літасьці ў некага; і Астап ішоў вуліцай рабочага пасёлку, па гразі, па каўдобінах, пад мутнай росьсю восеньскага дажджу, і яму здавалася, верылася: прыдзе вясна, шумная, вясёлая, зашумаціць зялёным вецьцем і лістотаю сваёй, пакліча маладых і ўпартых на баль вясновае сонечнасьці—высока, недзе на Эльбрусах чалавечага шчасьця, за хмарамі будзённага бруду, пад самым месяцам, вясёлым і шчасьлівым, якім бывае ён у лёгкія вечары бабінага лета.

Акрываўленае шкло

I

„Чаму на мітынгу ня было Шалага?" запытаў сам у сябе Астап. „Ён-жа працаваў сёньня ўначы, і на мітынгу абавязкова павінен быў быць. Ці не захварэў ён часам? Надламіўся, напэўна. Старасьць прышла... Та-а-к... „Старасьць—ня радасьць і маладосьць ня ў радасьць"... у Тургенева, здаецца, недзе ёсьць... Няпраўда! Можна адваротнае давесьці... Але-ж і да самога некалі прыдзе... Трэба змагацца... Галоўнае, у руках сябе трымаць... вучыцца... Не аддацца часу... падначаліць яго сабе... запоўніць работай... Імкнуцца да аднае мэты, не разьбягацца па тысячах сьцежак, ня спыняцца на раздарожжы... Ісьці сьцежкаю,—няхай яна будзе ўзьбягаць на кручы, падаць з крутаяраў, абрывацца перад прорвамі, ву жакаю хавацца паміж купніку і асакі,—але ня губіць яе, ня спушчаць з вачэй, ісьці ёю да маяка... што бліскае недзе ў сінеючай далячыні"...

Так хацелася Астапу разважаць далей, ідучы па вуліцы рабочага пасёлку, але чамусьці зьявілася думка:—што за лірыка? што за фантастыка?—і ўспомнілася зусім іншае. Пасьля ранішняга мітынгу адбыўся мітынг на дзённай зьмене. Мітынг праходзіў у перапынак, у самой гуце. Было за сотню рабочых. Абгаварваліся тыя-ж самыя пытаньні, што і на ранішнім мітынгу: прарыў, барацьба за якасьць, тэмпы. Гаварылі, даводзілі, успаміналі тое-ж самае, што і раніцой на дварэ гуты: соцспаборніцтва, ударніцтва, дысцыпліна. І вось у гэтае-ж самае ўварвалася нешта чужое, варожае.

У самы разгар сходу ў гуту ўскочыў Нупрэй Перапечка, ускалмачаны, з вытарашчанымі вачыма, расхрыстаны (каўнер зашмальцаванае сарочкі быў расшпілены, крыса падранае ватоўкі хісталася паміж ботаў (а боты сьмяяліся іржавымі сваімі зубамі і хлюпалі з гразкасьцю і брудам), шапка часоў японскае вайны сядзела на патыліцы),— ускочыў у гуту і не сваім голасам закрычаў:

— Па-ску-ды!...

Рабочыя глянулі на яго, недалужнага і п'янага, а ён, не заўважаючы поглядаў, плюнуў на зямлю, топнуў нагой па сьліне, матнуў непаслухмянай галавой і крыкнуў у другі раз:

— Па-а-ску-у-ды-ы!...

Паркан праціснуўся праз натоўп да Перапечкі, паклаў яму руку на плячо, запытаў:

— Што табе трэба, Нупрэй?

Перапечка рвануўся ў бок, матнуў галавой, замахаў рукамі; і ў гэтых яго рухах адчувалася баязьліваcьць і разам з тым зласьлівая рашучасьць,—вось, быццам, надумаўся чалавек нешта зрабіць паганае і злое, і ў яго радасна і разам з тым прыкра на душы; „А д'ябал яго ведае, мо' дрэннае што будзе... Ат, што будзе, то будзе... не павешаюць!...

— Я-ж што, па-вашаму?—закрычаў Перапечка.—Смаршчок я ці казяўка, га? Я для вас кавалак зялеза ці жменя жвіру? га?... Маць вашу... у тры паверхі!.. Спаборніцтва... ударніцтва... расцэнкі зьніжаць!.. А ў мяне вы запыталі? душа ў душу пагаварылі? Можа-б я зусім адмовіўся ад заробку... Можа-б я ўсю пэнсію аддаў у асаавіяхім... А то што-ж гэта... раз-два! шыта-крыта! бах-балабах! Го-ла-а-а-с-с ма-ас!.. Маць вашу ў голас... у тры пагібелі.

Перапечка лаяўся, біў сябе ў грудзі, тупаў нагамі, а потым, напэўна жадаючы ўзьняцца на трыбуну, скакнуў на ярус бутэлек, і тут адбылося самае прыкрае: ярус зазьвінеў, затрэскаў,—няўклюжае цела Перапечкі распласталася на бутэльках, рукі і ногі яго біліся ў суздрыгах; бутэлькі крышыліся, і шклянкі ад бутэлек ляцелі ў бакі.

— Хлопцы, выратоўвай!—крыкнуў нехта з рабочых.

П'янага падхапілі, паставілі на ногі. Твар яго быў акрываўлены, у руках тырчэлі шклянкі. І настрой, відаць, зьмяніўся ў Перапечкі, на вуснах яго блудзіла бязсэнсавая ўхмылка, вочы паглядалі вінавата з-пад ілба, фігура была абмяклай і хісткай. Здавалася, што ён зусім ня быў п'яным, а проста так прыкінуўся, каб напужаць некага, каб сваімі паводзінамі паказаць на нешта. Але такім магло быць першае ўражаньне; на самай справе ад яго пахла моцным перагарам гарэлкі, і ногі ў галенях час-ад-часу ўздрыгвалі.

II.

Астап не хацеў успамінаць падрабязнасьцяй гэтага выпадку, але яны стаялі ў ваччу, назолаю, чапляліся за іншыя думкі. З гэтымі нярадаснымі ўспамінамі і падыйшоў Астап да хаты Антося Шалага.

Хата вынаходцы—што сівы бабыль: гарбатая, з трыма хмурымі вакенцамі, з страхою-чупрынай, зарослай сінім мохам. Стаіць яна на канцы пасёлку—канцавая хата, і веку ёй, напэўна, паўтары сотні год, Тады, калі яна будавалася, ня было яшчэ піл у гэтай мясцовасьці, ведалі толькі адну сякеру: сякерай сьсякалі сосны, сякерай падганялі лутки, сякерай цясалі дошкі на столь і падлогу. Хату пабудавалі бяз коміну, курніцаю, пасьля ўжо Антось перабудаваў печ і паставіў комін.

Увайшоўшы ў хату, ня можна было сказаць, што яна такая старая і нязграбная: хата падзялялася на дзьве паловы; столь і сьцены былі абклеены газэтамі; на сьценах віселі портрэты правадыроў. У хаце заўсёды была спакойная цішыня, толькі калі-ні-калі чуўся лязг жалезьзя: гэта Антось майстраваў што-небудзь за сваім рабочым сталом

Жыў Антось з дачкой сваёй,—пятнаццацігадовай Марыляй; яна прыбірала хату, паліла ў печы, гатавала страву. Жонка Антося памерла сем год таму назад, вясной, у шалыя павадкі, калі прагаліны зацьвіталі пралескамі і зямля набухала сокамі маладосьці. У нядзелю ішла яна з царквы па балоце, сьцежкаю між качкароў,—ішла і не гадала, што сустрэне сьмерць: пад нагамі праламіўся крохкі лёд, сама апынулася ў сьцюдзёнай вадзе. Балазе ў гэты момант ішлі хлопцы з кірмашу, яны і выцягнулі яе з вады. Ледзь дайшла да хаты, павалілася на ложак і больш ня ўстала: праз чатыры дні пахаваў яе Антось—без папа, без малітваў, без народу (адчураліся бязбожніка старыя, прышла на пахаваньне толькі моладзь). Гэта быў другі ўдар па Антосю; яшчэ за тры гады да сьмерці жонкі атрымаў Антось жудаснае паведамленьне: „Ваш сын, Пракоп Шалы, загінуў гэроічнай сьмерцю ў барацьбе за справу рабочае клясы пры наступленьні на горад Кіеў".

Вось і ўвесь жыцьцяпіс сям'і Антося Шалага, па прозьвішчу Мудрая Галава. Гэты жыцьцяпіс добра ведае Астап, і калі заходзіць да Антося, заўсёды ўспамінае яго.

У першай палове хаты Астапа сустрэла Марыля, чарнявая і шустрая дзяўчынка. Яна сказала:

— Бацька ў другой хаце нешта складае і перакладвае, капціць цэлы дзень.

І сапраўды, у хаце было дымна, пахла прымусам, за дзьвярыма ў другую палову чулася шамаценьне. Астап адчыніў дзьверы і ўвайшоў у другую палову хаты. Антось замітусіўся, замешана адказаў на прывітаньне; відаць было, што ён нездаволены прыходам пастароньняга чалавека.

— Вось малайчына, што зайшоў!—казаў Антось, гасячы сьпірытусовую газоўку.

— Але чаму-ж ты кідаеш работу?—запытаў Астап.

— Ай, брат, не кажы: цалютны дзень ламаю галаву!.. Трэба адпачыць...

— Ён нават не палуднаваў,—сказала з-за дзьвярэй Марыля.

— Дзе тут палуднаваць, калі галава ходарам пашла!—усьміхнуўся Антось, глянуўшы на дачку.—Ты вось цяпер вынь чаго-небудзь нам, бо хутка трэба ісьці займацца... Студэнты, ёлкі-палкі!... Ты таксама, напэўна, не палуднаваў?—запытаў у Астапа Антось і, не чакаючы адказу, дадаў:—Ну, канешна, не да полудню на гуце... Злашчы табе... Такія справы! Такая трывога! Куды там!

Антось вышаў у пярэднюю палову хаты. Астап застаўся адзін. Ахмяляючы пах сьпірытусу, прагоркласьць газы, зьедлівы дым, пара бэнзыну—ўсё гэта ахапіла Астапа, і ён ня ўтрымаўся, каб не адчыніць фортку. На стале-варштаце стаяла самадзелкавая самадуйка, напоўненая вадой, лямпа з падвоеным прытокам паветра, хітра прыстасаваная Антосем для сваёй работы, мех для надзьмуханьня паветра, шклянкі, бутэлькі і колбы з невядомымі для Астапа вадкасьцямі, празрыстымі, што крынічная вада, мутнымі, што вада з балота, сінімі, жоўтымі. На сьцяне вісела прылада, здаецца, газагенэратар для курбыраванага паветру (некалі тлумачыў Антось), таксама самадзелкавы, зроблены з банкі ад цукерак і з бляшанае трубкі, у якую было ўлітавана дно з дзюркаю пасярэдзіне, пяць сеткавых кружкоў і века. Астап глядзеў на ўсе гэтыя прылады і зьдзіўляўся: „Як у яго хапае цярплівасьці сядзець у чадзе, у дыме, ламаць галаву над нечым, магчыма ўжо вырашаным некалькі дзесяткаў год назад? Што яго прымушае, кінуўшы работу, бегчы да хаты—ня ў ложак, не пад коўдру, а да сваіх прыладаў, інструмантаў, вышукваньняў? І цікава, што ён вышукае тут? Чаму не параіцца з інжынэрам?

Лёгкія крокі Марылькі з двума талеркамі ў руках пачуліся за сьцяной. Яна ўвайшла ў пакой. За Марыляй увайшоў і Антось. Ён запрасіў Астапа папалуднаваць разам з ім.

— Чаму-ж Марыля не палуднуе?—запытаў Астап.

— А што я вас буду чакаць,—засьмяялася тая і выбегла ў першую палову хаты.

„Слаўная дзяўчынка", падумалася Астапу. А ў голас сказаў:

— Шустрая дачка ў цябе!

— Во-о-о-о, яна, брат, добрая ў мяне!...—узрадаваўся Антось.

— Вучыць трэба!

— Яна-ж вучыцца! Толькі што з сямігодкі прышла. У шостай клясе ўжо.

— Глянь ты, хутка сямігодку скончыць!

— Дзеці пойдуць не па бацькавых сьлядох. У іх зусім іншыя дарогі. Куды там, што раўнаць. Гэта я, вось, у маладосьці старасьцю жыў, а цяпер да маленства іду... Маладзею... Як быццам круг які... Толькі вось шкада, што хутка ён зачыніцца... А не ахвота яшчэ... Хочацца неяк пашырыць яго, павялічыць дыямэтр кругу, адкінуць наперад пункт злучэньня дзьвюх ліній.

Антось сьмяяўся, жартаваў, і абед праходзіў па-сяброўску, няпрыкметна. Але ў гэтай няпрыкметнасьці можна было заўважыць: хавае нешта, яму толькі вядомае, затоенае і глыбокае, Антось, гаворыць ён, сьмяецца, жартуе—пра гуту, з суседзяў сваіх, над хваляваньнямі Астапа (бачыць вока старога, што на сэрцы ў маладога), але ўсётакі Астап адчувае: ня выказвае нечага Антось, трымае ў тайнікох розуму думку сваю—магчыма пра яго, Астапа, работу, паводзіны, магчыма зусім пра іншае, але важнае і маючае дачыненьне да Астапа. І нельга знайсьці ўзаемнага разуменьня і ўзгодненасьці; захаванасьць Антося стварае напружанасьць і няшчырасьць: словы старога выклікаюць у Астапа трывожныя думкі і нацягненасьць. Бачыць стары нездавальненьне маладога і ведае прычыну яму, але што ён можа зрабіць: расказаць пра баламутную думку сваю, пра першыя няўдалыя спробы ажыцьцёвіць яе, расчыніць душу на распашкі—а сьмех? а кпіны? а зьдзекі? Людзі вельмі моцна прырасьлі да зямлі і часам за гразкасьцю ня бачаць небасхілу; многія кратамі сьвідруюць зямлю, думаюць: новыя землі адчыняюць; многія проста чарвякамі поўзаюць па зямлі. Расказаць, паказаць шмат чаго цяжка самому сабе,—а другому, хоць-бы лепшаму другу, самаму блізкаму чалавеку?

...І падсьвядомыя, няма ведама адкуль узятыя—ня то ўспаміны, ня то сны—у смутнасьці і ў чарнаце невядомасьці:

...Ёсьць на сьвеце белым—за буянымі (у павадках) рэчкамі, за суровымі (да самага неба) горамі, за бурапеннымі (у штормах і навальніцах) марамі—ёсьць разрыў-зельле, трава, імя якой сьмерць. Хочаш знайсьці яе, адшукаць: чорнай, бы здрады, ноччу, калі на небе ні месяца, ні зор, ідзі ў непраходную пушчу равамі, крутаярамі, цераз бярлогі,—адшукай гняздо вожыка, абарві траву вакол гнязда, абгарадзі яго колікамі; сам схавайся пад вецьце дубу, чакай! Прыдзе

вожык, паглядзіць, абнюхае, і кінецца шукаць разрыў-зельле, каб разбурыць загарадку, раскінуць астрожныя краты, вызваліць сваіх дзетак. Стой пад дубам, не краніся! Вожык прынясе зельле, кіне на загарадку,—загарадка разьляціцца ва ўсе бакі. Бяжы да гнязда, шукай зельле; ранку зрабі на руцэ—нажом парэж руку; пакладзі на сьвежую кроў разрыў-зельле, ранку закрый падарожнікам з растанцоў. Зажыве рука, загоіцца: возьмеш ёю жалеза—растопіцца яно ў руцэ тваёй, дакранешся да чалавека—трасца ахопіць яго, даткнешся да ворага—сьмерці яму не мінаваць. Хадзі тады, ламай, крышы нечысьць, погань, кратоў чалавечае пароды, за марамі ў бурах, за горамі ў небе, за рэчкамі ў ліхаманкавай буянасьці, хадзі, ламай, крышы па ўсім белым сьвеце!...

...Ціха ў пакоі. Шкляная цішыня. У Антося падкасіліся ногі, рукі апусьціліся на калені. А потым перапужаны голас Астапа:

— Што з табою, Антось? Галава? Вады, вады, Марылька! Вожы, кі? якія вожыкі? Разрыў-зельле? Прыляж на канапу... Вось так. Падушку, Марылька! Ня плач!.. Глупства! Зараз пройдзе...

Ціха ў пакоі. Цікае гадзіньнік. Чуваць няроўнае дыханьне Антося. Ён ляжыць на канапе, левая рука яго на ўпалых грудзях, правая худымі пальцамі чапляецца за падлогу. Астап сядзіць каля ўзгалоўя, рукою падтрымлівае галаву старога. Валасы на галаве Антося—мяккія, шаўковыя. На скронях відаць сівыя валасінкі. Твар бледны, з маленькай бародкай і рэдкімі вусамі. На правай шчацэ відаць чарнявая радзімка.

Марыля бегае то па ваду, то па падушку, то па рушнік; яна хусьцінкай выцірае вочы.

— Ня плач, Марылька!—угаварвае дзяўчыну Астап.—Нічога не здарылася, бацька зараз-жа ўстане. Проста замарыўся чалавек.

— Ён як прышоў, так і сеў за свой стол.

— І нават ніколькі не адпачыў?

— Я прасіла яго, каб ён адпачыў троху, але ён ні за што не згадзіўся.

— Ой, стары, ой стары!—прагаварваў Астап.—Ноч працаваць на гуце, а потым дзень вазіцца са сваімі шклянкамі... Куды-ж гэта варта·

— Я-ж кажу яму заўсёды...

— Яму трэба ўзяць адпачынак, на курорт паехаць...

— Скажыце яму, угаварыце яго...

— Паехаць на курорт, пабыць там месяц, а потым і за шклянкі ўзяцца... Не ўцякуць...

— Стары закашляў, павярнуўся на другі бок, адчыніў павекі ласкавых вачэй. Погляд яго быў спакойны, сьветлы, здавалася, што з ім нічога не здарылася, проста замарыўся чалавек і прылёг на гадзіну адпачыць. Астапу захацелася песьціць гэтага старога чалавека,

ласьціць яго слабое цела, гладзіць яго шаўковыя валасы, гаварыць яму самыя мілыя, самыя пекныя словы. У ім было ў гэты момант нешта дзіцячае, непасрэднае і шчырае; здавалася, што ён сьвеціцца дабрынёю і радасьцю, што ён лёгкі, як пух, і чысты, як крышталь.

— Вось і прайшло...—ціха ўсьміхнуўся Антось.

— ...Прайшло...—з ласкаваю ўсьмешкаю ўздыхнуў Астап.

Марылька стаяла каля канапы, рукою гладзячы галаву бацькі. Калі загаварыў ён, яна ўгледзелася яму ў вочы і спытала:

— Цяпер будзеш адпачываць, тата? паедзеш на курорт?

— Так, дачушка, так... Толькі ня сумуй па мне... Я здаровы і дужы...

— І цяпер, калі прыдзеш з працы, ляжаш спаць?

— Так, дачушка, бяз сну ніяк ня выходзіць...

— Ты праўду кажаш, тата?

— А можа і хлушу...—засьмяяўся Антось.

— Я-ж ведаю, што ты заўсёды хлусіш...—засьмяялася і Марыля, хусьцінкаю выціраючы сьлёзы, толькі ня з суму цяпер, а з радасьці.

Яна вышла ў пярэднюю палову хаты. Астап з Антосем засталіся адзін на адзін.

— Ты ўмееш маўчаць?—ціха спытаў Антось у Астапа.

— Як гэта маўчаць?—зьдзівіўся той.

— А вось так... як табе сказаць... ваенную тайну зможаш захаваць?

— А што ў цябе ваеннае можа быць?

— Я, здаецца, не сказаў так?

— Няважна, але тайну ўмееш захоўваць?

— Я наогул супроць усякіх таемнасьцяй, але калі справа патрабуе гэтага, чаму-ж не захаваць?

— А калі-б ня справа, а толькі адзін чалавек?

— Хіба адзін чалавек ня можа зьяўляцца часткай вялікай справы?

— Гісторыю-ж, здаецца, ня робяць асобы?

— А хто, калі не яны? Адна асоба ня можа рабіць гісторыю, а сотні, тысячы, мільёны?

— Вось што, Астап,—узьнімаючыся з канапы, замест адказу пачаў Антось,—у мяне зьявілася вар'яцкая думка... Мне здаецца, што табе можна сказаць...

І тут пачалося дзівоснае і нязвычайнае; Астап слухаў Антося—у напружанасьці і цішыні; Антось, ляжачы на канапе (на лакці, прыжмурыўшы левае вока) спакойна і ціха казаў:

— Ты бачыў калі-небудзь, як б'ецца посуд, як крышыцца шкло, як на дробныя кавалкі разьлятаюцца бутэлькі, банкі, колбы? Я памя-

таю, у дваццаць першым, здаецца, калі яшчэ ў нас працаваў за спэца Корбут Раман, многа посуду папсавалася тады. Вымуць з каляніцы бутэлькі ці што іншае, пачнуць укладваць, а яны бух! бух! бух— разьлятаюцца ў пыл. Канешне, гэта была справа рук Корбута, хоць і ня было тады пэўных доказаў на гэта: хітра працавала ў яго галоўка! Ён казаў тады, што ведае сакрэт, каб ня білася шкло; і, канешне, часам яно выходзіла добраякаснае,—ён тады ганарыўся сабою і кожнаму паказваў: „Паглядзі на шкло мае работы—як звон, як крышталь! Лепшага нідзе ня знойдзеш! Я ведаю ўсе сакрэты! А вы што? Гліну мясіць вам, а ня посуд выраблять!" У яго была тады свая лінія, мы яе зламалі, але я не пра гэта. Месяцы два таму назад я сказаў Сакалоўскаму, што ў нас адзін рабочы хоча вынайсьці такое шкло, каб яно зусім ня білася... Разумееш, Астап? Бярэш колбу кідаеш яе на падлогу, а ёй хоць-бы што! толькі глуха пазваньвае. Ці, да рэчы, робіш апарат далікатны для аптэкі, для навуковых лябораторый, і не баішся, што танюсенькія трубачкі лопнуць ці разабʻюцца... Шкло будзе—што бляха, толькі празрыстае, такое, як цяпер... Гэта будзе цэлы пераварот. Шкло зойме першае месца сярод мэталяў і мінэралаў; цяпер нават цяжка ўявіць усе магчымасьці яго скарыстаньня... Інжынэр сказаў мне, што, каб гэта рабіў я, дык ён параіў-бы мне кінуць гэту справу, а калі вынаходзіць такое шкло нехта другі, то і няхай на здароўе дарма траціць час... Я сказаў. што, каб хто дапамог рабочаму, ён можа і вынайшоў-бы такое шкло. Інжынэр адказаў мне на гэта, што ў вынаходствах патрэбна свая ініцыятыва, свае разьлікі; дапамога будзе толькі перашкаджаць, затрымліваць работу і пэўных вынікаў ня дасьць. На гэтым мы і разышліся Я адчуў тады, што ў інжынэра ёсьць нешта сваё ў галаве; на яго, відаць, павеяў сьцюдзёны вецер. Больш яму не напамінаў пра гэта ён, калі сустракаўся са мною, то неяк бокам абыходзіў мяне. Канешне, я ня бачу ў гэтым нічога дзіўнага...

— Але хто-ж гэты рабочы?—запытаўся Астап.

— А ты не здагадаўся?—усьміхнуўся Антось.

— Ты?

— Мне здаецца, што я проста табе казаў...

— Ну, і як у цябе пасоўваецца з гэтым?

— Дрэнна, і нічога ня бачу ў пэрспэктыве. Да гэтага часу дасягнуў толькі таго, што зьменшыў крохкасьць шкла.

— Якім-жа чынам?

— Простымі сродкамі: бяру шкло, вару яго ў вадзе ці ў масьле, а потым астуджваю ў гэтай-жа вадкасьці. Яно як-бы загартоўваецца і рэдка калі трэскаецца.

— Але-ж гэтага мала... Ды гэта і не вынаходніцтва...

— Я ведаю. Трэба нешта другое... Але покуль што нічога не знайшоў.

— Ды што-ж тут таемнага?—усьміхнуўся Астап.

— Вось я і пужаўся гэтага... Ты зусім па-інакшаму глядзіш.

У голасе Антося чулася нездавальненьне. Астап засьпяшаўся запэўніць старога:

— Ні слова, ні гуку...што камень!.. Але табе трэба дапамагчы...

— Ніхто мне не патрэбен!—з яўным нездавальненьнем прабурчэў Антось.—Каго папрасіць? Сакалоўскага? Ён-жа хітрая лісіца, зьвярок для самога сябе... Цябе? Дык ты і бяз просьбы павінен дапамагчы... Для гэтага і расказаў табе ўсё...

— Ну, досыць, досыць!—адказаў Астап.—Згода, мір... Табе трэба на заняткі ісьці...

— Правільна, палова шостай,—устаючы з канапы, сказаў Антось.—Толькі галава ў мяне нешта кружыцца, быццам з пахмельля...

— Калі так, дык ні на якія заняткі ня пушчу цябе... Кладзіся і адпачывай! Нікуды ня трэба ісьці!

— Як гэта?—ажно заглянуў у вочы Астапу Антось.

— А вось так, што ты ня спаў цэлую ноч... ды што ноч,—поўныя суткі на нагах!.. Ня дзіва, што кружыцца галава... Тут можна зусім зваліцца з ног.

— Ну, і што з таго? Старому можна зусім ня спаць...

У пакой увайшла Марыля і пачала ўпрашваць бацьку ня ісьці на заняткі. Астап падтрымліваў яе, кажучы, што сёньня на рабфаку нічога новага ня будзе, будуць толькі паўтараць пройдзенае (сам нічога ня ведаў, але трэ' было хлусіць: інакш не ўгаворыш Антося). Антось нехаця згадзіўся.

—Я-ж павінен быць інжынэрам, а вы мяне ня пускаеце!—жартаваў Антось.—Каму якая справа, што мне пяцьдзесят год? Я яшчэ другому маладому ногі за патыліцу закладу.

III.

Астап разьвітаўся і вышаў з хаты. Дзень скончыўся, пачынала цямнець. Шэрасьць паветра і гразкасьць вуліцы зьліваліся ў адну суцэльную дрыгву. Пахла балотам. Цела пранізвала вільгаць. Недзе ў небе гагаталі гусі. Па вуліцы плыў мужык на калёсах, калматы, з шырокай барадой; каняга яго бултыхаўся на гразі па самае пуза; калёсы танулі каткамі і тральнёю ў гразь; здавалася, не на калёсах, а на саломе сядзіць мужык, на саломе едзе па гразі, быццам на плыце плытагон.

Астап спыніўся на момант, глянуў на небасхіл, на мужыка, а потым шпаркімі крокамі пайшоў па вуліцы. Ішоў з левага боку вуліцы, глядзеў на панурыя застрэшыны хат на правым баку, думаў: „Вось за гэтымі сьценамі, абымшелымі і трупелымі, жывуць людзі,

рабочыя; у іх ёсьць дзеці дробныя, што гарошынкі ў чыстым полі, змарнелыя, што трыпутнік пры дарозе... Па хаце раскідана сьмецьце; на шастох вісяць лахманы; на печы грэе плечы сямідзесяцігадовая бабуля. На падлозе, у сьмецьці і вільготнасьці, дзеці гуляюць у гуту: бяруць кіякі, дзьмухаюць у іх з усяе сілы, аж да чырвані на твары"... Абыходзіў лужыны па завалінах, пад самымі вокнамі хат, па шчыкалаткі вязнучы ў гразі, а думка-назола не пакідала: „Колькі бруду на сьвеце, колькі гразі! Гразкая вуліца рабочага пасёлку застравае ў багне балота;—не прасьці ўвосень ні па вуліцы, ні праз балота: засмокча, зацягне гразь па калені, па вушы... Крычы, паратунку прасі: калі моцны сам—вылезеш на ўзгорак, слабы—засмокча недатлівая сіла ў беспрадоньне... Так было спрадвеку, спакон вякоў, ад дзядоў і прадзедаў, продкаў і прашчураў, але так ня будзе: замест хат, застрэшынамі ў неба вырастуць муры-камяніцы, на вуліцы ляжа брук, праз балоты перакінецца шаша... Покуль-жа, сёньня, цяпер: у хату, што патанула да самых акяніц у гразкасьць і сярэднявечча, увапхнецца Перапечка Нупрэй, п'янымі нагамі разбурыць гуту дзіцячую і імі-ж—з іржавымі зубамі ў ботах—будзе біць, штурхаць жонку сваю Макрыду Макараву... А потым возьме касу жончыну, пышную і доўгую ў дзявоцтве, абтрапаную, кароткую цяпер, абкруціць касу на руку сваю, загрубелую і ў мазалёх, дыргане ўгору яе, ботам ударыць Макрыду,—Макрыда павісьне на руцэ Нупрэя касою, бабскай доляй сваёй, крутой і суровай, што нораў мужа, што маразы ў звонкія лютаўскія ночы"...

Тут Астап успомніў Антося, гэтага дзівака-фантаста, і яму ўздыхнулася вальней. Але гэта толькі на мгненьне: Антось паўстаў згорбленым і прыкаваным да свайго стала-варштату, асьветленага мутным мігценьнем сьпірытусовой газоўкі,—у дыме, у чадзе, у бессані трывожных начэй. І зноў назолаю чапляліся думкі: „Антось чакае дапамогі... а хіба можна дапамагчы дасягнуць недасяжнае? Шкло—што шчасьце людзкое: сьветлае, празрыстае, звонкае, крышыцца, ломіцца, крамсаецца—на аскелёпкі!.. Хіба можна вынайсьці машыну вырабляць шчасьце паштучна і оптам, разьлівачна і на вынас, пад сургучовымі пячацямі і проста бяз усялякіх пячацяў—для першай, другой і трэцяй катэгорый? Нельга,—шаленства выдумляць такую машыну,—ніколі! А шкло—што шчасьце людзкое, крохкае, нятрывалае, што дзіцяці перад сьмерцю—у маразах, у сьцюжы лютых завірух...

Сьмерць, сьмерць. Ня вытрымаць шклу сіберных моразоў! Ад маразаў пакрышыцца, паламаецца, пакромсаецца, нават чалавек не датыкнецца да яго—крохкага і нятрывалага. Антось-жа, вынаходца, няхай вышуквае; жывуць-жа людзі, веруючы ў хімэру—далёкую, нязбытную,—а вынаходца верыць шчыра, ад душы. І к таму яшчэ—шкло ўсётакі можна зрабіць менш крохкім, магчыма можна і трывалым зрабіць:—

бі, барабаншчык, сьмялей і гучней, каб гулам гудзела шкло!—каб звонам зьвінела яно!—бі на ўсю сілу аж да сотага поту!—(а сонца? а радасьць? а эльбрусы чалавечага шчасьця?) Не, не—усё-ж такі павінны быць—высока, няхай у нязбытнасьці і недасяжнасьці, за грамады хмар—эльбрусы чалавечага шчасьця! І да іх, да іх—скрозь дождж і завіруху, цераз балоты і трасяніну, скрозь пушчы чалавечага няшчасьця, каб касьцьмі яно ўслала дарогу ў вышыню, каб крывёю заліло разьбітае шкло"...

Астап падышоў да самых дзьвярэй у рабфак, хмурых і важкіх, як і самы будынак: няўклюды і чорны, як глухая лістападаўская ноч: азызлая і сьлізотная, як кроў вужакі ў сьцюдзёны хмарны дзень глыбокае восені.

(*Працяг будзе*)

Андрэй Ушакоў

Людзі вялікіх спраў

Комсомол должен быть ударной группой, которая во всякой работе оказывает свою инициативу, свой почин. Ленин.

Трывожныя думы

Як і штодзённа
ў клюб
праз шыбы вакон
Урываецца
шоргат піл з лесапільні...
Тут кожная дробязь
знаёма вакол,
Кожны плякат
на сьцяне
павучыннай і пыльнай.

Адвячорак.
Барвянцам
фарбаў густых
Афарбованы сьцены
рукой
мастака-заката...
Пільна ўзіраецца
сьлёсар
Броня Кастыль
На стракатую фарбу пляката:
...Абязьлічка,..
...Прагулы...
...прастоі...
...рабсілы цякучасьць,..
...Цягнікі хворыя...
...транспорт—
„вузкае месца"...
І сэрца
агонь апаліў пякучы

Ад гэтых трывожных
плякатных вестак.
За горла
сьціснула боль абцугамі,
Трывога па нэрвах
прабегла дэпэшай,
Улівалася ў цягліцы
ўпартасьць,
жадалася змаганьня;
Рынуцца ў атаку
адважна,
першым!
І дзіўна чамусьці было пасьля,
што гэты плякат
раней не заўважыў.
...Павольна
шкло электрычных лямп
Летняя ноч
ахінае сажай...
І калі
праз чыгунку
ішоў
дамоў
Пасьля клубнага тлуму
хадой шырокай,
Наліваўся
сьпелымі думкамі мозг,
Як пад сонцам яблыка
важкім сокам:
— Зьвесіў галоў
салютны сэмафор...
Па чэцьвера сутак
прастоі ў парку...
Стаяць нярухома
шарэнгі пляцформ
З дошкамі,
з касілкамі,
з жняяркамі.
А на бязьмежжы
колгасных ніў
пад сонцам сьпякотным
У смазе горкай,—

Чакаюць сьпелыя ячмені
Бальшавіцкай
ударнай уборкі.
І будзе
сьлёзы-зярняты ліць
Вусаты колас
сьпелы
і плённы.
Сакоўнаю раніцай
на палі
ня прыдзе
зубчатых жняярак колёна.
І муляр
няскончаным кіне дом—
Для рыштаваньня
ня хопіць дошчак...
...Прабег цягнік
на мазутны дол.
Разьліў густы ядраны пошчак.
Броня глядзіць на цягнік
і ў мозг
Пытаньне ізноў
усплыло мімаволі:
— Дык хіба-ж
позыцыі мы здамо?!
— Здамо???
— Н-не!!!
— Н-ніколі!!!
І ў думах
стаяла пытаньне адно:
Вялікае
неадымнае
ад сэрца Броні...
...Гэта была
трывожная ноч,—
Калі волас ад дум
сівее
на скронях.

2. На сходзе комсамольскай ячэйкі

Захлынаючыся
ўласнымі словамі,
Хутчэй,
як скоры
шпарыць на рэйках,
Броня Кастыль
гаварыў прамову
На сходзе
комсамольскай ячэйкі.
І думкі
ва ўсіх
наэлектрызаваны былі,
Каб пасьля ўзарвацца
навальнічным выбухам.
Нават спыніліся
паслухаць
два старых кавалі:
Брыгадзір Лісоўскі
і Ванька Грыбаў.
Гэсты рукі—
удар па жалезу кавадлы,
І вось
ляцяць іскры—
словы гарачыя.
Абрываюць ранейшы
настрой суладны,
Думкі напружваюць
і перайначваюць:
— Я ўспомніў
бацьку старога свайго—
Ён суровага вучнёўства
спазнаў законы,—
Нарадзіўся на чыгунцы
і 47 год
Працаваў на ёй
да самага скону.
Калі ў абточцы
рамонтны пульс
Слабеў пад драпежнай
прарыву лапай,

Ён суткі
дамоў ня прыходзіў адтуль—
рабіў
на тры зьмены
ўзапар.
Часамі праз сон
галаву ўзьнімаў,
Трывожна
нэрвова
крычаў у морак:
— Дык як гэта,—
зноў
рабсілы няма?..
— Э-эт!
ізноў спозьніцца скоры!..
Гэта рэзалі сэрца яго
нажы—
Вытворчыя неладзі
і непарадкі,
Бо гадавала яго
і вучыла жыць
Праца,
суровая
жорсткая матка!
І ён
да чыгункі мне даў любоў.
Я сэрцам прырос
да шпалаў
і рэек,
І цяпер адчуваю
за транспорт боль.
Транспорт хворы—
і я хварэю.
Вось, чуеце,
чуеце,
— Цягнікі
Да сябе
комсамолію нашу клічуць!—
І ўзмахам шурпатай рукі
паказаў на плякат парыўча.

Ціш...
гострая ціш...
(Гэтак прагна
праз сонечны
вадкі прамень
Узіраліся ўсе
на плякат каляровы).
І кожны тады
бяз слоў зразумеў
Кастылём
недаказаныя словы.
І ў протоколе
агрызкам алоўка
ў радкі лагодныя
запісаў
сэкратар сходу--
стругальшчыца Рыва:
— „Ахвяраваць
свае дні выходныя
Да поўнай ліквідацыі прарыву".
І нялоўка старым,
што яны толькі ўдвох
Ад іншых стаяць
бязудзельна збоку.
У кожнага
на твары задумай лёг
Пісяг,
прарэзаўшы лоб глыбока.
А потым,
зірнуўшы адзін на аднаго,
Як згаварыўшыся,
разам абодвы
Падышлі да стала
і сказалі:
— Пішэце,
і мы, значыцца,
за вамі
наўздагон,
і мы-ж
дзеці
свайго заводу.

3. Ударны—дваццаты

Стаяць комсамольцы
ў мазутных блюзах,
Абступіўшы
чорны
паравоз-волат...
Заскрыгалі рэйкі
ад шматтоннага груза...
Цяжка павярнуліся
тоўстыя колы...
Прагна глытаючы
чорны вугаль,
Паплыў паравоз
да паваротнага круга.
Напяліся струнамі
вагары,
Заблішчэла латунь пералівам.
Болей пары,—
мацней
перабойны
няпэўны рытм,—
Пырскнуў сьмехам
радасна і гульліва.
Калі выплюнуў
чорны дымар
У паветры
бярэма
густога дыма,—
Усплыў пачатак
абрыўкамі мар,
Напоўніўшы сэрца
гарачым уздымам:
— Мы адпачынак
мазольных рук
чыгунцы аддалі
ня дарма,—
Цяпер—
чарапашых тэмпаў зрух:
— Даем з рамонту
дваццаты,
ударны!
Пабягуць цягнікі,
пабягуць у даль—

Павязуць у колгасы
машынны росквіт...
Будзе рэек пакатых
гамонкаю сталь
Гадаваць
няўгамонны лёскат.
— Чуеце,
пабягуць,
пабягуць цягнікі,
Па загаду
новага чалавека.
— На адказны фронт
сілы кінь—
У атаку,
на небясьпеку!
Шмат за плячыма
ў нас перамог,—
І тут
позыцыі не здамо!
Мы ня вучыліся
зброю кідаць,
вялікіх
упартых боек армейцы...
Пабягуць цягнікі,
пабягуць у даль
Гэ-эх!.. як гулка
транспорту
б'ецца сэрца.
— Па шляху перамог
яшчэ адзін крок
Прайшла
комсамольская брыгада!
... І здаецца па жылах
цячэ ня кроў,
А густая, густая радасьць:
— Чарапашых тэмпаў
вялікі зрух—
— Даем з рамонту
дваццаты
ўдарны!
Мы адпачынак
мазольных рук
Чыгунцы далі ня дарма!

г. Віцебск, жнівень 1931 г.

Драм. група БелТРАМ'у

Першы штандар

(*Трамаўскае прадстаўленьне ў 3-х кругох*)

ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ:

Быхаў—сэкратар ячэйкі КПБ(б) на пабудове заводу сельгаспадарчых машын.
Марыля—сэкратар яч-кі ЛКСМБ.
Прылуцкі—кіраўнік пабудовы заводу сельгаспадарчых машын, камсамолец.
Зося—жонка Прылуцкага.
Штыльман—інжынэр з трэсту.
Вера—дачка Штыльмана.
Мэндаль Гдалявіч—дзесятнік пабудовы.
Казёл—кладаўшчык.
Іваноўскі—тэхнік.
Старшыня рабачкому.
Вульф—рабочы пабудовы, комсамолец.
Надзя—жонка Вульфа.
Шпунт—рабочы пабудовы.
Алеська—заг. гаспадаркі вытворча-пабудовай камуны.
Гурвіч, Сьцяпурка, Зьмітроўская, Янкаў } камсамольцы на пабудове.
1-ы рабочы.
2-гі рабочы.
1-ы прагульшчык.
2-гі прагульшчык.
Рабочыя, комунары, партызаны, кулакі.

Малюнак першы

(Пабудова заводу сельскагаспадарчых машын. Сход. Музыка. Прылюдзе)

Прылуцкі—Дык вось, хлопцы, канчаючы, прыходзіцца зрабіць вынік. Вельмі цяжка сказаць, будзе пабудова скончана ў тэрмін, ці не?

1-ы комсамолец—Коратка і ясна.

2-гі комсамолец—Ня коратка і ня ясна.

3-і комсамолец—Але-ж ты тэхнік. (*Канец музыкі*).

Прылуцкі—Мне, таварышы, здаецца...

3-і комсамолец—Перахрысьці нос, каб не здавалася.

Марыля (*старшыня сходу*). Таварышы, супакойцеся, дайце магчымасьць гаварыць.

Прылуцкі—Вы павінны зразумець, што пабудову скончыць у тэрмін нельга: не хапае будаўнічых матар'ялаў... не стае транспарту, а таксама і кваліфікаванай рабочай сілы...

1-ы рабочы—Прычыны нібы сур'ёзныя.

2-гі рабочы—Што супроць іх скажаш.

Прылуцкі—А таму трэст дазволіў скончыць пабудову на 6 месяцаў пазьней вызначанага тэрміну (*паўза*).

Янкаў—Як бяз мяне мяне жанілі.

1-я комсамолка—На лічніках прыкінулі, абмеркавалі, тэрміны перасунулі, а мы на ўвесь саюз спаганімся.

Гурвіч—А старыя тэрміны дутыя, абяцанкі-цацанкі. Савецкую ўладу абжулілі.

Вульф—Таварышы, мы зараз слухалі даклад нашага камсамольца-тэхніка, які павінен быў гаварыць аб становішчы працы на пабудове. Але ён ніводнага слова не сказаў пра тэмпы працы, пра тэмпы, якіх патрабуюць задачы нашага соцыялістычнага будаўніцтва.

Шпунт—А якія ў ліха вам яшчэ тэмпы патрэбны?!. раскрычаліся... скончыць у тэрмін? Паплявaў на рукі, пайшоў на перагонкі—і завод вырас. Вы слухайце, што гавораць сапраўдныя рабочыя, якія ня першы год працуюць: „селядцом да соцыялізму ня прыдзеш". Чулі? Хай пуп на лоб вылезе, а галодным шмат чаго ня зробіш. Ды і сярод камсамольцаў тэмпы не паважаюць. Моладасьць прэ, кроў ў жываце бурліць, а тут надрывайся. Жыцьцё ў нас уперадзе, а з такой працай хутка ногі ўверх тармашкамі задзярэш. Я сам ня супроць ударніцтва, я сам ня супроць соцспаборніцтва, але нас, сьвядомых, на пабудове мала—можам адарвацца ад мас.

Марыля—Эх ты, б'ешся ўгрудца... Брэшаш і на камсамол і на ўсіх рабочых нашай пабудовы. Дзе-ж тваё сумленьне? Нам патрэбны тэмпы. Тэмпы на заводзе, на фабрыцы, на нашай вось пабудове, а як мы працуем...

Зьмітроўская—Вось у нас, у сталярнай, быў такі выпадак: рабілі рамы для плужнага цэху. Матар'ял даў нам дзесятнік.

1-ы комсамолец— А, пан Мэндаль.

Зьмітроўская—Так. Матар'ял быў сыры. Казалі яму пра гэта.

1-ы комсамолец—Што-ж ён?

Зьмітроўская—Кажа, што іншага няма. Рамы зрабілі, а калі трэба было паставіць іх на месца, выявілася, што яны малыя. Ссохліся. А чарцяжы таксама не ў парадку былі.

Прылуцкі—Ну, рамы другія зробяць.

Янкаў—А ці-ж мала ў нас такіх выпадкаў, час праходзіць марна.

2-гі комсамолец—Грошы ляцяць на вецер.

1-ы комсамолец—Учора цэглы не хапіла—поўдня гулялі.

2 я комсамолка—Кожны дзень зьмены, пераробкі.

2-гі комсамолец—А падзёньнікі санаторыю на даху заснавалі, гадзінамі вылежваюцца, загараюць.

Гурвіч—Умова аб соцыялістычным спаборніцтве засталася простай паперкай.

Быхаў—Марыля, дай слова.

Быхаў—Правільна, Шпунт. Пляваць нам на тое, што зрываецца пабудова, пляваць нам на тэмпы і на соцыялістычнае будаўніцтва, нам бы толькі свой жывот набіць. Ганьба, таварышы! Грамадзянін Прылуцкі, хто вам дазволіў пабудову адтэрмінаваць?

Прылуцкі—Трэст.

Быхаў—А гаспадары пабудовы далі вам на гэта права?

Прылуцкі—(!!)

Быхаў—Мы, рабочыя, далі вам сваю згоду на гэта?

Шпунт—Да мы ўсе...

1-ы рабочы—Мы ня супроць.

3-ці рабочы—Лжэш! (*Паступовае нарастаньне музыкі*).

2-гі рабочы—Усе Шпунты, ня ўсе рабочыя.

1-ы комсамолец—Што за нас адказваеш, абібок?!

2-гі комсамолец—Мы супроць адтэрміноўкі!

3-ці комсамолец—Мы не дапусьцім!

Быхаў—Таварышы, увесь СССР на барыкадах. Увесь СССР б'ецца за тэмпы, за пляны, за процанты перавыкананьня... А мы...

Вульф—Лынды б'ем.

Янкаў—Адцягваем на 6 месяцаў выпуск машын.

Марыля—Зрываем другі бальшавіцкі сеў.

2-гі рабочы—Не, гэтага нельга дапусьціць.

1-ы комсамолец—Мы павінны пабіць Шпунтоў і павесьці за сабой пабудову.

Гурвіч—Мы-ж камсамольцы.

1-ы рабочы—Што-ж мы можам зрабіць?

Янкаў—Што? А вось учора усе на дажджавыя пайшлі, а мы працаваць выйшлі—і ўсе за намі.

Зьмітроўская—Калі выклікаць падзёншчыка на перагонкі, больш за зьдзельшчыка зробіць.

Галасы—Правільна.

Гурвіч—Трэба арганізаваць ударную групу.

Галасы—Варка!

Вульф—І так дагаварыліся. Організоўваем ударную брыгаду, Хто?!!

Галасы—
Я!
Я!
Я!

Быхаў—Крый, хлопцы!

Янкаў—Ну і дамо дыхту!.. *(Музыка паступова пераходзіць разам з песняй у работу)*

Канец першага малюнку.

Малюнак другі

Сталярная майстэрня. Працуюць ударная брыгада і пяць чалавек рабочых ня-ўдарнікаў. Пры перабежцы сьвятла—рытмічныя рухі *праца*). У часе паасобных рэплік сьвятло спыняе перабежку. Тэмп рухаў у ўдарнікаў і рабочых розны.

Песьня:

1) Стучым... габлюем і зьбіваем—
За цьвікам цьвік, за рамай рама...
ш-шо сь-сь...
За намі ўсьлед варштаты расьпяваюць:
яшчэ дзум-дзум...
Хутчэй... гак-гак...
Даеш!
2) Ляцяць істужкі, пахне смольным лесам,
А зь рукой ня ўгоніцца прамень.
Як люба жыць і ад рытмам гэтай,
гэтай песьні!—
Нам кораткі васьмігадзінны дзень.

Сьцяпурка—Цісьнем, хлопцы!
Гурэвіч—Накручвай!
1-ы рабочы—Адзінаццатую чэрці канчаюць!
2-гі рабочы—Ударнікі!!.
Сьцяпурка—Націскай!
Янкаў—Пайшла дванаццатая!
Гурэвіч—Цьвікоў!
1-ы рабочы—Стараюцца.
2-гі рабочы—Глядзі, каб не перастараліся.
Вульф—Сёмка, зьбегай прынясі цьвікоў!
Гурэвіч—Ёсьць, таварыш брыгадзір! (*выходзіць*).
Зьмітроўская—(*да Сьцяпуркі*). Памажы расьпілаваць дошку!
Сьцяпурка—Мне-ж габляваць трэба.
Зьмітроўская—(*да Янка*). Давай з табой.
Янкаў—А мне рамы зьбіваць.
Зьмітроўская—Дык што-ж мне стаяць?
2-гі рабочы—Глядзі, работнічкі больш сварацца, чымся робяць

Вульф—Станавіся, Сьцяпурка, на расьпілоўку (*да Зьмітроўскай.* А ты на габлёўку.

1-ы рабочы—Канчаем.

2-гі рабочы—Чухайся, да палудня яшчэ далёка.

Янкаў—Цьвікоў.

Вульф—Выйшлі ўсе.

Янкаў—Што рабіць?

Вульф—Вары клей.

Янкаў—Ёсьць.

Сьцяпурка—Дошчак прынясі.

Вульф—Толькі сухіх.

Зьмітроўская—Дружна!

Вульф—Шпар, братва!

4-ы рабочы—А ну, весялей!

Песьня:

Ударнікі, ударнікі! Будуем.
Жыцьцё заводу і завод—жыцьцю.
Запалам маладым сваім мацуем
Магутных пяцігодак жыцьця цек.

Уся зямля сачыць за нашым раньнем.
Трымай, братва, высока свой штандар!
...Ляцяць істужкі з певам рыштаваньняў.
Яшчэ... дзум-дзум...
Хутчэй... Гак-гак...
За шпар!

2-гі рабочы—Не застанемся ад гэтых смаркачоў. (*Канец песьні*)

3-ці рабочы—Эх, каб быў маладзейшы, пашоў-бы ў ударнікі. (*Канец музыкі*).

Янкаў—Ідзі ў брыгаду, маладзейшым станеш.

Вульф—Панацісьнем, хлопцы, заўтра працу здаваць трэба.

Янкаў—А заўтра што рабіць будзем?

Вульф—Ды д'ябал яго ведае, пан Мэндаль яшчэ нічога не гаварыў.

Зьмітроўская—Зноў прастой.

Янкаў—Хлопцы, дошчак няма. Я апошнюю забраў.

Зьмітроўская—Апошні цьвік.

Вульф—Нешта Сёмка затрымаўся.

Сьцяпурка—(*да Вульфа*) Пакліч Мэндаля, прастой хай піша.

Янкаў—Які там д'ябла прастой. Навошта нам сваю дзяржаву абіраць. Я вось прапаную з пераходам на новую працу зьнізіць расцэнкі на 20 проц., гэтым мы пакажам прыклад астатнім рабочым.

Зьмітроўская—Па 10 гадзін удзень працаваць будзем.

Янкаў—А дні адпачынку ў карысьць індустрыялізацыі краіны. Таварышы, хлопцы! Па-мойму ня то, што, а працуй і працуй. Моладасьць вынесе, кроў у жылах яшчэ не застыла. Горы ўзрушым, а сваё возьмем.

1-ы рабочы—З маладых ды раньнія.

4-ы рабочы—Ты іх не чапай.

3-ці рабочы—Справу сваю ведаюць.

2-гі рабочы—А як-жа, адны зьніжаюць, а другія над капейкаю трасуцца.

Ударнікі—(*Усе*)—Хто?

Сьцяпурка—А я вось не разумею вас, хлопцы. Чаму, калі я магу зарабіць болей, дык павінен адмовіцца ад сваіх грошай? Чаго пушчаць на вецер грошы, якія я зарабіў сваім уласным мазалём? Няўжо мы так разбагацелі? А колькі разоў узімку мы бяз грошай сядзелі. На тое брыгада, каб больш зарабляць. А зараз, калі ёсьць магчымасьць, дык выходзь, хлопцы. У сьвет грошы яны выводзяць чалавека. З грашыма табе і пашана і жыцьцё, пражывеш па-сапраўднаму.

Янкаў—Ты разважаеш, як рвач.

Зьмітроўская—Не аб кішэні думай, а аб справе.

1-ы рабочы—Баба навучае.

2-гі рабочы—Перапрашаю, сталяр ў спадніцы (*сьмяецца*).

3-ці рабочы—Дзяўчына на два вялікіх якога хлапца за рамень заткне.

Вульф—Братва, цішэй. Ты, Сьцяпурка, памыляешся. Але-ж і вы хлопцы накруцілі. Ня так лёгка гэта робіцца, што сёньня зьніжаюць, а заўтра канцы аддаваць. Дзеля таго, каб зьнізіць, трэба да гэтага дайсьці. Зьніжэньне павінна ісьці за кошт уплатненьня працоўнага дню і організаваннасьці працы, а не за лік павялічэньня рабочага дню.

Янкаў—Так, праўда, а то загнулі. Ша, хлопцы, начальства прэ! (*Уваходзіць Прылуцкі і Мэндаль*).

Прылуцкі—Таварышы, чаму не працуеце?

Мэндаль—Што, працы няма?

Вульф—Ды вось з вашага благаваленьня матар'ялу няма.

Мэндаль—Ды што-ж, можа вам прастой запісаць?

Сьцяпурка—Ды мы і без вашага прастою абыйдземся.

Мэндаль—Малайцы, што захоўваеце дзяржаўныя грошы.

Вульф—Так, пан Мэндаль, захоўваем.

Мэндаль—Колькі разоў я прасіў, каб вы пакінулі мяне клікаць „пан Мэндаль". Прайшоў ужо той час паноў.

Зьмітроўская—Прайшоў, ды ня зусім.

Прылуцкі—Гэта дробязі. Але з рамамі, якія вы рабілі, нешта дрэнныя справы. Яны паразыходзіліся. Учора рабочыя мяне папракалі ў тым, што праца ўдарнікаў дрэнна зроблена.

Мэндаль—Ды яны вельмі завіхаюцца, у мяне проста для іх працы не хапае. Але такога выпадку, здаецца... пакуль ня было.

Прылуцкі—Трэба працаваць павольней, толькі каб якасьць была вышэйшага гатунку.

3-ці рабочы—А тое, што рабочыя падменьваюць рамы, гэта вы не прыкмячалі.

Мэндаль—Як? Хто абменьвае?

3-ці рабочы—Ды вось учора Маладзечка падмяніў некалькі рам.

Мэндаль—Трэба будзе высьветліць.

Янкаў—А слана дык ён і не прыкмеціў.

Вульф--Не прыкмячаем, што нам ножку з усіх бакоў падстаўляюць.

Прылуцкі—Гэта вам толькі здаецца (*Убягае Гурвіч*).

Гурвіч.—Братва! добры дзень. (*Да Мэндаля і Прылуцкага*).

Сьцяпурка.—Дзе ты прападаў так доўга? Цьвікоў прынёс?

Гурвіч. Дзе ты бачыў.

Прылуцкі.—Што, няма цьвікоў? Мэндаль Гдалявіч, вы выпісал цьвікі?

Мэндаль—Ды я казаў Казлу, каб выпісаў.

Вульф—Пакуль вы сабраліся выпісваць, мы без працы стаім.

Прылуцкі—Пойдзем, Мэндаль Гдалявіч, паглядзім.

Вульф—А ты вушамі хлопай,—няма цьвікоў, дастаць.

Гурвіч—Хіба я вінаваты. Прыходжу ў кладоўку. (*Пераключэньне Шыльда „Кладоўка", уваходзіць Гурвіч*).

Гурвіч—Здароў, Казёл. Дай цьвікоў, ды хутчэй, браток.

Казёл—Што за прыткасьць такая?

Гурвіч—А ты сваю справу ведай,—давай хутчэй.

Казёл—Прыткасьць патрэбна толькі ў часе паляваньня на блох. Зразумеў. (*Перакрыўляючы*). Давай пагутарым, таварыш ударнік.

Гурвіч—(*таксама перадразьніваючы*). Вось іменна ўдарнік, пане філёзоф. Адпраў мяне хутчэй. Дзе ў цябе цьвікі?

Казёл—Куды сьпяшаешся, дзеля чаго? Так надрывацца, так працаваць могуць толькі нар'яты, а мне наплявать на энтузыязм. Мне сваё здароўе даражэй. Свае сем чарвонцаў я заўсёды атрымаю. (*Уваходзіць Шпунт. Музыка вясковага характару: „Эх, матаначка мая, каго любіла да мяне?*)

Шпунт. Я любіла, так спазабыла, а цяпер люблю цябе. Здароў, дружа!

— Казёл—А-а-а, здароў, здароў, ударнік!

— Шпунт—А-а-а. Ты ўжо ведаеш. Ну што ты скажаш на гэта? Што-ж ты думаў—я лыкам шыты. І я магу быць ударнікам. Невялікая штука. Акрамя таго, не забывай, браток, што я сьвядомы перадавы рабочы, дык, значыцца, павінен быць ударнікам.

Казёл—(*сьмяецца*). Толькі што павінен, а так які ўжо з цябе ўдарнік.

Шпунт—Ну, абы на паперы быў запісаны „Ударнік Шпунт“.. Абы ў вочы ня лезьлі. А там ужо не мая справа.

Голас—Цэмант давай, цэмант!

Шпунт—Чаго яго халера бярэ. Ёсьць цэмант, ці не?

Казёл—Ды дзе ты бачыў? Раніцой апошнія 8 бочак выдаў.

Шпунт—А ну яго да чортавай мацеры. Чым яму глотку заткнуць? Змарыўся я з гэтым цэмантам за цэлы дзень (*Лезе ў бочку*).

Казёл—Адпачывай, адпачывай, хлопча, на тое ты і ўдарнік, каб адпачываць.

Шпунт—А заўтра на вечарыну ў Дрычына папромся. Там ня толькі дзеўкі, а яшчэ нештачка будзе.

Казёл—Не вечарыны ў галаве, дружа. Заядаюць, сволачы. Хто я такі—кладаўшчык. Кожная дрэнь над табой камандуе, патрабуе, заўвагі робіць: „Цьвікоў дай“, „рыдлёўка паламалася“, „пачапкі на вёдрах паабломваліся“. Ва ўсім я вінаваты. Цяжка і крыўдна. І куды так сьпяшацца? Дзеля чаго? Вось будуюць завод-гмах, а рабочым жыць няма дзе. Кватэр няма. Мануфактуры няма. Падноскі па талёнах, папіросы па кніжках, гэтага не хапае, а таго зусім няма. Жраць нечага, а машынамі захапляюцца. (*Уваходзіць Гурвіч*).

Гурвіч—Чаму ў цябе трохдзюймовых цьвікоў няма? І што ты толькі робіш? А яшчэ Мэндаль узьнімае пытаньне аб падвышэньні заробкі табе.

Казёл—Ды ну цябе ў балота. У мяне і без цябе клапот поўны азярот.

Гурвіч—Ну і работа!

Казёл—Без смаркатых абыйдземся. (*Уваходзіць Мэндаль*).

Мэндаль—Таварыш Казёл, толькі бяз гэтакіх штук, ён-жа ўдарнік.

Гурвіч—Добра. Мы яшчэ паглядзім (*выходзіць*).

Казёл—Во бачылі.

Мэндаль Вы-ж ня дзіцё, таварыш Казёл. Яны-ж камсамольцы і ўдарнікі.

Казёл—Ах, каб іх ужо пяруном ударыла. Каб ім кішкі павырывала, каб ім... (*Мэндаль перабівае*).

Мэндаль—Хопіць, хопіць. Дзе Шпунт?

Казёл—Ён адпачывае, Мэндаль Гдалявіч.

Мэндаль—Таварыш ударнік, пара ўставаць. Гэтак вы і абед прасьпіцё. Апошні раз кажу, Шпунт. Я таксама не каменны, магу і я дакласьці.

Шпунт—Ідзі да чортавай мацеры.

Мэндаль—Шпунт, Шпунт. (*Шпунт вылазіць з бочкі*).

Шпунт—А нічога, Мэндаль Гдалявіч, свае людзі, аддзякуем калі-небудзь.

Голас—Цэмант давай!

Шпунт—Ну, якую я ім трасцу дам.

Мэндаль—Цэманту няма. Што-ж, трэба пісаць прастой (*Пераключыліся на брыгаду*).

Гурвіч—Вось і працуй. Падымай норму.

Вульф—Так, братка, цяжка так працаваць.

Янкаў—Гнаць такіх у каршэнь з пабудовы.

Вульф— Што-ж, паставім пытаньне ў рабачкоме. (*Уваходзіць Быхаў*).

Зьмітроўская—Вось добра, Быхаў, што ты прышоў.

Быхаў—Чакай, браткі. Ёсьць важная справа. Вы памятаеце выпадак са зьнікшымі рамамі. Ён высьветлены. Іх знайшлі сярод нашай працы. У ўдарнай брыгадзе ёсьць злодзей (*Трывожная музыка. Ударнікі пераглядаюцца. Зьмітроўская апушчае вочы. Усе глядзяць на яе. Прамень святла ловіць Зьмітроўскую*).

Зьмітроўская—Так. Я... але...

1-ы рабочы—Ударнікі.

2-гі рабочы—Мусіць у нас кралі, ды норму павышалі.

3-ці рабочы—Ну, чаго маніш, сваю працу нябось ведаеш.

4-ы рабочы—Сарвалася дзяўчынка.

2-гі рабочы—Разагнаць трэба брыгаду!

Сьцяпурка—Аганьбіла ўсіх нас. Зараз не пакажаш вачэй. Ударніца.

Гурвіч—Што цяпер рабіць?

Быхаў—Чаму гэта, Наста?

Зьмітроўская— У брыгадзе старалася, не пасьпявала. Цяжка было...

Вульф—Ці ў гэтым выхад?

1-ы рабочы—Позна плакаць адумалася.

2-гі рабочы—Лопне брыгада!

Вульф—(*Узбураная музыка*). Ня лопне брыгада! Чуеце вы! Ня лопне! (*Канец музыкі*).

Канец другога малюнку.

Малюнак трэці

Памяшканьне рабачкому. Абедзены перапынак. У рабачкоме некалькі рабочых. Старшыня рабачкому. Шумліва. Вісіць лёзунг—„Прафсаюзы—тварам да вытворчасьці" Сьвет).

Першы рабочы—Што-ж гэта такое, таварышы. Ты вось старшыня рабачкому, у цябе пад носам непарадкі, брыдота, а ты і ня бачыш. Старшыня... паседжаньне... Увязаць... Узгодніць... А як рабочых ашукваюць, дык рабачком у кустох.

Шпунт—З талёнамі, дык ён махлюе, каб сабе больш.

2-гі рабочы—Круці, Мікіта, профсаюзную дэмакратыю.

Старшыня рабачкому—Галёкаць ты майстар. Гарлянкай не бяры. Да ладу раскажы, што ў цябе там.

Шпунт—Ды ня тое, што крычаць, а за такія справы і па хлебарэзу цяпнуць можна.

Старшыня рабачкому.— Ды ну цябе да ліха... У чым справа?

2-гі рабочы — За расцэнкі яшчэ ня раз рабачкому карак намылім.

1-ы рабочы—Ага. Пан Мэндаль такія расцэнкі вызначае, што...

Старшыня рабачкому.—Ведаю пра гэта. Разьбярэм. Відаць, дзесятнік памыліўся.

1-ы рабочы— А ён ня мае права памыляцца на рабочым карку.

2-гі рабочы— Нешта круціць пан Мэндаль усю пабудову. (*Убягаюць Вульф і Янкаў*).

Янкаў. Цярпець мы гэтага больш ня будзм. Амба.

Вульф—Не гарачыся... слухай, рабачком. Ударнай брыгадзе не даюць працаваць. Ты ведаеш, што сёньня сядзелі мы амаль што паўгадзіны, склаўшы рукі, бо ня было цьвікоў. Матар'ял у пору ня выпісваюць; каб атрымаць што-небудзь у кладоўшчыка, трэ' траціць цэлыя паўгадзіны. Ударная брыгада стараецца на ўсе застаўкі. А дапамогі ад кіраўніцтва аніякай

Янкаў—Мы свае абавязкі выконваем, а яны...

Старшыня рабачкому. Ды чаго-ж вы хочаце ад рабачкому?

Вульф—Ня толькі прыгожых слоў, але і справы.

Старшыня рабачкому—Якія справы? Што справы? Чым-жа вы лепшыя за другіх рабочых?

Янкаў—А з-за недахопу вапны тынкары стаялі. Стаялі...

Старшыня рабачкому—Ды што вы да мяне прычапіліся?

Вульф—(*перадразьнівающы*)—Прычапіліся.. Нічога ты, браток, ня робіш...

Старшыня рабачкому—Не раблю. А ну-ка палічы: колькі ў клюбе вечароў наладжана, колькі кіно-сэансаў прайшло, акрамя лекцый „Вэнэрычныя хваробы і барацьба з імі" і „Шкода курэньня". Для каго стараліся? Для вас, для рабочых пабудовы.

Вульф—Вось лекцыю то ты слухаў аб хваробах, а сам хворы на чарапашые тэмпы. Кожны дзень прастоі з-за недахопу матар'ялу, прагулы па няўважных прычынах. А ў кіраўніцтве...

Янкаў—Ты, Вульф, пра гэту сволач раскажы.

Вульф—Пан Мэндаль, якога трэба гнаць з пабудовы ў тры шэі.

Шпунт—Ну... ну... заткніся.

Старшыня—Размахнуліся. Нельга так, таварышы, адным махам разьвязваць пытаньне... Што гэта пустая бочка, ці што. Узяў, выкінуў з пабудовы і—скончана. Дзе знойдзем іншага дзесятніка. Ды я не разумею, чым дрэнны з Мэндаля дзесятнік. Пры чым тут рабачком?

Вульф—А ты сапраўды павярніся тварам да вытворчасьці—убачыш. Ці-ж можа такі чалавек, як Мэндаль, быць адданым соцыялістычнаму будаўніцтву.

Старшыня—Трэба ўмець скарыстоўваць спэцыялістых.

Вульф—Так, але не такіх, як Мэндаль. Такія Мэндалі... (*наплыў прагульнікаў*).

Прагульнік—(*пьяная музыка*).

Эх, гуляй, душа і цела,
Уся палучка праляцела.

І-ха-ха-ха-ха-ха-ха,
Усё жыцьцё—пацяруха.

1-ы прагульнік—Дзякуй табе, божанька. Нарэшце дажджу дачакаліся. Адпачыць можна, хлопча.

2-гі прагульнік—Люба жыць на белым сьвеце: гуляй колькі хочаш, ці колькі хочаш...

1-ы прагульнік—І працуй, колькі хочаш.

2-гі прагульнік--Працы мала, а грошай яшчэ менш. Можа пераматнем куды, хлопча?

Грошай - грош, а працы—пуд,
Шпарым, хлопцы, на Менбуд.

Іха-ха-ха-ха-ха
Выганяйце лятуна.

1-ы прагульнік.—А добра было-б зараз дома, на вёсцы: на стале самавар, баба пад бокам, у хлеве кароўка.

У вёсцы баба—гаспадарка,
Выганяй чырвонцы шпарка.
Іха-ха-ха-ха-ха-ха,
Ах, якая любата.

(*Уваходзіць Мэндаль*).

Усе—Добры дзень, таварыш старэйшы дзесятнік, Мэндаль Гдалявіч.

Мэндаль—Добры дзень. Не працуеце? А па якіх прычынах?

2-гі прагульнік—Дык...

Абое—Дождж.

Мэндаль—Ага...

1-ы прагульнік—Сёньня на вечарыну прыдзеце, Мэндаль Гдалявіч?

2-гі прагульнік—Як-бы, таварыш старэйшы дзесятнік, разрад мне хутчэй павысілі.

1-ы прагульнік—Ды наконт лепшай працы скумекай, старэйшы дзесятнік Мэндаль Гдалявіч. Мы тут два з палцінай, больш ня вырабіш, а на фасадзе шэсць ці восем рублёў у дзень- (*На ўсе рэплікі Мэндаль рэагуе гэстамі*).

Мэндаль—Найлепшага...

Усе—Бывайце здаравенькі, таварыш старэйшы дзесятнік Мэндаль Гдалявіч.

1-ы прагульнік—Вось залаты чалавек. (*Пераключэньне на раб-ком*).

Вульф—Вось і будуй... Цукерныя, размокнуць.

Старшыня—Так па колумове паложана. Дождж—не працаваць.

Янкаў—А дошкі змоклі і матар'ялаў ня было для працы. На гэта колумовы не знайшлі.

Вульф—Ці справа толькі ў Мэндалю. (*Сьвятло пераключаецца на Быхава і Прылуцкага*).

Быхаў—Ланцужок цягнецца да такіх Казлоў, Шпунтоў і іншых варожых нам людзей: прагульшчыкаў, п'яніц, гультаёў, рабочых з вясковымі настроямі., ён яднае фронт прыхільнікаў нявольніцкага тэмпу. Наша праца ня гульня, а барацьба... Клясавая барацьба ў самой пабудове. А ты раскіс... Праглядзеў галоўнае. Ня ведаю, як вас вучылі ў тэхнікуме будаваць, але ведаю, што ці вас мала вучылі быць бальшавікамі, мала вас вучылі працаваць з рабочай клясай, з колектывамі, ці вы забываецеся на гэта... Ты адзін разам з усімі тваімі ведамі—ноль, а веды, узброеныя клясавай зарадкай, памножаныя на калектыўную працу, зрушаць горы.

Прылуцкі—Я адчуваю сябе, як у лесе... Я тэхнік, камсамолец, але я чужы: мяне ня любяць ударнікі, скоса паглядаюць на мяне рабочыя, падстаўляе ножку дзесятнік... Цяжка...

Быхаў—Ты затрымаўся на палове дарогі. Чаму ты не дапаможаш ударнікам, не прагоніш Мэндаля, не націснеш на ўсе пэдалі тэмпаў, а гэта зрабіць ты можаш і павінен. Моцнага кіраўніцтва, тэхнічнай дапамогі, таварыскае парады, рабочыя чакаюць.

Прылуцкі—Так... патрэбен пералом... іначай... (*Уваходзіць Мэндаль*)

Мэндаль—Таварыш прараб, адно маленькае слова.

Прылуцкі—Ну, што?..

Мэндаль—Кастусь Іванавіч, бачыце, трэба хутчэй канчаць галоўны корпус заводу. Ну, дык ёсьць думка паставіць выдзьвінуўшыхся ў мяне рабочых на фасад.

Прылуцкі—Калі ласка, Мэндаль Гдалявіч, рабеце, што трэба.

Мэндаль—Васюцін добры ў мяне працаўнік. Я, ведаеце, і сам-бы зрабіў. Але паслухайце, аб чым зараз крычаць у рабачкоме. Я праходзіў міма і зусім выпадкова пачуў... І, ведаеце, я думаю, што з боку ўдарнікаў гэта... проста антысэмітызм.

Прылуцкі—Трэба высьветліць, (*Пераключэньне на рабачком. Уваходзіць Быхаў.*

Быхаў—Чуеш? Бюро парт'ячэйкі даручае табе сабраць матар'ял-

Марыля—Добра.

Вульф—Памажы націснуць, Быхаў. Трэба падкруціць гайкі на пабудове.

Старшыня—Занадта ўжо рашуча бярэцца брыгада. (*Уваходзяць Мэндаль і Прылуцкі*).

Прылуцкі—Сарвацца можа. Папрабуй падняць нашых рабочых адным махам—падарвешся.

1-ы рабочы—Ты рабочых не чапай. Хто сьвядомы—разумее брыгаду.

Вульф—Мы зьнізілі расцэнку. Выклікаем усіх партыйцаў, камсамольцаў... прафсаюзны актыў, узяць з нас прыклад.

Янкаў—У кожным корпусе павінна быць ударная брыгада.

Прылуцкі—Толькі вось перабоі з матар'ялами..

Вульф—А ты ня будзь сьлімаком... Ды менш давай веры такім вось... (*Паказвае на Мэндаля*).

Старшыня—Ну, ты, Вульф, цішэй.

Янкаў—Што цішэй. Грамчэй, грамчэй крычаць трэба. Не хварэе ў цябе душа за прадпрыемства.

Прылуцкі—Можна хварэць і адначасова памыляцца.

Старшыня—У мяне цьвёрдая лінія. Абараняць інтарэсы рабочых—асноўная задача рабачкому.

Быхаў—Інтарэсы рабочае клясы могуць супярэчыць інтарэсам паасобных рабочых.

Янкаў—Як, напрыклад, Шпунта.

Шпунт—Не напірай на закускі, стол абернеш.

Вульф—Ды яшчэ п'яніц, прагульшчыкаў, гультаёў. Рабачком павінен гнаць такіх з пабудовы.

Старшыня—Мы павінны ўмець выхоўваць чалавека. Трэба ўмець заглянуць у душу п'яніцы. Ты вось папрацуй, выхавай·

Вульф—А пабудова, дзякуючы прагулам, зрываецца.

Быхаў—Ня гэта твая асноўная справа, рабачком. Плытка ты плаваеш, трэба на справу глядзець значна глыбей. Тым, што ты прагульшчыка плакаць прымусіш, соцыялізму не пабудуеш.

Янкаў—Яшчэ Ленін казаў: „комунізм пачынаецца там, дзе зьяўляепца самаадданая клапатлівасьць рабочых у справе павялічэньня вытворчасьці працы".

Быхаў—Ты здолей організаваць ініцыятыву рабочых, падымі іх энэргію, творчасьць. Пакажы значэньне будаўніцтва, вялікія мэты... А ці разумееце вы, актыў пабудовы, значэньне заводу? Ці ведаеце, што будзе, калі наш завод сельскагаспадарчых машын ня зможа ў гэтым годзе пачаць працу? (*Наплыў кулакоў. Музыка кулакоў*).

1-ы кулак—Вёска мілая, родная вёска!
Ты на тая, ня тая цяпер.
Па загонах тваіх з дзікім лёскатам
Пяе новыя песьні матор.

На душы маёй завіруха,
Вялікая роспач і сум.
Не магу, не магу я слухаць
Гэты новы, ня любы мне, шум.

3-і кулак—(*разварачвае газэту*). Старэнна чытаю. Але няма радасьці. Паляць комуністычныя словы. (*Усе нахіляюцца над газэтай*).

2-гі кулак—Апанас! Дзядзька! А можа наша возьме.

3-і кулак—(*чытае*). Зрываецца пабудова заводу сельскагаспадарчых машын.

1-ы кулак—Селі макам. Згарэлі. Усюдых... Усюдых сарваць-бы.

3-і кулак—Вунь у калгасе „Пераможны шлях" плугам зямлю варочаюць, а расьце, шырыцца калгас.

2-гі кулак—Дык што-ж нам? памірaць?..

1-й кулак—Зубамі.. З боскай дапамогай (*усе жагнаюцца*) папалім, сарвем, парэжам.

3-і кулак—А яны дыктатурай.

2-гі кулак—І суцэльнай.

1-ы кулак—Перамогуць? Пабудуюць? Нас зьнішчаць?..

3-ці кулак—Так. На тое яны бальшавікі (*Пераключэньне на рабачком*).

Быхаў—На тое мы бальшавікі. (*Музыка пераходзіць у пераможны напеў*).

Канец першага кругу.

КРУГ 2-гі

Малюнак 4-ы

(Муз.—Прылюдзе. Памяшканьне вытворчае-бытавой камуны на пабудове заводу сельскагаспадарчых машын.)

Заг. гаспадаркі—(*Працуе над рэлямэнтам дня комуны*) Пад'ём а шостай гадзіне раніцы. Мыцца на рэчцы. Сьнеданьне 20 проц. усіх дзённых харчоў. А як я вылічу процанты. Камуну мы організавалі „Вытворча-бытавая камуна імя Карла-Лібкнехта на пабудове заводу сельскагаспадарчых машын". Крычалі ура, гаварылі прамовы...

1-я дзяжурная—Таварыш загадчык гаспадаркі, дазвольце дзяжурным схадзіць на рэчку.

Заг. гаспадаркі—Правільна. Працу ўдарных брыгад паставілі на вышэйшую ступень. Такой вытворчасьці, такой дысцыпліны пабудова ня бачыла. Сталі зьнітаваным калектывам.

2-я дзяжурная—Алеська, пусьці пакупацца. Мы пасьля сканчым прыбіраць.

Заг. гаспадаркі—Але цяжкасьцяў вагон. Па-першае, камуна мы, ці вытворча-бытавая арцель? Ці трэба абагульваць скрынкі? Працуем па адной разьліковай кніжцы. Бязумоўна, у нас агульныя..

1-я дзяжурная—Усе купацца ідуць, а мы тут пакутаем.

Заг. гаспадаркі—Агульная ў нас праца, кватэра, харчы. Разам чытаем, вучымся, глядзім кіно. А як быць з адзежай? Толька любіць што-небудзь новае адзець, а Пятрусь абношанае, тое, дзе ўжо ўляглося кожнай зморшчынкай. Аднаму на адзежу трэба больш, другому меней.

1-я дзяжурная—Гэта сьвінства, Алеська. Мы таксама людзі. (*Кідае венік і выходзіць*).

Заг. гаспадаркі—А адпачынак. У Сёмкі ные сэрца па Галі. Пагаварыць сам на сам хочацца, ручку пацісьнуць, а то і пацалавацца. А тут круглыя суткі на вачох. Хіба выкрасьліць каханьне з інвэнтару камуны?..

1-я дзяжурная—(*паказваецца*). Алеська, Грышку прывітаньне перадаць? (*Сьмех, вышла.* (*Уваходзяць камунары з рушнікамі*)

Заг. гаспадаркі—Што за жарты, куды вы? (*Музыка, сьпеў: „Пойдзем мыцца, мыцца, мыцца, ад грахоў сваіх адмыцца. Рэчка быццам банны цэх, рэчка змые ўсякі грэх*[з]. *Выходзяць*). Розныя характары сабраліся ў нашай камуне. Адзін спакойны, як цялё, другому супроць слова не скажы, з кула-

камі папрэцца на цябе. (*Задумваецца*). А можа разьбіць усю камуну на сэктары: на нэрвовы, на спакойны, на лірычны... Не, і так цяжка, заблытаешся.

Зьмітроўская (*Уваходзіць*) Так, цяжка, калі заблытаешся.

Заг. гаспадаркі—Што? Чаго ты купацца ня ідзешь?

Зьмітроўская—Нуда агарнула, месца не знайду.

Заг. гаспадаркі—Ін-ды-ві-ду-а-ліс-тка. Табе каля мамкінай спадніцы сядзець, а яна ў камуну папёрлася.

Зьмітроўская—Ня тое, Алеська. Я камуну ляпей сябе люблю. А брыгаду... Няўжо я для сябе брала. Я-ж думала для ўсіх, для ўсёй брыгады...

Заг. Гаспадаркі—Хіба цябе брыгада прасіла, каб ты рамы крала?

Зьмітроўская—Я ведаю цяпер, што зрабіла дрэнна. Але-я думала гэтым дапамагчы брыгадзе, каб ня быць у хвасьце.

Заг. гаспадаркі—Як у хвасьце? Ты павінна ісьці у перадзе: „кожны ўдарнік павінен быць перадавым авангардам рабочай клясы". Во, чула?

(*Акцэнт музыкі*)

Зьмітроўская—Я ведаю ўсё гэта. Але ў мяне не хапала сілы. Слабая я, не магла ўгнацца за ўсімі. Крыўдна было перад брыгадай. Ну, і рашыла...

Заг. гаспадаркі—Левы ўхіл на практыцы.

(*Акцэнт музыкі*)

Зьмітроўская—Ды зразумей ты, Алеська...

Заг. гаспадаркі—Зразумела, зразумела. Гэта, адрыжка капіталізму, (*акцэнт муз.*), а ў камуне капіталістычным элемэнтам ня месца. Цябе трэба выкрэсьліць з інвэнтару камуны. (*Зьяўляецца Быхаў*).

Быхаў—Не. Інвэнтар камуны Зьмітроускую трэба абнавіць.

Заг. гаспадаркі—Ба! Правы ўхіл на практыцы.

(*Акцэнт музыкі*).

Быхаў—Чакай ты, хадзячая лічба. Раскаркалася, як тая варона. Ухіл, Ухіл. А ці разумееш ты сам, што гаворыш?

Заг. гаспадаркі—Разумею, разумею.

Быхаў—Калі разумееш, дык ведай, што камуна—гэта кузьня новага чалавека.

Заг. гаспадаркі—Вось, вось правільна. Кузьня новага чалавека.

Быхаў—А таму, калі наша дзяўчына зьвіхнулася, яе трэба накіраваць на правільны шлях, а ня выкідваць за плот.

Заг. гаспадаркі—Накіруй, калі ў яе буржуазныя адрыжкі.

Быхаў—Эх, ты адрыжка. Блытаешся паміж трох хвой і заблытваеш свайго таварыша. Наста зразумела свае памылкі. А вось такія, як ты, не дапамагаюць ёй выправіць іх.

Замест таварыскай дапамогі, адпіхваюць яе ад сябе. А ты, Наста, кінь нюні распускаць. Ты можаш і павінна быць сапраўднай камунаркай. Трэба толькі не на словах, а на справе выправіць свае памылкі. Бяжы на рэчку. Рабяты там цябе чакаюць (*Ціхая музыка са сьпевамі*).

Зьмітроўская—Няўжо? (*Пабегла*).

Быхаў—А ты кінь дробязі. Скарыстай менш сваю любоў да гарачых прамоў сёньня на сходзе. І ў камуне можа быць буза. (*Пераключэньне—сад*)

Гурвіч—Галя, Га-ля... Э-э-э... Наста... Фу, д'ябал перапужала мяне.

(*Акцэнт музыкі*).

Зьмітроўская—Сёмка, ідзем мыцца на рэчку.

Гурвіч—Я, ведаеш, рушнік забыўся.

Зьмітроўская—А гэта (*паказвае на Сёмкін рушнік*).

Гурвіч—А-а-а... Бачыш мыла... мыла забыўся...

Зьмітроўская—Хутчэй-жа, бо нас чакаюць (*пабегла*).

Гурвіч—Зараз, Настачка, зараз. (*Сьвятло пераключаецца на Галю*).

(*Акцэнт музыкі*).

Галя—Сём-ка...

Зьмітроўская—Галя.

Галя—Э... Э... Наста. Фу, перапалохала мяне...

Зьмітроўская—Хадзем мыцца на рэчку.

Галя—Я, ведаеш, рушнік... рушнік забылася...

Зьмітроўская—А гэта.

Галя—А-а-а... Бачыш мыла... мыла забылася...

Зьмітроўская—Хутчэй-жа, бо нас чакаюць (*пабегла*).

Галя—Зараз, Настачка, зараз. (*Гурвіч і Галя сустракаюцца*)

(*Акцэнт музыкі*).

Гурвіч і Галя (*разам*)—Наста.

Гурвіч—Галя.

Галя—Сёмка.

Гурвіч—Чаму ты не на рэчцы? (*Муз. песьня*).

Галя—А ты?

Гурвіч—Я рушнік забыўся.

Галя—І я таксама рушнік забылася.

Сёмка—Сёньня я спазьніўся на працу. Сорамна паказацца братве.

Галя—А я ня была ўчора на сходзе ячэйкі. Марыля лаяцца будзе.

Сёмка—Так нельга, Галя...

Галя—Што-ж рабіць, Сёмка?

Сёмка—Зразумей. Калі мы будзем кожную ноч гуляць да 3-й гадзіны, дык я стану прагульшчыкам, а цябе выключаць з камсамолу. (*Уваходзіць бузацёр*).

Галя—Так. Цябе могуць выключыць з брыгады, а мяне з камсамолу.

Сёмка—Ня добра кожны вечар патаемна выходзіць з камуны, раніцой чуць насьмешкі, адгрызацца...

Галя—Перашкаджае каханьне працы.

(*Канец музыкі*)

Сёмка—Мне за цябе асабліва крыўдна. Актывістка, такая праца зараз, горы зьвярнуць трэба, а ў яе вочы закаханыя.

Галя—А калі ў ударніка Сёмкі ў часе працы рукі трасуцца Рот разьдзіраецца ад пазяханьня—цябе не пашкадуеш (*Падкрадуюцца комунары*).

Сёмка—Цяжка.

Голас—Ага.

Галя—Давай спынім спатыканьне.

Голас—Давай.

Сёмка—Ты гэтага хочаш.

Голас—А ты гэтага хочаш?

Усе—Раз, два, тры апчхі (*Музыка чіханьня*) (*Шум, рогат*)

1-ы голас—Хлопцы, пажар! (*Убягаюць атстатнія комунары*).

Галасы—Дзе? Што гарыць?

1-ы голас—Галя і Сёмка загарэліся!

Бузацёр—Што-ж вы, чэрці, лахматныя, да гэтага часу нічога не казалі.

Галя—Што не казалі?

Бузацёр—Ша, бяз спрэчак.

Гурвіч—Дай мне слова.

Бузацёр—Садовым прагульшчыкам слова не даю, а па-першае сам бяру. Таварышы, мітынг у зьвязку з пажарам у камуне імя Лібкнэхта лічу адчыненым. (*Музыка туш*). На парадку дня стаяць наступныя пытаньні: 1. Суд над падпальшчыкамі каханьня ў камуне—дакладчык я. 2-е. Аб організацыі сямейнай ячэкі у камуне—дакладчык я. 3-е. Аб міжнародным становішчы ў зьвязку з гэтым—дакладчык я. У прэзыдыум аднагалосна абраны я, старшынёй прэзыдыуму таксама я. (*Шум*).

Галасы—Хто цябе абіраў? Пратэстуем.

Галя—Хопіць.

Галасы—Давай суда. Пакараць!..

Бузацёр—Ша. Што значыць хопіць. Не змазвайце праблемных пытаньняў. Перад намі, паважаныя таварышы грамадзяне і грамадзяначкі, ганебнае злачынства: камунар і камунарка

патаемна ад усіх сустракаліся, вялі невядомыя для грамадскасьці размовы. Ці могуць быць сакрэты ад камуны? Не. Але ці зможам мы забараніць каханьне? Не. Ну дык...

Галя—Сустракацца на вачох усіх?

Сёмка—Дзе выхад? Век халасьцяком быць. Не хачу.

Голас—Не жадаю.

Бузацёр—Ша. Па дазволу камуны будзем організоўваць сямейныя ячэйкі. Асобныя пакоі. Дык давайце абгаворым.

Галасы—Тады Быхава ў камуну. Сямейных. На ўсё жыцьцё камунарамі.

Бузацёр—Ша. Па парадку. Цішэй, ну. (*Убягае Заг. гаспадаркі.. Ускаквае на лаўку. Цішыня*).

Заг. гаспадаркі—Тэрмінова сход камуны. Прыклад, прыклад, таварышы? Уся камуна павінна стаць на начную зьмену. Цяжка, але на начную працу. Ніякіх разважаньняў!

Сьцяпурка—На начную. Дык значыцца ўначы на нас выехаць хочуць!..

Заг. гаспадаркі—Ах, так! Вы супроць?!

Янкаў—Ну ты! (*Праходзяць Прылуцкі і Быхаў*).

Прылуцкі—Канешне, але чалавек не сава. Праца ў ночы.

Быхаў—Калі пачне ў нас працаваць тэхнік Іваноўскі.

Прылуцкі—Хіба я супроць. Але паглядзім, што скажуць масы

Канец 4-га Малюнку.

КРУГ 2-гі

Малюнак 5-ты

Памяшканьне комуны. На сцэне Быхаў, рабачком, Марыля. Марыля піша вялікі лёзунг. „Ёсьць у нас ударнік Шпунт, гэта хлопея проста грунт: дзень працуе, два гуляе—па бутэльцы ударае".

Рабачком—А ня дрэнна прыдумала камуна. Гэтыя лёзунгі глыбей суровых вымоў за сэрца рабочых бяруць. Дай я памагу.

Быхаў—Чаго ты круцішся. Ну цябе—глядзі, літару размазаў.

Рабачком—Толькі зразумей... (*Чытае лёзунг*)

Марыля—Я цябе вымажу.

Рабачком—Толькі не апартуністычнай фарбай.

Быхаў—Спазьнілася, ня той рабачком стаў. На бюро за начную зьмену галасаваў. А памятаеце? (*Уваходзіць Янкаў*).

Янкаў—А што Вульфа і Прылуцкага няма?

Рабачком—Паўгадзіны чакаем.

Янкаў—Нікуды ня варта. Трэба-ж загадзя ўсе дробязі прадбачыць.

Марыля—Аб начной зьмене нават у камуне рознагалосьсе.

Быхаў—Ведаеш, Янкаў, мы падрыхтоўваем пытаньне аб Мэндалі.

Марыля—Ну, і матар'ялу я сабрала.

Янкаў—Рашуча змагацца трэба. Бяда з Прылуцкім, моладзь хоча вучыцца. Арганізавалі тэхнічны гурток. А Прылуцкі тры разы сарваў заняткі, ня прыходзіць.

Марыля—Хлопцы кінулі наведваць.

Рабачком—Што-ж ячэйка з ім цацкаецца. Пагнаў-бы я яго з камсамолу.

Марыля—А раней ты гэта таго... Нешта ня так фармуліраваў. Ён-жа спэцыялісты.

Рабачком—Дык то раней... Партыя навучыла. (*Убягае Вульф*)

Янкаў— Вульф.

Марыля—Дзе ты быў?

Быхаў—Чаму так позна? Ужо гадзіну чакаем.

Вульф—Ды цяжка... Трыкутнік: пабудова, сям'я... Эх, таварышы. (*Наплыў кватэры Вульфа*) (*Надя і Вульф каля ложку хворага сына*).

Надзя—Як ён цяжка дыша.

Вульф—Я выкліч доктара.

Надзя—Я што калі Алеська памрэ?

Вульф—Чаму ты гэтак гаворыш Надзя? (*глядзіць на гадзіньнік*).

Надзя—Ты ідзеш куды?

Вульф—Сёньня камуна павінна выйсьці на начную зьмену.

Надзя—Але-ж ты толькі што прышоў.

Вульф—Я кіраўнік.

Надзя—А я змучылася адна. Ня ідзі...

Вульф—Без мяне могуць быць затрымкі.

Надзя—І можа памерці твой сын.

Вульф—Я іду. Патрэбен прыклад.

Надзя—Алеська зусім халодны.

Вульф—Надзя, зразумей...

Надзя—Ты ідзеш? Табе будаўніцтва даражэй, чым сын.

Вульф—Я больш камуністы, чым бацька (*выходзіць*).

Надзя—Вульф пайшоў. Грамадзкая праца. Як непатрэбнае рызьзё адкінута сям'я... Не разумею... Няўжо выхаваньне дзіцяці—справа толькі маткі. Я дзеля Алеські кінула ўсё. Вульф дзеля брыгады. Хто правы? Вульф, мне здаецца, ты не камуністы. (*Пераключэньне*).

Вульф—Што рабіць? Парваць кайданы сям'і. Цяжка. Мая жонка на фронце была, а цяпер гаршкамі дома варочае.

Марыля—Няўжо зачараванае кола?

Янкаў—Дзеля будаўніцтва—хутчэй трэба арганізаваць па-камуністычнаму наш быт.

Быхаў—Адразу ня зробіш

Вульф—Дзе-ж выхад. (*Убягае загадчыца комуны.* (*Уваходзяць на руках, на нагах, на галаве і г. д. разгуляўшыяся комунары*).

Заг. гаспадркі—Хутчэй, хутчэй. Камуну... камуну... Камунары супроць. А-а-а!!!

На сцэну выходзіць вясельная процэсія комунараў, падвязаных рушнікамі, хусткамі. Сьпевы, скокі, якія паступова ўзрастаюць і пераходзяць у агульны скок.

Заг. гаспадаркі—Што за вар'яцтва?

Быхаў—Ну, і разгуляліся.

Гурвіч—Весела жыць у наш час.

Галасы—Даеш скокі. Быхава ў кола. Гоп, кума!!!

Канец музыкі.

Сьцяпурка—Стой. Быхаў будзе асобным нумарам. Сёньня гуляем да раніцы.

Вульф—Цішэй, цішэй, таварышы, сёньня камуна выходзіць на начную зьмену.

Сьцяпурка—Што за буза? Усюдых камуна.

Марыля—Так вырашылі на бюро партыйнай ячэйкі.

Сьцяпурка—А нас запытаць ня трэба было? А комсамольская ячэйка.

Быхаў—Давайце абгаворым.

Сьцяпурка—Тэкс. Значыць на начную зьмену, партыйным загадам. З бочкай цэманту скакаць у цэмры па сходах. Добра. Толькі, знацца, быць у камуне гэта падобна, як яго на прымусовую працу. Таварышы! Мы на начную зьмену выйсьці ня... (*аглядаецца*).

Галасы ўсе—Можам.

Сьцяпурка—(*аглядаецца, падтрымкі няма*). Цяжка выйсьці.

Вульф—Сёньня на начную зьмену выйдуць усе камунары. Патрэбен прыклад. Сэзоньнікаў узьняць ня лёгка.

Марыля—Працуючы як раней на дзьве зьмены, пабудовы ў тэрмін ня скончым.

Янкаў—А Прылуцкі. Дзе-ж кіраўніцтва?

Быхаў—Варожых людзей з пабудовы гнаць. Ня нашыя настроі разьбіць. Мэндаль здымаецца з работы. Сёньня ўначы пачынае ў нас работу тэхнік камуністы—Іваноўскі. А Прылуцкі? Сёньня ён сам канчаткова вырашыць пытаньне альбо з намі, альбо... І я, ведаючы яго настроі і работу, ўпэўнен...(*Наплыў кватэры Прылуцкі, жонка яго Зося і таварышка*).

Зося—(*пяе „Вашы пальцы пахнуць ладанам"... Музыка высьмейвае яе*).

Ты, Кастусёк, больш ні куды ня пойдзеш, добра?

Прылуцкі—Нельга Зося. Я прараб.

Зося—Гэта-ж жах так працаваць! Ведаеце, яго замучыла гэта пякельная пабудова.

Вера—Мой татка інакш глядзіць на справу. У гадзіны адпачынку працаваць ня будзе.

Прылуцкі—Але сёньня пачынае работу начная зьмена.

Зося—Бяры прыклад з такіх людзей, як паважаны інжынэр Штыльман.

Таварышка—Татка хацеў вас пабачыць.

Прылуцкі—Але-ж я комсамолец.

Зося—Маеш табе. Будзеш так гаварыць--я ўзлуюся.

Прылуцкі—Няма за што злавацца, Зоська. Мне-ж трэба было-б ісьці...

Таварышка—Татка часта кажа: мы жывем толькі раз.

Зося—Міленькі, каханенькі Кастусёк, застанься дзеля мяне, маленькай Зосі, ня ідзі.

Прылуцкі—Мы жывем толькі раз (*Музыка, пахавальны сьпеў*).

Прылуцкі—Застаўся. Рвуцца апошнія ніці... Што-ж. Разьбівацца на кавалкі. Забыць пра сваё асабістае я. Увесь час працаваць на карысьць кагосьці. Не, не, я не магу ўсяго сябе аддаваць будаўніцтву. Я не магу быць машынай. Не магу... (*Пераключэньне*).

Галасы—Хутчэй вырашайце. Ня трэба такіх. Кіш!

Сьцяпурка—Дык я памыліўся, таварышы, прабачайце. Я хацеў сказаць, што цяжка... Але трэба выйсьці.

Вульф—Давайце вырашаць. (*Гудок. Музыка. Убягае Зьмітроўская*).

Зьмітроўская—Хлопцы! На працу выйшла брыгада маляроў, тынкароў, каменшчыкаў. Ідуць, ідуць. Працай заліта пабудова.

Вульф—На працу. (*Урачыстая музыка, Марш ударнікаў*) (*Усе падымаюцца. Сьпеў. Выходзяць*).

Быхаў—(*глядачам*). Ну папрабуйце з такім народам не перамагчы.

Канец 2-га кругу.

КРУГ 3-ці

Малюнак 7-ы

Музыка Прылюдзе. (Пабудова. Начная зьмена працуе. Колектыўная мелёдэклямацыя. Музыка—працы машын).

Гучна
Магутна
Проста
Сурова
Зычныя рупоры ўдаліч грымяць:

Мы абяцаем
Сэрцам

І кроўю
Мы абяцаем
Дагнаць,
Перагнаць!..

Таварыш рабочы,
Туды, дзе п'янкі
Грозна кіруй
Жарлы гармат.
Таварыш рабочы,
З такімі, як Янкаў—

Ударым
Ударам
Ударных брыгад.

Гэй, камсамолія,
Арш—у паходы...

Гэй, камсамолія,
Шырэй крок.

Гэй, на працу
Дружна

Р - Р а з...

Узьнімай штандары.
У карпусах фабрычных мас
Г р а й,
Гудок ударны.

Рабачком—Эх, чэрці! Вось гоняць. Ну ня хлопцы, а золата.

Вульф—Самаварнае. (*Сьмех. Гудок. Уваходзіць Надзея*) Надзя! Ты чаго?

Надзя—Прышла цябе да хаты гнаць.

Вульф—Што ты гародзішь?..

Надзя—Ха-ха-ха! Напужаўся. Прымайце камунараў.

Вульф—Надзя, Надзячка... Хлопцы!

Галасы—Качаць іх. Хай жывуць новыя камунары! Ура!

Надзя—Я вам перашкаджаць ня буду—дзіця ў яслі, а сама на працу. Член ударнай брыгады жонак рабочых прыступае да працы!..

Быхаў—Малайцы рабяты! Хутка мы ўключымся ў конкурс на лепшую пабудову,—змагацца за першы штандар.

Сцяпурка—Як, як ты кажаш?

Быхаў—Змагацца за першы штандар, за лепшую працу.

Сьцяпурка—Ха-ха-ха... Ды ты сьмяешся, Быхаў.

Быхаў—Ну што тут сьмешнага?

Сьцяцурка—Гэта-ж ня фронт. Не Перакоп, а звычайная праца. Хіба-ж мы гэроі якія?

Быхаў—А хто па-твойму гэрой?

Сьцяпурка—Ясна хто: Будзёны, Варашылаў...

Быхаў—А яшчэ хто?

Сьцяпурка—А яшчэ... Ну і ўсе.

Быхаў—Мала ты пра гэроізм ведаеш, калі так гаворыш.

Галасы—Адкуль нам ведаць. Расскажы Быхаў, ты-ж партызан.

Быхаў—Добра, расскажу.

Ударніца—Толькі пра Перакоп не запамятай.

Быхаў—Не запамятую. Слухайце. Гэта было ў 20-м годзе... (*Наплыў: 20 год. Атрад. Трывожная музыка*).

1-ы партызан—Раніцаю сьмерць...

2-і партызан—Сьціснулі белыя як у пастку (*уваходзіць камандзір*).

Камандзір—Паніка пагражае атраду.

Быхаў—Наступаць

3-і партызан—Мора, скалы, агонь, жалеза, кроў...

Гарманіст—(*Ірае „яблочко“*). Калі ужо памірaць, дык з музыкай (*Музыка. Сьпевы. Скокі. Бой.*)

(*Пераключэньне на пабудову.*)

Быхаў—А раніцою полк белых на капусту пасеклі! Два танкі голымі рукамі ўзялі. А вось Пятруся, разам з гармонікам—на кавалкі...

Сьцяпурка—Шкадую я, браткі, што не радзіўся дзесяць год назад. Рукі у мазалёх, а пораху ня нюхаў. Пра гэроізм ведаю толькі з апавяданьняў.

Быхаў—А зараз, хіба, не гэроізм?!.

Марыля—Пяцігодка ў чатыры гады ня патрабуе гэроізму

Янкаў—Турксіб, Днепрабуд, Трактарабуд!..

Сьцяпурка—Ну, хіба-ж гэта гэроізм? Вось тады на фронце: калі у кожнага за плячыма стаяла з вышчаранымі зубамі сьмерць, калі вакол быў толькі адзін шлях—сьмерць... А людзі гэтага не баяліся і ішлі з адкрытымі тварамі у атаку!.. Вось гэта быў гэроізм. А нам вайны ня бачыць.

Вульф—А небясьпека іртэрвэнцыі, ты думаеш, мінавала? Хуткэ нам яшчэ ўсім прыдзецца патрымаць вінтоўкі: французскі гэнштаб вызначыў апошні тэрмін інтэрвэнцыі на 31 год.

Марыля—А промпартыя? Меньшавікі? А нацдэмократы тут у Менску падрыхтавалі інтэрвэнцыю, каб аб'яднаць пад крылом фашысцкай Польшчы Беларусь: „хай лепш нэгры наводзяць парадак, чым бальшавікі“. Хвалебныя вершы Пілсудзкаму. Гэта па-твойму што?

Сьцяпурка—Ну, я і кажу, калі будзе вайна, тады будзе і гэроізм. А зараз... Дзе-ж яны твае гэрої?

Быхаў—Усюдых. Глянь на вакол сябе; кожная хвіліна, кожная праца нараджае новых гэрояў, новых энтузыястых... Такой гэроічнай эпохі яшчэ ня было ніколі!.. (*Гурвіч убягае*).

Гурвіч—Хлопцы, Наста Зьмітроўская са страхі... (*Уводзяць Насту*).

Галасы—Наста, Настачка, што з табою, што здарылася?

Зьмітроўская—Шклілі страху. Вецер. Сьлізка... Звалілася... Але цахі зашклілі. Заўтра пачынаем монтаж машын!..

Усе—Ура.

Янкаў—Эх, ты. (*Націвае Сьцяпурцы на вочы шапку. Сьмех*).

Канец 7-га малюнку.

Малюнак 8-ы

(Паседжаньне ячэйкі КП(б)Б.).

Старшыня—(*рабачкому*). Узялі усё-ж такі сваё чарцяняты.

Марыля—На два тыдні раней тэрміну скончылі пабудову. Трэба толькі цяпер канчаткова выкарчаваць п'янку

Янкаў—А добрую справу прыдумала братва—конкурс на лепшага п'яніцу. Пераможцу прыз; звальненьне з пабудовы.

Стар'шыня—Ці варта гэта?

Янкаў—А што-ж іх па галоўцы гладзіць, ці што? З новымі раштаваньнямі вырастаюць і новыя людзі (*Пераключэньне*).

Рабочы—(*піша заяву*). У бюро ячэйкі КП(б)Б, заява. Прашу залічыць, мяне ў сталёвыя шэрагі КП(б)Б, як я ёсьць ударнік і стары рабочы. Ня ўступаў раней—проста кажу: слабыя партыйцы былі на пабудове, а зараз бачу Ленінскі шлях. (*Пераключэньне на бюро ячэйкі*).

Быхаў—Значыць скончана. Вульфа вылучаем старшым дзесятнікам.

Старшыня—А з Прылуцкім як?

Марыля—Камсамольская ячэйка выключыла яго з камсамолу.

Быхаў—Так. (*Уваходзіць Іваноўскі*). Вось і таварыш Іваноўскі. Добра, што ты прышоў. Гэта, наш новы прараб. Распытайцеся ў яго, як ён трапіў да нас, на пабудову. Пачуеце характарыстыку аб некаторых нашых спэцах.

Іваноўскі—Гэта было заўчора (*Наплыў. Пакой інжынэра Штыльмана. Штыльман і Прылуцкі*).

Штыльман—Я стары спэцыялісты і ня мог-бы цярпець такія зьдзекі, малады чалавек. Нейкія плянавыя групы суюць нос у пляны пабудовы. Нейкія няпісьменныя малакасосы сочаць за кожным вашым крокам. Хто-ж, нарэшце, будуе завод?—тэхнік ці комсамол? Я паважаў вашага бацьку і павінен вам сказаць, што ваша нерашучасьць ня робіць яму гонару.

Прылуцкі—Я кіну пабудову. Ня зручна адно—я не хачу парываць з комсамолам. Я падаў апэляцыю.

Штыльман—Сорам быць такім сэнтымэнтальным. Комсамольскі білет—мандат на праванавучаньня. А зараз вам ніхто ня можа загадваць працаваць—вас павінны прасіць.

Прылуцкі—Вы правы, Франц Язэпавіч. Я маю права пазбавіцца ад гэтых тэмпаў, схавацца ад гэтых дапытлівых вачэй, пакінуць гэтую пякельную пабудову. (*Уваходзіць дачка Штыльмана Вера*).

Вера—Татачка, вас пытае нейкі чалавек з трэсту.

Штыльман—Ён сказаў, хто ён такі?

Вера—Так, нейкі Іваноўскі.

Штыльман—Гэта з тых, што захапляюцца размахам. Прасі яго, Вера.

Прылуцкі—Ён на маёй пабудове практыкуе. Ня дрэнная зьмена, Франц Язэпавіч. Я заўтра-ж падаю заяву аб пераводзе. Толькі куды вы мяне накіруеце?

Штыльман—Зразумела, заставім у трэсьце. А калі затрымаецца пабудова заводу, будзе ня дрэнна... Я вас пазнаёмлю з якімі. кольвек настроямі ў трэсьце, Кастусь Іванавіч. (*Уваходзіць Іваноўскі*).

Іваноскі—Добры вечар. Я на хвілінку, Франц Язэпавіч. Прыводзіў у парадак проекты і знайшоў вялікую недакладнасьць. Рашыў патурбаваць вас і адразу-ж разабрацца.

Штыльман—Вельмі рад, што зайшлі. Сядайце. Толькі шкада—у сябе дома я зусім не інжынэр і працаваць у часе адпачынку не магу.

Іваноўскі—У наш час прыходзіцца і ў адпачынак працаваць, калі гэта трэба, Франц Язэпавіч. Наш час патрабуе працаваць іначай.

Штыльман—Вы разважаеце з натхненьнем гімназіста вясной. Трынаццаці гадоваму дзіцяці Расіі хочуць надзець боты-скараходы.

Іваноўскі—Вы хочаце сказаць, што размах будаўніцтва надуманы, лёзунг—„дагнаць і перагнаць Амэрыку"—казачны?

Прылуцкі—Гэтыя размахі я адчуваю на сабе. Я кідаю пабудову заводу сельскагаспадарчых машын, яна выматала ўсе мае нэрвы... Даволі!..

Іваноўскі—Кінуць ня скончаную пабудову. Гэта—вар'яцтва, ці шкодніцтва?!

Штыльман—Кастусь Іванавіч разважае зусім правільна. Месца тэхніку, сапраўдны размах, магчымасьць працаваць—толькі у трэсьце.

Іваноўскі—Прамяняць непасрэдны ўдзел у будаўніцтве, працу з калектывам на цішыню габінэту?..

Прылуцкі—Папрабуйце, папрабуйце такімі тэмпамі. Даведзецеся тады?

Іваноўскі—Я шмат працаваў з рабочай клясай, грамадзянін Прылуцкі. А з трэсту хачу выйсьці даўно, начальства толькі ня пушчае.

Штыльман—Прымаючы пад увагу ваша жаданьне, зараз я асабліва супярэчыць ня буду.

Іваноўскі—У такім разе я заўтра на пабудове і, магчыма, на вашай пасадзе, грамадзянін Прылуцкі.

Прылуцкі—Там попыт на энтузыястых. Ха-ха-ха.

Штыльман—І на жадаючых выслужыцца спэцыялістых.

Іваноўскі—Эх, вы! Як добра, што такіх спэцаў мала. Вы, грамадзянін Штыльман,—чужы сацыялістычнаму будаўніцтву, а вы былы комсамолец,—інтэлігент—мокрая ануча. (*Цемната. Пераключэньне*).

Іваноўскі—Ну, вось і ўсё.

1-ы рабочы—Крышка. Хай адпачывае.

2-і рабочы—Даўно пара.

Рабачком. Усё добра, што добра канчаецца.

Янкаў—Не, яшчэ ня зусім скончана. Прылуцкіх трэба і там узяць на мушку.

Галасы—Правільна.

Іваноўскі—Слухай, рабачком. Склікай вытворчую нараду. Ёсьць вельмі цікавая прапанова аб экономіі цэглы. Апрача таго, даруй, ты дагэтуль не паставіў ў саюзе пытаньне аб паездцы лепшых ударнікаў на іншыя пабудовы... ды памяшканьне для гуртку тэхнікі трэба...

Рабачком—Добра, Іваноўскі, добра. Усё зраблю, што патрэбна для пабудовы.

Быхаў—З заўтрашняга дню ты здымаеш кладаўшчыка?

Іваноўскі—А што-ж з ім цацкацца. Хто ня з намі, той супроць нас.

Быхаў—Закручвай, Іваноўскі, мацней. Толькі ты аддавай увагі больш начной зьмене і будзь асьцярожней.

Іваноўскі—Так. Ходзяць размовы. Трэба быць напагатове. (*Пераключэньне. Прылуцкі, Казёл*).

Казёл—Цяжка, Кастусь Іванавіч... Мяне вось праганяюць з пабудовы. Начная зьмена працуе... пераблыталіся дзень і ноч...

Прылуцкі—Мабыць, рабочыя нездаволены Іваноўскім?..

Казёл—Праўду сказаць, дык наадварот. Вельмі паважаюць Іваноўскага. Уласна — усе арабіліся псыхамі. Слова гонару, Кастусь Іванавіч, такой працы я яшчэ ня бачыў.

Прылуцкі—Што кажуць пра начную зьмену? Яна-ж такая шкодная, такая небясьпечная...

Казёл—Пакуль каго-небудзь за язык не пацягнеш, гаварыць ня будуць. Кастусь Іванавіч, мабыць вы мне працу атрымаць дапаможаце?..

Прылуцкі—Пра начную зьмену павінны загаварыць. Пэўна-ж ёсьць, ці будуць факты... А працу я вам, Казёл... але... (*Прылуцкі выходзіць. Казёл убачыў Шпунта. Пальцем падзывае яго да сябе*).

Шпунт—Во (*паказвае на пабудову*). Расьце і пранцы яе не бяруць.

Казёл—Эх, Шпунт, не па-нашаму выйшла!

Шпунт—Начная зьмена працуе без затрымкі, нібы той кажан лётае, Шпунт, ні адпачыць, ні пакурыць.

Казёл—Вось дзе стала мне начная зьмена.

Шпунт—Перавярнулася ўсё. Цяпер і з дзеўкамі не пагуляеш і ня выпʻеш... Бывайце, вечарыны!..

Казёл—Вось каб гэта электрычнасьць часта псавалася, можа-б перасталі ўначы працаваць.

Шпунт—Што электрычнасьці станецца. Усе лямпачкі не перабʻеш.

Казёл—А ты раськінь розумам. Ёсьць адзін выхад. Людзі дзякаваць будуць. (*Гаворыць на вуха нешта Шпунту; апошні хрысьціцца і лезе на вежу. З насілкамі праходзяць два рабочыя. Надпіс „Сьцеражыся". Шпунт перарэзвае правады. Цемра. Візг пляцоўкі, грукат, крык, шум, звон, беганя з ліхтарамі. У пацёмках выносяць забітага. Узрывы музыкі—трывога*).

Галасы—Што такое?

Што здарылася?

Правады перарэзалі.

Васіля забіла.

Ой, божачка, мой міленькі. За вошта-ж гэта?

Шкоднікі.

Сарваць пабудову задумалі. (*Усе падыходзяць да забітага. Пахаронны марш музыкі*).

1-ы рабочы—Васіль, Васілёк, сынок... завошта-ж гэта... за вошта (*Кідаецца да забітага. Пауза*).

Шпунт—Вася, Васілёк.. сябра... дружа... даруй. Я-ж не хацеў цябе забіць... Дальбог не хацеў... Я толькі на начной не жадаў

працаваць. Васілёк, павер... каб я ведаў, што такая храновіна здарыцца—дальбог не паслухаў бы ня толькі Казла, але нават і Прылуцкага.

Галасы:—Ага!

Вось яно што!

Бач што задумалі, сволачы! Сарваць начную.

Шкоднікі.

Вульф—Але ня будзе гэтага. Чуеце вы, Казлы,—ня будзе...

Быхаў—Кроў па кроплі аддамо, але ня спусьцім першы штандарт перамогі. (*Музыка. Праца заводу*).

Быхаў—Дні гараць нябачанай будоўляй,
дні гараць запалам маладым.
Дні такія раджаюць годы пяцігодкі,
дні такія будуюць падмурак сацыялізму.
Міліёны рук будуюць краіну, міліёны энтузыястых аддаюць нэрвы, мускулы, жыцьпё рыштаваньням будучага. Шкоднікам не загасіпь нашага полымя, не сарваць нашай работы. Таварышы, чым больш перамог,—тым бліжэй да мэты і тым рашучай змаганьне. Ударнікі Савецкага саюзу, чырвонасьцяжнікі—гісторыі! Мацуйце нэрвы, мускулы, мазгі ланцугамі клясавай волі. Яшчэ вышэй тэмпы, яшчэ больш зоркасьці да ворагаў. Будуйце краіну брыгадамі, камунамі, заводамі! На штурм пяцігодкі! На подступы да сацыялізму Рубільнік уключыць! *Пачынае працаваць завод. Увесь калектыў за працай пяе*)
Вы чуеце сьпеў рыштаваньняў—
У ім наш юнацкі імпэт.
Ён ворагаў нішчыць і раніць,
Ён кліча за працу, за тэмп!

Прыпеў—Сірэны перамогу галасіце!
І трактарам адгукнецца колгас
Мы гэткім часам можам ганарыцца,
А ганарыцца намі будзе час.
— Рабочая моладзь заводаў,
Чыгункі, палёў, пабудоў,—
Фармуйце ўдарныя ўзводы,
Штурмуйце ўпартасьць гадоў!

Прыпеў—Сірэны перамогі галасіце!
І трактарам адгукнецца колгас...
Мы гэткім часам можам ганарыцца.
А ганарыцца намі будзе час.

Канец.

Оскар Канэль

Strasse frej[1])

Strasse frei.
Над натоўпам сьцяг ірдзяны,
Перад ім трамвай спыняецца з пашанай.

Доўга гнеў мы гадавалі...
„Völker, hört die Signale“ [2])
Strasse frei.

З намі сьцюжа, з намі голад.
Душыць нас ваш каменны горад...
... Мы хлопамі вашымі болей ня будзем.
І права сваё мы ў змаганьні здабудзем...
Strasse frei.
Strasse frei.

Хадзем у палацы,
Туды, дзе яны тлусьцеюць бяз працы,
Дзе мчацца фіаты і рысакі,
Дзе ў пэрлы апранутыя жанкі.
Strasse frei.
Strasse frei.

Мы пойдзем у турмы,
Дзе гінуць гэроі клясавых штурмаў,
Мы выдзярэм іх з вастрожых лап.
І вернем у свой ваяўнічы штаб.
Strasse frei.
Strasse frei.

Хто ня з намі, той вораг нам.
Мы вас пачастуем пякучым порахам.
Праклятаму бюргеру ў сэрца штых.
З вялікай пашанай ад нас усіх.
Strasse frei!

Пераклалі з нямецкае мовы
А. Зарыцкі і Ю. Таўбін.

[1]) Вуліца вольная.
[2]) „Народы, слухайце сыгнал“—словы з нямецкага „Інтэрнацыяналу“.

Эрнст Толер

Салдаты

(Soldaten)

На твары маіх таварышоў я не магу забыцца.
Яны прымушалі заводы ісьці і сэрцы машынныя біцца

Чатыры гады вайны іх душы скамечылі і вочы зашклілі.
Абліччы іх завастрылі і сарамлівасьць забілі.

У шлюх з цёмных партовых тавэрнаў і брудных бардэляў
Іскры вясёлага сьмеху можна пабачыць часамі праз вэлюм.

А мае сябры ня ведаюць сьмеху,
як лістападнае неба.

Бог! Брат! Чалавек! Ці прачнуцца яны калі-небудзь.

З нямецкае мовы пераклалі
А. Зарыцкі і Ю. Таўбін.

Алесь Жаўрук

Колёнаважаты

Як у тысячны раз адчыняецца рань
На сёньня прыбоем раскатным...
Ён зноўку выходзіць прымаць свой парад—
Таварыш колёнаважаты...

Палалі гады ліхаманкаю стром
(Ды хто іх, калі, забудзе?)!—
Ён танкі вадзіў—няпрыкметны гэрой,
Дзе сёньня ўстаюць Днепрабуды.

Шрапнэлі кантузілі сьнежную ноч
І трупы як звон гудзелі...
Мы помнім, высокай, дабротнай цаной
Мы ўзялі сягоньняшні дзень наш.

Каб гэты накал і экстаз не астыў,
І гэтая радасьць—ніколі,
Каб дымных заводаў ўзраслі карпусы
І жыта багатае ў полі.

Гараж на нагах, раньнем ў пяць хвілін,
І белазубы Строныч,
Раздаўшы нарады, як шлях запыліць
І гуд ажыве над колёнай.

Калі з урачыстасьцю танкаў жывых
Фордзоны суцішак красаюць,—
Плывуць клетракі...
Ён мне кажа:—„Ты
Сягоньня на фронце таксама!“

І песьню заводзіць пад дыскавы цок
Пагібель прынесшы дзірванам—
Ён—порахам, куляй і шалам рубцоў
Ў дзесятках баёў натаваны.

Мацнее, над гудам ўзьнімаецца сьпеў—
Тут бойка другога парадку:
Колёна пацее,
Колёна—імпэт,
Колёна—ва ўсе лапаткі...

Калі-ж адвячоркавы рэтуш ў палёх
Уп'ецца нафтавай гар'ю—
Зьлічаем трофэі ня лікам галоў
Забітых і ўзятых жыўём у палон,
А колькасьцю ўзьнятых гэктараў.

Я сквапна сачу, я вучуся штодзень,
Як фрэзаю глебу ён—словам
Драбіць ў патаемных завулках сярдзец
Сумненьняў зьляжалыя слоі.

Я шчыра і ўпарта гартую, як сталь
На верны клінок—свае строфы,
Каб ў словах высокіх і простых устаў
Падзей нябывалых профіль.

Каб золатам пленным шастаў штодня
Разгон комунарскіх бязьмежжаў,
Каб песьня мая,
Радасьць мая—
Ўставала патрэбнай і сьвежай.

Комуна імя „БВО".

Юрка Лявонны

Вясна 1931 году

Яна звычайна ідзе
туманам пахкіх кветак,
З вібрацыяй крыві
і маладосьцю дум.
На плошчах і палёх
яна раджае лета,
І зноў кіруе ў даль
вясёлую хаду.
А вось цяпер спаткаць
цудоўна і нязвычна
Вясну жывую,
упартую, як сталь,—
З прыроднае красы
сарваць аполітычнасьць,
Мінуць пялёсткі,
плот і ціхі стаў.
Так! Нашая вясна—
сягоньня бальшавічка.
Яна вядзе на бой
кагорты змагароў,
Яна ўстае сьцяной,
расьце вытворчай змычкай,
І росквітам жыцьця
цьвіце, як дзень—зарой.
Там за парканамі,
на колішняй ускрайне,
Дзе сакавітыя
ўзрасталі, сьпелі дні—
Фабрычная вясна
ў гудкі спавіла раньне
І кінула ў прастор
сузор'і навальніц.

Там сёньня праца
гонарам паўстала;
Імклівых, новых форм
дужэе ўдарны рух,
Зьнямога млявая
даўным-даўно растала,
Ня бачна ў гору ўзьнятых
бледных рук.
На кволай цытры
не заграюць пальцы,
Калі індустрыя сягоньня—
лейт-мотыў;
Па шкодніку,
па гультаі-нядбайцы
Надзейным залпам стрэльні,
колектыў!
Над дымамі,
над вежай комбінатаў,
Ажно ў палі,
дзе смаглая ральля,
Лягло аднэй
з суровых дамінантаў:
— Мы перавысіць мусім
прамфінплян!
Ток нашых воль
мільёнам-болей!—вольт стаў,
Такі разгон
калі і хто прыдбаў?
і не дарма
ўчора комсамольцы
Па антрацыт
паехалі ў Данбас;
З грудзей краіны,
з тысячы артэрый
Нясецца гул:
— Мэталі, нафту руш!..
І мы дамо
прадвесьню новай эры
Багацьці нашых руд,
багацьці нашых душ!
А за жалезным скрогатам,
за брамай,

Ляжаць абшары
стомленых дарог.
Яны стагодзьдзямі
ў палон былі забраны,
І хіба вецер
долю іх сьцяро́г.
Вясковы побыт,—
цьвілісты, нязграбны,
Рыпіць, што брудная,
сухотная арба.
Здаецца, лёс дзядоў
зацят між зуб'я грабляў,
Як саламяная
спрадвечная журба.
Вясной цяперашняй
імчым па рэйках новых;
Палова ўсіх двароў,—
глядзі,—пайшла ў колгас!
Палова ўсіх двароў...
Ды хіба зьбітым словам
Пра веліч гэтую
сказаць, як сьлед, ільга?
Напорны шлях!
Ня кашаль абразанкі,
Ня воблескі рубінаў
на страсе;
Удзень, уноччы,
увечары і ўранку
З вяроўкі хітрыкаў
кулак ману пляце.
Напорны шлях!
ня можа быць ваганьняў.
Няхай шыпяць
вужакі хцівых меж;
Калі ў цябе сумненьне
шкодай стане—
Яго, як пацерку нікчэмную,
адрэж!
Дык вось, вясна...
Між пахкіх дрэў мяцеліць,
Дзяўчат хвалюе...
Лашчыць брук і лог.

А чорны Захад
жэрлы ў нас нацэліў
І зьнішчыць прагне
скарбы перамог...
Колгас і фабрыка,
музэй і качагарка,—
На вахту ўсе!
Нам кажа стрэлка:
„Шторм".
Краіна дыхае,
цьвіце агнём і яркне,
Узьнімаючы сьцягі
вышэй ад круч і гор.
Вясна, вясна!
Развой яшчэ надай нам!
Ты чуеш, як гудзе
ўстрывожаны завод?
У восень сьпелую
паклічуць нас комбайны—
І мы зьбярэм
паўнюткі ўмалот.
. . . . . .

Мы ўсе сыны
эпохі гэроічнай—
А на шляхох
ці мала хто прыстаў?..
І вось цяпер спаткаць
цудоўна і нязвычна
Вясну жывую,
ўпартую, як сталь;
Яна-ж звычайна ідзе
туманам сноў і кветак,
З вібрацыяй крыві
і маладосьцю дум.
На плошчах і палёх
яна раджае лета
І зноў кіруе ў даль
вясёлую хаду.

19-20 мая 1931 г.
Менск.

АРТЫКУЛЫ

Л. Авербах

Баявыя задачы пролетарскае літаратуры СССР[1)]

А ці-ж мы ня ведаем, таварышы, які нязначны быў размах работы шкоднікаў у Народным комісарыяце пошты і тэлеграфу? Ці-ж ня вядома, што гэтая шкодніцкая арганізацыя перш за ўсё старалася паралізаваць працу тых зьвеньняў Наркомпаштэлю, якія былі зьвязаны з прасоўваньнем кнігі, з распаўсюджаньнем газэт, з ўсёй сыстэмай працы з друкам? Ці-ж не вядома, што гэтыя людзі знарок падбіралі кадры вясковых лістаносцаў з кулацкіх элемэнтаў вёскі?

А шкоднiцтва ў кнігараспаўсюджаньні на Украіне? Біографіі гэтых людзей таксама варта-б было прывесьці. Гэта амаль цалкам былыя пятлюраўцы, якія яшчэ пры Пятлюры працавалі ў „Кнігаспілцы“ і якія ўжо пры нас захапілі галоўнейшыя месцы ў савецкім кнігараспаўсюджаньні. Яны праводзілі працу бадай анолёгічную мэтодолёгіі шкоднікаў саўкіно. Максымальна распаўсюджваліся імі кніжкі найбольш нядобраякасныя, кніжкі нават шкодныя і нават значная колькасьць эмігранцкіх выданьняў. У той-жа час імі ў як найменшай колькасьці пашыралася наша літаратура і ў першую чаргу літаратура, неабходная для політычных масавых кампаній. Савецкі апарат, савецкае кнігараспаўсюджаньне, — а шовіністычная эмігранцкая погань на першыя месцы, а літаратура комуністычная — на задворках! прычым у гэтых шкоднікаў была і свая літаратурная політыка. Шырока прасоўваючы творы аўтараў „Пролітфронта“ (был. ваплітоўцаў), заціскалі творы вусппаўцаў.

Я павінен сказаць, што падобная ацэнка твораў нашых аўтараў шкоднікамі зьяўляецца фактам, за які мы павінны вітаць нашых маладнякоўцаў, нашых вусппаўцаў, усіх украінскіх напостаўцаў. (Воплескі).

Выкрыцьцё клясавага ворага на ідэолёгічным фронце, выкрыцьцё такіх форм яго барацьбы, як шкодніцтва, зьяўляецца адзнакай нашай сілы, адзнакай паглыбленьня нашай працы, адзнакай усьцяж узрастаючай сьпеласьці нашых кадраў, адзнакай пасьпяховага наступу пролетарскай культуры ў кожнай нацыі. Пакуль мы былі слабыя, — ці слабейшымі, — мы яшчэ не маглі ў дастатковай ступені разьбірацца ў гэтым. Зараз-жа ня толькі пасьпяхова вучымся, але таму-сяму ўжо навучыліся. Пакуль

[1)] Гл. № 8.

яшчэ ня мелі сваіх кадраў, нас маглі вельмі часта ашукваць. Зараз ужо ўзгадоўваюцца нашы кадры: ашукваць цяжэй. Яшчэ мабыць ашукваюць, але і ашукваць робіцца цяжэй, паколькі абвастрэньне клясавай барацьбы ў краіне няўхільна вядзе ня толькі да выкрыцьця намі, але часам нават і да самавыкрыцьця шкодніцкіх элемэнтаў.

Савецкую літаратуру вядуць пралетарскія пісьменьнікі

Мы, Усесаюзнае аб'яднаньне асоцыяцый пролетарскіх пісьменьнікаў, маем падставы гонорыцца тэй барацьбой, якая была праведзена нашай організацыяй у цэлым і ўсімі яе складанымі часткамі супроць контррэволюцыйных нацыяналістычных організацый, супроць усіх і ўсякіх форм выяўленьня буржуазнай ідэолёгіі. Я ўжо адзначаў вышэй пра барацьбу Беларускай асоцыяцыі супроць „Узвышша" і „Полымя", пра барацьбу ВУСПП і „Маладняка" супроць групы Іўчанка, г. зн. групы так званых нэоклясыкаў, на барацьбу РАПП супроць старога кінокіраўніцтва, — колькасьць падобных прыкладаў можна лёгка павялічыць.

Пры гэтым, вядома, не абыходзілася ў нас і без памылак, часам нават вялікіх памылак, калі, напрыклад, крытык Доленгаў часопісі ВУСПП „Гарт" выступаў у абарону ўспамінанага намі роману Іўчанка, — памылак у працы ўсіх нашых організацый і ўсяго УсеААПП у цэлым. Можна прывесьці рад прыкладаў, якія сьведчаць аб нашай недастатковай клясавай пільнасьці, аб недастатковым разгортваньні наступленьня на ворага, аб няўменьні яго дабіць. Але, ня гледзячы на ўсе нашыя шматлікія недахопы і прарывы за апошнія 2-3 гады, пролетарскія пісьменьнікі Савецкага саюзу прайшлі школу вялічэзнай полі тычнай вучобы, і гэта адна з вельмі важных прычын, якія тлумачаць тое, што мы зараз ва ўсіх рэспубліках Савецкага саюзу можам гаварыць аб вядучай ролі організацыі УсеААПП у літаратурным жыцьці. Савецкую літаратуру зараз усюды ўжо вядуць і стаяць на чале яе пралетарскія пісьменьнікі. Гэта—прыватнае выражэньне посьпехаў пролетарскай культурнай рэволюцыі ў цэлым. Гэта—прыватнае пасьведчаньне таго, як вырашаецца пытаньне: хто каго. Гэта—прыватны прыклад перамог соцыялізму. І адзінства УсеААПП ва ўсіх баёх апошняга часу зьяўляецца выражэньнем, пасьведчаньнем і прыкладам росту інтэрнацыянальнай еднасьці ўсіх пролетарскіх атрадаў нацыянальных літаратур у межах тае ці іншае аднае рэспубліканскай організацыі.

Тры гады таму назад мы зьмянілі структуру ўсяе нашай організацыі: з усесаюзнай асоцыяцый пролетарскіх пісьменьнікаў ва ўсесаюзнае аб'яднаньне асоцыяцыі пролетарскіх пісьменьнікаў. У той час былі таварышы, якія гаварылі: вы адыходзіце ад структуры адзінай організацыі, гэта прывядзе да паслабленьня інтэрнацыянальнай сувязі пралетарскай літаратуры, да росту і ўмацаваньня нацыянлістычных настрояў у паасобных зьвеньнях УсеААПП. Прайшло ўсяго 3 гады, і мы можам сказаць, што новыя організацыйныя формы нашага руху апраўдалі сябе цалкам, што мы дасягнулі за мінулы пэрыод часу значна большай спайкі ўсіх атрадаў пролетарскай літаратуры, спайкі не на словах, спайкі не формальнай, спайкі не парадна-дэкляцыйнай, але спайкі дзелавой, спайкі сапраўды таварыскай, спайкі сапраўднага збліжэньня. Сёньня УсеААПП ня проста мэханічнае злучэньне некалькіх атрадаў.

Не, сёньня мы, УсеААПП, адзіная баявая і ваяўнічая організацыя ра-

бочай клясы на літаратурным фронце. (Воплескі).

Я лічу, таварышы, патрэбным спэцыяльна адзначыць, што гэтае збліжэньне не сямёх рэспубліканскіх організацый, але ўсіх нацыянальных літаратур, у тым ліку і літаратур тых народаў, якія да Кастрычніка яшчэ нават ня мелі сваёй пісьменнасьці. Памыляюцца тыя таварышы, якія адмаўляюць магчымасьці росту расійскай пролетарскай культуры на Украіне ці, скажам, латыскай пролетарскай культры ў РСФСР. Не, нацыянальная політыка нашай партыі і, у суадпаведнасьці з гэтым, політыка нашых усеаппаўскіх організацый павінна забясьпечваць магчымасьць сапраўднага разьвіцьця любой і кожнай нацыянальнай літаратуры на тэрыторыі Савецкага саюзу. Трэба пры гэтым у парадку самакрытыкі сказаць адразу, што з працай сярод нацыянальных меншасьцяй у РСФСР у РАПП справа стаіць значна горш, чым у некаторых іншых Саюзных рэспубліках. У гэтым выражаецца пэўная недаацэнка радам нашых таварышоў нацыянальнага пытаньня, недаацэнка, якая часам мяжуецца на практыцы з вялікадзяржаўным шовінізмам.

Не зазнавацца!

Мы зараз маем надзвычайнае павялічэньне ўвагі да мастацкай літаратуры, рост зацікаўленасьці да яе, што зьяўляецца паказчыкам узмацненьня яе грамадзкага значэньня. Літаратура сапраўды зьяўляецца ў нас сёньня вельмі і вельмі вялікай зброяй выхаваньня мас. І сёньня мы ходзім крыху нават у імяніньніках, — і іменна таму мне асабліва хочацца зазначыць на найвялікшую небясьпеку зазнацца, мець галавакружэньне ад посьпехаў, — а посьпехі, якіх нельга адмаўляць, толькі падкрэсьліваюць недастатковасьць нашых дасягненьняў. Мы, таварышы знаходімся на першых этапах нашай перабудовы. І тыя посьпехі, якія мы, паўтараю, ня можам не канстатаваць, яны дадаткова падкрэсьліваюць адставаньне нашай літаратуры ад задач, якія прад'яўляюць ёй тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва ў краіне.

А між тым ужо маюцца ўсе об'ектыўныя ўмовы для таго, каб у як найкарацейшы тэрмін была дасягнута творчая гэгемонія пролетарскай літаратуры. Пытаньні барацьбы з адставаньнем і дасягненьнем гэгемоніі паміж сабой непарыўна зьвязаны. Ліквідацыя адставаньня мысьліцца намі не як ліквідацыя мастацтва і замена яго продукцыі другараднай, хутка-вытваранай продукцыяй, але якая і хутка псуецца. Перамаганьне адставаньня для нас непарыўна зьвязана з барацьбой за такое мастацтва, якое, паводле слоў Леніна, зьяўлялася-б шагам наперад у мастацкім разьвіцьці чалавецтва. І мы ведаем, што, высоўваючы лёзунг вялікага мастацтва бальшавізму, мы змагаліся за лінію партыі, за лінію партыі на правядзеньне культурнай рэволюцыі, за лінію партыі на крытычнае засваеньне ўсяго культурнага вопыту мінулага, за лінію партыі на стварэньне новай культуры і новага мастацтва рабочае клясы.

За вялікае мастацтва бальшавізму.

Мы жывем у такі час, роўнага якому ня было ў чалавечай гісторыі. Задача пабудовы соцыялізму патрабуе рашучага падвышэньня культурнага ўзроўню. І сапраўды, у нас на вачох усё больш шпарчэй, шырэй і глыбей адбываецца рост мільёнаў і мільёнаў, якія будуюць соцыялізм у нашай краіне. Ці можам мы ў такі час і ў такіх абставінах зьніжаць патрабаваньні да мастацтва? Ці можам мы ў такі час і ў такіх абставінах зьмяншаць тыя задачы, якія стаяць перад нашымі мастакамі? Не, мы можам і мы павінны з кожным днём павялічаць патрабаваньні, ставячы перад літаратурнымі працаўні-

камі пролетарыяту вялікія задачы, задачы, памеры якіх абумоўліваюцца нашым вялікім часам.

Мне ўжо даводзілася гаварыць, што гэгемонію пролетарскай літаратуры мы вызначаем ня толькі ў суадпаведнасьці з яе творчым узроўнем у параўнаньні з творчым узроўнем папутніцкай літаратуры. Падумаеш, якая перавага — быць вышэй якога-небудзь Пільняка, гэтага мізэрнага паскрэбка буржуазнай літаратуры! І нават параўнаньнем не з Пільняком, а з лепшымі прадстаўнікамі папутніцтва мы ня можам абмяжоўваць крытэрыі гэгемоніі. Мы павінны перавысіць лепшыя вузоры ўсяе мінулай літаратуры,—і мы пераконаны ў тым, што мы перавысім іх ня толькі тады, калі ўжо адамрэ клясавае грамадзтва, але зараз у нашай вялікай цяжкай барацьбе за соцыялізм. Трэба сказаць, што кадры нашых пісьменьнікаў будуць расьці тым шпарчэй і тым лепш, чым больш адказныя і сур'ёзныя задачы будзем мы перад імі ставіць.

Гаворачы аб тым, каб перавысіць лепшыя вузоры мінулай літаратуры, мы ні ў якім выпадку не разумеем пад гэтым капіраваньне клясыкаў. Наадварот, гутарка ідзе аб якасна новай літаратуры, гутарка ідзе аб якасна новым мастацтве, гутарка ідзе аб складанай частцы якасна новай культуры. Наша кляса мае свой крытэры мастацкасьці—тое, што здавалася мастацкім адным, зусім не абавязкова здаецца мастацкім для нас. І ўжо зараз, вывучаючы водзывы пролетарскіх чытачоў і аналізуючы іх інтарэсы, мы знаходзім хуткае формаваньне новага эстэтычнага густу, эстэтычнага густу пролетарыяту. З гэтага пункту гледжаньня барацьба за гэгемонію і нашае абмяркаваньне пытаньняў творчага мэтоду зьяўляецца аднэй з форм клясавай барацьбы на літаратурным фронце. Гэта ня проста дыскусія аб тэхніцы літаратурнага пісаньня і аб тым, якімі прыёмамі адлюстраваць наш час. Не, абмяркоўваючы пытаньні творчага мэтоду, мы ў складанай і спэцыфічнай форме змагаемся за якасна новае аблічча нашай клясавай літаратуры.

Тэмпы набліжэньня творчай гэгемоніі—пытаньне нашай літаратурнай палітыкі. Мы павінны ўмець весьці за сабой папутніка ня толькі з-за таго, што правільна праводзім партыйную лінію ў мастацкай літаратуры, што ў нашых творах адлюстроўваюцца лёзунгі партыі, што мы бальшавіцкая арганізацыя. Мы тады па-сапраўднаму будзем весьці за собой папутніцкіх пісьменьнікаў, калі будзем даваць і дамо творы, якія выразна стаяць на больш высокім мастацкім узроўні, чым творы асноўных папутніцкіх пісьменьнікаў. І іменна тады па-сапраўднаму будзе замацавана і падмацавана тая вядучая літаратурна-палітычная роля пролетарскай літаратуры, якая ёсьць ужо, бяз сумненьня, і сёньня.

Некаторым здаецца, што абслугоўваньне бягучых палітычных кампаній, абслугоўваньне дня, так сказаць, б'е па барацьбе за мастацкую якасьць. Гэта найвялікшы забабон, які адлюстроўвае ўяўленьне аб канонах буржуазнага мастацтва, як аб спэцыфікуме мастацтва наогул. Наша мастацтва—іменна мастацтва якасна не падобнае на мастацтва мінулых гадоў—расьце тады, калі і—маса нашых пісьменьнікаў уключаецца ў практыку соцыялістычнага будаўніцтва, калі маса нашых пісьменьнікаў вучыцца на абслугоўваньні дня, калі гэтае абслугоўваньне дня разумеецца не як творчасьць паводле календарнай даты, не як вульгарнае пісаньне одаў, што прапаведвалася літфронтаўскімі тэорэтыкамі, але як неабходнасьць быць наўзроўні найвялікшай практыкі нашых дзён, але як уменьне ўсьведамляць гэтую практыку, але як уменьне разьбірацца ў найвялікшым перапляценьні розных і супярэчных тэн-

дэнцый у нашай рачаіснасьці. Мы вучобай у практыкі клясы для практыкі клясы можам даць надзвычай шмат і для нашага чыста-літаратурнага разьвіцьця, для правільнай пастаноўкі пытаньняў творчага мэтоду, для правільнага вызначэньня творчых шляхоў пролетарскай літаратуры.

Для таго, каб стварыць такое вялікае мастацтва бальшавізму, нам трэба яшчэ больш ўзмацніць нашу працу па стварэчьні новага тыпу пісьменьніка.

Ня толькі твар нашага пролетарскага пісьменьніка, але нават і воблік папутніцкага пісьменьніка, наогул ужо ў шмат чым розьніцца ад тыпу старога пісьменьніка. Наш пісьменьнік ужо рэдка падобен на нейкага лахматага мэсіяша, які быў вельмі распаўсюджаны ў мінулым на богэмца і звыш індывідуаліста. У нас ужо выразна выявіліся рысы новага тыпу пісьменьнікаў. Але мы яшчэ далёка не закончылі выпрацоўкі пісьменьніка, які зьяўляўся-б ня нейкім вольным стралком, але профэсыянальным рэволюцыянэрам, які ўладае зброяй мастацкай літаратуры. Словы Леніна аб профэсыянальных рэволюцыянарах бальшавіках, аб іх характары і аб стылі іх дзейнасьці,—яны павінны зьяўляцца і для нас кіруючымі, якія павінны ў галіне літаратуры змагацца за тып пісьменьніка, профэсыянальнага рэволюцыянэра рабочае клясы.

Што для гэтага патрэбна? Перш за ўсё трэба, каб кожны наш пісьменьнік быў па-сапраўднаму ўключаны ў практыку сёньняшняй барацьбы, у практыку культурнай рэволюцыі, у практыку соцыялістычнага будаўніцтва. Сьмешна і шкодна было-б рабіць спробы дакладна рэглямэнтаваць і загадзя вызначаць усе тыя формы, у якіх можа і павінна адбывацца падобнае ўключэньне пісьменьніцтва ў сапраўдную практыку.

Другая профэсія, напр., аб якой у радзе рэспублік ужо ішлі спрэчкі, бязумоўна, толькі карысна для вельмі вялікай колькасьці нашых пісьменьнікаў, але нічуць не абавязкова. Будзе недарэчнасьцю думаць, што калі пісьменьнік ня мае другой профэсіі, то значыцца ён той самы тып вольнага стралка, супроць якога мы павінны змагацца. Пытаньне аб другой профэсыі не такое ўжо простае. І галоўнае тут у тым, каб умець падыйсьці да кожнага пісьменьніка ў паасобку, каб ставіць гэтае пытаньне не ў парадку устанаўленьня абстрактных нормаў, але цалкам конкрэтна.

Некаторым здаецца, што унівэрсальным мэтодам уключэньня пісьменьнікаў у будаўніцтва соцыялізму зьяўляюцца брыгады. Давайце моў хутчэй разьмяркуем усіх пісьменьнікаў на брыгады, давайце паскорым тэмпы працы гэтых брыгад, давайце ўзмоцнім перакіданьне пісьменьнікаў з аднаго заводу на другі. Сёньня на Балахне, заўтра на Пуцілаўскім, пасьля заўтра ў Кузбасе і г. д. і. т. п. У такіх выпадках часта ня столькі дапамагаюць працы і самі вучацца, колькі робяць крыку ў газэтах. У шмат каго справа іменна ў гэтым: пабудуць на заводзе дні са тры, пасьля дзён шэсьць вершы пішуць, а пасьля тыдні тры ці шэсьць гамоняць аб гэтым ва ўсім друку. Вядома, шмат каму брыгады прынесьлі і яшчэ прынясуць у будучыне вялікую дапамогу. Вядома, адмаўляцца ад брыгад няма ніякага сэнсу, але трэба ўмець адрозьніваць работу ў брыгадах і работу брыгад ад налётаў на прадпрыемствы, ад вялікай мітусьні і малога часу на абмяркаваньне, усьведамленьне і мастацкае выкарыстаньне накопленага матэрыялу. І мне здаецца, што ў некаторых пісьменьнікаў брыгадная шуміха прыкрывае ня толькі самарэкляму, але і выяўляе іх уцяканьне ад задач барацьбы за вялікае мастацва, за літаратуру, якая сапраўды варта рабочае клясы. Аднак,

паўтараю, брыгады пры іх правільнай організацыі, могуць быць выкарыстаны для перабудовы старога тыпу пісьменьнікаў.

Заклік рабочых-ўдарнікаў

Асабліва шмат чаго, што характарызуе новы тып пісьменьніка, мы знаходзім у закліканых у літаратуру рабочых-ўдарнікаў. Вельмі шмат якія таварышы ставяць пытаньне аб пэрспэктывах іх профэсіяналізацыі ў літаратуры. У гэтай справе асабліва будзе шкоднай якая-б там ні была тарапліваcьць. Мы будуем соцыялізм, які здымае і ўжо пачынае здымаць супроць-легласьць паміж працай разумовай і фізычнай.

З пункту гледжаньня гісторычнага заўтра пытаньне аб профэсыяналізацыі будзе выглядаць зусім інакш, чым яно стаіць сёньня. Да таго-ж у нас бывае так, што бяруць добрага токара па мэталі і быццам-бы ў інтэрэсах яго пісьменіцкага росту сьпяшаюцца здымаць яго з вытворчасьці. Я пераконаны ў тым, што найчасьцей гэта робіцца пакуль зусім дарэмна і няправільна... (Галасы: „правільна“).

Заклік рабочых-ўдарнікаў сапраўды зьяўляецца гісторычнай тычкай, ад якой распачынаецца новы этап разьвіцьця пролетарскай літаратуры. Няма ніякага сэнсу гаварыць пра значэньне закліку. Гэта было-б дарэмнай тратай часу. Куды важней спыніцца на пытаньні аб тым, як засвоены гэты заклік у нашых літаратурных організацыях, як пастаўлена наша праца з закліканымі ўдарнікамі. Мне здаецца, што ў нас яшчэ маецца шмат крыку аб значэньні закліку, і не хапае практычнай дзейнасьці, каб яго замацаваць, каб яго сапраўды практычна выкарыстаць, вылучыць з ліку закліканых, якія найбольш даюць і якія найбольш абяцаюць. Хто, напрыклад, з нашых лепшых пісьменьнікаў штодзённа працуе з закліканымі ўдарнікамі? А без такой работы мы, вядома, не забясьпечым іхняга росту. Мы павінны стварыць такое становішча, пры якім закліканыя ў літаратуру рабочыя-ўдарнікі былі-б на справе забясьпечаны творчай дапамогай з боку ўсіх нашых і лепшых пролетарскіх пісьменьнікаў. (Воплескі).

Я думаю, таварышы, што каб мы хоць крыху вызваліліся ад тае засядацельскай мітусьні, якая вельмі часта пануе ў нашых літаратурных організацыях—а няма чаго грэх утойваць, у нас любяць рабіць політыку часам нават больш, чым у партыйных організацыях, копіруючы іх цалкам ня крытычна, і калі-б мы у першаю чаргу ліквідавалі трапатню пісьменьніцкіх кадраў на ўсіх пасяджэньнях,—то няма сумненьня ў тым, што мы вызвалілі адразу шмат часу для працы з ударнікамі. Нашы організацыі павінны з гэтай мэтай перагледзець нагрузку кожнага выяўленага пролетарскага пісьменьніка, і калі хто-небудзь, пасьля падобнага перагляду яго нагрузкі і дакладнага вызначэньня організацыяй кругу ягоных абавязкаў перад ёю, ня будзе працаваць з ударнікамі, то ён выкрые сябе як чалавек, органічна чужы прынцыпам і асновам нашага УсеАПП'аўскага руху. Зараз мы маем далёка ненормальнае становішча, калі нашы асноўныя пісьменьнікі траціць шмат часу на наведваньне і на выступленьне на такіх сходах, на якіх няма вялікай патрэбы. Паглядзеце і на Фадзеева, і на Панфэрава і на Лебядзінскага, і на Кіршона, і на Ілеша і на ўсіх іншых. Ці ня было-б куды больш правільным разгрузіць іх ад таго сяго, каб прымацаваць да іх 1—2 ударнікаў... (Галасы з месц: „Мала“). Можна, вядома, і 20 прымацаваць, але што атрымаецца? Я лічу, што лепш прымацаваць 2, а то і 1, будучы пры гэтым пераконаны ў тым, што пісьменьнік перадасьць ударніку свой творчы

вопыт і дапаможа яму ў ягоным літаратурным разьвіцьці. Я думаю, ленінскае патрабаваньне: „лепш менш, ды лепш", і тут зьяўляецца цалкам правільным. У гэтай справе, таварышы, галоўная небясьпека— гэта літаратуршчына. У нас часта навучаюць рабочых-ударнікаў разьбірацца ў літаратуры не на аснове барацьбы за выкананьне прамфінпляну, скажам, ня выходзячы з іх вопыту, ня ўзьнімаючы іх агульнакультурны ўзровень, але пачынаюць навучаньне ў гурткох з таго, што вось, моў, РААПП змагаўся з тымі-та і тымі, і яшчэ з тымі-та і тымі, і вось яшчэ з такімі і такімі, што пераверзеўшчына, моў, кепская, і што Бяспалаў нічуць ня лепшы і г. д. і т. п. (сьмех). У парадку літаратурнай самаадукацыі ўсё гэта ніколькі не зьяўляецца лішнім, але кепска, калі гэта ідзе за лік галоўнага, за лік асноўнага, па сутнасьці справы не заклікаюць людзей у літаратуру на практыцы, але іх ад яе адштурхоўваюць.

Эстэцкі падыход можа загубіць заклік ўдарнікаў. Цікавы ў гэтым пляне нядаўна выпушчаны Ізогізам альбом ўдарнікаў. У ім зьмешчаны вялікі лік фотоздымкаў, у тым ліку і тых ударнікаў, некаторыя з якіх закліканы зараз у літаратуру. І зазначана: гэта ўдарнік такі-та з такога-та заводу, а гэта другі ўдарнік („імя рэк") з другога заводу. Каштуе гэты альбом, калі ня мыляюся, 3 руб. 50 кап. Зразумела, што да рабочых мас ён ня дойдзе, і думаецца, ня ўсе ў ім сфотографаваныя таксама згодзяцца страціць такую суму грошай на гэта выданьне, што пасыўна адлюстроўвае, але нікога не арганізуе і нікога нічаму не навучае. Падобныя выданьні зусім не гавораць аб барацьбе за ўдарніцтва, але прыклад наскрозь эстэцкага адыгрываньня задзіўляючага росту комуністычных форм працы. І, напэўна, у Ізогізе той-сёй мяркуе, што яны выканалі „соцыяльны заказ". Ударнікі? Калі ласка! вось альбом аб ударніках... (Кіршон: „Не хапае толькі літфронтаўскіх вершаў"). Гэта правільна, варта толькі дадаць масавыя ўзоры політычнай продукцыі паводле літфронтаўскіх рацэптаў, і атрымаецца цалкам гармонічны і закончаны твор, які ў роўнай ступені нічога агульнага ня мае з барацьбой за промфінплян, ні састварэньнем вялікага мастацтва бальшавізму.

Падобная альбомаўшчына мае месца і ў працы з ударнікамі ў галіне мастацкай літаратуры. Ці-ж не спатыкаемся мы тут з сюсюканьнем, з непрызваітымі пахлебнымі гуркамі аб тым, што вось, моў, якія вы закліканыя ўдарнікі, слаўныя, якія вы харошыя, толькі пра вас мы і лятуцелі, толькі за вас мы ўсе і змагаліся і г. д. і т. п. гуркі, ад чаго закліканым ударнікам нічуць не лягчэй.

Зразумела, што сёньня нельга ўжо судзіць толькі на падставе дэкляратыйных заяў таго ці іншага таварыша, тэй ці іншай арганізацыі.

Хто скажа сёньня, што ён супроць закліку? На словах ўсе за заклік. Хто згодзіцца расьпісацца ў тым, што ён опортуніст? На гэта згаджаюцца ці па дурнаце, ці ў выніку выкрыцьця на практыцы. У галіне закліку рабочых-ударікаў опортуністычная недаацэнка гэтай справы выяўляецца пераважна ня ў форме адмаўленьня неабходнасьці закліку, але ў характары, тоне і зьмесьце работы з закліканымі ўдарнікамі. Іменна ў тым, як працуюць з ударнікамі, што ім даюць і што ад іх бяруць, іменна ў гэтым сказваецца ўменьне па-бальшавіцку выкарыстаць заклік ці опортуністычна яго адмаўляць, ці змазваць.

Трэба, вядома, уводзіць рабочых ударнікаў ва ўсе пытаньні нашага літаратурнага жыцьця, нашай літаратурнай політыкі, нашых творчых дыскусій. Заклік рабочых-ударнікаў павінен значна ўзмацніць

рабочае ядро ў пролетарскай літаратуры і на справе ўтварыць вядучую ролю рабочага ядра ў адносінах да ўсіх нашых пісьменнікаў.

Рабочыя-ўдарнікі павінны адчуваць сябе ва УсеААПП не выпадковымі гасьцямі, а гаспадарамі, а мы, пасланыя партыяй на працу ў галіне літаратуры, павінны гаварыць з гэтымі ўдарнікамі ня мовай сюсюканьня, але як з баявымі таварышамі, якія разам з намі ў поўнай меры адказваюць за літаратурны фронт, перад нашай партыяй, перад нашай клясай. Ня толькі мы, УсеААПП, адказваем за тое, як будзе праведзены заклік ударнікаў, і як ён будзе рэалізаваны, але ўжо і тыя новыя пласты рабочых-ударнікаў, якія ўліліся ў нашу арганізацыю, павінны адчуваць на сабе адказнасьць за ход клясавай барацьбы ў галіне літаратуры. Рабочыя-ўдарнікі павінны адчуваць на сабе адказнасьць за тэмпы перабудовы нашай арганізацыі, за тэмпы росту пролетарскай літаратуры, за тэмпы разгортваньня соцыялістычнага наступу ў нашай галіне.

Неаднароднасьць пролетарскай літаратуры, рабочае, унутранае папутніцтва.

У прыватнасьні і асабліва мне хочацца адзначыць будучую ролю рабочых-ударнікаў у справе ўзгадаваньня і пераўзгадаваньня таго ўнутранага папутніцтва, якое маецца і ўнутры нашых усеаппаўскіх арганізацый. І тут асабліва патрабуецца індывідуалізаваны падыход да кожнага пісьменьніка ўнутры-папутніцкага толку. Мы павінны дзёрціся за тое, каб наш унутраны папутнік хутчэй станавіўся сапраўды пролетарскім пісьменьнікам.

Для гэтага трэба на справе дапамагаць іх перабудове; і якія-ж мы працаўнікі пролетлітаратурнага руху, калі мы ня здолеем стварыць гэтым пісьменьнікам таварыскую атмосфэру, якая-б спрыяла іх шпарчэйшай бальшавізацыі і ідэйна-мастацкаму росу.

Праўда, у нас маюцца такія, якія-б надзвычай хацелі разбавіць УсеААПП пісьменьнікамі, якія яшчэ ня сталі пролетарскімі. Я выказваю тут сваю асабістую думку, але я лічу патрэбным адзначыць, што ў гэтых адносінах некаторыя нашы організацыі крыху занадта вольна падыходзяць да вызначэньня свайго складу і да прыёму новых членаў. У гэтых адносінах я зьяўляюся прыхільнікам большай асьцярожнасьці (воплескі). Я, як відаць, тут трапіў ва ўкраінскія рознагалосьсі, бо мне аплёдавала адна частка ўкраінскай дэлегацыі (сьмех). Але ў мяне, таварышы, цалкам ня было жаданьня распальваць украінскія спрэчкі... (Мікытэнка: „2—3 лішніх прынялі, гэта дакладная даведка“). Для мяне, таварышы, асноўнае ня ў тым, 2, ці 3, ці 20, ці 30 унутраных папутнікаў ва ўсеааппаўскай організацыі, забясьпечце разуменьне таго, што гэтыя пісьменьнікі яшчэ ня пролетарскія, каб ня было ніякіх недагаворанасьцяй у адносінах з імі, каб усё гаварылася зусім проста і шчыра—і гэтым таварышом будзе лягчэй працаваць, і лінія ўсёй організацыі будзе больш правільнай. У нас ёсьць розныя ўнутраныя папутнікі. Ёсьць такія, якія ідуць да нас, але-ж якія яшчэ да канца ня сталі нашымі. Ёсьць такія, якія пахіснуліся ў сёньняшніх абставінах, у той час, калі яшчэ ўчора былі цалкам вытрыманымі пролетарскімі пісьменьнікамі. Было-б вялікай недарэчнасьцю і дзяцінствам проста адкінуць гэтых людзей на бок. Гэта было-б комчванствам самага вульгарнага характару. Гэта было-б адобраньнем лініі найменшага супраціўленьня. Выключыць лёгка, але як перарабіць? І ў парадку самакрытыкі я лічу неабходным адзначыць, што адным з галоўнейшых прабелаў у працы расійскай асоцыяцыі пролетарскіх пісьменьнікаў зьяўляецца наша не-

дастатковая ўвага да такіх пісьменьнікаў, як, напрыклад, Лугаўской, ці Багрыцкі, якіх мы, прыкладна, год таму назад прынялі ў свае рады, але не акружылі патрэбнай ўвагай. Трэба, таварышы, на справе берагчы кожнага пісьменьніка, знаходзячы да яго асаблівы падыход і гаворачы з ім асаблівымі словамі.

Што азначае берагчы пісьменьніка? Берагчы—гэта азначае прынцыпова крытыкаваць. Некаторым здаецца, што берагчы—гэта значыць, наадварот, паблажліва адносіцца да недахопаў і абыходзіцца с пісьменьнікам як найбольш лібэральна. Мы думаем, што толькі там пісьменьніка сапраўды берагуць, толькі там пісьменьніку па-сапраўднаму дапамагаюць перабудоўваць сваю работу—а дапамагаць перабудоўваць і азначае берагчы пісьменьніка,—дзе на справе забясьпечваюць прынцыповую крытыку у ягонай творчай продукцыі.

Іменна з гэтым справа стаіць у нас надзвычай кепска.

Тварам да конкрэтнай крытыкі.

У галіне крытыкі мы маем у нашым руху бадай ці не прарыў. Нават,—калі пакуль што не гаварыць пра якасьць працы большай часткі нашых крытыкаў,—дык верхам нядобрастаннасьці зьяўляецца ўжо і тая колькасьць твораў, якая падлягае ацэнцы ў нашых асноўных часопісях. Большая частка кніжок праходзіць цалкам бяз водзываў. У выніку шмат што праходзіць каля нас, у выніку мы шмат чаго праваронваем, шмат чаго шкоднага прапушчаем і шмат чаго новага і цікавага не адзначаем.

За апошні час зьявілася ня толькі шмат новых твораў, але шмат новых прозьвішчаў, новых, раней невядомых, пісьменьнікаў, у тым ліку і пісьменьнікаў ужо наяўна і асабліва значных. Вазьмеце, напрыклад, у галіне пролетарскай прозы „Июнь—Июль“ Мітрафанава, ці „В поисках героя“ Лаўрухіна. Як бы мы ні разыходзіліся, наколькі-б мы ні лічылі патрэбным іх крытыкаваць, але гэта, бязумоўна, творы выдатныя. А як адклікнулася на іх наша крытыка?. Па сутнасьці ніяк. А ў нас-жа ёсьць далей такія рабочыя поэты, якія выпрадзілі цэлы рад старых поэтаў комсамольцаў. Гэта так (голас з месца: правільна). Той, хто гэта адмаўляе, той выражае максымальнае неразуменьне ходу разьвіцьця пролетарскай літаратуры (воплескі). Але ў нас, на жаль, ёсьць такія таварышы, якія вельмі злуюць за тое, калі ім паказваюць памылкі.

Прыпомніце інцыдэнт паміж Трошчанкам і Жаравым. Я ня ведаю, наколькі мае слушнасьць т. Трошчанка, але ня сумняваюся ў тым, што частушкі Жарава ў „Комсомольской Правде“ ўяўляюць сабой разбэшчанасьць і брыдоту... (Жараў: а артыкул Косарава што ўяўляе?). Тав. Косарава да гэтай справы і ў гэтай сувязі прыцягваць няма чаго, у яго лісьце ня ішло і ня было гутаркі аб тым, што нібы ў нас няма такіх рабочых-пісьменьнікаў, якія ўжо дарасьлі да пэўнай вышыні (Жараў: а я казаў?). У мяне няма пад рукой цытат з тваіх выступленьняў, і я з гэтай прычыны асабліва ня сумую. І дарэмна ты, тав. Жараў, крыўдзішся, бо ты стары раппавец, ты ў арганізацыі бадай не спачатку яе існаваньня, у цябе ёсьць усе даныя для таго, каб ісьці ў перадавых атрадах пролетарскай поэзіі, а не конкураваць з рабочымі-поэтамі, якія выяўляюцца. (Воплескі).

Іменна слабасьць нашай крытыкі ў шмат чым тлумачыць кепскую наладжанасьць абмену творчым вопытам кадраў пролетарскіх пісьменьнікаў. І нават тое, што мы часта ўжо робім, намі недастаткова рэалізуецца. Возьмем, напрыклад, раппаўскія вытворчыя нарады. Сэкратарыят РАПП праявіў найвялік-

шую халатнасьць і аднёсься проста безадказна да справы выданьня стэнограм усіх гэтых вытворчых нарад: і тэатральнай, і нарысіцкай, і поэтычнай. Між тым гэтыя нарады вельмі важныя ня толькі з таго пункту гледжаньня, што яны маглі-б даць і сапраўды далі вялікую колькасьць каштоўнага матэрыялу, але яны важны і прынцыпова, як прыклад ломкі старых звычак саматужнай пісьменьніцкай працы, як прыклад колектыўнага абмеркаваньня агульных для ўсіх пісьменьнікаў пытаньняў, як, напрыклад, шуканьне шляхоў да новага стылю ўсёй пісьменьніцкай дзейнасьці. Невыпадкова, іменна, на гэтых вытворчых нарадах так шмат гаварылася аб недахопах нашай крытыкі. Зараз ўжо стала модным: хто толькі ня лае крытыку. І тут трэба адрозьніваць. Ня ўсякая крытыка нашай крытыкі зьяўляецца марксыцкай крытыкай недахопаў пролетарскай крытыкі. Вельмі часта за крыкамі аб недахопах крытыкі хаваецца нездавальненьне ідэйнай гэгемоніяй марксызму, вельмі часта за крыкамі аб тых ці іншых, нават правільна паказаных, памылках крытыкі хаваецца ня што іншае, як барацьба супроць бальшавіцкай ініцыятыўнасьці, вельмі часта фронда супроць крытыкі зьяўляецца не жаданьнем падняць нашу марксыцкую крытыку на большую вышыню, але атакаю з клясава-варожага лягеру.

Прыслухайцеся і ўдумайцеся ў гутаркі тых, якія асабліва крытыкуюць нашу крытыку з лягеру папутніцкіх пісьменьнікаў. Найчасьцей гэта не выражэньне нездаволеньня частым няўменьнем разабрацца ў спэцыфікуме літаратуры ці кепскім эстэтыцкім густам таго ці іншага крытыка. На жаль, для іх ня ў гэтым сутнасьць справы. Сутнасьць справы для іх зводзіцца да жаданьня, каб як мага паслабіць ідэолёгічныя запатрабаваньні і зусім зьнішчыць тыя палітычныя крытэрыі, якімі—вельмі частаня ўмела—кіруецца і павінна кіравацца наша крытыка.

Мы ня маем нахілу хоць у найменшай ступені зьменшваць хваробы нашай крытыкі і адмаўляць яе наогул і цалкам надзвычай нізкі тэорытычны ўзровень. Але мы, ўсесаюзнае аб'яднаньне асоцыяцый пролетарскіх пісьменьнікаў, крытыкуем марксыцкую крытыку не за яе палітычную накіраванасьць і бальшавіцкую нецярпімасьць: гэтыя якасьці мы вітаем і наша крытыка ідзе перш за ўсё па лініі ўказаньняў на недастатковую бальшавіцкую нецярпімасьць і на нездавальняючую палітычную выразнасьць у большай часцы ацэнак твораў сучасных пісьменьнікаў.

Асобна трэба паставіць пытаньне ня толькі аб крытыцы, але і аб літаратуразнаўстве, аб літаратурнай тэорыі паколькі без павялічэньня ўвагі да тэорыі нам не палепшыць марксыцкай крытыкі.

Творчая дыскусія і падвышэньне тэорытычнага ўзроўню

Зазначэньні тав. Сталіна на адставаньне тэорыі ад практыкі цалкам адносяцца і да галіны літаратуразнаўства. Асноўнай тэорытычнай задачай, якая стаіць перад намі, зьяўляецца неабходнасьць крытыкі Плеханава з пункту гледжаньня новага ленінскага этапу ў разьвіцьці дыялектычнага матэрыялізму, у які мы зараз уступілі. Значэньне плеханаўскай спадчыны для разьвіцьця марксыцкага літаратуразнаўства надзвычай вялікае. Але мы да гэтага часу недаволі крытычна адносіліся да Плеханава. І гэта, вядома, было аднэй з праяў уплыву дэборыншчыны на нашыя тэорытычныя кадры. Дэборыншчына, уплыў якой усё-ж на радзе іншых вучасткаў ідэолёгічнага фронту быў больш істотным і сур'ёзным, чым на нас. Але факт застаецца фактам. Да Плеханава мы сапраўды аднесьліся недаволі кры-

тычна і, па сутнасьці справы, яшчэ ў сур'ёз не распачалі ленінскай крытыкі яго літаратурных работ.

Формулёўка, якая была аднойчы дадзена ў часе дыскусіі з Пераверзевым у часопісі „На літпосту", формулёўка „За плеханаўскую ортодоксію ні ў якай меры не павінна апраўдвацца якімі-б там ні было спасылкамі на тое, што ў дыскусіі з Пераверзевым мы павінны былі яму супроцьпаставіць Плеханава і таму мелі права даць падобны лёзунг. Не. Гэты лёзунг быў і ў той час ўжо памылковым. Я лічу патрэбным сказаць пра гэта з усёй патрэбнай выразнасьцю і рэзкасьцю. Усе мы лічым, што наша тэорытычная лінія была ў асноўным правільная. Некаторыя супярэчаць гэтаму і зараз. Але мы, паўтараю, лічым, што ня толькі наша літаратурна палітычная і творчая, але і тэорытычная лінія была ў асноўным правільнай. Мала сказаць, што, моў, наша лінія забясьпечыла ўздым пролетарскай літаратуры на больш высокую ступень свайго разьвіцьця,—няма патрэбы ўвільваць ад адказу на пытаньне. Ня гледзячы на ўсе памылкі, ужо раскрытыкаваныя, ці якія яшчэ не раскрытыкаваны, тэорытычная лінія РАПП і УсеААПП была ў асноўным правільнай. (Воплескі). Гэтым, вядома, не зьмяншаюцца нашы памылкі, але, наадварот, іменна такая пастаноўка пытаньня ставіць перад намі запатрабаваньні яшчэ большыя. Мала адзначыць памылкі, трэба ўмець іх раскрытыкаваць. Мала раскрытыкаваць адны гэтыя памылкі, трэба разабрацца ў тым, адкуль яны растуць, трэба ліквідаваць магчымасьць іх далейшага зьяўленьня. Трэба сачыць за тым, ці ня зьвязаны гэтыя памылкі паміж сабой, ці няма небясьпекі ўтварэньня цэлай сыстэмы памылковых поглядаў.

Шмат нам дапаможа праца па пераглядзе дэбораншчыны, не агул у галіне фізёлофіі, але ўплыву дэборыншчыны на нас, на нашу работу, на нашу галіну.

Аб бальшавіцкай самакрытыцы і цытатных справах прыват-доцэнтаў

Большая частка прыват-доцэнтаў, якія спэцыялізуюцца на крытыцы нашых памылак і якія ператвараюць гэта ў сваю адзіную прафэсыю, думаючы, што гэтым самым яны будуць мець, ці маюць якіясьці адносіны да літаратуры, займаюцца гэтай крытыкай надзвычай плоска, вульгарна і часта нават нядобрасумленна. Гэта тлумачыцца тым, што іх тэорытычная крытыка амаль заўсёды зьяўляецца зброяй, ці прыкрыцьцём палітыканскай грызьні. Дзеля гэтага яны заўважаюць найдрабнейшыя памылкі Ярмілава і Лебядзінскага і ў той жа час прапушчаюць і не зьвяртаюць патрэбнай увагі на сур'ёзныя памылкі іншых таварышоў з нашага Усеаапаўскага кіраўніцтва. Вось, напрыклад, кніга Афінагенава „Творчы мэтод тэатру". Таварыш Афінагенаў, стары напоставец, але трэба проста сказаць, што на радзе палажэньняў ягонай кнігі ляжыць адбітак стопроцантнага ўплыву дэборыншчыны. Калі-б Афінагенаў сам гэтага не зразумеў, калі-б ён ня прызнаў сваіх памылак, калі-б ён ня выступіў з самакрытыкай, мы-б яго адсеклі ад нас. Мы-б сказалі: „ты дэборынствуеш, нам з табой не па дарозе". Але мы ўжо дарасьлі да зразуменьня хоць бы таго, што вельмі лёгка адсекчы, але куды цяжэй дапамагчы выправіцца, што лёгка адсекчы, але цяжэй даць крытыку па сутнасьці, што адсекчы лёгка, а цяжэй дапамагчы па-бальшавіцку самакрытыкавацца. Наша лінія заключаецца ў тым, каб на падставе поўнай прынцыповай яснасьці і бальшавіцкай нецярпімасьці людзей выпраўляць, дапамагаць выпраўляцца ім самім і кадры не разбазарваць.

Вось, напрыклад, на т. Ярмілава вешаюць сабак больш чымсьці на каго іншага. На гэта ёсьць падставы. У яго былі вялікія памылкі, але ён ўжо напісаў самакрытычны артыкул, ён напісаў яго сумленна, ён сваіх памылак не абараняе, ён сябе не супроцьстаўляе бальшавіцкай крытыцы. Ярмілаў разумее, што яму патрэбна, як ўсім нам, ня толькі вучыцца, але ў тым-сім і перавучвацца. Аднак, Ярмілаў працуе з намі ня першы год. Ён праверaны нашым рухам не ў аднэй дыскусіі з „Літфронтам", але ў радзе літаратурных дыскусій, тых дыскусій, у якіх формавалася і сформавасася лінія нашага руху. Калі-б ён, Ярмілаў, паставіў сябе ў палажэньне інтылегента, пакрыўджанага крытыкай з боку пролетарскай організацыі, вядома, для яго не знайшлося-б месца ў кіраўніцтве РАПП. Але гэтага няма. І пакуль гэтага няма, тав. Ярмілаў будзе, як раней, членам нашага сэкратарыяту.

Тое-ж самае можна сказаць што да тав. Лебядзінскага. Не падлягае сумненьню, што ў яго былі памыллі, што ён зусім нядаўна, скажам, памыліўся ў ацэнцы апошніх твораў Дзям'яна Беднага. Але мне здаецца, што рад сваіх памылак Лебядзінскі ў № 1 часопісу „РАПП", —яшчэ ня ўсе памылкі, але цэлы рад іх—крытыкуе больш сур'ёзна і грунтоўна, чым ўсе разам ўзятыя прыват-доцэнты, якія крычалі аб яго правым ухіле. І калі-б Лебядзінскі не заняўся такой самакрытыкай, ён, вядома, не астаўся-бы ў кіраўніцтве нашым рухам. Але Лебядзінскі сумленна і па-бальшавіцку займаецца самакрытыкай. Гэта адзін з каштоўнейшых пролетарскіх пісьменьнікаў, гэта адзін з найбольш выверaных кіруючых работнікаў пролет - літаратурнага руху

Мы, таварышы, ведаем з якімі цяжкасьцямі ў кожнай ідэолёгічнай галіне,—у прыватнасьці і асабліва ў нашай галіне, скалачваюцца кадры. З якімі цяжкасьцямі ствараецца і расьце ў такіх галінах партыйнае ядро, з якімі цяжкасьцямі і з якімі адсевамі адбіраюцца ў гэтых галінах людзі, здольныя весьці бальшавіцкую політыку. І мы адважна разгортваем самакрытыку; яшчэ недастаткова разгарнулі, але разгортваем і будзем разгортваць, ведаючы, што самакрытыка—між іншым—зброя вялікага спрацоўваньня кадраў, большай колектыўнасьці ў працы, большага ўмацаваньня склаўшагася ядра, а нічуць ня тое разбазарваньне людзей, да якога насштурхаюць прыват-доцэнты, тыпу тых нямецкіх студэнтаў, аб якіх часта гаворыць і паўтарае тав. Фадзееў.

Гэтыя прыват-доцэнты ўжо прынесьлі шмат шкоды нашаму руху. Пры ўсіх рысах падабенства, яны таксама розныя. Вось, напрыклад, Татулаў. Гэта прыват-доцэнт клясычны, бяспрыкладны, стопроцантны і ортодоксальны. Цікава, што ў часе дыскусіі з „Літфронтам" ён казаў, гэта друкавалася ў часопісі „На рубеже Востока", што, мо ў, трэба-ж, таварышы, больш далікатна абыходзіцца з блёкам, гэта значыць з „Літфронтам". Бо ў ім знаходзяцца такія буйныя марксысты, як Бяспалаў, Гельфанд, і Зонін. (Сьмех). Прыват-доцэнт прыват-доцэнта бачыць здалёку! Гэтай заявай Тутулаў вычарпальна ахарактаразаваў, як самога сябе, таксама і вядомую перaверзеўскую тройку [1]).

Але прыват - доцэнты бываюць ня толькі такія лашчоныя, як Татулаў. Бываюць прыват-доцэнты

[1]) З гэтай тройкі трэба зараз вылучыць таварыша М. Гельфанда: ён сумленна адышоў ад Перaверзева, ён прынцыпова пераглядае сваё літфронтаўскае мінулае, ён прабуе на справе быць карысным пролетарскай літаратуры. Л. А.

гаваркія. Такім звыш гаваркім прыват-доцэнтам зьяўляецца Ражкоў, які ўчора тут выступаў. Калі яму было дадзена слова, я крыкнуў тав. Стаўскаму, што гэта „последняя туча рассеянной бури". Гэта было, вядома, пачварным перавялічэньнем наконт „тучы" і наконт „буры". Никакая это не туча, а сплошное облако без штанов. (Сьмех).

Якім тонам выступаў гэты разьвязны прыват-доцэнт? Ён літаральна сказаў: патрэбна-ж выкарыстаць усе легальныя магчымасьці. Ён гаварыў аб нас зьдзекваючыся: вось, моў, ортодоксы і офіцыйная крытыка. Ці можа ў падобным тоне разважаць бальшавік? Ці не зразумела, што гэта тон дробна-буржуазнай опозыцыі, што Ражкоў зьяўляецца яе поўнамоцным прадстаўніком (воплескі). Ражкоў адзначаў тут нашыя памылкі ня толькі мнімыя, але і сапраўдныя, адшукаў якуюсьці выразна-памылковую цытату з якогасьці майго артыкулу. За гэта я яму толькі ўдзячны. Але калі Ражкоў спрабаваў на гэтых падставах прыпісаць нам цэлую лінію памылак у галіне культурных пытаньняў, на гэта мы заслужана рэагавалі толькі сьмехам. На самай справе, хто ня ведае, што іменна мы, напостаўцы, біліся супроць Іонава, супроць Сьляпкова, супроць Лупола, супроць Баброўнікава і ўсіх іншых дэборынскіх і бухарынскіх вучняў у галіне культуры. Тав. Сутырын у спрэчках па творчых пытаньнях добра гаварыў аб неабходнасьці аналізаваць нашы памылкі з пункту гледжаньня таго, ці выяўляюць яны адступленьне ад правільнай лініі, ці проста пераход на няправільны пункт гледжаньня. Што гэтыя памылкі—складаная частка памылковай сыстэмы поглядаў, ці вядомыя, хоць і зусім неабавязковыя „издержки выработки правильной линии", ці выражэньне яшчэ нераможанага ўплыву ідэйнага працiўніка і г. д. і т. п.?

Я думаю, што ўсе мы былі-б вельмі рады, калі-б можна было вылучыць спэцыяльную брыгаду, якая-б перагледзела ўсе нашы кніжкі: мае, Фадзеева, Ярмілава, усіх інш., выпісала-б усе памылковыя цытаты; можа быць можна да гэтай справы прыцягнуць і Ражкова, я, асабіста, загадзя згодны ахвяраваць яму ў прыватную ўласнасьць усе тыя памылковыя цытаты, якія ён ў мяне знойдзе (сьмех, воплескі). І падобную работу, вядома, трэба прарабіць.

Але той, хто думае, што гэта ёсьць усё неабходнае для разгортваньня самакрытыкі, той прыніжае яе значэньне, той адмаўляе патрэбную нам глыбіню і сур'ёзнасьць самакрытычнай работы. Самакрытыка зусім ня зводзіцца да таго, каб з пункту погляду 1931 году праглядзець артыкулы 1926-27 ці 1928 г. г., і ўжо тым больш вырываючы асобныя цытаты з контэксту і не разумеючы гісторычнага разьвіцьця таго ці іншага пункту гледжаньня, тэй ці іншай сыстэмы поглядаў, тэй ці іншай лініі. Гэта толькі нязначная частка работы па разгортваньні самакрытыкі, пры гэтым не найбольш цяжкая; яна зусім лёгкая там, дзе старыя працы праглядаюцца не для схолястычнай лаянкі цытатамі, але для таго, каб ўсё старое ацаніць з пункту гледжаньня новых пытаньняў, і для іх правільнага вырашэньня.

Апошні пэрыод часу характарызуецца ў нас бязумоўным узмацненьнем самакрытыкі. Але гэта, вядома, толькі пачатак, бо і да гэтага часу самакрытыкі ў нас яшчэ малавата. А трэба-ж ўлічыць, што мы ў прыватнасьці таму і „Літфронт" так пасьпяхова разграмілі, што ў дыскусіі з ім не паставілі сябе ў становішча непагрэшных папаў рымскіх, але, наступаючы на працiўніка, разгортвалі адначасова самакрытыку ў сваіх рядох. І мы не ў найменшай ступені, паўтараю яшчэ раз, не пра-

тэндуем на якую-небудзь непагрэшнасьць. Ды адкуль маглі-б ў нас зьявіцца падставы для падобных прэтэнзій: працуем мы ў галіне надзвычай цяжкай, у галіне, у якую партыйныя кадры яшчэ толькі толькі па-сапраўднаму падцягваюцца, у галіне, раней марксызмам ня так ужо моцна распрацаванай, у галіне, дзе пролетарскія бальшавіцкія кадры вельмі маладыя. Вазьмеце сярэдня-рапаўскі ўзрост; дзеля таго, каб не компрамэтаваць кіраўніцтва, я ня буду гаварыць аб сярэдняй колькасьці гадоў, якая прыпадае на кожнага з нас (сьмех).

Гэта, вядома, весела, але-ж гэтым маладым кадрам прыходзіцца быць у цяжкім становішчы. У шмат чым яны толькі складаюцца ў процэсе руху. Усе яны разам з рухам растуць: інакш партыйнае ядро і ня можа складацца. Інакш, у габінэтах толькі і выпрацоўваюць прыват-доцэнтаў бяспалаўскага тыпу, якія церпяць самае ганебнае паражэньне пры першым датыку з літаратурнай рачаіснасьцю.

Так, у нас вельмі шмат памылак, і, адзначаючы цяжкасьці работы і моладасьць нашых кадраў, мы іх толькі ў пэўнай ступені вытлумачваем, але нічуць не апраўдваем, бо ўсе гэтыя памылкі павінны быць усьвядомлены ня толькі як пасьведчаньне нясьпеласьці ці моладасьці нашага руху, але і распрацаваны ў сьвятле клясавай барацьбы, якая адбываецца ў нашай галіне, у сьвятле націску хістаючыхся элемэнтаў на правядзеньне генэральнай лініі партыі. Ленін любіў прыводзіць, здаецца, словы Маркса, што пакідаць памылку не абвергнутай, значыць заахвочваць інтэлектуальную нясумленнасьць. Гэты выдатны выраз абавязвае нас узмацніць бальшавіцкую самакрытыку. Бальшавіцкая самакрытыка заўсёды дапамагае ўзьняць аўтарытэт кіруючых работнікаў, сьветчыць аб іх сапраўднай партыйнасьці.

Ці застаецца вароншчына галоўнай небясьпекай?

Патрэбнае для нас разгортваньне самакрытыкі дапаможа і таму, каб ня толькі разьбіваць, але і да канца дабіць вароншчыну. Трэба сказаць, таварышы, што і ў нас на пленуме ў дыскусіі па творчых пытаньнях ня зусім правільна была разьмеркавана ўвага. Вельмі шмат гаварылі аб „Літфронце" менш аб вароншчыне. А між-тым вароншчына застаецца галоўнай формай праяўленьня буржуазных ўплываў на пролетарскую літаратуру.

Вароншчына—наш галоўны вораг пры распрацоўцы пытаньняў творчага мэтоду. Вароншчына больш за ўсё адчуваецца на практыцы нашых пісьменьнікаў. Трэба пры гэтым бачыць і новыя формы вароншчыны. Зусім ня ўсе выступаюць так, як раней адкрыта, як некаторыя аўтары вядомага зборніка „Як мы пішам". Па адным гэтым зборніку можна меркаваць аб ступені распластаваньня ў асяродзьдзі колішняга папутніцтва і аб намерах уплыву на яго буржуазнай ідэолёгіі. Хто з аўтараў гэтага зборніку займае найбольш ортодоксальную позыцыю з пункту гледжаньня вароншчыны? Яўгені Замяцін. Цытаты з артыкулу гэтага махровага рэакцыйнага пісьменьніка можна параўноўваць ня толькі з духам і сэнсам пісаньняў Варонскага, які выдае сябе за марксыста, але лёгка проста параўнаць цытаты. Можна ўстанавіць з дакладнасьцю: ступень перабудовы папутніцтва зьяўляецца адначасова ступеньню яго адыходу ад тэорыі Варонскага ў агульных пытаньнях мастацтва і ў прыватнасьці ў пытаньнях творчага мэтоду. Ці не зьяўляецца гэта новай і цалкам здавальняючай ацэнкай клясавай сутнасьці вароншчыны?

Я лічу патрэбным зрабіць новы націск на нашых старых формулёўках аб вароншчыне, як галоўнай небясьпецы, і таму, што мы таго-ж

самага „Літфронту“ не даб'ём без узмацненьня агню па вароншчыне.

У асноўным пытаньні, у пытаньні аб ролі сьветапогляду ў творчасьці мастака, мы маем простае перапляценьне і зрастаньне пункту гледжаньня як адкрыта правых, таксама і так званых левых опортуністаў. І, падзяляючы схэматычна і ўмоўна і рацыяналістычныя і эмпірычныя плыні ў творчай дыскусіі, у роўнай ступені не разумеюць, а то і проста адмаўляюць ролю сьветапогляду, г. зн. як раз тое, на чым робім націск мы, вядучы барацьбу за высокі ідэйны ўзровень пролетарскай літаратуры. Гэта нашая галоўнейшая задача. Шагам наперад у мастацкім разьвіцьці чалавецтва пролетарская літаратура будзе станавіцца толькі тады і толькі ў такой ступені, калі і ў якой ступені будзе востра і рашуча павышацца яе ідэйны ўзровень.

Нам патрэбны пісьменьнікі, якія ўмеюць браць вялікія ідэі нашае клясы не схэматычна, не зьбядняючы іх, не вульгарызуючы і не апашляючы іх; нам патрэбны пісьменьнікі, якія сапраўды-б стаялі на вышыні гэтах ідэй. Нам патрэбны пісьменьнікі, палітычная кваліфікацыя якіх ня зводзілася-б толькі да знаёмства з чарговымі перадавіцамі газэт. Нам патрэбны пісьменьнікі для якіх матэрыялістычная дыялектыка не зьяўлялася-б прыгожай, можа быць нават і жаданай, але „незнакомкай“. Нам патрэбны пісьменьнікі, удзел якіх на практыцы соцыялістычнага будаўніцтва ня быў-бы толькі практычнай формай масавага вытварэньня, рэклямнай шуміхі.

Які-ж ідэйны ўзровень у большасьці пролетарскіх пісьменьнікаў? Яшчэ вельмі нізкі, які далёка і далёка не адпавядае тым задачам, якія ставяцца рабочай клясай перад савецкім мастацвам. Іменна неабходнасьць аўладаць тэматыкай рэконструкцыйнага пэрыоду з асаблівай сілай падкрэсьлівае значэньне пытаньняў сьветапогляду. Чаму мы павінны дзёрціся за лёзунг паказу рэконструкцыйнага пэрыоду? Таму, што рэконструкцыйны пэрыод уяўляе сабой новы этап разьвіцьця пролетарскай рэволюцыі, этап больш складаны, больш насычаны новым і куды больш значным зьместам. Для таго, каб працаваць над тэматыкай рэконструкцыйнага пэрыоду патрэбен і больш высокі ўзровень сьветапогляду, большая ідэйная глыбіня мастака, большая шырыня ўспрыняцьця ім соцыяльнай рачаіснасьці, шырыня, недасягаемая без аўладаньня матэрыялістычнай дыялектыкай на справе. За тэматыку рэконструкцыйнага пэрыоду азначае адначасова—за больш высокі сьветапогляд пролетарскага мастака. Найвялікшая бяда і грэх „Літфронту“ заключаліся ня толькі ў тым, што літфронтаўцы не разумелі гэтай пастаноўкі пытаньня, але і ў тым, што яны актыўна супроць яе змагаліся.

Чым зьяўляўся „Літфронт“?

Мы падводзім зараз вынікі барацьбы з „Літфронтам“. Чым-жа ён зьяўляўся? рэакцыяй на недастатковасьць нашай перабудовы? рэакцыяй на нашыя памылкі і промахі? Ці гэта быў блёк плыняў, якія адлюстроўвалі дробна-буржуазныя хістаньні ў пролетарскай літаратуры пры пераходзе яе да новага этапу свайго разьвіцьця, блёк, сугучны групоўцы Сырцова-Ломінадзе? На гэтыя пытаньні патрэбна даць зусім выразны адказ. Тут няма месца ні для якога манэўраваньня, якім шмат тых, хто сёньня на словах прызнаюць правільнасьць нашай лініі, хацелі-б займацца. А між іншым у нас ёсьць і такія, якія, галасуючы сёньня за нашы ўстаноўкі, адначасова апраўдваюць сваё мінулае прабываньне ў „Літфронце“ тым, што, моў, там і так, яны змагаліся за перабудову УсеААПП і за разгортваньне сама-

крытыкі. Тым самым, натуральна, працягваецца і пэўная рэабілітацыя „Літфронту". Тым самым, натуральна, укосна апраўдваецца і пакрываецца іх мінулая лінія паводзін. Вядома, калі некаторыя рабочыя таварышы, —нікалькі не 16 гурткоў у ленінградзе, бо ніколі ў „Літфронту" ня было 16 гурткоў!—ішлі за „Літфронтам", то ў некаторых у тэй форме сапраўды адчувалася нежаданьне лініі РАПП супроць стаўляць сваю лінію, а сумленнае жаданьне дапамагчы бальшавіцкаму разьвіццю пролетарскай літаратуры. Былі і такія. І іх мы сёньня прыпамінаем толькі таму, што як раз яны даюць найбольш жорсткую, найбольш вострую, найбольш ваяўнічую бяз ўсякіх паблажак ацэнку „Літфрорту" і сваёй літфронтаўскай" мінуўшчыне.

У радзе мясцоў былыя літфронтаўцы яшчэ жывуць настроямі рэваншу. Да гэтага можна аднесьціся з поўным спакоем: справа іх безнадзейная! І аднак, самым шкодным для нас было-б думаць, што літфронтаўшчына ўжо зьнішчана, і што карэньні яе выкарчаваны. Львіная доля гэтае работы яшчэ наперадзе.

Мала разьбіваць і вароншчыну і літфронтаўшчыну ў тэорытычных дыскусіях. Трэба зразумець, што дабіць гэтыя варожыя нам плыні мы зможам толькі тэмпамі нашай перабудовы. Толькі практыкай перабудовы, толькі паказам яе вынікаў. І, нават выкрываючы тыя ці іншыя вылазкі літфронтаўскага характару ці характару вароншчыны, мы павінны дашуквацца да якогасьці сваяабсалівага адлюстраваньня і выражэньня ў іх, як у крывым люстэрку, хвароб нашага руху

Мы перамаглі вароншчыну і да канца перамагаем „Літфронт" іменна таму, што творы пролетарскай літаратуры, яе практыка і тэорытычная продукцыя пацьвярджаюць правільнасьць нашых генэральных ўстановак. Адзін з апошніх прыкладаў: „Разбег" Стаўскага. У гэтай кніжцы, вядома, маецца рад вялікіх недахопаў, але гэта сапраўдны вялікі бальшавіцкі твор, які знаходзіцца на сталбавой дарозе пролетарскай літаратуры і дэмонструе перамогу нашых творчых лёзунгаў. Я зазначаю іменна на „Разбег" тав. Стаўскага, як напрыклад таго, што самая актуальная тэматыка, лепш за ўсё разгортваецца мастакамі-напостаўцамі.

Мы гэта, на вялікі жаль, растлумачваем вельмі вельмі недастаткова. Мы яшчэ ня далі ні аднае ня толькі кніжкі, але нават сур'ёзнага артыкулу аб вынікак творчай дыскусіі. Мы яшчэ да гэтага часу не аб'ядналі вынікаў усёй тэй колектыўнай працы, якую прарабіў наш рух дыскусіяй пра творчы мэтод. Мы яшчэ нават не падсумавалі хоць-бы апошнюю дыскусію з „Літфронтам." А між тым, яны, разьбітыя і пераможаныя, нас у гэтай справе выпераджаюць. Вось за апошні час, напрыклад, на расійскай мове вышлі 3 кніжкі—Майзеля, Родава і Ражкова.

„Кароткі нарыс сучаснай літаратуры" Майзеля,—кніжка настолькі-ж прэтэнцыёзная, наколькі і дробнабуржуазная. Праўда, Майзель дае ў ёй усё, што ён можа даць, але, на-жаль, даць-та ён можа вельмі мала—2-3 літфронтаўскія ідэйкі, 2-3 інтэрпрэтацыі гарбачоўскіх ці бяспалаўскіх палажэньняў, продукцыя, для якой патрабуюцца не мазгі, а ортодоскальная адданасьць нажніцам і клею.

Кніжка Родава, якая вышла пад назваю „На посту", да літаратуры наогул ніякіх адносін ня мае. Гэта сапраўды на пасту,—на пасту склок, інтрыганства, дробнага палітыканства, бяздарнага манэўраваньня, манэўруючых бяздарнасьцяй - (воплескі).

І, нарэшце, Ражкоў. На ім, вядома, дадаткова спыняцца няма ніякай патрэбы.

Мы перамаглі ў бойцы. У дыскусіі наша ўзяла. А яны нас выпераджаюць ...(Кіршон: „Ім толькі гэтае і застаецца, не адбірай у людзей апошняга“). Не, я не магу да гэтага падыходзіць з пункту гледжання лібэральнага гуманізму, з гэткай перавальскай літасьцю да людзей наогул (сьмех). Родаў—гэта жывы труп, які заражае абстаноўку. Ідэйна расстраляць яго—мы яго расстралялі. Трэба яго канчаткова літаратурна пахаваць!

Я ня спыняюся больш падрабязна на творчых установах літфронту таму, што гэтаму пытаньню пленум ўжо аддаў шмат увагі пры абмеркаваньні першага пункту парадку дня.

„Літфронт“ і нацыянальнае пытаньне.

У сувязі з „Літфронтам“ мне хочацца толькі адзначыць той бок, які ў нас звычайна зусім ігноруецца. Гутарка ідзе што да „Літфронту“ і нацыянальнага пытаньня. Якія элемэнты гуртаваліся навокал „Літфронту“ ці орыентаваліся на яго? У Беларусі, напрыклад, Купцэвіч. Хто такі Купцэвіч? Нацыянал-дэмократ. Хто спачуваў „Літфронту“ на Украіне? Горшыя элемэнты пролітфронту. У тюркскай літаратуры з абаронай „Літфронту“ выступаў Алі-Назім, бяспрынцыпны малады чалавек, які ўхітраўся адначасова супрацоўнічаць і ў бальшавіцкім друку і ў друку кемалісцкім—турэцкім. У Закаўказьзі, наогул, паўпрэдам „Літфронту“ быў Татулаў, ўся практычная праца якога была наскрозь прасякнута нацыяналістычным жаданьнем супроцьставіць Закаўказьзе ўсім іншым атрадам УсеААПП.

Вось якія элемэнты гуртаваліся навокал „Літфронту“. Вось да каго ён сам цягнуўся. Вось на каго ён орыентаваўся, каго ён узгадоўваў і каго ён падтрымліваў. Больш таго, я павінен сказаць, што орыентацыя ўсіх гэтых элемэнтаў на „Літфронт“ тлумачыцца ня толькі натуральным для ворага жаданьнем падтрымаць практычна „Літфронт“, як сілу, якая расхіствае пролетарскі літаратурны рух. Не, тут справа больш складаная і глыбейшая. Тут тэма, якая патрабуе спэцыяльнага разгляду. Тут гутарка ідзе аб тэй пераклічцы па творчых пытаньнях, якую можна знайсьці паміж найбольш гарачымі тэорэтыкамі „Літфронту“ і найбольш адкрытымі прадстаўнікамі нацыянал-дэмократычных плыняў у галіне літаратурнай тэорыі. Прыпомніце, што і Хвылёвы на Украіне і Зарэцкі ў Беларусі выступалі пад сьцягам барацьбы за романтыку і романтызм. Прыпомніце, што амаль ўсе нацыянал-дэмократычныя плыні атакавалі нас і па лініі пытаньняў мастацкага мэтоду. І можна устанавіць, што іх патрабаваньні: „даёш романтыку“, зьвязваліся з тэорыямі самабытнасьці іх народаў, з романтычнымі жаданьнямі ідэолізаваць сваё мінулае і г. д. і т. п.

Патрэбна бачыць, вядома, ня толькі падабенства, але і розьніцу, не адмахваючыся лепш ад тэй свая-асаблівай пераклічкі, якая ішла тут па творчых пытаньнях паміж „Літфронтам“ і Зарэцкім.

Ражкоў штосьці тут разважаў аб романтыцы і пра Шылера. Але каб для Ражкова зрабіць хоць-бы, школьны элемэнтарны экзамэн, дык лёгка выкрыецца, што Шыльлера ён ведае толькі паводле чутак, ці паводле гімназыяльнага падручніка, а можа быць нават толькі і па загалоўку гэтага падручніка... (Голас: „Можа быць ў тэатр Вахтангава хадзіў“). Можа быць халзіў у тэатр Вахтангава... (Жараў: „Калі жыве на Арбаце“). Бадай што і так (сьмех). Але не хвалюйцеся за Ражкова, ён, вядома, заўсёды будзе з вамі разважаць і спрачацца пра Шылера, бо для яго гэта вельмі проста: возьме адзін, другі творык, выцягне з яго адну-другую цыта-

тку,—глядзіш, хто-небудзь і паверыць, што ён Шылера ведае. Шмат якія прыват-доцэнты такім чынам жывуць даволі прытульна і комфортабэльна.

Забясьпечыць разгортваньне творчых дыскусій, дапамагчы формаваньню творчых груп, зжыць адміністраваньне і командваньне.

Разгром „Літфронту“ павінен прывесьці—і ўжо прыводзіць—не да заміраньня, а да сапраўднага ўздыму творчых дыскусій і росквіту творчых груповак. Адзіным сур'ёзным месцам у выступленьні Ражкова было яго разважаньне на тэму аб патрэбе дыскусіі і опозыцыі ў нашай організацыі. Але гэта месца ў разважаньні тав. Ражкова зьяўлялася простым плагіятам. Ці-ж не займаўся ён амаль даслоўным паўтарэньнем таго, што было надрукавана ў перадавіцы № 11 часопісі „На літпосту“?

У перадавым артыкуле аб выніках апошняга пленуму РАПП было сказана аб тым, што гэта першы пленум, на якім ня было опозыцыі. Плюс гэта ці мінус? У перадавіцы гэта разглядалася, як найвялікшае дасягненьне РАПП. Гэта правільна І калі гутарка ідзе аб опозыцыі літаратурна-палітычнага парадку. У гэтым выпадку адзінства ўсёй організацыі на аснове барацьбы за генэральную лінію партыі ў данай галіне зьяўляецца надзвычайна вялікім дасягненьнем, значэньне якога нельга не даацэньваць. Аднак, калі гутарка ідзе аб адсутнасьці на пленуме творчай „опозыцыі“, дакладней і правільней—ня творчай „опозыцыі“, а раду „опозыцый“, ці—яшчэ больш дакладна—раду спаборнічаючых творчых груповак, калі гутарка ідзе аб адсутнасьці такой „опозыцыі“ на апошнім пленуме, дык гэта, вядома, не дасягненьне, а недахоп, гэта ня плюс, а мінус.

Гэта называецца: нашым-жа дабром! Чаму мы ў нашай перадавіцы слова „опозыцыя“ ўзялі ў лапкі? Таму, што ў нас ідзе гутарка не аб тэй анархічнай конкурэнцыі, да якой у свой час заклікаў нас Бухарын, і не аб атмосфэры калатні і сваркі—такую абстаноўку ствараць лёгка,—а мы змагаемся за разгортваньне творчай дыскусіі за ўтварэньне творчых груповак на аснове таварыскага супрацоўніцтва і таварыскай узаемадапамогі. Задача кіраўніцтва ў зьвязку з гэтым заключаецца ня толькі ў тым, каб не перашкаджаць існаваньню такіх „опозыцый“. Задача кіраўніцтва ў тым, каб форсаваць процэсы творчых разьмежаваньняў, каб іх самому ўтвараць і ўмацоўваць, каб ім на справе дапамагаць.

Мы ведаем, што тэмпы ўтварэньня творчых груповак знаходзяцца ў пэўнай суадпаведнасьці з узроўнем творчага разьвіцьця пролетарскай літаратуры. І гэты ўзровень такі, што мы ўжо сёньня маглі-б мець вялікую колькасьць творчых груповак.

Чым шпарчэй будзе расьці і перабудоўвацца пролетарская літаратура, тым глыбей і грунтоўней будзе разьвівацца творчая дыскусія. Ёй перашкаджаюць, вядома, і нашы організацыйныя недахопы, організацыйныя прарэхі, частае неразуменьне характару нашых пісьменьніцкіх організацый, пэўная наяўнасьць мэтодаў командваньня і адміністраваньня, а, між тым, няма нічога больш шкоднага, як копіраваньне ва ЎсеААПП мэтодаў работы савецкай і партыйнай організацыі,—на практыцы гэта здараецца і нават нярэдка. Кожнаму з нас даводзіцца спатыкацца нават са звычайнай падменай ідэйна-выхаваўчай работы адміністраваньнем і командваньнем. Калі мы ня здолеем гэта канчаткова ліквідаваць, дык мы выдадзім сабе патэнт на ідэйную беднасьць.

Узмацненьне ролі рабочага ядра і ў гэтых адносінах павінна прынесьці самыя найлепшыя вынікі.

Мацней агонь па буржуазных уплывах на пролетарскую літаратуру.

Творчая дыскусія павінна быць адначасова і творчым аглядам пролетарскай літаратуры. Мы павінны ведаць, хто над чым працуе, хто чым цікавіцца, хто як расьце мы павінны з як мага большай паўнатой уяўляць сабе творчы воблік усяго нашага руху ў цэлым, кожнай нашай асоцыяцыі, кожнага нашага пісьменьніка. Бяз гэтага ніякай дапамогі ні новым, ні старым кадрам мы ня зробім. Бяз гэтага нам не ўсьвядоміць і не падлічыць творчага вопыту, які ўжо маецца. Бяз гэтага не падыйсьці нам да таго вядомага плянаваньня творчай продукцыі членаў нашай організацыі, да якога мы, вядома, прыйдзем.

Такі творчы агляд павінен дапамагчы ачыстцы нашых організацый ад чужых элемэнтаў. Вось, напрыклад, Міх. Аляксееў; нават яго вялікая барада ня можа захаваць таго факту, што ягоны роман „Рэсторан на Арбаце" не мастацкі твор пролетарскай літаратуры, а буржуазная халтура (воплескі). Гэты Аляксееў спрабаваў утварыць якіясьці групоўкі, блёкаваўся з „Літфронтам" і г. д. і т. п. Да гэтага можна аднесьціся без асаблівай зацікаўленасьці, і вельмі кепска, што ў нас больш займаліся яго групоўкамі, чым разглядам яго роману перад усёй масай рапаўцаў.

У гэтым творчым аглядзе павінны быць выяўлены і выкрыты і такія, як Осін, які здолеў надрукаваць выразна контррэволюцыйны верш у часопісі ЗОАПП „Наступ". Гэта быў буйны прарыў у нашых смаленскіх таварышоў,—мы зьнялі там сэкратара абласной організацыі, павялі растлумачальную працу, але трэба памятаць, што і ў іншых АПП, напэўна што ня ўсюды, яшчэ выкінуты падобныя Осіны. Ці нават угрузінскай літаратуры тав. Вакелі быў раней пролет. пісьменьнікам, сёньня-ж ён ім не зьяўляецца (Голас: „ніколі і ня быў"). Ну, гэта і пераўвялічана і ўпрошчана, гэта рэпліка Кікодзе, хоць і ня ім сказаная (Кікодзе: „Я за ўсё адказваю"). Хопіць таго, што ты за сябе не адказваеш. (Воплескі, сьмех).

Больш увагі ў барацьбе за літаратурную політыку партыі.

Аднак, неабходнае павялічэньне ўвагі да творчых пытаньняў не павінна зьменшыць значэньне літаратурна-політычнай работы. А між тым яна ў нас выразна паслабла за апошні час. Мы за апошні час ня толькі кепска, але ўсё горш і горш займаліся барацьбой з буржуазнай літаратурай і работай з папутніцтвам. Тав. Фадзееў меў поўную слушнасьць, зазначаючы пра гэта ў „Праўдзе"—захапляемся, моў, унутранай дыскусіяй, а шмат якія з буржуазных твораў пакідаем без адпору. На самай справе, таварышы, пасьля „справы" Пільняка і Замяціна мы ня мелі ні аднэй больш вялікай грамадзка-літаратурнай кампаніі такога характару, а трэба быць нічым ня прыкрытым правым опортуністам для таго, каб адмаўляць наяўнасьць у нас буржуазных твораў, наяўнасьць у нас буржуазных уплываў, наяўнасьць у нас буржуазнай небясьпекі у самых злосных, у тым ліку ў новых сваяасаблівых формах.

Без узмацненьня барацьбы з буржуазнай літаратурай—і не ў парадку дэкляруцый і алілуйшчыны, а разглядам твораў,—нам не забясьпечыць комуністычнага перавыхаваньня папутніцтва.

У апошнім нумары часопісі „Літаратура і мастацтва", у перадавіцы сказана, што мы—зьезд, ці наш пленум, зможам не займацца пытаньнямі папутніцтва. Можа гэта друкарская памылка, якую трэба чытаць—ня зможам не займацца, але калі гэта і памылка, дык, бязумоўна, у часопісі выдатны корэктар, які цалкам правільна разумее сапраўдную лінію яго рэдакцыі (сьмех).

Мы павінны ўзмацніць працу з папутніцтвам, дапамагаючы тым, якія перабудоўваюцца выкрываючы тых, якія прыстасоўваюцца, дзяручыся з тымі, хто адыходзіць на позыцыі буржуазнай літаратуры. У шмат чым ад нас залежыць паскарэньне тэмпаў распластаваньня папутніцкіх радоў; самі папутнікі ў масе ўжо разумеюць правільнасьць нашай пастаноўкі пытаньня: саюзьнік ці вораг. Саюзьнік ці вораг—гэтым палажэньнем вызначаецца наша політыка ў адносінах да папутніцтва, але гэтая політыка павінна праводзіцца без лявацкіх загібаў, без раптоўнага абвяшчэньня ворагам ўсякага, хто яшчэ да канца ня стаў саюзьнікам.

Вядомы грузінскі пісьменьнік Міх. Джавахішвілі казаў нядаўна аб тым, як цяжка жыць папутніку, моў, я хачу быць папутнікам, але сёньня адны патрабаваньні, заўтра іншыя патрабаваньні—проста жыць немагчыма! Падобным чынам разважаюць шмат якія папутнікі, якія тым самым сьведчаць, што яны ня толькі былі, але яшчэ і засталіся папутнікамі. Зьмена патрабаваньняў закладзена ў абстаноўцы, і, сапраўды, без найвялікшага ўзмацненьня тэмпаў і глыбіні перабудовы ўчарашні папутнік перастае ім быць сёньня.

Некаторым здаецца, што можна ставіць знак роўнасьці паміж зьменавехаваўствам і папутніцтвам.

Гэта памылкова. У нас вядома было і зьменавехаваўскае „папутніцтва" і, паводле ўдалага выразу тав. Каваленко, папутніцтва ад ўкраінізацыі. Але ў нас ёсьць ўжо сёньня і саюзьнікі па будаўніцтву соцыялізму.

Трэба тут па-рознаму падыходзіць да розных пісьменьнікаў, знаходзячы розныя крытэрыі ў розных рэспубліках. Недахоп часу не дае мне магчымасьці спыніцца на гэтым больш падрабязна—спадзяюся, што т.т. ў спрэчках выкажуцца, а я яшчэ—у заключным слове. Я лічу правільным пераіменаваньне таварыства сялянскіх пісьменьнікаў у таварыства пісьменьнікаў пролетарска-колгасных. Гэтае пераіменаваньне правільна адбівае тэндэнцыі іх разьвіцьця, і іх пісьменьнікаў, і іх організацыі ў цэлым. Але будзе кепска, калі таварышы тэндэнцыі разьвіцьця прымуць за характарыстыку ўжо існуючага ў рачаіснасьці;—ёсьць такія, якія ўжо рэалізуюць гэтую тэндэнцыю, але ёсьць яшчэ і такія, якія хістаюцца, якія адлюстроўваюць тыя зрухі ў настроях тых і іншых пластоў серадняцтва,—важна, каб яны не адштурхоўваліся ў выніку пераіменаваньня. Таварыства пролетарска-колгасных пісьменьнікаў павінна забясьпечыць перавыхаваньне тых, якія хістаюцца, быць для іх школай, ня губляць іх.

Ставяць пытаньне: у тых рэспубліках, дзе няма яшчэ організацыі пролетарска-колгасных пісьменьнікаў, ці варта іх ўтвараць? Я не магу даць на гэтае пытаньне адзін агульны адказ: ён вызначаецца аналізам становішча. Галоўнае ў тым, як забясьпечыць пролетарскі ўплыў і пролетарскае кіраўніцтва. У залежнасьці ад гэтага павінны вырашацца організацыйныя пытаньні, як політычна больш мэтазгодна з пункту гледжаньня пераводу на рэйкі пролетарскай ідэолёгіі пісьменьнікаў, якія ідуць з вескі. І тут асноўнае ў адказнасьці за ўсю савецкую літаратуру.

Нашы чарговыя задачы. Рост нашых кадраў.

Барацьба за творчую гэгемонію—гэта наша першая галоўнейшая задача, вырашэньню якой павінна быць падпарадкавана ўся наша праца. Гэтым лёзунгам ня толькі дыктуецца неабходнасьць усё новага і новага павялічэньня ўвагі

да творчых пытаньняў, але і ставіцца мэта, даецца генэральная ўстаноўка—у наяўнасьці ўсе гісторычныя прадпасылкі ажыцьцяўленьня гэгемоніі—заваюем яе, узьнімаючы ўсё савецкае мастацтва на больш высокую ступень. Я гэта асабліва падкрэсьліваю: гэгемонія пролетарскай літаратуры мысьліцца намі не як вынік, скажам да прыкладу, банкроцтва папутнікаў, якія канчаткова выбываюць з радоў. Не. Нам патрэбна гэгемонія пролетарскіх пісьменьнікаў у выніку і на падставе найвялікшага росту савецкай літаратуры не таму, калі так можна сказаць, што іншыя пішуць яшчэ горш, а таму, што мы пішам ўжо лепш. Гэтым я толькі зноў пацьвярджаю тое палажэньне, што гэгемонія пролетарскай літаратуры не за гарамі, што мы не адкладваем дасягненьні гэтай гэгемоніі на той час, калі крывая клясавай барацьбы рэзка пойдзе ўніз і калі будзе пабудаваны ня толькі фундамант, але і гмах соцыялізму. Мы можам і павінны стаць гэгемонамі ў найбліжэйшы час. Папутнікі ўжо ня могуць і ня здолеюць творча весьці ўсю савецкую літаратуру. Пролетарскія пісьменьнікі яшчэ ня ўмеюць, але здолеюць, калі ўзмацняць вучобу, паскорыць тэмпы перабудовы, шпарчэй створаць новы тып пісьменьніка. Тады мы сапраўды зробім шаг наперад у мастацкім разьвіцьці чалавецтва, і гэтае вялікае мастацтва бальшавізму стварае пісьменьнік, які аддае справе соцыялізму ўсе свае сілы, увесь свой розум, усю сваю волю, пісьменьнік, які навучаецца ў Леніна і Сталіна спалучаць цьвярозасьць і вялікі запал, пісьменьнік, які не адрываецца ад жыцьця, а перабудоўвае яго ў гушчы будаўнічых будняў, пісьменьнік політэхнічна адукаваны, які ўмее змагацца за тэхнічнае наватарства, не эмпірык і не схэматык, а матэрыяліст-дыялектык, пісьменьнік, які кахае сапраўднасьць і які бачыць барацьбу супярэчных тэндэнцый і напрамак разьвіцьця, пісьменьнік з суровым і дакладным вокамерам і пісьменьнік-лятуценьнік — „фантазія ёсьць якасьць найвялікшай каштоўнасьці". Дарэмна думаюць, што яна патрэбна толькі поэту. Гэта—недарэчны забабон. Нават ў матэматыцы яна патрэбна, нават адкрыцьцё дыфэрэнцыяльнага і інтэгральнага вылічэньняў было-б немагчымым без фантазіі" (Ленін). Такі пісьменьнік ўжо расьце; мы абавязаны дапамагчы ягонаму росту на справе, змагаючыся за бальшавізацыю пролетарскай літаратуры, індывідуалізуючы наш падыход да кожнага пісьменьніка, узьнімаючы ўсю нашу організацыю на такую справу, як паказ гэрояў працы. Калі мы гаворым пра гэта, дык гутарка ідзе не аб тым, каб з рук збыць—даць беглыя і пасьпешныя зарысоўкі—абы шмат і хутка. І тут гутарка ідзе аб барацьбе за якасьць, аб тым, каб паказ гэрояў працы прысьпяшаў-бы перабудову пролетарскай літаратуры, яе набліжэньне да гэгемоніі, да ўтварэньня вялікага мастацтва бальшавізму.

Выгнаць з творчай дыскусіі схоластыку шчагаляньне цытатамі і павярхоўнае і прымітыўнае „начетничество". Ператварыць творчую дыскусію ў школу колектыўнай выпрацоўкі стылю пролетарскай літаратуры: ня бухарынская анархічная конкурэнцыя, а таварыскае спаборніцтва і ўзаемадапамога павінны характарызаваць усю нашу работу. Нам патрэбна, каб творчая дыскусія была зьвязана з творчым аглядам, з паваротам да конкрэтнай крытыкі, з разгортваньнем творчых груповак. Пашырыць і паглыбіць творчую дыскусію—задача УсеААПП у цэлым і кожнай асобнай асоцыяцыі. Для гэтага і таму—весьці яе не на падставе 2–3 твораў, не для рэклямы тых ці іншых пісьменьнікаў, якія прэтэндуюць на палажэньне „мэтраў", але на

падставе ўсяго вопыту пролетарскай літаратуры, і ня толькі расійскай, але ўсесаюзнай. (Воплескі)

Узьняць тэорытычны ўзровень нашага руху. Мы яшчэ далёка, далёка не засвоілі ў нашай галіне ленінскай філёзофскай спадчыны. Мы мала ўсьвядомілі і ўсьведамляем для нашай практыкі ўсю літаратуру і літаратурнае разьвіцьцё мінулага. Наша тэорыя ня ставіць вялікіх задач перад нашай практыкай, не дае вялікіх і далёкіх пэрспэктыў. Бясплянавасьць і бяссыстэмнасьць характарызуе нашу тэорэтычную работу. Ці не пара перайсьці да плянавай пастаноўкі чарговых тэорытычных задач? Ці не пара і тут выступіць супроць перажыткаў індывідуалістычных мэтодаў працы? Ці не пара на справе аб'яднаць усе тэорытычныя кадры, здольныя на фронце мастацтва змагацца пад сьцягам ваяўнічага ленінізму? Ці не пара і тут канчаткова дабіць буржуазныя тэорыі, псэўдомарксызм, прыспасабленцаў і тых, якія перафарбоўваюцца псэўдомарксызмам опортуністам? Ці не пара і на вучастку нашай тэорыі абвясьціць вайну дылетанству, малапісьменнасьці, прэтэнцыйнаму ўсезнаўству — нічога нязнайству? (воплескі) Дзеля гэтага патрэбна моцная бальшавіцкая самакрытыка: узяць пад агонь ўсіх без выключэньня. Такая самакрытыка дапаможа новаму і значна шпарчэйшаму вылучэньню і росту кадраў ўсеапаўскіх організацый. Такая самакрытыка ўзмацніць колектыўнасьць у працы любой ячэйкі УсеААПП зьнізу да верху. Такая самакрытыка забясьпечыць дружнае і таварыскае зжываньне няўхільных і неабходных сутычак поглядаў пры выпрацоўцы, распрацоўцы, і правядзеньняі нашяй лініі. Такая самакрытыка — пролетарская, бальшавіцкая, таварыская — дапаможа і барацьбе з адміністраваньнем і командваньнем, дапаможа перагляду мэтодаў нашай організацыйнай працы, дапаможа ўстанавіць тып кіраўніцтва нашай організацыі, організацыі не командная а перш за ўсё ідэйнавыхаваўчай.

Трэба памятаць, што ва ўмовах вялічэзнага росту ўшыркі і глыбіню, ва ўмовах неаднароднасьці нашага руху, ва ўмовах разгортваньня творчых груповак, адзінства УсеААПП можа быць забясьпечана толькі поўнай ліквідацыяй элемэнтаў адміністраваньня і командваньня, начальніцкага загадваньня і бюрократычнага націску ці заціску.

Актывізаваць нашу літаратурна-палітычную работу.

Лінія партыі — наша лінія. Няма ў нас ніякіх літаратурна-палітычных задач акрамя тых, якія выцякаюць з генэральнай лініі партыі і ею ставяцца.—Гэта мы гаварылі і раней, гэта абавязаны мы сказаць і сёньня, калі УсеААПП стаў асноўнай організацыяй, якая правядзіць лінію партыі ў літаратуры. Больш увагі няпрымірымай барацьбе з ухіламі ад бальшавіцкай палітыкі, — з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай, з „левымі" загібамі і заскокамі. Больш увагі барацьбе за перабудову папутніцтва, за сапраўдны саюз з саюзьнікамі, за адпор хістаньням у бок ад нас. Лепш організаваць і ўзмацніць наступ на буржуазную літаратуру, на буржуазныя ўплывы, на папутніцтва, на буржуазныя ўплывы і на некаторых з пролетарскіх пісьменьнікаў. Соцыялістычны наступ на літаратурным вучастку ідэолёгічнага фронту патрабуе ўзмацненьня клясавай пільнасьці.

Прышоў ужо час, калі можна і патрэбна зблізіць усе атрады пролетарскага мастацтва (воплескі). Мы ўжо дарасьлі зараз да буйнага і баявога аб'яднаньня з пролетарскімі музыкантамі, мастакамі, работнікамі кіно, радыё, да гэтага патрэбна падцягнуць і пролетарскіх архітэктараў. На справе ўжо ў шмат чым УсеААПП адыгрывае

вядучую ролю ў адносінах да ўсяго пролетарскага мастацтва, але трэба адзначыць, што вельмі часта, музыканты ці мастакі ведаюць нас значна больш і лепш, чым мы іх, а іх вопыт можа нам шмат дапамагчы. Патрэбна ўзмацніць і пашырыць удзел усіх атрадаў УсеААПП у міжнароднай працы. Мы, таварышы, зьяўляемся складанай часткай міжнароднай пісьменьніцкай організацыі, якая пасьля харкаўскай конфэрэнцыі пашла крута ў гору, якая мае такія значныя сэкцыі, як напрыклад, германская, японская, амэрыканская, якая вядзе буйную рэволюцыйную працу ў міжнародным маштабе, якая дэманструе рост пролетарскай культуры, яшчэ пад уціскам капіталізму. У нашых таварышоў і па эўропейскаму і амэрыканскаму захаду, і па Усходу мы можам і павучыцца і можам і павінны ім перадаць наш вопыт. Ці ўсе ў нас адчуваюць сваю адказнасьць перад міжнародным аб'яднаньнем? Ці дастаткова ў нас вядзецца гэтая інтэрнацыянальная праца?

Па-сапраўднаму наладзіць удзел пролетарскіх пісьменьнікаў ва ўсёй практыцы культурнай рэволюцыі. Раней мы займаліся гэтымі пытаньнямі больш, чым зараз. А між тым мы павінны актыўна ўдзельнічаць у барацьбе за бальшавіцкія тэмпы культурнага будаўніцтва, за напрам усяго культурнага росту па соцыялістычнаму рэчышчу, за ленінскую тэорыю культуры. Раней мы змагаліся за пролетарскую культуру — гэтую барацьбу мы працягваем і сёньня, калі гаворым аб соцыялістычнай культуры, якая ўзмацняецца і перамагае ў процэсе культурнай рэволюцыі. Раней мы — у дыскусыях з Багданавым, напрыклад, — супроцьстаўлялі культуру пролетарскую соцыялістычнай культуры, але культуры комуністычнай, культуры бясклясавай комуністычнай грамады. І мы правільна рабілі, што супроцьстаўлялі, змагаючыся за клясавую чоткасьць і выразнасьць, за культурную гэгемонію пролетарыяту, пролетарскі наступ у клясавай барацьбе на фронце культуры. Зараз патрэбна ўдакладніць, што мы не супроцьстаўляем культуры пролетарскай культуры соцыялістычнай, што мы будуем соцыялістычную культуру і змагаемся пад яе сьцягамі.

Узмацніць і паглыбіць інтэрнацыянальнае адзінства УсеААПП.

Мы павінны быць у першых радох барацьбы за міжнародную пролетарскую культуру. Супроць нацыянальнай замкнёнасьці, супроць консэрваваньня якіх-небудзь рэштак нацыянальнай адасобленасьці працоўных, супроць нацыяналістычнага провінцыяналізму і за шырокі кругазор салдатаў арміі сусьветнай рэволюцыі. Нам яшчэ патрэбна больш зблізіць усе нацыянальныя атрады УсеААПП, і, даючы жорсткі адпор найменшай праяве вялікадзяржаўніцтва, гэтаму галоўнаму ворагу, расчышчаць шляхі да як мага большага зьліцьця працоўных усіх нацый. Патрэбна ўзмацніць УсеААПП, як кіруючы цэнтр усесаюзнага руху. Т. Ярмілаў унёс ужо прапанову аб ператварэньні тэорытычнага часопісу „РАПП„ у орган УсеААПП. „Страна савецкая" таксама павінна быць усеаппаўскім часопісам (воплескі).

Таварышы! Яшчэ ня вельмі даўно даводзілася гаварыць аб тым, што мы больш абараняліся, чым нападалі. Гэта быў адзін з найбольш крызісных момантаў пераходу да новага этапу, да новых тэмпаў перабудовы, да ўзмацненьня ў новых абставінах барацьбы за бальшавізацыю пролетарскай літаратуры. Гэты момант хутка праляцеў. Наша організацыя здолела даць адпор ворагам генэральнай лініі, УсеААПП здолела даказаць сваю адказнасьць партыйнай лініі, здолела ня гледзячы на шмат якія памылкі і недахопы, адшукваць асноўныя ключы да перамаганьня адставаньня. Мы сёньня ў

нашай галіне ў суадпаведнасьці з курсам партыі разгортваем соцыялістычны наступ, мы — бальшавіцкі авангард савецкай літаратуры!

Трывога, а несамазадаволенье

(Заключнае слова)

Таварышы, спрэчкі па маім дакладзе і па дакладзе тав. Селіваноўскага далі вялікую колькасьць каштоўнейшага матэрыялу, матэрыялу, які дапаўняе рад нашых палажэньняў, матэрыялу, які ілюструе шмат якія з гэтых палажэньняў, матэрыялу, які прымушае нас рабіць рад новых дадатковых вывадаў перш за ўсё ў адносінах палітыкі збліжэньня ўсіх нацыянальных атрадаў пролетарскай літаратуры Савецкага саюзу. Спрэчкі ня толькі далі нам вялічэзную колькасьць матэрыялаў. Спрэчкі іменна таму былі каштоўнымі, што ў іх і ў тым матэрыяле, які мы атрымалі, выявіўся вялічэзны вопыт, ужо накоплены нашым рухам, вялічэзны вопыт барацьбы з рознымі нацыянал-дэмократычнымі плынямі, вялічэзны вопыт клясавай барацьбы на літаратурным фронце. І таксама таму былі так важны нашыя спрэчкі, што яны паказалі рост нашага руху. Тое, які матэрыял мы атрымалі на нашым пленуме ў параўнаньні з ранейшымі пленумамі, тое, як асьвятляўся гэты матэрыял па ўзроўню пастаноўкі пытаньня і на папярэдніх пленумах і на гэтым пленуме, усе гэта гаворыць аб бязумоўным росьце асноўных кадраў нашага руху, такім росьце, які адбівае сапраўдны рух наперад усёй масы пролетарскіх пісьменьнікаў. Асаблівае значэньне мае тое, што, паставіўшы перад сабой вялікую колькасьць новых пытаньняў і паставіўшы гэтыя пытаньні на новым матэрыяле, мы павінны канстатаваць найвялікшае адзінства ўсіх выступаўшых тут таварышоў, адзінства, якое сьведчыць аб магутнасьці нашага руху, паказвае, што Усесаюзнае аб'яднаньне асоцыяцый пролетарскіх пісьменьнікаў зьяўляецца на сёньняшні дзень такой організацыяй, тэмпы бальшавізацыі якой пачынаюць усё больш адпавядаць задачам, якія перад ёй стаяць.

Калі перайсьці да некаторых пытаньняў ,якія закраналіся ў спрэчках, то на першае месца трэба паставіць проблему нацыянальнай культуры. Мне здаецца, што асноўнае павінна быць намі сёньня ўсімі канстатавана, гэта тое, што з тэорытычнай распрацоўкай пытаньняў нацыянальнай культуры справа абстаіць вельмі кепска. Нашы спрэчкі паказалі, што на мясцох у адносінах ўвагі да нацыянальнай проблемы, у адносінах да тэорытычнай распрацоўкі нацыянальнай культуры робіцца крыху больш, чым тут, у Маскве,—а тут, у Маскве, робіцца вельмі мала, вельмі недастаткова. Адгэтуль вывад для сэкратарыяту УсеААПП: паставіць на абмеркаваньне ўсіх нашых організацый рад вузлавых пытаньняў і ажыцьцёвіць пад кіраўніцтвам УсеААПП плянавую распрацоўку асноўных проблем нацыянальнай культуры. Гэта азначае: ўзяць на вучот усе тэорытычныя кадры нашага руху, усеапаўскія кадры. Гэта азначае, далей, узяць на вучот усе партыйныя тэорытычныя кадры, якія ў гэтых адносінах нам змогуць дапамагчы. Гэта азначае: заключыць практычны блёк з тымі організацыямі, якія гэтай справай займаюцца, павінны займацца ў кожным выпадку. Комакадэмія ў першую чаргу і намеціць разам з імі дакладны плян працы ў гэтых адносінах.

Займацца ня толькі тэорыяй, але і практыкай культурнай рэволюцыі.

Ніякіх агульных гутарак аб уважэ да нацыянальнай культуры! Нам патрэбна конкрэтная распрацоўка такіх-та і такіх вузлавых пытаньняў, і будзе добра, калі мы здолеем падобна таму, як калісьці праводзі-

ліся вытворчыя нарады па пытаньнях поэзіі і нарысу, у выніку нашай працы склікаць вытворчую тэорытычную нараду па пытаньнях тэорыі нацыянальнай культуры. Мне здаецца, што спрэчкі выявілі і другі вялікі недахоп у працы нашых асоцыяцый. Я кажу аб увазе да практыкі культурнай рэволюцыі. Вельмі мала тут казалася аб практычных пытаньнях культурнай рэволюцыі. Проблема ліквідацыі няпісьменнасьці, проблема ўсеагульнага навучаньня, проблема політэхнізацыі школы і г. д. і т. п., гэтыя проблемы ў спрэчках амаль не закраналіся. Ці гэта праўда, ці не? Праўда. Плюс, ці мінус? — Мінус. Пролетарскія пісьменьніцкія кадры гэтай справай займацца павінны, і калі за культурнае жыцьцё кожнай нацыянальнай рэспублікі, кожнай саюзнай рэспублікі адказвае Народны комісарыят асьветы, то мы, Усесаюзнае аб"яднаньне асоцыяцый пролетарскіх пісьменьнікаў, маем права называцца складанай часткай УсеААПП, і мы УсеААПП, тады будзем мець права прэтэндаваць на кіраўніцтва пролетарскім літаратурным рухам, калі на справе будзем ставіць рад пытаньняў культурнай рэволюцыі і будзем дзерціся за іх бальшавіцкае вырашэньне. Гэтага пакуль што няма.

Гэта толькі адносна новыя задачы, мы іх і раней ставілі, але зараз яны паўстаюць па-новаму, у сувязі з новым размахам культурнай рэволюцыі, і гэтыя новыя задачы мы павінны паставіць перад сабой абавязкова.

Кадры растуць на бальшавіцкім вырашэньні новых усё больш цяжкіх задач.

Усе выступаўшыя таварышы гаварылі, што па гэткай-та лініі ў нас промах, па гэткай-та лініі ў нас недахоп, па гэткай-та лініі мы аддаем мала ўвагі і г. д. Новых пытаньняў і задач можна налічыць вельмі шмат. Сапраўды, перад намі зараз у зьвязку з тым, наколькі выросла значэньне пролетарскай літаратуры ў цэлым, УсеААПП у прыватнасьці, перад намі паўстае шмат новых задач і пытаньняў, а між тым мы ўжо на сёньняшні дзень маем вельмі вялікі разрыў паміж нашымі задачамі і нашымі кадрамі Перад намі значна большая колькасьць задач, чым мы маем сіл кадраў для таго, каб з імі спраўляцца.

Пытаюся: як выйсьці з такога становішча? Тут ёсьць два выхады. Першы выхад заключаецца ў тым, каб звузіць круг задач, якія мы павінны вырашаць, каб абмяжаваць колькасьць спраў, якімі мы займаемся. Гэта няправільная пастаноўка пытаньня, гэта раўнаньне на вузкія мясьціны. Ёсьць другая, правільная, бальшавіцкая пастаноўка пытаньня, якая заключаецца ў зразуменьні таго, што кадры растуць на пастаноўцы новых задач, што кадры растуць тады, калі ставяцца ўсе больш і больш цяжкія з кожным днём новыя задачы. Мы выбіраем другую лінію, выбіраем тую лінію, якая не абмяжоўвае колькасьць пытаньняў, якімі мы займаемся ў літаратурным руху,—мы бярэм ўсю тую суму пытаньняў у цэлым, якія няўхільна стаяць перад літаратурным рухам, будучы ўпэўнены ў тым, што, бяручы гэтыя задачы і падыходзячы да іх ў суадпаведнасьці з устаноўкамі, якія дае партыя, мы будзем мець рост кадраў, які будзе ўсьцяж павялічвацца. Кадры толькі так могуць расьці і будуць расьці.

Гэта, таварышы, наша лінія, і адпаведна з ёй, у прыватнасьці, мы высунулі лёзунг закліку рабочых-ударнікаў. Калі мы гаварылі аб гэтай задачы, здавалася-б: ня справіцца, ня хопіць сіл. І на самай справе, на сёньняшні дзень яшчэ ня справіліся. Не мы толькі падышлі да пастаноўкі на справе гэтай працы. Калі казаць пра вопыт РАПП, аб Маскоўскай і Ленінградзкай асоцыяцыі, то там мы маем ўжо новае рабочае кіраўніцтва. І ў Ленінгра-

дзкай і Маскоўскай арганізацыях там за невялікі адрэзак часу выраслі і занялі ў арганізацыі па сапраўднаму кіруючае становішча новыя рабочыя таварышы. Калі не гаварыць толькі аб тых задачах, якія перад намі стаяць, а працаваць над імі, як належыць, то будуць выяўляцца новыя кадры. Гэта закладзена ва ўсёй нашай абстаноўцы, гэта закладзена ў гіганцкім уздыме соцыялістычнага будаўніцтва, гэта закладзена ў тым гіганцкім трудавым энтузіязьме нашай краіны, які ня можа не адбівацца і на галіне літаратурнай працы.

Аб пролетарскай організаванасьці і літаратурным асяродзьдзі.

Калі мы гаворым аб супярэчнасьці паміж нашымі задачамі і кадрамі, калі мы даем лёзунг яшчэ большага пераключэньня нашай увагі на творчыя пытаньні, мы павінны завастрыць пытаньні організацыйнага парадку, каб ўсе нашы організацыі выканалі тыя задачы, якія перад намі стаяць. Аб гэтым казалася мала, а між тым, вазьміце практыку кожнай літаратурнай організацыі, перш за ўсё РАПП. Колькі безадказнасьці, няхлюйства, нявыкананьня прынятых пастаноў,—на адным паседжаньні разьбіраецца пытаньне, ставіцца яно-ж і на другім паседжаньні пераносіцца на 3-е паседжаньне і ізноў усплывае на 4-м. Гэта тлумачыцца тым, што звычкі літаратурнай богэмы, уласьцівыя дарэволюцыйнаму літаратурнаму асяродзьдзю, гэтыя звычкі ў тым-сім пераносяцца на сыстэму працы пролетарскіх літаратурных організацый, пры чым мне здаецца, што гэта ня толькі маецца ў РАПП, але што і ва ўсіх пролетарска-літаратурных організацыях такое становішча маецца. Калі не разумеюць, што гутарка ідзе не аб гуртку сяброў, не аб літаратурнай гутарцы, а гутарка ідзе аб вялікім руху, які адказвае за ўсю літаратуру ў цэлым, за ўсіх пролетарскіх пісьменьнікаў, за ўвесь фронт літаратуры,—вось такога падобнага зразуменьня ў нас яшчэ няма.

З тых спрэчак, якія тут адбываліся, выцякае яшчэ адно сур'ёзнае пытаньне па лініі організацыйнай—выжыць богэмшчыну, дабіцца такога становішча, калі нашы літаратурныя організацыі будуць працаваць, як рабочыя організацыі, будуць ня толькі „заклікаць" ударнікаў і дэкляраваць, але і перабудоўвацца так, каб паўдарнаму працаваць. Бяз гэтага мы ня справімся з задачай вылучэньня новых кадраў і сапраўднага павароту да творчых пытаньняў, які мы павінны зрабіць.

Гутарка ідзе не аб тым, каб богэмшчыну замяніць бюрократызмам, нельга кідацца ў крайнасьці. Гутарка ідзе аб тым, каб на пачатках сапраўды пролетарскай дэмократыі дабіцца сапраўды добрай бальшавіцкай работы організацый. Гэта не азначае, што трэба капіраваць мэтоды работы іншых організацый. Гэта прынесла-б толькі шкоду. Наадварот, трэба больш увагі аддаваць організацыйным пытаньням раз і на заўсёды, каб пасьля займацца імі значна менш. Таму, шчыра кажучы, зараз на організацыйнае пытаньне аддаецца больш часу, чым калі-б мы ўстанавілі патрэбны парадак і адказнасьць у сябе, як у іншых організацыях. Але тут трэба адзначыць нашу спэцыфічнасьць. Яна заключаецца ў тым, што мы не павінны капіраваць мэтод працы партыйных організацый, мэтод працы савецкіх організацый, чым менш займацца організацыйнымі пытаньнямі, а ўсю практыку працы, усю організацыйную сыстэму падпарадкаваць творчым задачам, таму, каб дапамагчы нашым творчым кадрам, тэорытычным, пісьменьніцкім, з гэтым мы павінны справіцца, каб дапамагчы куды большаму вылучэньню новых кадраў у літаратурным руху. І гэтая задача ўскладняецца тым, што ў нашых організацыях

маецца вялікая колькасьць звычак мінулага літаратурнага асяродзьдзя.

Няма нічога горшага за дробна-буржуазнае асяродзьдзе няма нічога горш гэтага дробна-буржуазнага акружэньня, якое спаткаецца каля кожнай нашай пролетарскай літаратурнай організацыі, і няма нічога горшага, як звычкі мінулага, якія засталіся ў галіне літаратуры, калі шмат якія з пісьменьнікаў, і нават пролетарскіх пісьменьнікаў, адчуваюць сябе ня столькі таварышом другога пролетарскага пісьменьніка, колькі конкурэнтам, які суперніча з ім, калі мы маем становішча, што замест таго, каб цешыцца посьпехамі свайго суседа і хварэць за яго няўдачы, мы маем зусім іншыя адносіны. Хаваць няма чаго, гэта і ў нашых організацыях ёсьць, і гутарка ідзе аб тым, каб так перабудаваць нашы організацыі, каб адкінуць усё тое дробна-буржуазнае ахвосьце, якое круціцца навокал нашых організацый, адкінуць усю тую калялітаратурную публіку, якая на любым літаратурным сходзе, на любым літаратурным дакладзе—я не ўпэўнены, што яе няма і тут—заўсёды круціцца і прысутнічае.—Падобных людзей і людзішак нам патрэбна адкінуць на бок, каб нашы пролетарскія літаратурныя організацыі працавалі сапраўды ў пролетарскім літаратурным асяродзьдзі, са звычкамі пролетарскай дэмократыі, каб была здаровая партыйная атмосфэра ў організацыях, а не атмосфэра групаўшчыны і гурткоўшчыны (воплескі).

Аб гэтым патрэбна абавязкова гаварыць у сувязі з падрыхтоўкай і вылучэньнем новых кадраў. Трэба разумець, што мы па сапраўднаму ня здолеем высунуць новыя кадры з рабочых да кіраўніцтва да тэй пары, пакуль па-сапраўднаму не справімся з рэшткамі дробна-буржуазнага літаратурнага асяродзьдзя.

Гэта мае значэньне і таму, што ў нас усё больш і больш будуць адчувацца пэўныя ўнутраныя супярэчнасьці ўнутры-пролетарскага літаратурнага руху, будзе ўсё больш і больш адчувацца неаднароднасьць руху ў цэлым.

Аб творчай дыскусіі і творчых групоўках.

У свой час мы маглі ставіць знак роўнасьці паміж напостаўствам і РАПП, паміж напостаўствам і ВУСПП і „Маладняком“, паміж напостаўствам і Закаўкаскай організацыяй. На сёньняшні дзень мы маем іншае становішча. Мы маем шмат таварышоў, якія не зьяўляюцца напостаўцамі. Напостаўства застаецца толькі аднэй з асноўных плыняў у нашай літаратуры—гэта кіруючы рух і кіруючыя кадры УсеААПП, гэта тыя кадры, якія прайшлі школу напостаўства, хочуць быць ў напостаўстве і надалей, бо лічаць, што яно найбольш адпавядае гэнеральнай лініі партыі, што гэта сваяасаблівая бальшавіцкая разьведка на літаратурным фронце. Побач з гэтымі старымі напостаўскімі кадрамі мы маем і іншыя кадры, якія ўсьцяж павялічваюцца. Прычым у ліку новых ёсьць і антыпостаўцы. Гэта, вядома, павялічвае адказнасьць напостаўства за кіраўніцтва ўсім пролетарскім літаратурным рухам, але, зьяўляючыся кіруючай плыньню ва УсеААПП, павінна забясьпечыць сапраўдную свабоду разьвіцьця ўсім творчым плыням. Гэта першая задача, якая ляжыць на кіраўніцтве.

Некаторыя разумеюць задачы напостаўцаў так, што гэта, моў, ісьціна ў апошняй інстанцыі. Гэта значыць, хтосьці спрачаецца, а мы нарэшце вырашаем. Гэта памылкова. Мы павіны самі ставіць новыя пытаньні, вырашаць іх і на гэтым ідэйна яднаць організацыю. У старых кадраў напостаўцаў, і расійцаў, і ўкраінцаў, і грузінаў, ёсьць яшчэ звычкі і традыцыі мінулага пэрыоду працы, калі мы былі аднэй

з плыняў, а зараз мы—УсеААПП, кіруючая оганізацыя, і мы павінны забясьпечыць такое становішча, калі ўсе, хто ўліваёцца ва УсеААПП будуць адчуваць сябе так, што калі я, сапраўды пролетарскі пісьменьнік, дык мне ва УсеААПП жыць лёгка, са мною лічацца, хочуць мне даць магчымасьць спакайней і больш упэўнена працаваць, мне тут дапамагаюць, ня гледзячы на рознагалосьсі з думкаю нават ўсіх напостаўцаў, з думкаю таго ці іншага крытыка, з думкаю кіруючай часопісі і інш. Гэта мы павінны забясьпечыць, бо інакш мы ня здолеем захаваць адзіны пролетарскі літаратурны рух.

Ва УсеААПП маюцца самыя розныя групоўкі. Рост рабочага ядра прывядзе і прыводзіць да таго, што гэтае рабочае ядро будзе і пачынае па-сапраўднаму кіраваць нашым рухам, але гэта ня значыць, што тым самым зьнікае проблема розных элемэнтаў. У нас маецца інтэлегенцкае крыло, сялянскае крыло, самыя розныя адценьні ў пролетарскай літаратуры.

Калі гутарка ідзе аб консолідацыі ва УсеААПП навокал яго, дык гэта адзначае, што тут павінны быць цалкам аднародныя погляды. Нам патрэбна консолідацыя, якая вырастае з барацьбы поглядаў, консолідацыя, якая зьбліжае розныя кадры. Тая консолідацыя, аб якой сьведчыць наш пленум, гэта ня ёсьць консолідацыя на аснове заглушэньня творчых дыскусій і поглядаў, а, наадварот, гэта ёсьць такая консолідацыя, літаратурня-палітычная, такая консолідацыя бальшавіцкіх кадраў, якая забясьпечвае і мае на ўвазе спакойнае разгортваньне творчай дыскусіі. Такія творчыя групоўкі, якія паспрабуюць перарасьці у літаратурна-палітычную фракцыю загадзя засуджаны на няўдачу, бо наш рух адзіны, ён сваю лінію выпрацаваў ў баёх, ён праверыў кожнага чалавека і ўсім ведае цану.

Консолідацыя нашага руху адбываецца навокал напостаўцаў. Напостаўства — гэта ёсьць асноўная плынь, але консолідацыя напостаўцаў павінна прывесьці да росквіту творчых груповак, да значна большага, чым гэта было раней.

У нас мала творчых груповак, хоць мы шмат пра іх гаворым, і галасуем за іх адназгодна. Чаму-ж ў нас мала творчых груповак? Мо, з прычыны консолідацыі? Так, моў, „консолідуем", што другіх забіваем? Не, гэта паказчык ўзроўню пролетарскай літаратуры. У нас мала груповак ў пролетарскай літарасуры таму, што яна яшчэ толькі ўступае ў перыод сапраўднага творчага росквіту,

Які-ж далейшы шлях пролетарскай літаратуры? Гэта шлях росту як мага большай колькасьці пісьменьнікаў, якія адрозьніваюцца адзін ад аднаго, пісьменьнікаў, у якіх будуць розныя школы, пісьменьнікаў, якія ідуць рознымі сьцежкамі па шляху ўтварэньня мэтоду дыялектычнага матэрыялізму. Можна ўжо і на сёньня ўтварыць 20-30-50 творчых груповак, гэта не складае цяжкасьці. Калі даручыць стараннаму крытыку, дык ён здолее напісаць і програму для груповак, але гутарка ідзе аб тым, каб утварыць такія творчыя групоўкі, якія будуць адлюстроўваць розныя плыні, якія ўжо намеціліся, ці якія толькі намячаюцца ў творчасьці.

Кіраўніцтва тады стаіць на вышыні, калі яно ўмее схопліваць праявы таго, што адрозьнівае аднаго пісьменьніка ад другога, умее схопліваць тое, што яшчэ ня ярка выяўляецца. Але тое, што намячаецца, умее схопліваць тэндэнцыі, У гэтым задачы кіраўніцтва. Кіраўніцтва павінна з гэтага выходзіць ва ўсей сваёй практычнай рабоце. Толькі тады яно мае права на сапраўднае кіраўніцтва.

Калі на пленуме гаварылі аб творчых групоўках, дык некаторыя таварышы зазначалі на небясьпеку, якая

з ёй зьвязана. Сапраўды, небясьпек шмат. Небясьпека заключаецца ў тым, што тая ці іншая творчая групоўка можа выразіцца ў групоўшчыну, можа скаціцца да пэўнай кялейнасьці ў сваёй рабоце, можа ўтварыць такое становішча, пры якім гэтая група будзе супроцьстаўляць сябе руху ў цэлым і адрывацца ад яго. Можа ўтварыцца такое становішча, што група, сама не аддаючы сабе справаздачы, для чаго яна ўтварылася, няўхільна будзе ствараць абстаноўку чутак і плётак. Можа быць такая небясьпека, што група захоча перарастаць у літаратура-палітычную фракцыю. Гэтыя небясьпекі маюцца. Але той, хто гаворыць толькі аб небясьпеках, той, хто толькі на гэтым спыняецца, той не разумее становішча нашага руху сёньня.

Сёньня нам патрэбна гаварыць аб небясьпеках, зьвязаных з тым, што мала—ужо можа быць больш!—гэтых творчых груповак, што тамсям маецца, мабыць, і бюракратычны зажым гэтых творчых груповак. Галоўная небясьпека на сёньняшні дзень заключаецца ў тым, што ня хочуць зацьвердзіць тую ці іншую творчую групоўку, калі яна яшчэ не даканца выпрацавала сваю платформу, галоўная небясьпека ў тым, што не адбываецца прысьпешаная творчая разьмяжоўка.

Наша задача заключаецца ў тым, каб па гэтай галоўнай небясьпецы ўдарыць з як мага найбольшай сілай, выкрываючы алілуйшчыну і ў гэтай галіне.

Таму, калі выступала група „напостаўская зьмена", дык пленум з радасьцю вітаў гэтую групоўку. І мне думаецца, што калі пленум Усесаюзнага аб'яднаньня асоцыяцый пролетарскіх пісьменьнікаў вітаў групу „напостаўская зьмена", дык ён вітаў усе групы, якія ўтвараліся і ўтвараюцца ў нашым руху.

Калі гутарка ідзе аб творчых групоўках і аб разгортваньні творчай дыскусіі, дык патрэбна адзначыць галоўнейшае, а іменна, забясьпечыць абмен вопытам, узаемадапамогу, таварыскае супрацоўніцтва. Творчая дыскусія павінна быць пастаяннай практычнай школай для ўсіх нашых пісьменьнікаў і, асабліва, для новых рабочых кадраў,—школа і вучоба творчаму мэтоду, а ня проста сумай прыкладных тэхнічных прыёмаў.

Перад намі стаіць задача ажыцьцяўленьня гэгемоніі у як найкарацейшы гісторычны тэрмін, але трэба сказаць, што ўзровень пролетарскай літаратуры яшчэ недаволі высокі. Гэта трэба сказаць з усёй выразнасьцю. Я рад канстатаваць, што калі таварышы выступалі ў спрэчках, дык адчуваўся тон трывогіі за ажыцьцяўленьне гэтых задач, якія стаяць перад намі, адчуваўся тон трывогі за тое, як мы справімся з усімі гэтымі задачамі, а нічуць ня тон самаздавальненьня.

Адставаньне пролетарскай літаратуры канстатавалася ўсімі. Гэта складанае пытаньне, якое шмат кім спрошчвалася і спрошчваецца. Проблема ліквідацыі і адставаньня гэта ёсьць проблема пераводу пролетарскай літаратуры ў больш высокую клясу, на вышэйшую ступень разьвіцьця на больш высокі ўзровень сьветапогляду бальшавізму. Ліквідаваць адставаньне па-літфронтаўску—гэта лёгка, але гутарка ідзе аб тым, каб ліквідаваць адставаньне па-бальшавіцку, гэта значыць, ставячы перад сабой вялікія задачы, даючы лёзунг вялікага мастацтва бальшавізму.

Мы сёньня шмат гаварылі аб недахопах, аб хваробах пролетарскай літаратуры. Але трэба бачыць у пролетарскай літаратуры тое, што адрозьнівае яе ад усіх іншых атрадаў савецкай літаратуры. Мы павінны ўмець схопліваць ў творчасьці нават начынаючага пісьменьніка рысы новага мастацтва, мас-

тацтва рабочай клясы, нічуць не перахвальваючы гэтага пачынаючага, але выяўляючы зерні таго, што можа стаць заўтра вядучым наперад усю нашу літаратуру.

Яшчэ аб закліку рабочых-ударнікаў

Мы часта спатыкаемся з некаторымі таварышамі з папутніцкага лягеру, ці таварышамі, якім уласьціва орыентацыя на папутнікаў, якія гавораць, што, моў, мы папутнікі, пішам лепш. Бывае, вядома, і так, але ты пішаш лепш з пункту гледжаньня якіх крытэрыяў? Дзе крытэрыі таго, што зьяўляецца мастацкім? Ці-ж можна дазваляць падменьваць разуменьне мастацкасьці літаратурнай тэхнікай? І тут мы сутракаемся з неразуменьнем таго, што гутарка ідзе аб новай якасьці, аб якасна новым мастацтве ў параўнаньні з усім мінулым.

Вядома, тая работа, якую выконваюць закліканыя рабочыя-ўдарнікі, стаіць яшчэ вельмі і вельмі часта на нізкім літаратурным узроўні. Але мы цалкам правы, калі аддаем надзвычайную ўвагу ўдарніцка-літаратурнай продукцыі. Чаму гэта важна? Чаму гэта частка куды больш важна, чым разгляд твораў таго ці іншага выяўленага пісьменьніка, які добра піша з абывацельскага пункту гледжаньня? Нам гэта важна таму, што гэтым утвараецца новае слова ў разьвіцьці мастацкай літаратуры. Для нас важна продукцыя рабочых ударнікаў ня толькі таму, што яна дае на сёньняшні дзень, а таму што ў ёй закладзены магчымасьці, якія да гэтага часу яшчэ не даацэнены. На падставе работы з гэтымі закліканымі і з тымі кадрамі, якія з іх зьявяцца, з гэтага абавязкова будзе расьці іменна тое, што якасна адрозьнівае наш рух ад іншых атрадаў савецкай літаратуры, тое, што павінна адрозьніваць ўсю пролетарскую літаратуру ад самай блізкай папутніцкай. Цяжка часам бывае правесьці мяжу між тым ці іншым паасобным пролетарскім пісьменьнікам і тым ці іншым папутніцкім пісьменьнікам. Але трэба ўмець бачыць мяжу, якая аддзяляе на даным этапе ўсю пролетарскую літаратуру ад усіх іншых атрадаў пролетарскай літаратуры.

Калі гутарка ідзе аб закліку ўдарнікаў, не выпадкова, мне здаецца, у спрэчках было аддадзена шмат увагі пытаньню аб профэсіяналізацыі. І гэтае пытаньне павінна вырашацца ў літаратуры, мне здаецца, у суадносьці з неабходнасьцю паставіць больш шырокія задачы і больш глыбокія проблемы. Неабходна паставіць проблему, як мага хутчэй зьнішчыць у нашай краіне супроцьлегласьці паміж разумовай і фізычнай працай,—да чаго мы ўжо расьцем. Мы назіраем, як у нас у краіне, па мере росту соцыялізму, пачынае згладжвацца супроцьлегласьць паміж разумовай і фізычнай працай. Заклік ударнікаў надзвычай ярка выяўляе гэтую тэндэнцыю. У нас зараз 7-мігадзінны рабочы дзень. Мы ідзем і да 6—і 5-цігадзіннага рабочага дня. Гэтае пытаньне гісторычна яснае. Гэта значыць, што мы ідзем да таго становішча, калі пытаньне аб профэсіяналізацыі будзе ставіцца па-іншаму, у сувязі з тым, што ў нас будзе па-сапраўднаму здымацца супроцьлегласьць разумовай і фізычнай працы.

Паказ гэрояў комуністычнай працы

У спрэчках малавата гаварылася, што да паказу гэрояў працы. Я ў сваю чаргу спэцыяльна заявіў, што ў дакладзе не хачу гэтага закранаць, бо хачу пасьля спрэчак падвесьці вынікі ўсяму зробленаму асоцыяцыямі. Трэба, таварышы, паклаўшы руку на сэрца, сказаць, што асоцыяцыі аб гэтым вельмі кепска інформавалі. Па сутнасьці справы ў гэтых адносінах шмат якія з нас пакуль што абмежаваліся некаль-

кімі дэкларацыямі, некалькімі прыгожымі заявамі—ня больш. А між тым, таварышы, калі мы гаварылі аб тым, што гэта экзамэн для пролетарскага літаратурнага руху, мы ня гулялі ў дурня, ні ў цацкі, не жартавлі. Гэта сапраўды экзамэн. І калі мы ня здолеем партыі даказаць, што мы, Усесаюзнае аб'яднаньне асацыяцый пролетарскіх пісьменьнікаў, і з гэтымі задачамі ня здолеем справіцца па-ўдарнаму, ніякага экзамэна мы не дамо, а будзем падобны на хлопчыкаў якія шмат крычалі, а на справе з сур'ёзным даручэньнем справіцца ня здолелі. Я думаю, што мы павінны проста і сур'ёзна нашаму сэкратарыяту УсеААПП даць наказ: не пазьней чым праз дзьве дэкады выясьніць, што зроблена ў гэтай галіне ўсім нашым рухам, каб сэкратарыят УсеААПП (новы сэкратарыят УсеААПП) на гэтай справе выявіў сябе, як організацыя, якая вядзе ўвесь наш пролетарскі літаратурны рух ня толькі, як месца спатканьняў, але і як рабочы штаб нашай організацыі. І калі мы гаворым аб заводзкай тэматыцы, аб паказе гэрояў працы, мы павінны забясьпечыць на гэтым рост ўсёй нашай літаратуры і павышэньне яе мастацкай якасьці.

Нам даводзіцца часам спатыкацца з такімі ныцікамі, якія гавораць: „Ах, прыходзім на мастацкую выстаўку, а на гэтай выстаўцы адны заводы, і ўсе афарбованы ў адзін шэры колер, якое гэта мастацтва? Гэта гібель мастацтва" і г. д. і т. п.

Гэтыя людзі, таварышы, не разумеюць таго, што ў нашым савецкім заводзе, на прадпрыемствах соцыялістычнага тыпу, у гэтай асноўнай ячэйцы новай грамады, якую мы будуем, што мы ў гэтым заводзе маем магчымасьць атрымаць, зачэрпнуць такую тэматыку, якую мы ні дзе ні на якім іншым вучастку савецкай рачаіснасьці ня знойдзем. Гэта па-першае.

Па-другое, гэтыя людзі ня здольны бачыць таго, што іменна гэтыя тэмы спрыяюць выпрацоўцы такога мастацкага мэтоду, якім наша мастацтва павінна спэцыфічна адрозьніваццца ад кожнага іншага мастацтва. Гэтыя людзі ня бачаць надзвычай часта, што хоць і фарбуюць у „шэрую фарбу", але навучаюцца, навучацца і пойдуць наперад і, галоўнае, ужо здорава ідуць.

Аб папутніках, аб саюзьніках, аб Аляксею Талстым

Вернемся, аднак, да паказу гэрояў працы. Гэта для нас абавязкова, гэта ня проста добрае пажаданьне. Паказваць гэрояў працы—гэта гучыць як загад для пролетарскага пісьменьніка,—гэта абавязкова і для папутніцкіх кадраў.

На праблеме папутніцтва я хачу адмыслова затрымацца, таму, што яна ў спрэчках заняла, як мне здаецца, недастатковае месца. Аб папутніцтве, у маштабе ўсяго нашага руху, гаварылася мала. Што мы маем з папутніцтвам на сёньняшні дзень?

Я гаварыў у дакладзе, што разгром зьменавехаўства, разгром нацыянал-дэмократызму ня здымае проблемы папутніцтва. Што тут патрэбна выпучыць?

Ёсьць нашы пісьменьнікі, якіх мы называем пролетарскімі. Каб быць пролетарскім пісьменьнікам ёсьць для іх справа органічная, гэта іх найвялікшая свабода,—іх вольнае разьвіцьцё ёсьць пролетарскае разьвіцьцё. Але ёсьць такія кадры папутніцкіх пісьменьнікаў, якія хочуць пісаць па-пролетарску, жадалі-б пісаць па-пролетарску, хацелі-б служыць пролетарскай рэволюцыі, але яны яшчэ ня могуць, ім яшчэ шмат што перашкаджае. Жаданьне быць пролетарскім пісьменьнікам не заўсёды зьяўляецца для іх органічнай свабодай. Гутарка ідзе аб тым, каб адшукаць такую зачэпку ў адносінах да кожнага

папутніцкага пісьменьніка, якая-б забясьпечвала ператварэньне яго неабходнасьці быць пролетарскім пісьменьнікам у ягоную свабоду, гэта значыць, гутарка ідзе аб глыбокай і сапраўднай ягонай перабудове. Таму патрэбна да кожнага папутніцкага пісьменьніка падыйсьці па-роднаму, каб дапамагчы яму набліжацца да нас. Мы павінны проста прызнацца, што мы гэта робім ня досыць добра, часта робім гэта няўмела, ня ўмеем ухапіцца за асаблівае, што іменна гэтага пісьменьніка хвалюе.

Пытаюся, якім чынам гэтыя папутніцкія кадры перабудоўваць? Тут мы маем два шляхі. Адзін шлях—асабліва часта рэкомэндуецца людзьмі, якія любяць гаварыць аб складанасьці, аб тым, што людзі ў нас складаныя, патрэбна да іх падыходзіць ня прымітыўна, што вы лезеце з агульнымі гутаркамі аб клясавай барацьбе, кіньце політграмату, моў, уся інтэлігенцыя ідзе да нас. Гэта, вядома, самыя вульгарныя права-опортуністычныя пошласьці, бо, па-першае, ня ўся інтэлегенцыя ідзе да нас, і што ёсьць інтэлігенцыя, якая адыходзіць ад нас. І калі мы гаворым аб папутніках, самае цікавае заключаецца ў тым, што маюцца ўжо папутнікі, якія нават самі не разумеюць, што яны перастаюць быць папутніцкімі пісьменьнікамі. Як гэта адбываецца? Гэта адбываецца так, што з кожным днём няўхільна ўсьцяж большыя і большыя патрабаваньні ставяцца, і нават самыя „страшныя" крытыкі нярэдка адстаюць ад гэтых патрабаваньняў, якія наша эпоха ставіць перад сваёй літаратурай. Шмат якія папутнікі не разумеюць, што бывае так: тое, што ўчора было адценьнем поглядаў, сёньня зьяўляецца двума рознымі і варожымі лініямі. Быць папутнікам нічуць не азначае стаяць увесь час на аднэй і тэй-жа позыцыі.

У мяне ў руках кніжка Пётры Шыраева: „Внук Тальони". Мне здаецца, што тут можна было-б так формуляваць два пункты гледжаньня на яе: адзін– вось, моў, памешчыкі займаліся гадоўляй коняй, умелі выгадаваць самай высокай якасьці конскія пароды, а зараз у нас сам селянін гэта можа зрабіць. Вось, моў, гавораць, што новая культура—гэта будзе хамства, гібель і ўсё іншае,—нічога падобнага, бачыце, мы яшчэ лепш выводзім пародзістых коняй, чым колішны памешчык. Вось, значыцца, рэволюцыйная ідэя, вось рэволюцыйні твор. Але тыя, якія так гавораць, не разумеюць таго, што яны гавораць аб буржуазна-дэмократычнай рэволюцыйнасьці, што „Внук Тольони", калі і рэволюцыйны твор, дык у буржуазна-дэмократычным сэнсе гэтага слова. Маюцца такія папутнікі, якім па шляху з тым, што наша рэволюцыя дарабіла буржуазна-дэмократычную, а мы сёньня супроцьстаўляем не расійскі і амэрыканскі шляхі разьвіцьця, а супроцьстаўляем буржуазнае разьвіцьцё соцыялістычнаму, супроцьстаўляем соцыялізм капіталізму. І кніжка Шыраева з гэтага адзіна правільнага пункту гледжаньня шкодная, бо гэтая кніжка даводзіць, што паасобныя сяляне-індывідуалы могуць справіцца са справаю конягадоўлі лепш, чым буйная памешчыцкая гаспадарка. Гэта найвялікшая недарэчнасьць, тым больш заблытаная, што Шыраеў дае селяніна не кулака, а серадняка і гэтым хоча паказаць, што серадняк можа гэтую рэч зрабіць, не адчуваючы патрэбы ні ў якіх калгасах. Гэта рэакцыйная рэч.

Вельмі магчыма, што Шыраеў, які пісаў гэтую рэч, здаецца, у 1928 г, быў вельмі добра і, як яму здавалася, рэволюцыйна настроеным, але гэтая "рэволюцыйнасьць" не бальшавіцкая, яна падобна хутчэй на эсэраўскую. І тут справа ня проста ў зьмене ці павялічэньні

патрабаваньня,—пры чым вельмі часта папутнікі нават і не разумеюць крытыку, і тыя патрабаваньні, з якімі крытыка да іх падыходзіць, яны лічаць зьменай асабістай ацэнкі таго ці іншага таварыша ў адносінах таго, ці іншага твору, тады калі гутарка ідзе аб адлюстраваньні клясавай барацьбы, якая абвастраецца і паглыбляецца,—не, твор Шыраева і ў 1927 і ў 1928 г. быў-бы шкодным і няправільным.

Потым, маюцца папутнікі, якія вядуць такія гутаркі,—я думаю, што гэта ёсьць ня толькі ў літаратуры расійскай, але і ў літаратуры ў большасьці саюзных рэспублік,—папутнікі, якія высоўваюць такія тэорыі, якое, моў, можа быць зараз мастацтва, калі нічога нельга выдумаць большага, чым наша рачаіснасьць, што гэтая рачаіснасьць настолькі вялікая, што нічога новага ня прыдумаеш, і нічога не застаецца для мастацтва. І калі раней пісьменьнік быў правадыром, „власьціцелем дум", навокал якога маглі вырастаць масы, дык сама маса на гэтулькі вырасла, што пісьменьнік ня можа яе весьці. На першы погляд такія разважаньні выглядаюць так, што быццам: глядзіце, як гэтаму пісьменьніку падабаецца наша рачаіснасьць і падабаецца рух мас, але на самай справе тут хаваюцца рэакцыйныя ідэйкі аб адмірaньні мастацтва, аб немагчымасьці пісьменьніцкай творчасьці ў нашай краіне. Вельмі часта даводзіцца гэтую рэакцыйнасьць вылушчываць з-пад шалупіньня формулёвак, якія маскуюць гэтыя ідэйкі. Мы добра разумеем, адкуль і куды растуць гэтыя тэорыі, падобная гутарка, што пісьменьнік ня можа быць „правадыром", мо і няма патрэбы „выдумляць", але трэба ўмець бачыць ня толькі паверхню зьяў, але і тое, што хаваецца за ёй і прадбачыць заўтра, убачыць сёньня тое, што засталося ад учора, і прадбачыць тое, што наступіць заўтра. Тут для таленавітага чалавека вельмі вялікая задача, і калі гаворыцца, што раней была патрэбна дыдактычная літаратура, а зараз яна не патрэбна, дык гэта памылкова. З пункту гледжаньня бальшавіцкага выхаваньня мас, нам патрэбна такая пролетарская літаратура, якая-б выступала ў якасьці ідэйнага кіраўніка ў адносінах да чытачоў. За такую літаратуру мы змагаемся, такую літаратуру мы створым і будзем за гэта змагацца з кім угодна, у тым ліку і супроць таго ці іншага папутніка, якім можа быць пэўны час яшчэ разам з намі на мінулым этапе рэволюцыйнага руху, а зараз адыходзіць ад нас. Я прывяду вам, таварышы, адзін прыклад такой папутніцкай „перабудовы", каб паказаць, як ня трэба перабудоўвацца, і супроць чаго мы будзем змагацца. Вось кніжка, напісаная брыгадай ВССП, пад назваю „Большая Балахна" (некаторыя гавораць пра гэтую кніжку: „бальшое барахло"). Брыгада складалася з пісьменьнікаў: Глеба Аляксеева, Бальшакова, Буданцова, Юрыя Сьлёзкіна (сьмех). Дзеля таго, каб уявіць тое, на колькі агідна тое, што гэтыя людзі зрабілі, трэба паглядзець на канец кніжкі. У канцы кніжкі прыкладзены водзывы рабочых аб гэтай брыгадзе, пры чым атрымліваецца такое становішча, што рабочыя Балахны, натуральна, выступалі як людзі культурныя і выхаваныя, бо гэтыя пісьменьнікі зьвярнуліся да рабочых, каб рабочыя далі водзывы аб іх дзейнасьці,—ужо адна гэтая рэч мала прыстойная. Можна было пайсьці ў заўком, ці на рабочы сход, зрабіць справаздачу і такім чынам мець водзыў, калі ў ім ёсьць патрэба, ня было патрэбы зьвяртацца да рабочых за падобнымі водзывамі. Амаль 15 старонак займаюць розныя водзывы аб працы гэтай пісьменьніцкай брыгады. Ня так цікава чытаць самыя водзывы, колькі пацешным зьяўляецца самы факт друкаваньня, як прыклад пратэнцыйнай брыдоты і вялікай фанабэрыі гэтых

людзей, якія паехалі „працаваць“ на прадпрыемствы.

Я прывяду адзін прыклад: Бальшакоў напісаў верш:

„Семнадцать тонн дать должен дефибрер,
Машины требуют древесной массы!
Кричи и требуй этого, рабкор.
Ты выполняешь волю класса!“

Далей ідуць комэнтарыі: „Нам падабаецца“. Мы гатовы пляскаць у далоні“. І надрукаваўшы гэта на 97 старонцы, гэтыя-ж радкі, інакш разьмешчаныя, паўтараюцца на 115 ізноў і яшчэ раз на 127 старонцы—як чатырохсьціішіа. Гэта самая нядобраякасная халтура, якая нічога агульнага з поэзіяй ня мае, якая нічога агульнага ня мае з барацьбой за прамфінплян, а зьяўляецца як прыклад інтэлігенцкай някультурнасьці,—а інтэлігенцкая някультурнасьць—адна з самых горшых някультурнасьцяй.

Таварышы, я прывёў некалькі адмоўных прыкладаў, але ёсьць шмат папутнікаў, якія перабудоўваюцца, якія становяцца нашымі саюзьнікамі, якія ідуць па шляху ў пролетарскую літаратурную арганізацыю, ідуць па шляху да нас. Вазьмеце Нікалая Ціханава, вазьмеце Слонімскага, ягонага „Фому Клешнева“, за якога на яго так несправядліва напалі ў Ленінградзе, што нам пасьля толькі ўдалося выправіць, вазьмеце Сейфуліну, Шагінян; яе апошні выдатны роман „Гидроцентраль“, гэта людзі, якія ідуць да нас. Можна было-б прывесьці рад іншых прозьвішчаў, якія ідуць да нас па-сапраўднаму, якія перабудоўваюцца з папутнікаў у пісьменьнікаў саюзьнікаў. Вось, напрыклад, тав. Дзем'ян Бедны тут вылаяў Веру Інбэр, сьмяючыся над тым, што рабочы-ўдарнік ідзе да Веры Інбэр. Я лічу што тав. Дзем'ян Бедны дарэмна вылаяў Веру Інбэр, бо як-бы ні ацэньваць літаратурны талент Веры Інбэр, але ў кожным выпадку гэтая пісьменьніца сумленная. Хто можа сказаць, што яна прыстасоўваецца? Яна сапраўды перастройваецца. Ёй, праўда, далёка яшчэ, да пролетарскай літаратуры, і шмат што ў яе творах мы можам крытыкаваць самым жорсткім чынам. Яна не выпадкова была ў групе канструктывістаў, у яе маецца схіленьне галавы перад усякім амэрыканізмам, маецца шмат недахопаў, але сказаць што яна ад нас адыходзіць, нельга. Нельга яе зьневажаць на нашым пленуме, бо мы не адзін з гурткоў, мы даўно ўжо адыйшлі ад гэтага, мы адказваем за кожнага пісьменьніка—вылаяць лёгка. А што мы зрабілі для таго, каб забясьпечыць добрую марксыцкую крытыку і каб па-сапраўднаму пісьменьніку было вытлумачана, што твая памылка выплывае адтуль і адтуль, але ты таго-та ня ўцяміў, гэта адбілася на тваім мастацкім мэтодзе, гэта зьніжае мастацкасьць твайго твору? Гэтага ў нас вельмі часта ня ўмеюць зрабіць, і мы ў адносінах да Веры Інбэр гэтага не зрабілі, не зрабілі таго, каб паслаць яе туды, куды гэта немэтазгодна, і да такой групы паслаць, дзе будзе забясьпечаны ўплыў не Буданцова, гэтага земгусара ад літаратуры, а дзе будзе забясьпечаны ўплыў пролетарскіх кадраў. Мы да гэтага часу яшчэ ня здолелі выканаць гэтага асноўнага, ня ўмелі на практыцы нашай дзейнасьці адрываць папутнікаў ад буржуазных пісьменьнікаў, ня ўмелі прымушаць выбіраць.

Гісторыя з Замяціным і Пільняком здабыла надзвычайную сур'ёзнасьць дзякуючы таму, што мы змусілі выбіраць—з кім вы—з намі, з пролетарскай літаратурай, з пролетарскай рэволюцыяй, ці з Замяціным і Пільняком. Так мы паставілі пытаньне, і такая пастаноўка пытаньня цалкам сябе апраўдала, бо заўсёды пацьвярджаецца правільнасьць лініі бальшавіцкай прынцыповасьці і заўсёды правальваецца лінія сьціраньня вострых кутоў, лінія ідэйных компромісаў.

Тых пісьменьнікаў, якія ідуць да нас, мы павінны кожны дзень змушаць выбіраць: няма адзінай грузінскай, армянскай, украінскай нацыянальнай літаратуры, выбірайце, з кім вы? Вось вам дадзены пролетарскія пісьменьнікі, і дадзены такія пісьменьнікі як Аляксей Талстой. Выбірайце, з кім вы? Да рэчы, аб романе Аляксея Талстога „Черное золото" Я думаю што такія людзі, як Аляксей Талстой, памыляюцца , калі думаюць, што мы ў тым пэрыодзе, калі нам не да мастацтва і што мы яшчэ зусім не навучыліся ў ім разьбірацца. Роман „Черное золото"—бульварная авантуршчына, халтура, якая нічога агульнага з мастацтвам ня мае. Там дадзены стандартны сюжэт любога другараднага авантурнага роману, для зацікаўленьня дададзены некаторыя гістарычныя прозьвішчы: Дзянісаў, Мілюкоў; для абыватальскага інтэрэсу паказана як яны п'юць гарбату і г. д., і далей пэўная доля эротыкі для таго, каб можна было перажыць тыя „ідэі", якія ў парадку прымусовага асортымэнту ад бальшавізму ўкладвае Аляксей Талстой у свой твор. Падобныя творы вельмі лёгка рабіць, асабліва маючы пісьменьніцкія здольнасьці Аляксея Талстога, а гэтыя вялікія пісьменьніцкія здольнасьці адчуваюцца нават і ў „Черным золоте". Мы павінны ўмець паставіць пытаньне перад усёй масай пісьменьнікаў: вось вам Аляксей Талстой, вялікі пісьменьнік, які можа быць вялікім пісьменьнікам, паглядзеце, што ён на сёньняшні дзень дае, і абмяркуйце, чаму ён гэта дае, змагайцеся разам з намі супроць падобных рэчаў, бо барацьба супроць падобных твораў, як „Черное золото", гэта будзе наша разам з папутнікамі барацьба за мастацкую якасьць. Аляксеі Талстыя любяць гаварыць, што ідзе новая літаратура. Але што яна дасьць? Мы можам адказаць, што-б яна ні дала, аднак у кожным выпадку гэта будзе ўсёж-такі лепшым, чым роман „Черное золото". Але гэта ня крытэрыі. Які крытэры і „Черное золото"? Вядома, мы напішам і ўжо пішам лепш, чым напісаў Талстой гэтае „Черное золото". Гэта нават не матар'ял для параўнаньня, для адштурхоўваньня, а гэта матарыял для адкіданьня! (Воплескі).

Ударыць па чырвонай халтуры

Калі я гавару аб „Черном золоте", я хачу зазначыць на мімікрыю пісьменьніка. Калі мы гаворым аб барацьбе з буржуазнай літаратурай, у нас ідзе гутарка аб тым, каб умець бачыць новыя формы у якіх, адбываецца барацьба з буржуазнай літаратурай, каб бачыць і ў свой час спыняць, у прыватнасьці, зьяўленьне чырвонай халтуры. бо і на Украіне і ў Закаўказьзі ёсьць чырвоная халтура. А між тым ніхто аб гэтым нічога не сказаў у спрэчках. А што мы робім для таго, каб па-сапраўднаму выпалаць гэтае пустазельле, якое ў нас маецца ў вялікай колькасьці? Дзе ў нас быў паказальны суд над рэдактарамі кніжак чырвонай халтуры? Дзе мы зьнялі таго ці іншага выдаўца, які выпусьціў гэтую чырвоную халтуру? Дзе і калі організавалі грамадзкі суд над падобнымі рэдактарамі якія друкуюць халтурныя рэчы?

Зараз ўсе згаджаюцца, што патрэбна зьнішчаць і біць чырвоную халтуру. Давайце аб гэтым менш гутарыць, а больш рабіць. Бо мы-ж адказваем за тое, каб тыя кніжкі, якія ідуць у рабочую масу, у масу колгасьнікаў, мы, кадры пролетарскіх пісьменьнікаў!—за тое, каб гэта былі ня кнігі, якія разбэшчваюць чытача „легким чтивом", падмяняючы ім барацьбу за мастацкасьць і за формаваньне сапраўдных эстэтычных густаў пролетарыяту. З гэтым мы павінны змагацца і павінны ўзьнімаць на гэта масы.

Выступленьне тут тав. Троіцкага ад „Комсомольской правды" зьяў-

ляецца вельмі каштоўным, бо гэтым самым здымаюцца гутаркі аб якіх бы там ні было рознагалосьсях у нас з „Комсомольской правдой“ і комсамолам. У нас быў і будзе і павінен быць ў далейшым самы сапраўдны, самы цесны баявы саюз ня толькі таму, што мы—асноўнае кіраўніцтва УсеААПП—амаль усе былыя комсамольцы, прайшоўшыя комсамольскую школу, ня толькі таму, што комсамольцы займаюць і будуць займаць вялікае месца ў нашай літаратуры, але і таму, што комсамол і „Комсомольская правда“ больш, чым хто-небудзь іншы, могуць зрабіць для ўтварэньня навокал літаратуры пролетарскай грамадзкасьці для таго, каб супроць чырвонай халтуры ўзьнімалася ўся маса чытачоў, каб узьнімаць шырокія пласты пролетарскай грамадзкасьці на барацьбу з чырвонай халтурай і з усімі відамі і формамі буржуазных уплываў у літаратуры. І гэта павінна быць адным з пунктаў нашых гутарак з тав. Троіцкім. Давайце возьмем некалькі прыкладаў з украінскай літаратуры, з закаўкаскай літаратуры, з расійскай літаратуры, давайце ўздымем усю масу комсамольцаў на барацьбу з такімі творамі, якія зьяўляюцца чужымі для нас, якія нам не патрэбны. Гэта будзе вельмі карысна, гэта падводзіць нас да пытаньня аб удзеле мас у літаратуры.

Аб чытачу, бібліотэках і выдавецтвах.

Т. Вігалок у надзвычай правільнай і прыгожай прамове, якую ён тут сказаў ад імя УсеЦСПС, ставіў пытаньне і адносна большай працы з чытачамі, з бібліотэкарамі і адносна—у гэтым пляне—большага ўплыву на работу выдавецтваў. Гэта правільна, аб гэтым патрэбна гаварыць, і таварыш Халатаў у сваім выступленьні аб гэтым гаварыў. Праўда, з ведамствам тав. Халатава ў нас адносіны складаюцца больш цяжка. Дагаварыцца з ГІХЛ—гэта, як гавораць таварышы, у нас „гіхлае дело“, рэч амаль немагчымая, справа гіблая. Тав. Халатаў сам асабіста дапамагае шмат: калі зьвернешся да яго асабіста, дык ён заўсёды дапаможа, а калі ня зьвернешся асабіста да тав. Халатава, дык заўсёды бывае вельмі цяжка. Гэта дакор тав. Халатаву таму, што я лічу, што ён адказвае за ўвесь ОГІЗ, за ўвесь свой апарат, у тым ліку і за ГІХЛ.

Сапраўды нам патрэбна на работу нашых выдавецтваў, на становішча нашых выдавецтваў, зьвярнуць значна большую ўвагу, чым да гэтага часу мы зьвярталі. І тут работа з чытачамі, з бібліотэкарамі, іх контроль над выдавецтвамі зможа даць надзвычай шмат, павінна даць шмат, а калі мы за гэта возьмемся і дасьць шмат тады, калі гэта ня будзе справай паасобных нацыянальных атрадаў: украінскага, беларускага, закаўкаскага, але калі гэта будзе формай інтэрнацыянальнага дзеяньня нашай адзінай арганізацыі.

Шпарчэй перамагаць нацыянальную замкнёнасьць.

Мы шмат гаворым аб інтэрнацыянальным адзінстве, але на справе яшчэ вельмі моцная нацыянальная замкнёнасьць, нацыянальная адарванасьць. Напрыклад, калі едуць пісьменьніцкія брыгады, дык украінскія брыгады едуць на Украіну, расійскія ў РСФСР і г.д. Замест таго, каб паслаць украінцаў вывучаць дасягненьні толькі Украіны, чаму-б не паслаць іх на Урал, чаму ўральцаў не паслаць на Украіну і г.д. Трэба знаходзіць дзесяткі новых форм, якія-б ірвалі колішнюю нацыянальную замкнёнасьць, якія паказалі, што мы не мэханічнае злучэньне нацыянальных атрадаў, але што мы сапраўды моцны, магутны, адзіны саюз пролетарскай

літаратуры. Гэта на справе трэба паказаць, не змазваючы, вядома, спэцыфічных асаблівасцяй таго ці іншага нацыянальнага атраду, не зьмяншаючы значэньня спэцыфічных задач іх,—але перамагчы нацыянальную замкнёнасьць мы павінны чаго-б гэта ні каштавала і гэтага можна дасягнуць у залежнасьці ад таго, ці будзе УсеААПП сапраўды кіруючым органам усёй пролетарскай літаратуы, сапраўды працуючым органам.

Тав. Радзіяні, які найбольш востра і таму найбольш правільна крытыкаваў работу УсеААПП, сказаў, што УсеААПП не ператварыўся яшчэ ў сапраўды працуючую організацыю, што няма яшчэ становішча, пры якім бы УсеААПП на справе кіраваў усімі нацыянальнымі атрадамі. Сапраўды, УсеААПП лаюць толькі ў часе Пленумаў і перад пленумамі, пасьля-ж пленуму наступае цішыня, дабрадушша,—ізноў да наступнага пленуму, калі гавораць: на ранейшым пленуме пастанавілі тое і тое, і зноў ня выканалі; і зноў гавораць прыгожыя пакаянныя прамовы, нічуць ня горшыя тых пакаянных прамоў, якія на сёньняшні дзень гавораць нашы колішнія ворагі, бо вельмі мала засталося такіх ворагаў, якія не кляліся-б сёньня генэральнай лініяй УсеААПП. Я павінен спэцыяльна папярэдзіць супроць гэтых алілуйшчыкаў; вельмі шкодны вораг, які перафарбаваўся і шчагаляе сёньня ў мундыры алілуйшчыка (воплескі) Я ведаю надзвычай шмат таварышоў, якія ў эпоху дыскусіі з „Літфронтам" спачувалі „Літфронту", а сёньня маюць адвагу абвінавачваць нават РАПП, бадай ня ў прымірэнцкіх адносінах да „Літфронту"; ёсьць такія таварышы, якія абаранялі пераверзеўшчыну, а зараз горда дэкляmуюць па поваду тэй ці іншай памылкі ў нас, у пэрыод нашай барацьбы з пераверзеўшчынай. Трэба падкрэсьліць, што калі мы гаворым аб консолідацыі, мы гаворым аб прынцыповай консолідацыі, аб консолідацыі з людзьмі, якія прынцыповы, якія маюць пэўную выразную прынцыповую лінію.

Самакрытыка—зброя прасоўваньня наперад.

У сувязі з гэтым трэба сказаць аб самакрытыцы, аб якой шмат гаварылася ў спрэчках. З гэтай прычыны можна прывесьці вялікую колькасьць спрыяючых заяў любога таварыша, але ажыцьцяўляць самакрытыку на справе значна цяжэй. Па-першае, патрэбна яе ажыцьцяўляць, як гэта заслугоўвае бальшавіцкай організацыі, патрэбна ажыцьцяўляць самакрытыку, якая-б не заключалася толькі ў самадаўлеючым перакідваньні цытатамі, але самакрытыку ідэйную, якая-б узьнімала нас на больш высокі ўзровень. Я думаю, што, калі гавораць аб самакрытыцы, гутарка ідзе аб тым, каб стаяць тварам наперад, да новых задач, руху, а не аб тым толькі, каб павярнуцца тварам да старых матэрыялаў і ў іх пароцца. Трэба глядзець наперад, каб і ва ўсім ўчарашнім разабрацца і яго ўсьвядоміць. Кадры патрэбна праверяць не на тым, ці ўмеюць яны вышукваць цытаты, трэба іх праверыць, як яны новыя пытаньні ставяць, як адбіваецца іх разуменьне мінулага і іх лінія ў мінулым іменна на вырашэньні новых проблем. Нам патрэбна консолідацыя ня людзей, якія маюць заслугі толькі ў мінулым,—гэта добра, але гэта не галоўнае,—нам патрэбна консолідацыя людзей, якія ў новай абстаноўцы, у новую эпоху могуць быць ўсеапаўцамі, і нашы кадры мы будзем праверяць іменна так. Мала таго, што быў калісьці сэкратаром УсеААПП, РАПП і г. д.—гэта ўсё добра і дай бог табе шчасьця, але ў нас новы этап, перад намі новыя задачы, і нам патрэбна перастроіцца так, каб усё

ўчарашняе зьяўлялася падрыхтоўкай і да сёньня. Сёньняшняе-ж—да заўтра і г.д. і т.п.

На гэтым мы абавязкова павінны праверацъ нашы кадры і ў гэтых адносінах пленум Усе ААПП зьяўляўся школай для ўсіх нас, бо на ім мы ў пяршыню мелі і такое адзінства ўсёй нашай арганізацыі і такое вялікае таварыскае разуменьне неабходнасьці настолькі шырока разгарнуць самакрытыку, якая-б навучала нас таму, як патрэбна працаваць ў галіне літаратуры па-бальшавіцку.

За лінію партыі.

Падводзячы вынікі тых спрэчак, якія былі тут, і заканчваючы сваё заключнае слова, я павінен паўтарыць, што асноўны тон быў тонам не самаздавольненьня, а тонам трывогі, гэта і павінна быць асноўным тонам нашай работы і далей, асноўнай нотай настрояў нашых пісьменьнікаў. Становішча ў нас яшчэ такое, што наша літаратура яшчэ адстае, і мы павінны напружыць усе нашы сілы і працаваць больш упарта, каб справіцца з задачамі, якія перад намі стаяць.

Я думаю, што мы павінны падвесьці вынікі работы нашага пленуму, у форме рапарту Цэнтральнаму комітэту, у форме рапарту тав. Сталіну, рапарту, у якім пролетарская літаратура засьведчыць тое, што кадры пролетарскіх пісьменьнікаў ведаюць цьвёрда, што толькі на аснове няпрымірымай барацьбы за генэральную лінію партыі, толькі будучы стопроцантнымі цьвёрда-каменнымі бальшавікамі, мы здолеем прывесьці нашу пролетарскую літаратуру да гэгемоніі і стварыць літаратуру вартую нашага бальшавіцкага часу. (Працяжныя воплескі).

Л. Бэндэ

Творчыя задачы пролетарскай літаратуры [1])

На маю задачу прыпадае зрабіць даклад аб тых творчых задачах, якія зараз на даным этапе соцыялістычнага будаўніцтва паўсталі перад беларускай пролетарскай літаратурай. Для гэтага трэба будзе, папершае, праглядзець у асноўным тую творчую продукцыю беларускай пролетарскай літаратуры і ў яе найбольш выдатных творах, якая зараз ёсьць, а з другога боку, у асноўным вызначыць тыя конкрэтныя творчыя задачы, якія зараз паўстаюць перад нашай беларускай пролетарскай літаратурай у час рэконструкцыйнага пэрыоду, у час разгорнутага соцыялістычнага наступу.

Пасьля першага пленуму прайшло ўжо два гады. За гэтыя два гады адбыліся агромністыя зрухі ў соцыялістычным будаўніцтве, у індустрыялізацыі нашае краіны, у колектывізацыі; нарадзіліся якасна новыя зьявы, што характарызуюць і адрозьніваюць даны этап комуністычнай рэволюцыі ад папярэдняга. За гэтыя два гады рабочая кляса дабілася новых агромністых заваёў на фронце культурнай рэволюцыі. Культурная рэволюцыя на даным этапе ўзышла на вышэйшую ступень свайго разьвіцьця: яна набыла масавы характар, яна адбываецца ў форме масавай пераробкі чалавечага матэрыялу, у прыстасаваньні гэтага чалавечага матарыялу, да тых задач, якія зараз паўстаюць перад пролетарыятам. Самае цікавае на даным этапе культурнай рэволюцыі тое, што справа соцыялістычнага будаўніцтва стала справай мільёнаў, што будаўніцтва соцыялізму адбываецца пры актыўным удзеле ўсіх працоўных, якія ў абсолютнай большасьці ўсьвядомілі задачы, што стаяць перад намі, задачы пабудовы соцыялізму. Гэтыя заваёвы—вынік процэсу той вялікай пераробкі чалавечага матэрыялу, людзей, якая адбываецца ў процэсе перабудовы ўмоў іх існаваньня.

У свой час Маркс пісаў:

„Рэволюцыя неабходна ня толькі таму, што нельга ніякім іншым спосабам зьвергнуць пануючую клясу, але і таму, што тая кляса, якая зьвяргае, можа ачысьціцца ад усяго бруду, старой грамады і зрабіцца здольнай стварыць новую грамаду толькі праз рэволюцыю".

Такім чынам, выходзіць, што рэволюцыя патрэбна ня толькі для таго, каб зьнішчыць стары лад, але яна патрэбна і для таго, каб перарабіць людзей, каб людзі маглі ачысьціцца ад таго бруду, той спадчыны, ад усяго таго, што вякамі, пры панаваньні эксплёататараў, напластоўвалася на іх, што зьяўлялася неадлучным ад прыгнячэньня, уціску і эксплёатацыі.

У гэтым рэволюцыйным процэсе пролетарыят, кіруючыся ленінскай партыяй, дасягнуў агромністых посьпехаў. У процэсе актыўнай

[1]) Апрацаваная стэнограма дакладу на пленуме праўленьня БелАПП (май 1931 г.)

зьмены экономічных адносін, у процэсе актыўнай зьмены ўмоў існаваньня мільённых працоўных мас, якасна мяняецца псыхіка людзей, мяняюцца погляды, разуменьні, пачуцьці. Нараджаюцца новыя людзі, якія характарызуюць наступленьне новага пэрыоду ў сусьветнай гісторыі чалавецтва. Гэты рэволюцыйны процэс, які адбываецца нябачанымі тэмпамі і ў нябачанай шырыні і глыбіні, перамагае той традыцыйны, унасьледаваны ад старой грамады „узкий горизонт буржуазного права", пра які Ленін у „Государство и революция" пісаў, што ён прымушае работніка „высчитываць с точностью Шейлока, не переработать бы лишних полчаса против другого, не получить бы меньше платы, чем другой".. Соцыялістычнае спаборніцтва ў яго розных формах, асабліва ў вышэйшай яго ступені—ударніцтве, захапіўшы мільёны рабочых і колгасьнікаў, нашчэнт зьнішчае ўсе ўнасьледаваныя ад капіталізму традыцыі, погляды, адносіны да працы, а замест іх нараджаюцца ў масавым маштабе новыя, комуністычныя.

„Самое замечательное в соревновании состоит в том, что оно производит коренной переворот во взглядах людей на труд, ибо оно превращает труд из зазорного и тяжелого бремени, каким он считался раньше, в дело чести, в дело славы, в дело доблести и геройства" (Сталін „Політсправаздача ЦК УсеКП(б) на XVI зьезьдзе партыі, стр. 52).

Гэта тое, што па сутнасьці характарызуе даны этап культурнай рэволюцыі, гэта тое, што зьяўляецца вынікам папярэдніх гадоў агромністага змаганьня рабочае клясы ня толькі за перамену ўмоў свайго існаваньня, але і за пераробку саміх сябе.

Рабочая кляса на даным этапе падняляся на такую вышыню культурнага разьвіцьця, што яна ня толькі пераймае старую культуру, ня толькі яе крытычна асвайвае, але рабочая кляса зараз ужо сама ў масавым маштабе ўтварае новую соцыялістычную культуру. Гэты процэс знаходзіць сваё прыватнае праяўленьне ў тым вагромністым паходзе за тэхніку, у вынаходзтве, гэта выяўляецца далей у закліку ўдарнікаў у літаратуру і г. д. Заклік ударнікаў у літаратуру ня ёсьць організацыйны прыём для папаўненьня радоў БелАППу. Гэта—выяўленьне процэсу аўладаньня, асваеньня рабочай клясай літаратуры

А ўсё разам узятае сьведчыць аб тым, што мы шчыльна падыйшлі да конкрэтнага вырашэньня зьнішчэньня розьніцы паміж разумовай і фізычнай працай. Асваеньне рабочай клясай літаратуры, заклік рабочых-ударнікаў у літаратуру іменна і ёсьць выяўленьне пачатку гэтага процэсу, процэсу зьнішчэньня розьніцы паміж разумовай і фізычнай працай, зьнішчэньне супярэчнасьці, якая зьяўляецца самай глыбокай асновай грамадзкай няроўнасьці.

А ў БССР, частцы Саюзу Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік, у краіне, працоўныя якой у сваім нядаўным мінулым знаходзіліся пад падвойным прэсам соцыяльнага ўціску, краіне ў мінулым са слабаю прамысловасьцю і слабым прапластваньцем пролетарыяту (што зусім не азначала маласьць жабрацтва); краіне, жыхары якой, як кажа П. Галавач у сваім „Спалоху на загонах", да ўсіх „гутараць сваею моваю і ім ніхто і ніколі гэтай мовай не адказваў"; краіне, працоўны чалавек якой „усе жаданьні збалелай душы сваёй, усе імкненьні свае выказаў толькі ў нязначна прыгожых і багатых казках і ўсе пачуцьці свае выказаў у сумных, поўных тугі і роспачы песьнях і ня ведаў вясёлых песень"; краіне, чалавек якой, „калі яго выгналі вайною з сваёй хаты, ішоў на далёкі ўсход і шлях свой цяжкі і бясконца ўстаўляў крыжамі над магіламі дзяцей

сваіх, каб ня зблудзіць, калі прыдзецца варочацца да дому". І вось у гэтай краіне, у людзей якой „хітрыя і моцныя зброяй політыкі сьцерлі іх уласнае імя і выхавалі ў сэрцах іх сорам да саміх сябе"— што мы маем на сёньняшні дзень? Мы маем агромністыя, нябачаныя яшчэ ніколі ў гісторыі посьпехі, заваёвы рабочае клясы і працоўнага сялянства.

На нашых вачох, пры нашым актыўным удзеле БССР у сваім яшчэ нядаўнім мінулым рамесьнікі, саматужнікі, „Северо-Западный край ператвараецца ў соцыялістычную краіну буйных фабрык і заводаў, у краіну Сталінстанаў, наша напоўпатрыяхальная, напоўжабрацкая вёска, з жыхара якой цягнулі „кроў і жылы" памешчык, казна, капіталісты і кулакі (а на недахоп эксплёататараў працоўныя Беларусі ніколі не скардзіліся), зараз, пад кіраўніцтвам рабочае клясы і ў саюзе з ёй, пасьпяхова перарабляецца на соцыялістычны лад, ліквідуецца апошняя эксплёататарская кляса, кляса найбольш шматлікая і з найглыбейшымі карэньнямі.

Ня гледзяны на тое, што нацыянал-дэмократы лічылі, што ў нас пролетарыяту няма, што ў нас ёсьць толькі сельтэрскі пролетарыят, мы на справе бачым, як пролетарыят БССР зьяўляецца сапраўдным кіраўніком соцыялістычнага будаўніцтва ва ўсіх галінах, у тым ліку і культурнага будаўніцтва.

Цяпер сярод буржуазнай інтэлігенцыі, сярод нацыянал-дэмократычнай інтэлігэнцыі ўжо ня чутны тыя размовы, якія мелі месца 2—3 гады назад, што яны зьяўляюцца пупам зямлі, адзіным кіраўніком культурна-нацыянальнага будаўніцтва. Гэты буржуазны, нацыянал-дэмократычны пуп магутнай постацьцю рабочае клясы адрэзаны, як кажа Мурашка, гэты „пуп закопаны".

На падставе гэтых посьпехаў рабочае клясы, посьпехаў, якія маюць сапраўды сусьветна-гістарычнае значэньне, і разгарнуўся шырокі літаратурны рух. Іменна гэтыя посьпехі абумовілі і нашы посьпехі, нашы перамогі ў галіне літаратуры.

Асноўны вынік, з якім пролетарская літаратура прышла на гэты пленум--дык гэта тое, што пролетарская літаратура набыла ідэйна кіруючую, ідэйна вядучую ролю. Гэтая кіруючая роля нашай літаратурай заваёвана праз жорсткае змаганьне з клясава-варожай буржуазнай, кулацкай, нацдэмаўскай літаратурай, праз ідэйны ўплыў на лепшую частку папутніцтва і сялянскую літаратуру. Гэта першы і асноўны рашаючы посьпех беларускай пролетарскай культуры.

У сьвятле гэтай перамогі пролетарскай літаратуры бачны і тыя процэсы, якія адбываюцца сярод папутнікаў. Там мы наглядаем пэўныя выразныя зрухі,—зрухі, якія характарызуюць сёньняшні дзень папутніцтва і якія ў значнай меры выяўляюць далейшыя яго шляхі. Перш за ўсё аб унутры-БелАППаўскім папутніцтве. Вядома, што БелАПП, як літаратурная організацыя, пры агульным яе пролетарскім напрамку, пры наяўнасьці вядучага атраду пролетарскіх пісьменьнікаў,—тым ня менш, не зьяўляецца адзінай організацыяй. Побач з асноўным, вядучым ядром выяўленых пролетарскіх пісьменьнікаў у БелАППе ёсьць і папутніцкае прапластаваньне, і досыць значнае, не гаворачы ўжо аб сялянскіх пісьменьніках унутры БелАПП.

З аднаго боку мы мелі сярод папутнікаў нашай організацыі за апошні час надзвычай добрае і характарнае зьявішча—гэта рух папутнікаў па шляху ператварэньня іх ў саюзнікаў пролетарыяту ў літаратуры, рух, які творчасьць некаторых былых папутнікаў прывёў да пролетарскай літаратуры,

прыкладна: Броўка, Шынклер, Зарыцкі і другія. З другога боку, мы маем і такія зьявы сярод папутнікаў унутры нашай організацыі, якія сьведчаць, што частка папутніцкай моладзі яшчэ знаходзіцца пад моцным уплывам буржуазнай ідэолёгіі, што буржуазная ідэолёгія рознымі спосабамі захапляе частку папутніцкай моладзі. Я маю на ўвазе тэндэнцыі, якія выяўлены ў апошніх творах Барыса Мікуліча, Ю. Таўбіна і Астапенкі, аб чым я буду гаварыць потым

Зрухі ўнутры БелАППаўскага папутніцтва выяўляюць і адлюстроўваюць процэсы, якія адбываюцца сярод папутніцтва ў БССР. У радох па-за БелАППаўскага папутніцтва процэсы, выяўленьне якіх мы наглядаем унутры БелАППу адбываюцца яшчэ больш выразна, больш чотка.

Частка пісьменьнікаў, якія ў час аднаўленчага пэрыоду былі папутнікамі, у пэрыод рэконструкцыі, ў пэрыод нябачанага абвастрэньня клясавага змаганьня ў яе розных формах,—скаціліся ў сваёй творчасьці на позыцыі ашалёлага кулака, буржуазнага інтэлігента, нацыянал-дэмократаў і сваёй творчасьцю дапамагалі рэстаўратарскім элемэнтам. Мы далі ім адкрыты бой, мы ў асноўным разгромілі іх у адкрытым боі. Мы паказалі працоўным масам сапраўдны твар групы пісьменьнікаў, якія нацягвалі на сябе маскі лёяльнасьці, а часамі нават і пролетарнасьці, як гэта рабіла група „Узвышша“. Нашым змаганьнем мы прымусілі частку буржуазных, нацыянал-дэмократычных баянаў і лірыкаў замоўкнуць, а другую частку сур'ёзна задумацца над далейшым сваім лёсам. У выніку мы маем магчымасьць чытаць лісты і заявы, дэклярацыі аб парыве з буржуазным нацыянал-дэмакратызмам, аб перабудове і г. д. Але пакуль што гэтая частка былых папутнікаў далей дэкларацый ня ідзе,—ня хоча выявіць свайго творчага твару, а выгляд учарашняга твару на сёньняшні дзень ня зусім прыемны, ён глыбокімі рубцамі і шрамамі, памяты і пакрыўлены ад нашых удараў,—і такім чынам знаходзіцца яшчэ ў стане буржуазнай ідэолёгіі. Пакуль што, акрамя дэкларацыі, мы ня маем твораў, якія-б сьведчылі, што гэтыя былыя папутнікі сапраўды перабудоўваюцца, сапраўды становяцца на шлях саюзнікаў, пролетарыяту ў літаратуры. І таму мы сёньня павінны прама і адкрыта сказаць ім: нуль цана тым дэкларацыям, якія не замацоўваюцца рэальнай творчасьцю. Пролетаріят патрабуе ад былых папутнікаў, пішучых дэкларацыі, не дэкларацый, не абяцанак, а твораў, якія-б сьведчылі, што яны сапраўды парвалі з нацыянал-дэмократызмам, што яны сапраўды перабудоўваюцца для таго, каб дапамагчы будаваць соцыялізм. Так стаіць пытаньне, а ня інакш. Выбірай: або з пролетарыятам, за соцыялістычнае будаўніцтва, за актыўны ўдзел у ім, і тады табе забясьпечаны рост, запал і імпэт для творчасьці, або з клясавым ворагам супроць соцыялістычнага будаўніцтва.

Але мы маем ня толькі такіх папутнікаў, мы маем папутнікаў, якія паварочваюць ў бок саюзнікаў пролетарыяту ў літаратуры, якія перамагаюць рэакцыйную буржуазную ідэолёгію, дробна-буржуазную надклясавасьць і суб'ектівізм, што асабліва праяўляецца ў так званым „псыхолёгізьме“. У гэтых адносінах характарнымі зьяўляюцца апошнія творы: Кузьмы Чорнага, аднаго з буйнейшых прозаікаў і Ц. Гартнага. Я не магу падрабязна застанаўляцца на іх творчасьці. Таварышы ў спрэчках выступяць і прааналізуюць кожны твор. Асноўнае гэта тое, што Кузьма Чорны тэматычна ўжо падыходзіць да задач, якія стаяць перад пролетарыятам, да задач

соцыялістычнага будаўніцтва. Часткова ў К. Чорнага ў апошніх яго творах „Вясна", „Ідзі. Ідзі", „Брыгадзіравы апавяданьні" вызначаецца тэндэнцыя перамаганьня яго ранейшага дробнабуржуазнага псыхолёгізму, які часта даходзіў да патолёгіі, перамаганьне дробнабуржуазнага суб'ектывізму і надклясавасьці, што характарызавала ранейшую творчасьць К. Чорнага, што надавала ёй об'ектыўна варожы характар. Шлях, на які зараз становіцца К. Чорны, зьяўляецца правільным шляхам, і наша задача ўсялякімі спосабамі дапамагчы яму як мага хутчэй вызваліцца ад рэштак буржуазнага і дробнабуржуазнага хламу, які тармозіць разьвіцьцё вялікага таленту, дапамагчы яму хутчэй ператварыцца ў сапраўднага саюзьніка пролетарыяту, бо толькі гэты шлях забясьпечыць К. Чорнаму, так і іншым папутнікам сапраўдны творчы росквіт.

Значны зрух адбываецца зараз і ў творчасьці Ц. Гартнага. Ц. Гартны таксама апошняй сваёй творчасьцю ўваходзіць у тэматыку рэканструкцыйнага пэрыоду, ідзе на вытворчасьць і там бярэ матэрыял для сваёй творчасьці. Гэта сьведчыць, што Гартны правільна зразумеў шлях для сваёй перабудовы. Аднак, ня гледзячы на гэта, Ц. Гартны яшчэ не пазбавіўся ад уласьцівага яму дробна-буржуазнага, інтэлігенцкага падыходу да об'екту сваёй творчасьці, ён яшчэ і ў апошнім сваім творы „Напевы сьверэн", не пазбавіўся цалкам ад дробна-буржуазнага, інтэлігенцкага спосабу ўяўленьня і вырашэньня проблемы суадносін асобы і колектыву, у яго і ў апошнім творы ўсё яшчэ „нравственный облік асобы часткова затушоўвае вытворчую ролю яе, не гаворачы ўжо аб тым, што схэматызм, які часам даходзіць да спрашчэнства, зьяўляецца неадлучным элемэнтам апошніх твораў Гартнага. Тым ня менш зрух ёсьць, першыя крокі ў справе перабудовы зроблены. Пісьменьніку іх трэба замацаваць, пашырыць, паглыбіць, узброіцца марксыцка-ленінскім творчым мэтодам і тым самым змыць з сябе плямы „здарэньняў з комісарамі" і па-сапраўднаму служыць справе соцыялізму.

Падобныя зрухі і процэсы адбываюцца і ў творчасьці іншых папутнікаў. Процэсы руху, процэсы змаганьня тэндэнцый у папутніцкім коле зараз набылі значнае паскораньне і актыўнасьць. Некаторыя зрухі адбываюцца і ў творчасьці Якуба Коласа. Яго прымітыў „Колгаснае", які па сутнасьці быў формальным адказам на пачатак шырокага масавага руху сялянства на шляху соцыялістычнай рэконструкцыі дробнай вытворчасьці, зараз зьмяняецца больш сталым творам „Адшчапенец". Праўда „Адшчапенец" адначасова выяўляе і тое, што Колас яшчэ ня здолеў зразумець усю глыбіню і складанасьць процэсу соцыялістычнай рэконструкцыі, што ён наперакор сваім намерам усё яшчэ знаходзіцца пад уплывам пачуцьцяў „адшчапенцаў," што „адшчапенец" пацягнуў за сабой і аўтара. Тым ня менш гэтая спроба асваеньня тэматыкі рэконструкцыйнага пэрыоду, ня гледзячы на зрыў аўтара, павінна быць ацэнена як станоўчая, і ўсялякім чынам трэба падтрымліваць імкненьне пісьменьніка пераўзброіцца, стаць пісьменьнікам вялікага часу, часу стварэньня новае соцыялістычнае грамады. У нашай рачаіснасьці ёсьць усе об'ектыўныя прадумовы для гэтага.

Больш павольна перабудоўваецца Янка Купала. За апошні год-паўтара наша савецкая пролетарская, грамадзкасьць мела магчымасьць прачытаць толькі адзін верш Купалы „А ў Вісьле плавае тапенец". Гэтага бязумоўна мала, Купала можа і павінен даць больш, гэтага патрабуем ня толькі мы тут з вамі, але гэтага патрабуюць працоўныя масы і Савецкай і Заходняй Беларусі.

Некалькі слоў аб Бядулі. З чым ён сустрэў рэканструкцыйны пэрыод? Бядуля рэканструкцыйны пэрыод сусрэў „Язэпам Крушынскім", а гэты твор па сутнасьці сваёй есьць ня што іншае, як выяўленьне капіталістычнай буржуазнай ідэалёгіі ў яе прыстасаваньні да ўмоў пролетарскай дыктатуры. Гэтай ідэалёгіяй твор „Язэп Крушынскі" фарміраваны, а не якой-небудзь другой. Твор „Язэп Крушынскі" зьяўляецца люстрам, якое выяўляе, адлюстроўвае ідэалёгію пэўнай клясы, варожай клясы, і гэта ня гледзячы на чырвоныя латкі, якія папрышываны, праўда, белымі ніткамі, да разгорнутай сыстэмы. І сапраўды вазьмеце вы хоць-бы вобраз самога Крушынскага. Там, дзе Бядуля паказвае Крушынскага як чалавека, як гаспадара і нават як культурнага і нават як чалавека „ажыцьцяўляючага" нацполітыку савецкай улады, там Крушынскі абмалёўваецца ў глыбока эмоцыянальных танох, там Бядуля-мастак, а вось там, дзе трэба паказаць Крушынскага шкодным, там зусім іншы характар носіць абмалёўка і ўся сыстэма паказу, там Бядуля-мастак ператвараецца ў конструктара схэм. Крушынскі перастае быць тым чалавекам, якім яго паказаў пісьменьнік раней. Рэволюцыйная на першы погляд фразэолёгія пісьменьніка, авантурны жыцьцяпіс Крушынскага, яго антысавецкіяўчынкі—усё гэта толькі прыватныя, прышытыя моманты, каб затушаваць буржуазны зьмест гэтага твору. І зусім не выпадкова, што першая частка роману аддзелена двухгадовым тэрмінам ад пачатку друкаваньня другой, у якой Бядуля імкнецца разьвянчаць Крушынскага. Ды пры гэтым трэба сказаць, што зьяўленьне пачатку другой часткі роману абавязана нашай крытыцы, якая ў апошнія часы ўзяла як сьлед у работу Крушынскага, а гэтым прымусіла пісьменьніка пасьпяшыць з зьнішчэньнем „духа, якога ён выклікаў".

А гэта ўсё гаворыць, што твор Бядулі „Язэп Крушынскі", якім характарызуецца ў асноўным яго творчасьць апошніх гадоў,—нічога агульнага ня мае з сапраўды папутніцкай літаратурай, што ён знаходзіцца па-за межамі папутніцкай літаратуры, не гаворачы ўжо аб пролетарскай. Апошняе слова я сказаў таму, што Бядуля належаў і належыць зараз да той арганізацыі, якая ў мэтах маскаваньня называла сябе пролетарскай. Праўда, мы заўсёды ім гаварылі, што аб людзях судзяць не па тым, што яны аб сабе думаюць і гавораць, а па тым, што яны робяць, чым яны ў сапраўднасьці зьяўляюцца. Як бачыце, мы памыліліся толькі там, дзе гаварылі, што „аб людзях судзяць не па тым, што яны аб сабе думаюць..."—большасьць узвышшанцаў нават ніколі і ня думалі, што яны пролетарскія пісьменьнікі. „Пролетарскасьць" ім патрэбна была, каб абмануць рабочых і сялян, прытупіць клясавую пільнасьць пролетарыяту, а з другога боку, завербаваць сабе наіўных людзей з літаратурнай моладзі і зрабіць іх пасобнікамі капіталістычнай рэстаўрацыі праз інтэрвэнцыю.

Вось, коратка гаворачы, тыя зрухі, процэсы, якія зараз адбываюцца сярод папутнікаў. Я не магу зараз ахапіць усю творчасьць папутнікаў, гэта і не ўваходзіць у маю задачу, але тое, аб чым сказана, паказвае нам, што шляхі ператварэньня папутнікаў у саюзьнікаў пролетарыяту ў літаратуры, шляхі перамаганьня дробнабуржуазнай прыроды кожным папутнікам— не зьяўляюцца аднолькавымі для ўсіх, што гэтыя шляхі надзвычайна рознастайныя, індывідуальныя. А гэта ў сваю чаргу паказвае, што нам трэба побач з руйнуючым змаганьнем супроць клясава-варожых вылазак і тэндэнцый, па-сапраўднаму ўзяцца за справу кіраўніцтва папутнікамі, за спрву

іх перавыхаваньня, за справу іх ператварэньня ў саюзьнікаў.

Мэтоды і спосабы нашай работы з папутнікамі павінны карэнным чынам перабудавацца, праца павінна конкрэтызавацца, індывідуалізавацца на аснове партыйнай палітыкі, і агульнай нашай літаратурна-палітычнай лініі, якая зьяўляецца ў асноўным конкрэтызацыяй партыйнай лініі. Змаганьне за папутніка, за ператварэньне яго ў саюзьніка павінна быць органічнай часткай нашай штодзённай работы.

Бясспрэчнай перамогай пролетарскай літаратуры трэба лічыць факт утварэньня аб'яднаньня колгасна-пролетарскіх пісьменьнікаў, бо ўтварэньне гэтага аб'яднаньня не зьяўляецца толькі простым організацыйным фактам, а мае вялікую палітычную важнасьць. Колгасна-пролетарская літаратура, якая зараз па сваёй продукцыі пакуль што не зьяўляецца шматлікай, але мы маем новыя кадры, якія абуджаны соцыялістычнай рэконструкцыяй с/г, ідуць для ўтварэньня пролетарска-колгаснай літаратуры. І таму правільна зрабіла пролетарская літаратура, выдзеліўшы ў паасобную групу наяўныя кадры колгасна-пролетарскіх пісьменьнікаў, паставіўшы перад імі задачу выяўленьня і організацыі новых сіл з масы колгасьнікаў. Таксама заваёвай пролетарскай літаратуры трэба лічыць стварэньне літаратурнага аб'яднаньня Чырвонай арміі і флёту (Беллачаф).

Тут ужо таварышы гаварылі, якое мае значэньне літаратура з абароннай тэматыкай на данай ступені нашага разьвіцьця. Я ня буду падрабязна на гэтым спыняцца. Аднак трэба прама сказаць, што мы ў гэтай справе зрабілі ня столькі, колькі павінны былі зрабіць і колькі маглі-б. Мы мала, зусім мала зрабілі па лініі стварэньня абароннай літаратуры, па лініі выяўленьня і організацыі новых пісьменьніцкіх кадраў з самой Чырвонай арміі. Праўда, за паўгода існаваньня Беллачафу мы выходзім на пленум БелАППа с першым зборнікам, які ня гледзячы на яго слабасьць, ня гледзячы на ўсю яго недастатковасьць, але ўсё-ж ёсьць сякое-такое дасягненьне. У зборніку 15 твораў, напісаных пра змаганьне і вучобу Чырвонай арміі, з іх 7 твораў напісаны непасрэдна чырвонаармейцамі і работнікамі РСЧА.

Робячы папярэдняе падсумаваньне бясспрэчных дасягненьняў пролетарскай літаратуры, мы можам ужо цьвёрда сказаць, што літаратурная справа зараз перастае быць справай групкі інтэлігентаў, якія выабражаюць, што яны „тварэньне бога", што яны пуп зямлі. Гэты пуп закопваецца агромністым рухам рабочых і сялян, справа літаратуры становіцца справай мільёнаў, усяе рабочае клясы, ажыцьцяўляецца ленінскі наказ. Ленін яшчэ ў 1905 г. пісаў:

„Мы, соцыялисты, разоблачаем... лицемерие, срываем фальшивые вывески,—не для того, чтобы получить внеклассовую литературу и искусство (это будет возможно лишь в социалистическом внеклассовом обществе), а для того, чтобы лицемерно-свободной, а на деле связанной с буржуазией литературе противопоставить действительно свободную, открыто связанную с пролетариатом литературу.

Это будет свободная литература, потому что не корысьць и не карьера, а идея социализма и сочувствие трудящимся будут вербовать новые и новые силы в ее ряды. Это будет свободная литература потому, что она будет служить не пресыщенной героине, не скучающим и страдающим от ожирения „верхам десяти тысяч", а миллионам и десяткам миллионов трудящихся, которые составляют цвет страны, ее силу, ее будущность. Это будет свободная литература, оплодотворяющая последнее слово революционной мысли человече-

ским опытом и живой работой социалистического пролетариата, создающая постоянное взаимодействие между опытом прошлого... и опытом настоящего, настоящая, борьба товарищей рабочих „(Ленин т. VII., ч. I ст. 24-25). Ленін пісаў далей, што літаратура павінна стаць партыйнай, што яна ня можа быць індывідуальнай справай, незалежнай ад агульнай пролетарскай справы.

„Литература должна стать партийной. В противовес буржуазным нравам, в противовес буржуазной предпринимательской, торгашеской печати, в противовес буржуазному литературному карьеризму и индивидуализму, барскому анархизму и погоне за наживой—социалистический пролетариат должен выдвинуть принцип партийной литературы, развить этот принцип и провести его в жизнь в возможно более полной и цельной форме.

В чем же состоит этот принцип партийной литературы? Не только в том, что для социалистического пролетариата литературное дело не может быть орудием наживы лиц или групп, оно не может быть вообще индивидуальным делом, независимым от общего пролетарского дела. Долой литераторов беспартийных! Долой литераторов сверх-человеков! Литературное дело должностаць честью обшепролетарского дела, „колесиком и винтиком“ одного единого, велікого социал-демократического механизма, приводимого в движение всем сознательным авангардом всего рабочего класса“ (Ленин, т. VII, ч. I, стар. 21-22).

І далей Ленін гаварыў, што „мы хотим создать и мы создадим свободную печать, не только в полицейском смысле, но и в смысле свободы от капитала, свободы от карьеризма, мало того: также и в смысле свободы от буржуазно-анархического индивидуализма“. Разьвіцьцё пролетарской літаратуры зьнішчае беспаваротна „всякую почву у старинного, полуобломовского, полуторгашеского российского принципа; писатель пописывает, читатель почитывает“ (Ленин), што мела і яшчэ да гэтага часу мае месца і ў нас у Беларусіі, у беларускай літаратуры.

Пролетарская літаратура становіцца сапраўднай зброяй пролетарыяту ў яго магутным змаганьні за соцыялістычную рэконструкцыю ўсіх асноў і ўсіх надбудоў грамадзкага жыцьця. Пролетарская літаратура становіцца магутным сродкам організацыі сьвядомасьці, волі і пачуцьцяў працоўных мас навакол конкрэтных задач соцыялістычнага будаўніцтва, у іх змаганьні супроць сваіх клясавых ворагаў.

Творчы рост пролетарскай літаратуры за два гады пасьля першага Пленуму БелАППа характарызуецца творамі: П. Галавача „Доляры“, „Вінаваты“, „Спалох на загонах“, „Сьвежы вецер“, М. Лынькова „Апошні зьверыядовец“; А Александровіча поэмамі „Цені на сонцы“, „Поэма імя вызваленьня“, „Нараджэньне чалавека“ (занова перааправаны) і радамі вершаў: Р. Кобеца „Гута“; Р. Мурашкі „Сын“; М. Чарота рад вершаў; Бязьмежнага „Говар машын“; П. Броўкі „Каландры“, „Цэхавыя будні“ „Гады як шторм“; радам твораў Шынклера і інш. пісьменьнікаў, творы якіх раскіданы па часопісях і газэтах, якія ў частцы сваёй уваходзяць у фонд пролетарскай літаратуры. Пролетарская літаратура зараз складаецца ня толькі з твораў пролетарскіх „з імёнамі“, а і з раду твораў пісьменьнікаў, якія пакуль што ня могуць цалкам быць аднесены да пролетарскіх пісьменьнікаў. Таксама ня трэба думаць, што пролетарскі пісьменьнік „з імем“ што ні напіша—усё ёсьць пролетарскае. Факты паказваюць, што не заўсёды так. Вазьмеце для прыкладу

„Званкі“ Р. Мурашкі, альбо творы Ліманоўскага, які таксама лічыцца, і многія яго лічаць, пролетарскім пісьменнікам.

Проаналізаваўшы ўсю гэтую творчасьць, мы бачым ня толькі колькасны рост, хоць ён за гэтыя два гады відавочна недастатковы, але мы маем і якасны рост, які сьведчыць аб тым, што беларуская пролетарская літаратура ўзышла на вышэйшую ступень свайго разьвіцьця, што пачатковыя крокі, якія былі зроблены да першага пленуму, ужо пяройдзены, і што мы пасунуліся значна ўперад.

У чым выяўляецца якасны рост нашай літаратуры? Перш за ўсё ён выяўляецца ў перамаганьні праз змаганьне нацыяналістычных уплываў на творчасьць нашых пісьменнікаў, якіх няўхільна павінна была паспрабаваць на сабе рэволюцыйная, пролетарская літаратура Беларусі на першых ступенях свайго разьвіцьця. Некаторы ўплыў старых літаратурных нацыяналістычных традыцый на рэволюцыйную, пролетарскую беларускую літаратуру ішоў перш за ўсё па лініі творчага мэтоду. У чым-жа асноўнае гэтага нацыяналістычнага ўплыву? Асноўнай, што характарызуе старыя літаратурныя нацыяналістычныя традыцыі гэта ідэолёгічны сьветапогляд сьветаўспрыйманьне. А адсюль і другая рыса, якая органічна вынікае з першага: звыш чалавечны падыход да рачаіснасьці. Суб'ект, пісьменнік, разглядаецца не як частка клясы, клясы вядучай змаганьне з другой клясай, а як нейкая надклясавая „сверхчувствующая“ сутнасьць. „Звышчалавечны“ падыход да рачаіснасьці, надклясавасьць прыводзіць няўхільна да задушваньня клясавага змаганьня, да „тэорыі самабытнасьці“, а адсюль у мастацкай практыцы „обоготвореніе„ „маці-бацькаўшчыны сьвятой Беларусі“, ідэалізацыя з усімі яе атрыбутамі, на ўсіх папярэдніх гісторычных этапах.

Наступнай рысай, якая характарызуе творчы мэтод нацыяналістычнай літаратуры,—гэта наданьне прымату надсьвядомага інтуіцыйнага над розумам, сьвядомым. А адсюль органічна вынікае замкнёнасьць ўнутры асобы, сэнтымэнталізм, сузіральнасьць і пасывізм.

Вось тыя асноўныя моманты, якія характарызуюць старыя нацыяналістычныя літаратурныя традыцыі, пад уплывам якіх значны час знаходзіліся група Белааппаўскіх пісьменнікаў.

Я ня буду тут зараз спыняцца на конкрэтных творах пісьменнікаў, якія выяўляюць гэты ўплыў. Возьмем хоць-бы М. Хведаровіча. У свой час ён так моцна ўліп у нацыяналістычную ідэолёгію, што нават працоўных Заходняй Беларусі заклікаў вызваляцца ад паноў не пад сьцягам Леніна, а пад сьцягам Кастуся Каліноўскага.

Праўда, у апошні час Хведаровіч пайшоў па шляху перамаганьня сваіх нацыяналістычных зрываў. Але Хведаровіч пайшоў не па шляху асваеньня марксыцка-ленінскага творчага мэтаду, а па лініі захапленьня і культаваньня канструктывізму. Ён, як гавораць, адной нагой вылез з нацыяналістычнага балота, другой нагой трапіў у дробна-буржуазнае балота канструктывізму.

Альбо возьмем творчы шлях Андрэя Александровіча. Мне здаецца, што крытык, які піша ў „Зьвязьдзе“, што ўся творчасьць Александровіча накірована супроць нацыянал-дэмократызму, ня праў. Гаварыць і пісаць так, значыць, першае: гаварыць і пісаць няпраўду, а па-другое, рабіць дрэнную паслугу самому пісьменніку і ўсёй пролетарскай літаратуры. Творчы шлях Андрэя Александровіча ішоў праз выплату даніны нацыяналізму на працягу значнага часу. Я ня буду прыводзіць конкрэтных твораў і докумантаў, спашлюся толькі на твор „Паўстанцы“. Там вы знойдзеце і ўба-

чыце, што мы правы, а ня крытык са „Зьвязды“ т. Лявонны.

Да чаго-б прышла наша літаратура, каб яе разьвіцьцё пайшло па лініі нацыяналістычных традыцый? куды-б гэта прывяло нашу літаратуру? Гэта прывяло-б нашу літаратуру да адрыву ад задач рабочае клясы, да супроцьпастаўленьня яе гісторычнаму процэсу, які адбываецца ў форме будаўніцтва соцыялізму.

Пролетарская літаратура, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, у асноўным перамагла тыя ўплывы, вызвалілася ад іх, забясьпечыла самастойны шлях свайго разьвіцьця. І гэта ёсьць першае рашучае творчае дасягненьне беларускай пролетарскай літаратуры.

Якасны рост, творчыя дасягненьні сказваюцца яшчэ і ў частковым аўладаньні нашымі пісьменьнікамі тэматыкай рэконструкцыйнага пэрыоду, у наданьні творчасьці пролетарскіх пісьменьнікаў актуальнага характару.

У коле тэматыкі пролетарскай літаратуры мы маем ужо такія тэмы, як соцыялістычнае будаўніцтва ў горадзе і вёсцы на даным этапе, з належнай, у значнай меры, для гэтых тэм глыбінёю мастацкага паказу. Далей проблема ўплыву дробна-буржуазнай стыхіі на рабочую клясу, стыхіі, якая зьяўляецца крыніцай усялякіх ухілаў як правага, так і левага. Абодвы яны маюць аднолькавыя карэньні. Задачы нашых пролетарскіх пісьменьнікаў усямерна выкрыць сваімі мастацкімі сродкамі гэтыя карэньні. Задача ня толькі паказаць камуніста ўхіліста, оппортуніста, але трэба ўмець паказаць, і карэньні гэтых ухілаў, паказаць адкуль яны ідуць, з якога асяродзьдзя, і гэтым самым дапамагчы нашай партыі ў яе змаганьні за генэральную лінію, за чысгату радоў партыі.

Тут некаторыя таварышы выступалі і досыць тэмпэрамантна даказвалі, што наша беларуская пролетарская літаратура ня мае твораў, якімі можна пахваліцца. Мне здаецца, а гэта так і ёсьць, што гэтыя таварышы памыляюцца. Мы маем к сёньняшняму пленуму рад твораў, якія адлюстроўваюць процэсы соцыялістычнай рэконструкцыі і ня толькі ў выглядзе фотографіі, а як сапраўдныя мастацкія творы. Мы маем творы, дзе ясна разьвязваецца проблема выкрыцьця шкоднікаў, мы маем творы, якія малююць нам новага чалавека, мы маем творы, якія мастацкі рэпродукцыруюць рэволюцыю 1905 году, маем творы з тэматыкай грамадзянскай вайны і г. д.

Вось прыблізна той комплекс тэм, якія характарызуюць работу беларускай пролетарскай літаратуры. Што, гэтыя тэмы не актуальны для пролетарскай літаратуры?

У нас яшчэ часта зьмешваюць тэматыку з матэрыялам, лічаць, што актуальным зьяўляецца тое, што напісана на матэрыяле сёньняшняга дню. Часта чутны галасы і нават з гэтай трыбуны, што „нам патрэбна літаратура, якая-б адлюстроўвала ня мінулае, а будучае, штурхала ўперад“, а таму лічаць, што толькі тая літаратура будзе штурхаць наперад, якая створана на матэрыяле сёньняшнага дню, ці якая зьяўляецца сваяасаблівай утопіяй. Мне здаецца, што такая пастаноўка пытаньня няправільная. Злабаднеўнасьць тэматыкі некаторыя падменьваюць матэрыялам. Я-б мог прывесьці дастатковую колькасьць прыкладаў, дзе нашымі пісьменьнікамі „ўжываецца“ гэтая „злабаднеўная“ тэматыка, але гэтыя творы ўсё-ж такі не зьяўляюцца актуальнымі. Узяць хоць-бы ўсе 7 зборнікаў таго-ж Юркі Лявоннага. Ня гледзячы на тое, што яны напісаны, як гавораць, на злобу дню, але яны нічога агульнага, блізкага з актуальнасьцю ня маюць. Я-б мог назваць яшчэ цэлы шэраг іншых твораў, якія гавораць аб электрычнасьцьі, і аб колгасах, і аб саўгасах, якія гавораць, што мы ўжо цалкам знаходзімся ў

соцыялізьме, іўсё-ж такі гэтыя творы не зьяўляюцца актуальнымі для пролетарскай літаратуры, а, наадварот, шкоднымі для савецкай літаратуры. Тыя таварышы, якія блытаюць тэматыку з матэрыялам, дапусьцілі памылку накшталт памылкі, якую дапусьціў вядомы Барыс Кушнераў, аб якой т. Авербах пісаў у „Правде" „материал произведения здесь отожествляется с его тематикой, игнорируется идейный уровень, потому что вообще отсутствует понимание и способность разбираться в актуальности идеи произведения, забывают вопрос о художественном качестве—как будто мера политического действия произведения совершенно не связана со степенью его художественности". (Правда от 8/V-31 г.)

Ня гледзячы на памылковасьць такой устаноўкі, некаторыя таварышы ўсё-ж такі ставяць так пытаньне што толькі той літаратурны твор зьяўляецца актуальным, які напісан на тэму сёньняшняга дню, а калі ўзяць, напрыклад, твор „Сын" Рыгора Мурашкі, дык ён па іхняму зьяўляецца не актуальным, таму што ён малюе рэволюцыю 1905 г. на Беларусі, раскрывае мастацкі змаганьне партыі і кляс ва ўмовах Беларусі, краіне эканомічна адсталай, краіне са складаным нацыянальным пераплётам і г. д.

Альбо вазьмеце тэматыку грамадзянскай вайны. Ці не зьяўляецца яна зараз найпатрэбнай тэматыкай? Мастацкі паказаць, як рабочыя і сяляне змагаліся супроць капіталістаў, супроць памешчыкаў і кулакоў, паказаць, што было ў аснове іх паражэньня і перамог, якія былі памылкі і моцныя бакі, што забясьпечыла іх перамогу над клясавымі ворагамі— ці-ж гэта не зьяўляецца актуальным? Праўда, нічога агульнага з актуальнасьцю ня мае опортуністычны паказ бездапаможнага інтэлігента, які ў стромкім руху рэволюцыйных здарэньняў хвалюецца проблемай „асабістага і рэволюцыйнага, які адшукоўвае скарб каханьня. Такі паказ ня толькі няздольны дапамагчы нам у сёняшнім змаганьні, але ён і ўчарашняе наша рэволюцыйнае калечыць. А далей, паказаць радаслоўную беларускага контррэволюцыйнага нац.-дэмократызму, ці гэтае ўзятае ўмесцы усё не зьяўляецца актуальным нават, у сэнсе перадачы вопыту для рабочае клясы іншых краін, нават у сэнсе выхаваньня нашага падрастаючага пакаленьня, не гаворачы ўжо пра „эмоцыянальны" бок гэтага факту?

Справа ня ў тым, які матар'ял бярэ мастак, пісьменьнік (хоць і гэта важна; выбар матар'ялу вызначаецца творчым мэтодам, сьветапоглядам, ідэйным узроўнем пісьменьніка), а як ён матар'ялізуе ў сваім творы ідэю, з якога пункту гледжаньня, наколькі ідэйны ўзровень твору адпавядае ідэйнаму ўзроўню пролетарыяту і яго задачам У гэтым справа. Няма такіх тэм, няма такіх проблем, якія-б не зьяўляліся тэмамі пролетарскай літаратуры. Гэта трэба запомніць усім выступаючым і гаворачым аб тэматыцы і яе актуальнасьці.

Той, хто гаворыць, што пролетарская літаратура не павінна займацца проблемамі мінулага, той дрэнную паслугу аказвае пролетарскай літаратуры; кіравацца гэтым рэцэптам значыць аддаць наша мінулае на зьежу буржуазнай сволачы, а мы добра ведаем, што ў нацдэмаў мінулае было ня чым іншым, як практычнай програмай будучага, але прыкрытай архаічнай мішурой мінулага, якая на першы погляд як быццам адрывае ад сучаснага творы буржуазнага нацыяналізму. А ўсё гэта, разам узятае, зьяўлялася зброяй нацдэмаў у іх змаганьні супроць соцыялістычнага будаўніцтва. Навошта, не пачынаючы бою, аддаваць ворагу зброю, якой мы яго павінны зьбіць? І іменна, тыя таварышы, якія гавораць нам, што пролетарская літаратура не павінна

займацца мінулым, яны аддаюць наша мінулае на зьежу буржуазнай сволачы

Тым ня менш, калі мы гаворым, што мы не адмаўляемся ад тэматыкі нашага рэволюцыйнага мінулага, якая на першы погляд не ўкладваецца ў рамкі сёньняшняга дню, мы павінны са ўсёй сілай тут на пленуме падкрэсьліць, што тэматыка, тэмы, матар'ял эпохі соцыялістычнай рэконструкці павінны быць у цэнтры творчай увагі нашых пісьменьнікаў.

Іменна на гэтай лініі мы можам канстатаваць нашы посьпехі, але на гэтай-жа лініі знаходзяцца і нашы вузкія месцы, наша адставаньне.

Наш рост далей выяўляецца ў тым, што пролетарская літаратура пачала выцясьняць буржуазны халтурны хлам з нашых тэатраў. Тут ужо гаварылі аб п'есе тав. Кобеца „Гута". Гэты твор ня толькі ўзьняў на вышэйшую ступень Першы Беларускі тэатр, але давёў, што пролетарыят здольны тварыць сваё нацыянальнае мастацтва. Праўда, у нас часамі чуюцца такія размовы, што гэты твор Кобеца не зьяўляецца беларускім творам, таму што Кобец пісаў свой твор напоўрасійскай, напоўбеларускай моваю,— бо ён не ўладаў цалкам беларускай мовай у час напісаньня гэтага твору. Гэта няправільна. Таварышы, якія сьцьвярджаюць, што твор Кобеца не зьяўляецца творам беларускай пролетарскай літаратуры і беларускай пролетарскай драматургіі, выходзяць з няправільнага разуменьня нацыянальнай формы. Яны ўсю нацыянальную форму, падобна Ваганьяну, зводзяць толькі да мовы, ня ўлічваючы ўсяго комплексу ідэй, пачуцьцяў, вобразаў, характарызуючых матываў і г. д., якія ў еднасьці даюць „Гуту", робяць яе творам беларуркай пролетарскай літаратуры і драматургіі. Твор „Гута" зьяўляўся першым найбольш выдатным, найбольш цэльным, найбольш праўдзівым творам аб пролетарыяце БССР, пролетарыяце, які ў складаных прамежных умовах, ва ўмовах складанейшага нацыянальнага і клясавага пераплёту, ва ўмовах складанейшых форм клясавага змаганьня будуе соцыялізм, замацоўвае форпост Савецкага Саюзу. Творам „Гута" пролетарская беларуская літаратура і драматургія нанесла першы і сур'ёзны, калі не сказаць сьмяротцельны,—удар па буржуазнай, нацыянал-дэмократычнай драматургіі, а таксама па рознай абывацельскай, мяшчанскай „сцэнічнай" халтуры. Той, хто адмаўляе „Гуце" ў праве быць творам беларускай пролетарскай літаратуры, той об'ектыўна гаворыць вуснамі нацыянал-дэмократаў, якія бачылі ў „Гуце" сур'ёзную небясьпеку і ўжывалі і ўжываюць розныя спосабы для компромэтацыі яе. І найбольш „ходкім таварам" у іх зараз зьяўляецца „утка", што твор Кобеца не беларускі таму, бачыце, што Кобец рабочы-качагар, скончыў пачатковую школу яшчэ ў старыя часы на расійскай мове, і што ў час напісаньня свайго твору ён яшчэ ня цалкам аўладаў беларускай літаратурнай мовай.

„Гута" Кобеца ёсьць ня толькі ўдалы, літаратурны, драматычны твор, „Гута" ёсьць вялізарнай важнасьці політычны дакумант, дакумант, які сьведчыць аб якасна новым этапе ў разьвіцьці пролетарскай літаратуры, які сьведчыць аб пачатку масавага процэсу выяўленьня творча-мастацкіх сіл з нэтраў вытворчасьці, процэсу аўладаньня рабочай клясай літаратурай, аб пачатку таго масавага процэсу, які зараз разгортваецца ў выглядзе закліку рабочых ударнікаў у літаратуру.

Усяго гэтага нельга сказаць пра твор Гурскага „Качагары", аб якім тут ужо гаварылі. Мне здаецца, што гэты твор ня ўзьняў нашу беларускую пролетарскую драматургію на вышэйшую ступень, што гэты

твор, у параўнаньні з „Гутай", зьяўляецца крокам назад.

У чым асноўныя зрывы аўтара і тэатру?

На сцэне тэатру ў п'есе „Качагары" адсутнічае рабочая кляса; жывы, сапраўдны рабочы колектыў. На сцэне, у ходзе ўсёй п'есы няма той клясы, якая кіруе соцыялістычным будаўніцтвам, якая перабудоўвае ўсю народную гаспадарку, якая праз жорсткае змаганьне перамагае сваіх клясавых ворагаў. Замест жывой рабочай клясы, замест жывых яе гэрояў-энтузыястаў—мы бачым манэкены, якія, як на спружынах, рухаюцца на сцэне. Роля рабочае клясы ў клясавым змаганьні, наперакор намерам аўтара, не паказана. Гэта першы і асноўны недахоп, зрыў аўтара і тэатру, недахоп,які кладзе адпячатак на ўвесь ход п'есы,

З першага недахопу органічна вынікае і другі. Партыйная арганізацыя як заводу, так і раёну—дзе адбываюцца здарэньні, не паказана, кіруючая роля партыі затушавана. Партыя, парторганізацыя ўвасоблена ў сэкратары райкому, які наперакор намерам аўтара, вышаў закончаным опортуністам. Аднак ход п'есы ня толькі не разьвенчвае опортуніста, а наадварот, гэты опортуніст дзякуючы некім таемным сілам, перараджаецца (мгновенно) і становіцца на чале рабочых мас, носьбітам і прапагандыстам ідэй ленінізму. Гэта другі зрыў, другі недахоп, які аднак нясе пэўную шкоднасьць. Мы ведаем, што ня ўсякі член партыі, папаўшы у балота опортунізму, гэтым самым беспаваротна страчаны для партыі, мы ведаем, што паасобных опортуністаў партыя перавыхоўвае. Але опортунізм, а ў „Качагарах" опортуніст—ёсьць вобраз опортунізму як соцыяльнай зьявы, вось гэты опортунізм ня мае права на апраўданьне, на перараджэньне ў ідэолёгію пролетарыяту; ён павінен быць разгромлены, а мастакомпісьменьнікам павінен быць разьвенчаны. У „Качагарах" ня ў прыклад „Гуце" гэтага мы ня бачым.

Трэці асноўны недахоп, дык гэта па часьці нацыянальнай формы. Аўтар, пастаноўшчык, кіраўніцтва тэатру ў змаганьні з богемай, з нацыянал-дэмократызмам не заўважылі тато, што аддалі на зьядзеньне нацыянал-дэмократызму нацыянальную беларускую форму. Яны не зразумелі таго, што новы зьмест таксама ня можа мець нацыянальнай формы. Далей, з якога гэта часу беларуская вопратка, беларуская песьня, скокі сталі дастаяньнем нацыянал-дэмократызму? А між тым па п'есе так. Адкуль гэта тэатр узяў, што „косоворотка" зьяўляецца адзнакай пролетарызацыі, а беларуская вышываная кашуля формаю варожых кляс? А па п'есе выходзіць так.

Праўда, мы чулі пярэчаньні (якія, да слова кажучы, не выратоўваюць кіраўнікоў пастаноўкі), што сяляне ў „Качагарах" апрануты ў беларускую вопратку. Добра. Стала быць, па-вашаму, таварышы пастаноўшчыкі, выходзіць, што толькі сялянства зьяўляецца носьбітам нацыянальнасьці, што толькі нацыянальная форма ўласьціва той культуры, якой жыве сялянства? Выходзіць так. А паколькі культура, якой жыве пакуль-што селянін, не зьяўляецца яшчэ пролетарскай, соцыялістычнай, бо сялянства толькі далучаецца зараз да соцыялістычнай культуры то выходзіць, што соцыялістычная культура беларускага пролетарыяту ня мае сваей беларускай формы.

Але, каб да канца ацаніць эфэктыўнасьць змаганьня тэатру з нац. дэмократызмам, па гэтай лініі, успомнім што гаварылі нацыянал-дэмократы аб носьбітах беларускасьці. Яны, як усім вядома, гаварылі што толькі сяляне зьяўляюцца сапраўднымі беларусамі, што рабочых беларусаў няма, што беларускія рабочыя толькі па сваім паходжаньні беларусы і г. д. Каму

патрэбна: каб наш тэатр падтрымліваў гэту рэакцыйную балбатню.

Можна было-б праілюстраваць вам некалькі ўзораў той дзікай „дыялектыкі", якую пробуе „ўжываць" пастаноўшчык. Так, напрыклад, п'яны харавод навокал цэбра выяўляе ідэю руху, а тое, што Іваноўскі ходзіць толькі ўніз, а ня ўверх, ідэю ўпадку клясы, прадстаўніком якой зьяўляецца Іваноўскі і г. д. і г. д.

Проблемы, якія паставіў перад сабою І. Гурскі, зьяўляюцца надзвычайна актуальнымі для беларускай драматургіі, але т. Гурскі пацярпеў на гэтым паражэньне, а пастаноўшчык тэатру яшчэ больш усіліў эфэкт паражэньня. П'еса „Качагары" патрабуе карэннай перабудовы, выпраўленьня вялікіх політычных і мастацкіх памылак, у тым ліку і памылак пастаноўкі. П'еса можа быць выпраўлена і павінна быць выпраўлена.

Ня гледзячы на зрывы і недахопы ў драматургічных творах пролетарскай літаратуры, зрух усё-ж зроблены. Зроблены першыя крокі па шляху стварэньня рэпэртуару, адпаведнага задачам рэконструкцыйнага пэрыоду. Але трэба з усёй рашучасьцю сказаць, што ў гэтай справе мы зрабілі куды менш, чымся маглі зрабіць пры хаценьні, пры належным кіраўніцтве, пры мобілізацыі ўвагі пісьменьнікаў навокал тэатру. Гэтага апошняга фактару, кіраўніцтва, у нас па сутнасьці ня было.

Горш, нікуды ня варта абстаіць справа ў кіно. Чым можна пахваліцца пленум перад рабочай клясай і працоўным сялянствам у гэтай галіне? Пакуль што нічым. На сёньняшні дзень мы ня маем яшчэ ніводнага твору беларускай пролетарскай літаратуры ў выглядзе сцэнарыя для кіно. Кіно—самае вузкае месца. Мне здаецца, што трэба нашым пісьменьнікам мобілізавацца і ўзяцца за напісаньне сцэнарыя. Недаацэнка работы кіно зьяўляецца горшым відам опортунізму.

Пролетарская літаратура зрабіла агромністыя посьпехі па шляху аўладаньня дыялектычна-матэрыялістычным творчым мэтодам.

Пролетарская літаратура на сёньняшні дзень дасягнула такой ступені станаўленьня творчага дыялектычна-матэрыялістычнага мэтоду, калі асноўныя моманты матэрыялістычнай дыялектыкі у часткі пісьменьнікаў сталі, а ў другой часткі становяцца, асновай творчай практыкі. Праўда, як мы забачым на разглядзе творчасьці пісьменьнікаў, што на гэтым шляху нам яшчэ трэба шмат працаваць, яшчэ шмат вучыцца і ўпарта вучыцца. Але вучыцца ня так, як гэта некаторыя разумеюць: засесьці за Гегеля засесьці за Маркса, засесьці за другіх клясыкаў, завесіцца фіранкамі брэзэнту, каб сапраўднасьць не прасякала ў яго габінэт. Ня так вучыцца, а вучыцца на жывой сувязі тэорыі з практыкай, у ўзаемнай і актыўнай сувязі з соцыялістычным будаўніцтвам. Толькі на падставе гэтага нашы пісьменьнікі сапраўды змогуць аўладаць дыялектыка - матэрыялістычным, марксысцка - ленінскім творчым мэтодам.

Да гэтага часу БЕЛАПП ня меласваёй творчай пляцформы. Дыскусія па творчых пытаньнях толькі пачнецца з пленуму. Да гэтага часу па розных прычынах мы яшчэ яе не разгарнулі як сьлед.

Праўда, былі спробы распачаць яе, але гэтыя спробы копіравалі горшыя бакі адмоўныя бакі творчай дыскусіі ў РАПП, гэта голае, схоластычнае практыкаваньне ў катэгорыі, адарванае ад штодзённага літаратурнага руху, ад творчай практыкі пролетарскіх пісьменьнікаў. Але, апрача гэтых бескарысных спроб, былі спробы выкарыстаць творчую дыскусію для адкрытай пропаганды буржуазнай тэорыі і „рэцэптаў". Я маю на ўвазе выступ-

леньне вядомай політычнай Mädchen für alles Функа-Гародні, выступленьне, якомумы далі жорсткі адпор.

Мы ня зьбіраемся вынаходзіць які-небудзь асаблівы, свой уласны беларускі „самабытны“ творчы мэтод. Дыялектыка-матэрыялістычны творчы мэтод зьяўляецца адзіным мэтодам як для расійскай украінскай, чуваскай, татарскай, і г. д., так і для беларускай літаратуры. Праўда, кожная, у тым ліку і наша, літаратура мае сваю спэцыфічнасьць, кожная літаратура будзе прымяняць гэты мэтод да сваіх спэціфічных умоў. Кожнаму нашаму пісьменьніку трэба гэтым мэтодам аўладаць добра, і тады наша пролетарская літаратура на падставе гэтага будзе мець яшчэ посьпехі большыя, большыя заваёвы.

Вам кожнаму вядома, што мастацтва і літаратура мае сваім об‘ектам об‘ектыўную рачаіснасьць, яе законамернасьць, процэсы, зьявішчы і г. д. Вы ведаеце, што няма такога зьявішча, такіх процэсаў, законамернасьцяй, якія-б не зьяўляліся об‘ектам літаратуры. Значыць літаратуру адрозьнівае ад іншых відаў ідэолёгіі, хоць-бы ад навукі, нешта іншае, а не об‘ект, не прадмет. Гэта іншае складае спэцыфікум літаратуры, утварае новую форму ідэолёгіі, „Разве есть область, составляющая исключительную собственность поэзии? Ведь ее содержание то же, что содержание философии“— пісаў ў свой час Пляханаў (гл т.XVIII старонка 225

Значыцца, розьніца паміж навукай і літаратурай ня там, дзе яе часамі шукаюць буржуазныя эстэты і іх эпігоны, ня ў розьніцы зьместу ня ў розьніцы об‘екту, а мабыць у форме выяўленьня зьместу, у форме яго выражэньня у форме пазнаньня об‘екту. Для нас, для пролетарскай літаратуры матацтва, а стала быць, і літаратура зьяўляецца асобнай, спэцыфічнай формай пазнаньня об‘ектыўнай рачаіснасьці, яе законамернасьцяй, яе процэсаў руху і г. д., вобразнай формай, мышленьнем вобразаў. Вобраз у мастацтве, у літаратуры ёсьць той сродак, праз які выяўляецца, пазнаецца, адлюстроўваецца рачаіснасьць у яе частках, у яе заявах, у яе сутнасьці. Спэцыфіка літаратуры у вобразе.

Вучоны пазнае рачаіснасьць, яе законамернасьці, об‘ектывіруе вынікі свайго пазнаньня праз лепшыя катэгорыі сылёгізмы пісьменьнік-мастак гэтае робіць праз вобраз, захоўваючы ў самой рачаіснасьці у свайго об‘екту „чувственную, наглядную“ форму.

„Искусство имеет своею целью представить идею под чувственною формою“, гаварыў стары Гегель, і гэта зьяўляецца глыбокай праўдай. Мастак, калі ён сапраўды мастак, а не мастак па сьпісе—а такіх у нас шмат,—складаную рачаіснасьць у яе зьявах, усю сукупнасьць свайго об‘екту выяўляе паказвае праз „чувственную“ форму, праз вобраз. Я дазволю сабе спаслацца на невялікую мясьціну з твору Платона Галавача „Спалох на загонах“, на мясьціну, дзе ён гаворыць пра бежанства.

„Чалавек, які, калі яго выгналі вайною з сваёй хаты, ішоў на далёкі усход і шлях свой цяжкі і бясконцы ўстаўляў крыжамі над магіламі дзяцей сваіх, каб ня зблудзіць, калі прыдзецца варочацца да дому...“ Што тут асаблівага? А тое, што тут „крыжы над магіламі дзяцей сваіх“ наглядна „чувственно“ выяўляюць, хвалюючы паказваюць хвалюючую трагедыю мільёнаў працоўных, якіх „выгналі вайною“, што гэты вобраз раскрывае перад вамі наглядна „чувственно“ той сапраўды „цяжкі і бясконцы“ шлях, па якім па „літасьці“ цароў, капіталістаў і памешчыкаў ішлі мільёны працоўных.

Тут, як бачыце, для таго, каб стварыць вобраз трагічнага шляху мільёнаў працоўных, пісьменьніку не патрэбна была статыстыка сьмяротнасьці, хворасьці, не патрабава-

лася пісаць па некалькі дзён гэтыя „выгнаныя людзі", ня елі, ня пілі і г. д. Ён удалым вобразам выкрыў усю глыбіню, усю трагічнасьць бежанства. Я ўзяў тут прыватны момант твору, асобны вобраз, які зьяўляецца органічнай часткай твору вобразу процэсу, процэсу які выяўляецца ў творы.

Мастак праз вобраз, праз наглядную „чувственную" форму ўскрывае і выяўляе супярэчнасьці об'ектыўнай рэальнасьці, змаганьне гэтых супярэчнасьцяй, пераход адной супярэчнасьці ў другую праз зьняцьце, праз перамогу вядучай тэндэнцыі. Мастак праз вобраз, улаўлівае і выяўляе рух і апосрэднічаньне аб'ектыўнага працэсу. А праз усё гэта ён і стварае вобраз процэсу ў яго рознастайнасьці і адзінстве.

„Явления искусства не только не суть простая видимость, но по сравнению с обыденной действительностью им следует приписать более высокую реальность и более истинное бытие"—гаворыць Гегель аб зьявах мастацтва. Калі мы будзем чытаць гэтую формулу па матэрыялістычнаму, калі адкінем адсюль ідэалістычнае разуменьне „более высокой реальности и более истинного бытия"—дык мы атрымаем формулу, якае вызначае розьніцу паміж сапраўдным мастацтвам і апісацельствам, портрэтнасьцю.

Звычайнае наша ўяўленьне аб рачаіснасьці—ёсьць звычайна павярхоўнае ўяўленьне. Тое ўяўленьне, якое мы атрымліваем ад нашых непасрэдных уражаньняў, яшчэ не зьяўляецца сапраўдным пазнаньнем рачаіснасьці ў яе сутнасьці. Пазнаць, выразіць, адлюстраваць рачаіснасьць—гэта значыць разгарнуць і выявіць усю яе сукупнасьць, улавіць законамернасьці яе руху, пераходы, апосрэднічаньні і г. д., інакш кажучы, пазнаць і выявіць рачаіснасьць ва ўсёй яе „богатой целостности с многочисленными определениями и отношениями" (Маркс), пазнаць і выявіць яе як адзінства рознастайнасьці, „сведенную к единству множества определений" (Маркс). Гэта значыць прадстаўленую ў вобразным уяўленьні. Пазнаньне дыалектычнай рачаіснасьці магчыма толькі праз разгортваньне ўсёй сукупнасьці.

„Развертывание всей совокупности действительности—сущность диалектического познания" (Ленін, зборнік IX, ст. 159).

Мастак дыялектык-матэрыяліст пазнае і разгортвае законамернасьці процэсаў, формы процэсаў, асобныя і агульныя зьявы,—інакш кажучы, усю сукупнасьць рачаіснасьці, ня як фотограф, які бярэ асобную зьяву ў яе статыцы і адбівае на плёнцы сваіх пачуцьцяў тое, што выбрала яго вока, альбо як павярхоўны апісацель фіксуе, зноў такі ў статычным стане, дробязі зьяў, і які ўсё-ж ня можа прасякнуць усёй глыбіні процэсу. Мастак дыялектык-матэрыяліст не пасыўны фіксатар зьяў. Утварэньне вобразу, які адлюстроўвае і выяўляе сутнасьць процэсу адбываецца не незалежна ад актыўнага ўдзелу сазнаньня, не без адпаведнага партыйнаму клясаваму пункту гледжаньня, не праз адно падсьвядомае, інтуіцыйнае, у супроцьлегласьць сьвядомасьці, а на аснове адзінства сьвядомага і падсьвядомага, пры прымаце сьвядомасьці.

Адсюль відавочна ўся рэакцыйнасьць і шкоднасьць тых творчых „рэцэптаў", якія ў свой час даваў пролетарскай літаратуры А. Варонскі. У сваёй кнізе „Искусство видеть мир" ён пісаў:

„Тайна искусства—в воспроизведении самых первоначальных и непосредственных впечатлений" (ст. 91). Няма чаго гаварыць, што калі-б пролетарская літаратура пайшла па шляху Варонскіх, дык яна ня толькі ня была-б пролетарскай, але-б нават ня здолела-б быць і літаратурай наогул, а была-б пародыяй на літаратуру, ня толькі не дапамагала-б пролетарыяту ў

ажыцьцяўленьні гістарычных задач, а, наадварот, была-б зброяй у руках клясавых ворагаў пролетарыяту, у іх змаганьні супроць соцыялістычнага будаўріцтва.

Відавочна рэакцыйнасьць і няпрыемлемасьць для пролетарскай літаратуры і такіх навучаньняў Варонскага, што „в создании образа деятельное участие принимает ум, но еще большее участие в его образовании принадлежит бессознательной работе" (там-жа ст. 17), Што тут характарнага у гэтай вынятцы? Перш за ўсё электрычнае, мэханістычнае разуменьне суадносін „ума и бессознательной творческой работы".

Па Варонскаму, розум і падсьвядомыя процэсы не знаходзяцца паміж сабой у дыялектычнай сувязі, яны разарваны, яны правамерны у сваёй самастойнасьці.

Але, па-другое, ня гледзячы насамастойнасьць розуму і падсьвядомага, у творчым процесе, у стварэньні вобразу прымат вядучая роля належыць падсьвядомаму. Адсюль адмаўленьне змаганьня за сьветапогляд, адсюль пэсымізм, капітуляцыя перад буржуазным і дробна-буржуазным інтуітывізмам, адсюль адмаўленьне змаганьня за папутніка. Можам мы пайсьці па гэтым шляху? Не, ня можам і ня пойдзем, бо гэты шлях ня наш, а шлях клясавых ворагаў. Зусім не выпадкова, што „рэцэпты" Варонскагэ зьяўляліся асновай творчых позыцый контрэволюцыйных нацыянал-дэмократычных лірыкаў. Не выпадкова і тое, што Вароншчына зьяўлялася асновай творчасьці большасьці ўзвышанцаў і актыўна імі пропагандавалася. Але пра гэтае потым.

Мастак дыялектык-матэрыяліст, насупроць Варонскім, не застанаўліваецца на павярхоўнасьці, не задавальняецца „первоначальными и непосредственными впечатлениями", не аддаецца ва ўладу сваёй інтуіцыі, стыхіі падсьвядомага, а прасякае ўва ўнутранасьці процэсаў рачаіснасьці, ва ўсю іх глыбіню, пазнае іх сілай сваёй сьвядомасьці, сьвядома робіць адбор агульнага, тыповага, таго, што можа быць ўзьведзена ў вобраз. Адсюль зусім ня значыць, што мастак ігнаруе „чувственную, наглядную" звычайную форму. Наадварот, ён, захоўваючы „чувственное, наглядное" звычайнае—выяўляе праз гэта сутнасьць зьяў. Праз „чувственное, наглядное" відзімае мастак дыялектык-матэрыяліст вызывае „сущее", сапраўднае.

Вось у гэтым спэцыфічныя моманты мастацтва, у гэтым асаблівасьці і асноўныя моманты мэтоду дыялектычнага матэрыялізму, мэтоду, якім павінен кожны пролетарскі пісьменьнік аўладаць, каб рухацца далей.

Аднак гэтае яшчэ ня ўсё. Варонскі ў свой час пісаў: „Эстетическое чувство лишено узко-утилитарного характера, оно бескорыстно.." Калі гэта перакласьці на звычайную нашу мову, дык гэтае сьцьвярджэньне набудзе наступны выгляд: эстэтычныя пачуцьці, якія знаходзяць сваё выяўленьне ў мастацкім творы ня носяць дзейнага характару, яны ня маюць за мэту і не зьяўляюцца спэцыфічным сродкам клясавага змаганьня, яны бескарысны. Эстэтычныя пачуцьці ёсьць толькі сваяасаблівыя, бескарысная, плятонічная форма сузіраньня. Ці правільна гэта? Гэта няправільна хоць-бы і таму, што такая пропаведзь ужо ёсьць фактар змаганьня буржуазіі супроць пролетарыяту, змаганьня за супроцьстаўленьне мастацтва, эстэтычных пачуцьцяў„ карысьці пролетарыяту".

Для нас, для пролетарыяту, мастацтва ня ёсьць сваяасаблівая форма пасыўнага сузіраньня альбо „бескарыснага адчуваньня", як гэта вучыць Варонскі. Для нас мастацтва ў яго функцыі ёсьць актыўны сродак пазнаньня сьвету, пазнаньня соцыяльных адносін; для нас мастацтва, далей, ёсьць актыўна дзей-

ная сіла, зброя ў клясавым змаганьні ў розных яе формах. Для нас мастацтва зьяўляецца актыўным сродкам мобілізацыі працоўных, за выкананьне задач па соцыялістычным будаўніцтве.

На даным этапе комуністычнай рэволюцыі больш чымся калі мастацтва „павінна максымальна ўзбуджаць псыхолёгічную актыўнасьць і энэргію рабочае клясы (Фрычэ), павінна быць актыўным сродкам ўзбуджэньня...?... актыўнасьці рабочае клясы і колгасьнікаў навакол задач па ажыцьцяўленьні проблемы „дагнаць і перагнаць".

Мы зараз больш, чымся гэта рабілі раней, павінны з ўсёй сілай падкрэсьліць, выпукліць актыўнасьць, функцыянальную ролю мастацтва, бо бяз гэтай ясна акрэсьленай мэтаўстаноўкі наша літаратура ня выканае сваёй ролі, сваіх задач, якія ёй адведзены ў сыстэме клясавага змаганьня, у сыстэме соцыялістычнага будаўніцтва.

Адсюль па ўсёй сваёй велічы, з усёй сілай паўстае задача перад пролетарскай літаратурай, задача аўладаньня тэматыкай рэконструкцыйнага пэрыоду. Трэба асазнаць і памятаць, што аўладаньне тэматыкай рэконструкцыйнага пэрыоду,—ня ў вульгарным яе разуменьні,—зьяўляецца па сутнасьці ўмовай аўладаньня дыяліктычна-матэрыялістычным мэтодам. Асваеньне нашай літаратуры тэматыкі вынікаючай з данага, конкрэтнага гісторычнага этапу, зьяўляецца ўмовай таго, што літаратура, ня будзе плесьціся ў хвасьце, у абозе гісторычнага руху, ня будзе стаяць у баку ад агульна пролетарскай справы па будаўніцтве соцыялізму.

Пролетарскія пісьменьнікі павінны сваёй творчай практыкай дабіць варожыя пролетарскай літаратуры тэорыі, ліквідатарскія тэорыі Троцкага-Варонскага і іх варыяцыі, у якую яны вопратку ні апраналіся. Я маю тут на ўвазе „тэорыю" „патоса-дыстанцыі", тэорыю, якая вучыць, што для таго, каб пісьменьнік стварыў вялікі мастацкі твор, для гэтага трэба, каб матэрыял эпохі, об'ект творчасьці вылежаўся, вымарыўся, што мастацтва наогул ня можа пасьпяваць за гісторычным рухам, што месца яго ў гісторычным абозе.

„В 18 и 19 г. г. на фронтах нередкость было встретить воинскую часть, движение которой скрывалось конной разведкой и замыкалось телегами с артистами, декорациями и всяческим реквизитом. Место искусства вообще—в обозе исторического движения" (Троцкий „Литература и революция"). Такім чынам вы зьяўляецеся не байцамі, не авангардным атрадам пролетарыяту, а па-просту кажучы, вы зьяўляецеся па Троцкаму абознай клячай. Праўда гэтая—адваротная. Палажэньне Троцкага прыстасоўваецца да яго само га. Ён не ў авангардзе рэволюцыі, а хутчэй у асэнізацыйным абозе буржуазіі.

Такой-жа думкі адносна месца мастацтва ў гісторычным руху, адносна таго, што сапраўднае мастацтва можна тварыць толькі ў эпохі сытасьці, зацішша, устойлівыя эпохі, трымаецца і А. Воронскі.

„Искусство,-преимущественно занятие мирное. Искусству трудно отдаваться в эпоху войн, битв, острых классовых столкновений и напряженной борьбы. В эти моменты воля видеть затемняется сплошь и рядом волей хотеть и действовать. Препятствуют также и общие неблагоприятные экономические и бытовые условия („Искусство видеть мир," ст, 14).

З усяго гэтага вынікае, што ў наш час напружанага і вострага клясавага змаганьня нельга „отдаваться искусству", што мастацтва не зьяўляецца вынікам і сродкам клясавага змаганьня, што тварыць мастацтва гэта ня значыць „хотеть и действовать", у клясавым змаганьні, а што

мастацтва толькі зьяўляецца сродкам „видеть“ пасьля абжорства. Што гэтыя тэорыі зьяўляюцца варожымі для пролетарскага літаратурнага руху, даводзіць наўрад ці патрэбна. Вельмі-ж відавочна буржуазная сутнасьць іх.

Нават стары Гегель і той трымаўся другога погляду на гэтае пытаньне. Ён у свой час гаварыў, што ня эпохі сытнасьці і зрэласьці ўтвараюць вялікія мастацкія каштоўнасьці, а эпохі гэроічныя. Вадаразьдзелам у творчасьцях пісьменнікаў розных кляс зьяўляецца сьветапогляд.

Ва ўсёй творчай практыцы пролетарскай літаратуры асноўную ролю, наперакор буржуазным тэорыям, наперакор інтуітывізму Вароншчыны адыгрывае сьветапогляд. Сьветапогляду ў творчым процэсе належыць вядучая роля. За вядучую ролю сьветапогляду нашаму пролетарскаму літаратурнаму руху прышлося на працягу апошніх год весьці жорсткае змаганьне ня толькі супроць Троцкізму і Вароншчыны, але і супроць нацыянал-дэмократычных варыяцый Вароншчыны. У свой час вядомы вам Язэп Пушча пісаў, што няхай лепш твор вырываецца з гарачага сэрца, чымся вымучваецца з халоднай галавы.

Дазвольце разам з вамі ўсумніцца ў якасьці і творчых здольнасьцях сэрца таго пісьменьніка, з халоднай галавы якога прыходзіцца вымучваць вобразы.

Таксама у свой час сярод Бел-АППаўцаў была ў модзе і карысталася досыць значнай популярнасьцю думка, праўда не орыгінальная, што пісьменьнік павінен пісаць пра тое, што ён адчувае.

Адзін з нашых маладых пісьменнікаў у 1929 годзе так і заявіў: „Буду пісаць тое, што адчуваю“. У свой час мы на такія выказваньні так адказвалі: паважаныя таварышы, па-першае, ня ўсё тое, што вы адчуваеце, мае грамадзкае значаньне; па-другое, ня ўсё тое, што вы адчуваеце і пішаце, уяўляе сабою мастацкую вартасьць; па-трэцяе, ня ўсё, што вы адчуваеце, павінна знайсьці сваё выяўленьне ў творах, з якімі-ніякімі сваімі пачуцьцямі, зрабеце ласку, застаньцеся самі. Пісьменьнік павінен пісаць аб тым, што хвалюе клясу, чым яна дыша, чым жыве, чым захоплівaецца, што творыць, пісаць аб тым, што зьвязана з процэсамі рачаіснасьці, якія адбываюцца ў нашай краіне, што адбываецца на рэволюцыйнай арэне комуністычнай рэволюцыіі.

Інтуіцыйным настроям, якія знайшлі сваё найбольш клясычнае выяўленьне ў зборніку „Как мы пишем“, у якім пропагандуецца палітычны індэфэрэнтызм, у якім пішуцца зусім дзікія рэчы,—усялякім такім настроям трэба даць рашучы, сьмяротны бой. Змагацца за дыялектыка-матэрыялістычны мэтод азначае змагацца ў першую чаргу за пролетарскі сьветапогляд, бо, як правільна пісаў т. Фрычэ, творчыя „мэтоды ў пісьменьнікаў вынікаюць з іх мэтодаў мышленьня, з іх клясава-абумоўленага агульнага сьветаадчуваньня“.

Сьветапогляд для пролетарскага пісьменьніка зьяўляецца не „ідэолёгіяй для галоўліта“ і ня нечым вонкавым, а органічнай, вядучай асновай творча-мастацкай практыкі.

Нашым пісьменьнікам трэба памятаць, што для пролетарскага пісьменьніка мала пазнаць сьвет, а што яго (сьвет) трэба праз пазнаньне ператварыць.

У сваіх тэзісах аб Фэйербаху Маркс пісаў:

„Философы лишь различным образом об‘ясняли мир, но дело заключается в том, чтобы изменить его“.

Мастацкая літаратура зьяўляецца аднэй з вастрэйшых зброй зьмены сьвету, адпаведна мэтаімкненьням перадавой, рэволюцыйнай клясы, а ня толькі сродкам пазнаньня яго. Мастацкі пазнаць, каб зьмя-

ніць—вось што зьяўяецца галоўным у нашай літаратурнай практыцы. Аб'ектыўная рачаіснасьць, сьвет, усё тое, што зьяўляецца об'ектам творчасьці пісьменьніка—у тым выглядзе, як ён ёсьць на кожным этапе нашага разьвіцьця, ня можа здаволіць пролетарскага пісьменьніка, таго пісьменьніка, які правільна ўлавіў і зразумеў тэндэнцыі гісторычнага разьвіцьця.

„Мир не удовлетворяет человека, и человек своим действием решает изменить его" (Ленин).

Пролетарыят сваёю штодзённай практыкай соцыялістычнага будаўніцтва, сьмяротнымі бойкамі з сусьветным капіталам зьмяняё сьвет. Рабочая кляса, якая прызвана кіраваць гісторыяй і тварыць яе, не застанаўліваецца на сваіх заваяваных посьпехах. Заваяванае для яе ёсьць толькі прадмова, аснова для далейшых заваёў у справе зьмены сьвету, у справе ператварэньня грамадзтва адпаведна комуністычным ідэалам.

Пролетарыят, перабудоўваючы сьвет, ператвараючы грамадзтва, кіруецца перадавой рэволюцыйнай тэорыяй — марксызмам-ленінізмам. Пролетарская літаратура цалкам, кожны пісьменьнік у паасобку, для таго, каб выконваць сваю ролю ў справе перабудовы сьвету, павінны узброіцца рэволюцыйнай тэорыяй, сьветапоглядам і мэтодамі Маркса-Леніна, бо „сознание человека не только отражает об'ективный мир, но и творит его" (Ленин).

Узброіцца марксысцка-ленінскім сьветапоглядам, аўладаць дыялектыка-матэрыялістычным творчым мэтодам, органічна, непарыўна ўвязаць літаратурную практыку з задачамі соцыялістычнага будаўніцтва, з задачамі культурнай рэволюцыі—такава задача, такія ўмовы пераўзбраеньня. Той, хто гэтага ня хоча, той няўхільна будзе адкінуты гісторыяй туды, куды адкідаецца ўсякі бруд у масавым рэволюцыйным руху.

Пролетарскі пісьменьнік зьяўляецца такім-жа профэсіяналам-барацьбітом за справу соцыялізму, як токар, сьлесар, муляр і іншыя, бо ён служыць справе рэволюцыі, справе соцыялістычнага будаўніцтва сваімі спэцыфічнымі сродкамі і мэтодамі, якія даручыла і даверыла яму рабочая кляса.

Даніель Окалі

Першы зьезд славацкіх пісьменьнікаў

Па прапанове літаратурнага аддзелу славацкай „Умелецкэ Бэсэды“ ў Браціславе пачаткам верасьня г. г. у Пішчаках[1]) мае адбыцца першы зьезд славацкіх пісьменьнікаў. На зьезд будуць запрошаны як госьці чэскія пісьменьнікі і некаторыя выдаўцы славацкіх кніг.

Гэта—першы зьезд славацкіх пісьменьнікаў. Трэба зазначыць, што чэскія пісьменьнікі дагэтуль зьезду ня мелі. На зьезьдзе, які мае быць дзелавым, выступіць з прамовай д-р Штэфан Крчмэры, сэкратар Славацкай школьнай рады; даклад аб сучаснай славацкай літаратурнай творчасьці маюць зрабіць Э. Б. Лукач і Данё Окалі.

Нельга цяпер яшчэ адгадаць высьледак зьезду, аднак ужо самы факт, што славацкія пісьменьнікі сыйдуцца, каб пагаварыць аб сучасных пытаньнях нашай літаратурнай творчасьці, аб яе соцыяльных, ідэолёгічных і мастацкіх квалітах, аб яе выхадзе з цяперашняга загніваньня і бязьдзеяльнасьці, аб далучэньні да прцоўных і змагаючагася клясу народу—работнікам і сялянам, паказвае, што славацкі пісьменьнік пасьля трынаццаці гадоў задумваецца, намагаецца аб тым, каб літаратура зноў стала вялікім фактарам клясавага змаганьня. Магчыма, пісьменьнікі на гэта і ня думаюць. Сучасны стан славацкай, а яшчэ ў большай меры чэскай літаратуры гаворыць, наадварот, як раз аб тым, што распад капіталізму захваціў як рухавіка і літаратуру. Бадай ніколі пасьля пераваротy не панавала гэткая глухата, крычачая бязьдзеяльнасьць, гэткая грабавая цішыня, як у апошнім годзе. Як раз гісторыя апошніх дванаццаці месяцаў крыкліва паказвае, што славацкая і чэская літаратуры збагнелі, што згубілі бадай зусім свой контакт з жыцьцём, з клясавым змаганьнем рабочых і сялян, што спакойна дрэмле ды пакульгвае за соцыяльна-клясавым змаганьнем, або, замест актыўнай, энэргічнай барацьбы ў гэтым грамадзкім змаганьні, ліквідуе ды адкідае на сьметнік сваю лепшую мінуўшчыну. Хай за сябе крычаць конкрэтныя факты.

У Чэхіі член быўшага „Дзевяцьсілу“ Яраслаў Сайфэрт 1-га мая 1931 г. гаварыў па радыё:

> „Успамінаючы на вершы (рэволюцыйныя), якія я тады пісаў, не магу перамагчы, каб чырвань сораму ня ўдарыла мне да твару„.

Гэта піша здраднік і дэзэртыр.

Сэйфэртаў колега і рэволюцыйны поэт Язэп Гора „працуе ў соцыяльфашысцкім „Чэскім слове“, „Літэрарскіх Новінах“, хваліць Віктараў Дыкаў[1]), прапануе розныя артыкуль-

---

1) Згодна апошніх вестак зьезд мае адбыцца 5 верасьня г. г. у Браціславе. — Заўвага перакладчыка.

1) Віктар Дык—чэскі фашысцкі поэт і політык, быўшая правая рука вядомага чэскага рэакцыянэра д-ра Крамажа. Памёр ад разрыву сэрца ў гэтым годзе.

чыкі, „порнаграфіі і абсцэнасьць“ і г. д., але не знаходзіць ані слова для пролетарскай і рэвалюцыйнай літаратуры, апрача яда-вітых слоў. Трэці член і найбольшы чэскі поэт Віт Нэзвал піша свае „Посэдлосьці“ (ашалеласьць), дзе гэрой прарабляе розныя французскія фокусы-мокусы са сваёй партнёркай і г. д. і г. д.

І славацкія пісьменьнікі не паддаюцца ў гэтых адносінах сябе зганьбаваць. Ва ўспомненым часе выходзіць Разуса „Юлія“, гісторычнае апавяданьне, якое азначае ўцёк ад рачаіснасьці да гарадзкіх архіваў гор. Брэзна. Пятро Суханскі выдае свой „Загадны самалёт“, рэч, якая мае быць „авантурным романам“ і зьяўляецца выйсьцем бязроднага дробнага мешчаніна, які кідаецца ў „фантазію“. Выходзіць зборнік Погосэлева, кніга Ільлі М. Марка „Студзенае сьветло“, А Рэнчыка „Танцуючыя атомы“, рэчы, перапоўненыя нявыразнай балбатнёй, прасякнутыя нігілізмам і пасыўнасьцю, якая найбольш знае, як захапляцца сьцёгнамі мілай. І большая частка вершаў у зборніку Фр. Гэчка зьяўляецца ідэолёгічнай недарэчнасьцю.

Абдзіваваньне зямлёй і сабою не зьяўляецца жадным выйсьцем, а таму поэт гаворыць:

„Мы напоў піраты,
і напоў бальшавікі“.

Трэба ўпамянуць і астатнія вершы Яна Смрэка, нашага „модэрніста“:

У бег раптам падаюся,
вушамі застрыгу,
чуйна ва ўсе бакі дзіўлюся,
ад жанчын я бягу“

(З вершу „Парыж“).

Трэ было-б прывесьці бадай цэлую славацкую літаратурную творчасьць, каб было ясна, што з гэтага боку яна зьяўляецца суцельнай, бо-ж яе твораць т. зв. „мастацкія індывідуалісты“. Таму рэзолюцыя харкаўскага зьезду рэволюцыйных пісьменьнікаў цалкам правільна зазначыла:

„Старшае пакаленьне пісьменьнікаў не знайшло шлях да сучаснай тэматыкі, а малодшае, пасьля некалькіх няўдалых спроб, у большасьці пераходзіць на тэмы не соцыяльныя“.

І цяпер, калі ад харкаўскага конгрэсу прайшло некалькі месяцаў, гэтыя адносіны славацкіх пісьменьнікаў да тэматыкі да сёньняшняга дню не зьмяніліся. Наадварот, з дробна-буржуазнага культурнага хаосу зьнікла група маладых крыкуноў, якая згрупавалася каля часопісу „Лук“ спачатку пад патронатам Славацкай школьнай рады, пазьней Славацкага студэнцкага саюзу. Гэта група сьвядома пераходзіць на шлях фашызму, а ў літаратурнай творчасьці соцыяльныя тэмы яна лічыць „тэмамі ўжо трохі старымі і атропанымі“ („Лук“, № 5—6, аўтар Рудо Угляр).

Ідэолёдічны распад, які пашыраецца адначасова з раскладам капіталізму, у гэтых маладых крыкуноў находзіць сваё выйсьце ў антысацыяльным, антырэволюцыйным зруху дробна-буржуазных элемэнтаў, якія ня маюць іншага паратунку, кідаюцца ў абоймы фашызму. А нейдзе ў цяні за гэтым стаіць тэорыя Марціна Разуса аб „народзе, як этыцкім адзінстве“, аб народзе бяз клясаў, без эксплёататараў, у якім мае панаваць бэхінёўская[1]) „нацыянальная солідарнасьць“ банкіраў з гарнякамі, памешчыкаў з парабкамі. А літаратура мае апяваць гэтую надклясавую гармонію. (А la „У бег раптам падамося“) і г. д.

Распад захвацiў усе галіны культуры.

Усе гэтыя крызісы: тэатру, крызіс інтэлігенцыі, на-

[1]) Рудольф Бэхінэ—лідэр чэскіх соцыяльдэмократаў, цяперашні міністар,—„міністар голаду“, як яго трапна рабочыя празвалі

роднай асьветы, крызіс моладзі, крызіс у адміністрацыі, хабарніцтва, протэкцыянізм, бюрократызм, крызіс юрыстыкі, крызіс романа, поэзіі і г. д.—усё гэта—адзнака цалковага стоку гэтага загніваньня.

А адгэтуль структура грамадзтва дае цалкам іншы вобраз.

Сотні тысяч беспрацоўных: мільёны галадаючых; дзесяткі тысяч эмігрантаў, якія гінуць у бэльгійскіх і французскіх шахтах, эксплёатуемыя „саюзьнікамі"; „перапродукцыя" інтэлігенцыі (згодна прамовы д-ра Дэрэра[1]) з дня 23. V. 1931 г. патрабуецца 4.148 вучыцеляў толькі для народных школ); зьніжэньне рабочым зарплаты; усьцяж завострываецца прасьледваньне рэволюцыйнага пролетарыяту; забарона вольнага побыту работніцкай моладзі ў прыродзе (тэрміны); уводжваньне перадваеннай выховы моладзі ад 6-ці гадоў (Чэскі Сокал ужо падаў адпаведную прапанову); страшная эксплёатацыя сельгаспадарчых рабочых, якія часта, як напр. у Сэрэдзі, жывуць у падземных дзірках і горскіх шчылінах; высыланьне. інтэлектуалаў[2]) і г., д. і г. д., і нарэшце Радоцін, Духцаў. Кашуты[3]) і—турма.

А на другім баку

ня зьменшаныя зыскі, дывідэнды, танціемы, курорты, мора, Рыв'ера, лячэньне тлушчу ў Мар'янскіх лазьнях (чэскі курорт), скачкі, шалёнае ўзброеньне, звышэньне вырабу зброі, удасканаленьне ваеннай тэхнікі, будаваньне ў Паватскай Быстрыцы новай збройні, модэрнізацыя зброі, газаў і г. д.

Капіталізм перажывае трэці пэрыод свайго разьвіцьця, пэрыод абвостранага імпэрыялізму, які, з аднаго боку, заканчвае концэнтрацыю капіталу ўжо проста пад прэсам дзяржаўна-капіталістычнага апарату (Італія), а з другога, бязупынна развальваецца. Пачынае загніваць цэлая капіталістычная сыстэма, яе незатрыманы распад і зьнішчэньне.

Гэта загніваньне, гэты распад капіталізму зьяўляецца адначасна і эпохай распаду і загніваньня капіталістычнай культуры. Між абедзьвюма зьявамі ёсьць жалезная, упорная дыялектычная сувязь. Зьявы, якія характарызуюць сучасную славацкую літаратуру, крытыку і культуру наогул і якія мы вышэй, пры дапамозе прыкладаў, паказалі, красамоўна пацьвярджаюць тое загніваньне і развал старых клясавых культурных форм.

Дзеля гэтага нельга пры данай палітычна-гаспадарчай сытуацыі чакаць ад славацкіх пісьменьнікаў таго, чаго вымагае ад іх даны момант: дабіцца і ісьці адзіным магчымым шляхам,

каб літаратура стала актыўнай зброяй у змаганьні пролетарыяту; каб пісьменьнік мэтодам „об'ектывізму клясавага змаганьня" (Ленін) пазнаў, аналізаваў і ў мастацкай творчасьці сынтэзаваў рачаіснасьць у яе глыбках і пазнаваў яе для таго, каб яго творчасьць дзейнічала як сродак, які накіроўвае да рэволюцыйнай зьмены гэтай рачаіснасьці. (З разьдз. характ. конгрэсу).

---

1) Міністар асьветы, чэскі соцыял-дэмократ.

2) Бэлу Балаша (вэнгэрскі пролет. пісьменьнік).

3) Расстрэл дэмонстрантаў.

ДАНІЭЛЬ ОКАЛІ

Славацкі пісьменьнік, як дробны буржуа (хоць вышаў у большасьці з сялянства і рабочае клясы), не адважваецца на падобную творчасьць. Нехватае яму перш за ўсё пазнаваючага мэтоду, якім зьяўляецца як раз дыялектычны матэрыялізм. А ў каго бракуе гэткага мэтоду, той ня можа правільна зразумець сувязь і законамернасьць грамадзкіх зьяў у іх клясавай аголенасьці. Такое мастацтва будзе толькі заіканьнем ды спатыканьнем сьляпога. У каго бракуе дыялектычна-матэрыялістычнага мэтоду, той у сваёй літаратурнай творчасьці выказвае сваё пазнаваньне соцыяльнай рачаіснасьці і супярэчнасьці ня ясна, містычна, імгліста. А жалезны закон у такім выпадку гаворыць, што літаратурны стыль пісьменьніка, яго літаратурная продукцыя будзе пакрыта імглой, што яго ідэолёгія, перанесеная на мову і дзейнічаньне яго гэрояў будзе агульнай, абстрактнай, накіроўваючы ў па-надземную містыку. Гэтыя зьявы прыводзяць на астатні шлях, прыводзяць да эклектызму, туманнага і няяснага стылю і тых пісьменьнікаў, якіх узварухнула соцыяльна-клясавае змаганьне. Між славацкімі пісьменьнікамі ёсьць шмат такіх, якія, калі і не сваёю творчасьцю, дык хоць сваімі адкрытымі выступленьнямі паказваюць, што вір соцыяльных зрухаў дахо-дзіць і да іх, прымушаючы даць ясны адказ: за або супроць. Калі яны і не зьяўляюцца матэрыялістычнымі дыялектыкамі і ня маюць адвагі пазнаваць ды называць рэчы і зьявы сапраўдным імем, іх стыль выпадае і формуецца конкрэтна так:

„Неба маўчыць. Багна гаворыць і боры.
Дзіўным бляскам зьзяе твой твар.
Ой, падлажыць-бы бомбы пад горы, вырасьце пажар".

(Э. Б. Лукач. „У праклятай краіне", „Элах" № 9).

Гэйда Вамош у артыкуле „Маю пісаць аб Англіі" („Элах" № 9) піша:

„Значная частка нашай прозы і большасьць поэзіі сёньня, што датыкаецца тэматыкі, робіць уражаньне, быццам паходзіць ад сьляпых, глухіх, уласным сэксуалізмам, або вячэрнім подыхам збаламучаных цецярукоў, для якіх крычачых пытаньняў разьвіцьця сёньняшняга сьвету да немагчымасьці напнутай нэрвозы ня існуе. Няма хлеба, жратвы, подласьці, хабарніцтва, паніжэньня, жорсткага конкурэнцыйнага змаганьня. Ёсьць толькі бароковыя пекныя сказы аб чульлівай сьвятой Леокадзі, хваравітага туга храбрага Слабамысьліна, і ня будзь Мілка Урбана, было-б у нас як у казцы".

Э. Б. Лукач у анкеце „Народн. Освобозэні" („Аб старых і моладзі") піша:

„Але гэтая інвэкціва тычыцца сягоньняшніх бацькоў", а менавіта нашых славацкіх „бацькоў народу"; усёй той часткі вярхоў грамадзтва, якая, будучы задаволена сваім жыцьцём, рохкаючы ціха засынае ў сваіх ангельскіх крэслах у абойме сваіх уласных фраз аб народзе; усіх тых, якія на працягу цэлага дзесяцігодзьдзя паваеннага пэрыоду не стараліся аб новым пакаленьні, а калі пачалі старацца, дык гэтае стараньне насіла характар ня чысты, чыста палітычна-партыйны".

Нават і Язэп Двожак у той-жа анкеце піша „сымболічна і туманна":

„Чакаем катастрофу. Адкуль прыдзе, не вядома, але факт, што сьвет мусіць рассыпацца. Дэмократызм мы перажылі яшчэ ў гадох ап'яненьня палітычнай свабодай, у добе вельмі няўстойчывай. —

Мы, як рака, як „жалезны паток", валімо ды шорхаемся, і калі не разьбіваем сёньня, дык заўтра будзем бяз літасьці".

А Мілко Урбан піша:

„Няхай чорт бярэ цэлае мастацтва і нас усіх разам, калі яно ня мае быць лепшым" і г. д

І пад напорам клясавага змаганьня і ў хаосе распаду, капіталізму, які распаўсюджваецца як мор, названыя пісьменьнікі, з якіх некаторыя належаць да найлепшых у Славакіі, хоць сваім выступленьнем пачынаюць разумець анархію і мярцьвецкі распад капіталізму. Аднак гэтага мала! Славацкая літаратурная творчасьць не адлюстроўвае рачаісны стан сёньня ані гэтым „туманным" спосабам. Вынятак робяць Мілка Урбан і Пятро Улемніцкі. Асабліва апошні роман Мілка Урбан „Імгла на досьвітку", у якім у некаторых разьдзелах пранікае Урбан аж да самай існасьці клясавага змаганьня (сцэна на тартаку; цяжарнасьць служкі і г. д.). Аднак у сваёй галоўнай частцы ідэолётічнае „перараджэньне" работніка-комуніста Сэдміка не дасягае мэты. Сэдмік вышаў не рэальны, літаратурнай фантазіяй. Мілко Урбан замест таго, каб ісьці далей у дыялектычным напрамку і мастацкай конкрэты. зацыі рачаіснасьці, проста выдумляе містычнае, панадземнае перараджэньне, да якога ўменшваецца пад развалінамі пожыцкага палацу[1]) сам Ісус Хрыстос. Гэта не адзіны прыклад у гысторыі літаратуры. Хоць-бы ўзяць, напр., творчасьць Дастаеўскага, ад якой таксама нясе анархістычнасьцю і туманнасьцю. Нарэшце, гэта ня што іншае, як страх пазнаваць і адлюстроўваць грамадзка-клясавы характар сучаснасьці, прабівацца да яе глыбіні. А адзіны літаратурна-творчы мэтод пазнаваньня, які дае магчымасьць зразумець існасьць сучаснасьці, гэта дыялектычны матэрыялізм.

Зьвернем увагу на некаторыя галоўныя закіды супроць гэтага творча-пазнавальнага мэтоду. Адным з такіх закідаў зьяўляецца тэндэнцыя. Цэлы апарат буржуазнай крытыкі аж да няпрытомнасьці раве, што мастацтва мусіць быць надклясавым, мусіць быць эстэтычным выплодам і г. д.

Сувязь гэтай тэорыі, як мы ўжо некалькі раз гаварылі, находзіцца ў функцыянальнай залежнасьці ад гаспадарча-політычнай структуры сучаснага капіталізму, які патрабуе „надклясавай веды, надклясавай дзяржавы, надклясавых поліцыянтаў", надклясавага саюзу капіталістаў з пролетарыятам і іх гармонію. Усе іншае—гэта толькі пустая брахня, якую ўжывае гэта крытыка.

Але відна, што гісторычна-матэрыялістычны запас ведаў у гэтых крытыкаў не вялікі. Досыць упамянуць на ўзьнікненьне аднакіх літаратур, дзе клясавае змаганьне буржуазіі за сваё панаваньне часова супадае з процэсам нацыянальнага ўсьведамленьня. Досыць упамянуць і зноў і зноў падкрэсьліць узьнікненьне славацкай літаратуры ў 48-х гадох. Жыцьцёвую істотнасьць соцыяльную функцыю літаратура гэтага часу бачыла ў тым, што яна была зброяй за клясава-нацыянальнае вызваленьне. І зброяй была! А гэта таму, што яе тэндэнцыйнасьць мела карэньне ў соцыяльна-клясавай тагачаснасьці, што была дыялектычна абгрунтавана патрэбамі політычнага змаганьня і клясавага змаганьня, што сваім зьместам і літаратурнай формай апіралася на сялянскія масы—яе мастацкая каштоўнасьць бясспрэчна. Тэндэнцыйнасьць, законамерна ўзнікаючая з дыялектыкі клясавых супярэчнасьцяй і сягаючая да глыбіні клясавай

[1]) У Празе гэты палац вядомы тым, што пару гадоў таму, калі будаваўся, „пацярпеў" страшную катастрофу, пахаваўшы пад сваімі развалінамі 45 рабочых.

псіхоідэолёгіі, ёсьць адным з самых галоўных вагароў кожнага мастацтва.

Тэндэнцыйнасьць, узнікаючая з успамянутых прычын, кішыць якраз у тых літаратурных творах буржуазных пісьменьнікаў, якія здаюцца быць або хочуць быць нетэндэнцыйнымі (напр. у авантурных романах, парнографіях, дзіцячай літаратуры і г. д.). У клясавым грамадзтве бестэндэнцыйныя літаратура і мастацтва і ня мыслімы. Таму, напр. цэлы поэтыстычны рух прапануе т. зв. „абсолютную і чыстую поэзію.[1]) „Як у смутку" (кнгіа Віцезслава Нэзвала—заўв. перакл.), „Неба,пекла, рай" (Конст. Бібля—заўвага перакл.) і г. д.—не зьяўляюцца „ацэнкай марксызму", як думаў проф. Ф. Х. Шальда [2]), але як раз тыпічным прыкладам распаду культурнага капіталізму. Калі параўнаць тыя лімонавыя ды іншыя вобразы романтычнага жаху „Яна ў смутку" з тым баёвізмам наступаючай буржуазнай літаратуры, напр. з такімі, творамі, як „Мары яго!" Сама Халупкі, песьняй „Гэй славакі", „Над Патрамі бліскае" [3]) і г. д. з творчасьцю Штуроўскай групы, з творамі чэскіх, вэнгерскіх, нямецкіх і г. д. пісьменьнікаў часоў клясавага змаганьня буржуазіі ў XIX стагодзьзі за сваё політычнае панаваньне,—дык найлепш пакажа фальш і подласьць сёньняшняй крытыкі, якая крычыць аб змаганьні з тэндэнцыйнай літаратурай, аб зьнішчэньні тэндэнцыйнасьці, якая зьяўляецца законным знакам кожнага клясавога літаратурнага твору.

Паглядзім цяпер на сучасную славацкую літаратуру з боку формальна-эстычнага. Яшчэ крытык Брык, член Лефу, у агульнай кнізе „Літаратура фактаў" у 1929 годзе цьвердзіць:

> — „Мяшчанства ня любіць фактаў: занадта беднае і ўбогае яго жыцьцё, каб быў сэнс доўга прытрымліваццa такога жыцьця. Таму мяшчанства ад пачатку стварала сабе іншую гэроічную рачаіснасьць, у якой ўсе факты не рэальны, але затое ў тысячу разоў больш урачысты, чым рачаіснасьць.
>
> Мешчанін так-сяк перажыве свой час, пасьвячаны працы, а астатак дню хоча жыць нейкім іншым, ідэалізаваным жыцьцём".

Гэта сьцьверджаньне ў свой час, у пэрыод дробнабуржуазнага разьвіцьця, магчыма, што мела сваю вагу, аднак цяпер гэтага сказаць нельга. А калі і мае, дык невялікую. Бо-ж між тым узьнікла „новая вечнасьць." Мешчанін аблюбаваў некаторыя факты, асабліва тыя, у якіх адбіваюць жахі сьвятовай вайны. Кніга Э. М. Рэмарка „На заходнім фронце без перамен" ужо стаіць пад знакам гэтага любаваньня крывавых, аголеных фактаў. Гэтак сама мешчанін аблюбаваў факты, адбіваючы праз мастацкую творчасьць сэнсуальныя пытаньні. Роман Лаўрэнца „Каханак лэдзі Чатэрлейн" і іншыя падцьвярджае, што такая „фотографія" становіцца сучасным мадэрна-творчым мэтодам буржуазнай літаратуры. І ня толькі гэта; у тэрмінолёгію буржуазнай крытыкі пранікаюць і выразы як „монтаж фактаў" і.г.д. Напр., для нас нічога нечаканага ня было, калі Цідо І. Гашпар узаўвазе аб „Матросе Сэлькіру," жыцьцё якога апісана ў романе „Робінзон Крузо", піша, што аўтар Даніель Дэфрэ ўжо тады, 200 год таму, у романе ўжыў „монтаж фактаў" з рачаіснага жыцьця матроса Сэлькірка. Монтаж фактаў вы-

---

[1]) Накшталт нашых узвышанцаў.—Галоўнымі цяперашнімі прадстаўнікамі чэскага „поэтызму" зьяўляюцца поэт Віцезслаў Нэзвал і тэорэтык Карэл Тайгэ.—Заўвага перакл.

[2]) Вядомы чэскі крытык, напоў-матэрыяліст, на поў-рэаліст.

[3]) Славацкая песьня, складаючая другую частку чэхаславацкага нацыянальнага гімну „Гдзе домов муй".

найшоў і часопісь „Політыка ў п'есе Клары Пражаковэ, „Адкрыцьцё". Во, глядзеце! Ужо Робінзон Крузо, глядзеце! І Клара Пражаковэ монтуюць факты! Але—а гэта важна—кожны формальны мэтод можна выкарыстаць толькі як творчы сродак. У руках буржуазнага пісьменьніка фактаграфія і яе формальны сродак азначае заведама тэндэнцыйнае выкідваньне найбольш вызначаных соцыяльна-клясавых фактараў. Азначае выкідваньне з соцыяльнай існасьці, з дыялектычна-клясавага змаганьня некаторых клясава-характарыстычных фактаў. Прыклад кнігі „На заходнім фронце без перамен" зьяўляецца красамоўным пацьверджаньнем гэтай буржуазнай фактаграфіі. Рэмарк нескладна рысуе нямецкіх салдат на заходнім фронце, як жывёлу. На працягу цэлай кнігі жадны з гэрояў не задумваецца над вайной, над яе прычынамі, над яе насьледкамі, над яе існасьцю і сувязьзю з астатнім соцыяльным сьветам. Яго гэроі ядуць, забіваюць, паміраюць, але ня мысьляць. Гэроі кнігі Рэмарка дзейнічаюць зусім ізолявана ад астатняга сьвету і. г. д. У рачаіснасьці-ж гэтыя гэроі разважалі, думалі, сварыліся, пракліналі, бунтавалі, дэзэртыравалі, з іх асяродзьдзя расьлі рэволюцыянэры которскага бунту, крагуеўскага паўстаньня, гэроі вулічных баёў Гамбургу і. г. д., і. г. д. Падобны монтаж фактаў, які мы бачым ва ўспомненых творах, зьяўляецца тэндэнцыйным знасілаваньнем соцыяльна-клясавай рачаіснасьці. Гэта – фактаграфія, прасякнутая буржуазнай ідэолёгіяй, а таму і з мастацкага боку дзеля ўспомненых прычын, нічога ня варта:

> Наадварот, калі монтаж фактаў хоча дасягнуць мастацкіх сродкаў, мусіць тварыцца дыялектычна. Сучасны расійскі фільм Эйзэкштэйна, Пудоўкіна, Вэртава і іншых дасягнуў сваёй мастацкай глыбкі і свайго ўчынку дзякуючы перш за ўсё таму, што яго монтаж рачаіснасьці творыцца дыялектычна-матэрыялістычным мэтодам.

Усіх пытаньняў літаратурнай тэоры і практыкі нельга разьвязаць на гэтым месцы. Аднак Браціслаўскі конгрэс мусіць так або інача гэтыя пытаньні разьвязаць, мусіць высьветліць іх сапраўдную існасьць. Славацкі пісьменьнік павінен зразумець, што яго творчасьць толькі тады будзе актыўнай служкай рачаіснасьці, калі далучыцца да баявых працоўных сялянска-работніцкіх мас Славакіі.

> „Так. Літаратура мае, болей таго, мусіць быць заўсёды рэволюцыйнай, мае, болей таго, мусіць нясьці ўсьцяж новыя позытыўныя каштоўнасьці, калі хоча спаўняць сваё пасланьне".

Гэтак ясна і адкрыта піша наш найлепшы пісьменьнік Міло Урбан, які як раз цяпер пранікае ў сьвет.

Аднак адных дэкларацый, хоць-бы яны паходзілі ад нашых найлепшых пісьменьнікаў, яшчэ мала. Сёньня патрабуецца дзеяньне. Мастацкія, эстэтыцкія формы—гэта толькі сродак. Самае галоўнае—гэта каб літаратурная творчасьць нашых пісьменьнікаў прыблізілася да клясавага змаганьня працоўных мас, каб стала іхняй абаронай. Калі для розных прычын (напр., неаўладаньне матэрыялам) ня можа зрабіцца зброяй клясавага змаганьня, дык каб хоць у той „імглістай" нясьмелай форме намагала ў змаганьні за

працу і хлеб!

Мала дылетанскага запалу, крыку невукаў, якія левымі, радыкальнымі лёзунгамі хочуць прыкрыць свае

мастацка-творчыя недахопы і бязраднасьць. Для таго, каб літаратурны твор уплываў на чытача, мусіць быць мастацка каштоўным, мусіць пры мінімальным абсягу і сродках выконваць максымальны ўчынак! Пісьменьнік павінен умець выкарыстаць любую мастацка-літаратурную форму буржуазнай эстэтыкі так, як рэволюцыянэр умее выкарыстоўваць уласную зброю капіталізму. З гэтым выкарыстаньнем настане і зьмена функцыі, так непарушна выказаная Марксам.

Мы добра разумеем, што літаратурныя творы нельга тварыць толькі на аснове програм. Але, з другога боку, мы так-сама разумеем, што жадная літаратурная практыка ня ўзнікла паміма літаратурнай тэорыі, паміма ідэолёгічнага накіраваньня. Браціслаўскі зьезд меў бы выясьніць гэтую літаратурную тэорыю замест дацяперашняга хаосу і неразьбярыхі, ўвесьці моцныя прынцыпы дыялектычна-творчага мэтоду.

(*Пераклад з славацкай мовы*).

Ал. Кучар

Творчасьць Васіля Каваля[1])

Васіль Каваль зьяўляецца адным з значных прадстаўнікоў беларускай сучаснай сялянскай літаратуры. Тэматыка творчасьці Васіля Каваля амаль выключна вясковая: у яго глыбокае веданьне вёскі, яе жыцьця і асаблівасьцяй псыхікі сялянскіх мас.

Асноўнае ў творчасці Васіля Каваля—гэта глыбока-лірычная любоў да жыцьця, цяга да жыватворчых крыніц радасьці, цяга да сонца, да песьні.

У Каваля жыцьцё і ціхая, але органічная і глыбокая радасьць—усюды. Вобразы прыроды навяваюць яму гэтую радасьць; парасткі новае культуры на вёсцы навяваюць яму гэтую радасьць; бойкая і ўпартая работа камсамольскае ячэйкі на вёсцы навявае яму гэтую радасьць, нават ад убогіх і гнілых стрэх старое вёскі, абагрэтых першымі праменьнямі вясновага сонца, вее радасьцю...

І ў смутку Каваль знаходзіць радасьць:

...„Звоняць над вёскай мілагучныя вясковыя званы—ціхі ды ласкавы рытм пра сьвята-вясну жыцьця. І радасьць і сум... А можа гэта ад таго, што ў жыцьці вялікая радасьць заўжды мяжуецца з незразумела ціхай, салодкай журбою".

Творчы шлях Васіля Каваля зьвязаны з пасьлякастрычнікавай вёскай.

Яшчэ ў першым сваім зборніку „Як вясну гукалі" (1927 г.) у невялічкіх казачых абразкох Каваль вітае радасьць надыходу пролетарскае рэволюцыі, радасьць новага жыцьця на вёсцы, радасьць новае песьні.

У апавяданьні „Як вясну гукалі" Каваль хоча паказаць, як сяляне ня просты „лад-матыў" гукаюць вясну Кастрычніка, як яны хочуць пазбавіцца старога і шлюць „пракляцьце ўсякаму старому". І тады „была перамога ў песьні, як новая мэлёдыя асыпала вакольле прыгажэйшымі словамі".

Тое-ж і ў апавяданьні „Сяльчане", Каваль хоча паказаць у асобе Зьмітрака Канцавога і комсамольскай ячэйкі людзей, якія перарабляюць старую вёску, людзей, якія штурхаюць вёску да новага.

Аднак, ня гледзячы на тое, што ў гэтым першым сваім зборніку Васіль Каваль зьвязвае сваю творчасьць з Кастрычнікам, вітае гэты Кастрычнік, яго надыход, ён усё-ж

---

[1]) Два гады таму назад я надрукаваў у часопісі „Маладняк" (№ 8 за 1929 г.) „Літаратурны портрэт Васіля Каваля". Лічачы, што гэты так званы „літаратурны портрэт" ні ў якой меры не дапамагаў пісьменьніку ў яго творчай рабоце і не высьвятляў сапраўднай існасьці творчасьці В. Каваля, я, крытычна ацэньваючы сваю ранейшую работу, даю на ўвагу чытача гэты новы кароткі нарыс пра творчасьць пісьменьніка. Нарыс між іншага разглядае і апошнія творы В. Каваля, якія яшчэ зусім не закраналіся крытыкай, і, на маю думку, у агуле больш-менш правільна вызначае творчы шлях В. Каваля.

Аўтар

такі сам знаходзіцца яшчэ ў палоне ўласьніцкіх інстынктаў і пачуццяў селяніна. Ён яшчэ ня здольны іх перамагчы. І таму там, дзе Каваль трымаецца за ўласьніцкую абмежаванасьць селяніна, вёска ў яго выступае адзінай, бяз клясавай дыфэрэнцыяцыі. Клясавае змаганьне на вёсцы амаль не знаходзіць адлюстраваньня ў творчасьці Каваля гэтага часу. Нават радасьць ад новых культурных паростаў на вёсцы ўсхваляецца ім і ўспрымаецца абстрактна, адцягнена (вельмі часта ў казачнай форме), як радасьць сама па сабе. Ён любіць вёску, імкнецца сам адштырхнуцца ад яе закасьцянеласьці, патрыярхальнасьці і ўласьніцкай абмежаванасьці селяніна, імкнецца перайначыць гэтага селяніна, але сам знаходзіцца яшчэ ў палоне старога і ўласьніцкага сьветапогляду, псыхікі.

І таму ў „Сяльчанах" ён усхваляе і тое новае, што прыносіць на вёску Кастрычнік, і з любоўю адносіцца да гнілых абагрэтых сонцам сялянскіх стрэх.

Новая кніжка Васіля Каваля „На загонах" (1928 г.) паказала, што ў творчым мэтодзе пісьменьніка выступаюць зусім выразныя ідэалістычныя тэндэнцыі. У гэтай кніжцы, як і ў „Як вясну гукалі", Васіль Каваль вёску, мужыка, зямлю папросту абагатварае. Зямля Кавалю ўяўляецца як нейкая магутная, жывая істота, якая дае сваімі сокамі жыцьцё ўсяму зямному, у тым ліку і чалавеку. Яна, гэтая зямля, што саграецца „ласкамі песень і казак вялікага Сонца", тая зямля, якая атрымлівае ўсе свае жыватворчыя сокі ад „найласкавейшага бога-Сонца", гэтая зямля зьяўляецца асновай сьветастварэньня, асновай быцьця.

„Зямля! Загубленая сярод вялікіх і малых сьветаў космосу, спавітая, як малое дзіцё мацерай, песьнямі, апетая чалавекам зямля. Сагрэтая і ўмоўленая самымі шчырымі словамі, праменьнямі ад найлепшага бога, якому пакланяўся чалавек, ласкавага сонца".

Гэтая богападобная зямля, якая хавае ў сабе аграмадныя сілы і здольнасьці, гартуе у сваіх абымах цела чалавека". Адсюль—толькі чалавек, які працуе на зямлі, які прыкованы да гэтай зямлі, можа атрымаць ад яе вялікія сілы і здольнасьці.

„...Бо зямля прыкавала да сябе з сілаю волата, прыцягнула к чорным грудзям сваім, аберуч агарнула чалавека, і ня можа ён разлучыцца з ёй; куды-б ні пайшоў, што-б ні зрабіў супраціўнае сабе і сваім жаданьням, усюды ў думках мужыка зямля - карміцелька. Часта ганьбіць яе, зьневажае, што ня корміць сям'ю да новага хлеба"... але-ж любіць яе.

І вось мужык, які атрымаў ад зямлі вялізарныя творчыя магчымасьці, прымушаны задушыць іх у сабе альбо даць разгул сваёй душы, якая прапахла „аржаным хлебам з мякінаю ды смалістымі хвоямі", толькі ў карчме... Гэтае і паказана ў аповесьці Васіля Каваля „На загонах", якая малюе жыцьцё дарэволюцыйнай вёскі.

Творчыя асновы Васіля Каваля, якія ідуць па лініі абагатварэньня зямлі, мужыка, усхваленьня прыкаванасьці гэтага мужыка да зямлі, -прыводзяць да таго, што пісьменьнік ня ўмее ўзьняцца сам вышэй „Сілы зямлі" і індывідуалістычных, уласьніцкіх інтэрэсаў сялянства. Гэтыя ідэалістычныя тэндэнцыі ў творчасьці Каваля маюць месца нават да апошняга часу.

Зборнік „На загонах" паказаў, што Васіль Каваль у большасьці сузіральна, застыгла мэтафізычна, пасыўна, а не актыўна-дзейна адносіцца да рачаіснасьці. Яшчэ апавяданьне „Сяльчане" з зборніку „Як вясну гукалі" вызначаецца тым,

што ў ім Васіль Каваль пасыўна фіксуе факты; тое-ж мы маем і ў зборніку „На загонах".

У творчасьці Васіля Каваля адлюстроўваюцца процэсы росту зьмены, ператварэньня пасьлякастрычнікавай вёскі.

Ён утварае вобразы таго, як у вёсцы адбываецца рост новае культуры, як гэта вёска зьмяняючыся ідзе да новага.

У аповесьці „На загонах" Васіль Каваль паказаў вёску Лугіны дарэволюцыйнага часу, дзе беднае сялянства стогне ад непасільных падаткаў, ад казны, ад эксплёатацыі сваіх-жа суседзяў-кулакоў. Галоўны гэрой аповесьці Максім, прыціснуты беднасьцю, ціха нясе пакуту, ды толькі часамі разгульную душу сваю супакойвае ў карчме. Тут характэрна, што Васіль Каваль, як і ў большасьці сваіх твораў, ня можа даць актыўных, дзейных, змаганчых людзей. Большасьць яго гэрояў пасыўныя, ціхія. І вось калі кулак, стараста Макей, ураднік, пісар і земскі пачынаюць зьдзеквацца над Максімам, ён ня вытрымлівае, і Максім забіў Макея. І зноў-жа характэрна, што гэты тэрорыстычны ўчынак Максіма мучыць яго самога, і ён, перажываючы страшэнныя псыхолёгічныя буры, ня вытрымлівае, канчае жыцьцё самагубствам. Былі тут, праўда, і іншыя прычыны. Акрамя таго, што Васіль Каваль надзяліў Максіма рысамі пасывізму, Максім сваім бунтам ня можа выйсьці за межы свае ўласнасьці, свае зямлі. Ён помсьціць не за крыўду такіх-жа прыгнечаных бедных сялян, як і ён, а за сябе, за сваю крыўду. І таму Максіма найбольш страшыць тое, што „загоняць на край сьвету... Мёртвым ляжаш у чужой зямлі. А каму-ж свая зямля застанецца?"

І тут мы бачым уласьніцкую абмежаванасьць селяніна.

У гэтым зборніку мы маем і новую пасьлякастрычнікавую вёску Чмарава, якую мы сустракаем і ў зборніку „Як вясну гукалі", але гэтая вёска ўжо выросла, пайшла наперад. Людзі яе таксама больш актыўныя, больш дзейныя, ніж у зборніку „Як вясну гукалі".

У апавяданьні „Ноч" у асобе Алісея Сімчанкі мы маем далейшае разьвіцьцё вобразу Зьмітрака Канцавога з апавяданьня „Сяльчане". Алісей Сімчанка зьўляецца актыўным грамадзкім работнікам на вёсцы, змагаецца з п'янствам, з бязкультурнасьцю і г.д.

Асаблівую ўвагу нашае грамадзкасьці зьвярнуў на сябе зборнік Васіля Каваля--„Крыніца". Гэтая кніжка паказала, што Васіль Каваль у параўнаньні з яго „На загонах і „Як вясну гукалі" больш блізка падыйшоў да адлюстраваньня проблем новай пасьлякастрычнікавай вёскі і клясавага змаганьня на вёсцы.

Аднак і тут мы можам заўважыць адзінства лініі ў паказе гэтай вёскі з ранейшай творчасьцю Васіля Каваля. Самую вёску мы, зразумела, маем тут паказанай на якасна новым этапе. Людзі, у параўнаньні з першымі творамі Васіля Каваля, перацярпелі вялікую якасную зьмену. Яны выраслі ў ідэёва-палітычных адносінах і пачынаюць, як і сам пісьменьнік, перамагаць у сабе прыкованасьць да ўласнасьці, перамагаць у сабе закасьцянеласьць, што засталося ад традыцый старой вёскі.

У аповесьці „Жніво" мы маем паказ, як комсамольская ячэйка сваёй грамадзка-карыснай работай дапамагала сялянам адзінаасобнікам, беднячкам, як гэтыя комсамольцы грамадзкай-карыснай работай (папраўляюць паламаныя масты і інш.), палітыка-выхаваўчай работай дапамагаюць партыі на вёсцы.

Цікавай у „Жніво" зьяўляецца комсамолка Арына. Яна, як і большасьць гэрояў Васіля Каваля, зьяўляецца якасна новым вобразам, які бярэ свой пачатак пад імем Аленкі, мэтаімклівай дзяўчыны, з апавяданьня „Сяльчане", якая цягнецца да прасьцягаў новага. Арынка ў „Жніво"

на камсамольскім сходзе першая прапанавала дапамагчы бедным удовам сабраць ураджай:

...„Жніво пачынаецца... У нас ёсьць адзінокія ўдовы, як Ігнасіха, Дар'я, якія самі ня могуць управіцца, каб і пажаць і пакасіць.,. Дык мы вось дапаможам трохі жаць, а хлопцы няхай ідуць касіць"...

Наогул у творчасьці Васіля Каваля мы маем два асноўных вобразы вясковай жанчыны. Першы вобраз—гэта новая жанчына мэтаімклівая, якая ідзе па шляху грамадзкае работы, па шляху новай вёскі. Другім вобразам зьяўляецца простая сялянская жанчына, змучаная бедным сялянскім жыцьцём, зьбітая мужам, прыгнечаная мацярынскай ношай, дробнымі дзяцьмі, жанчына пасыўная. Гэты другі тып бярэ свой пачатак з Дар'і, нявесткі Лявонавай у «Сяльчанах" (зборнік „Як вясну гукал!"), што вышла замуж ды гаруе цяпер, ідзе да Насты, сястры Агеевай, з апавяданьня „Ліпы" (Зборнік „Крыніца"), і, нарэшце, выступае як якасна новы вобраз у вобразе Хімы,з апавяданьня „За долю" („Крыніца"), дзе гэтая жанчына, раней забітая цяжкай працай, прыдушаная гаротным жыцьцём, у процэсе самаасьведамленьня свайго прыгнечанага становішча, становіцца на шлях грамадзкае работы, на шлях пошукаў новай долі. Такім чынам гэтая жанчына перарастае ў першы і асноўны вобраз жанчыны ў творчасьці Каваля, жанчыны актыўнай, новай. У апавяданьні „За долю" жанчына гэтая адарвалася ад гаршкоў, ад печы і пайшла ў вясковыя актывісткі, стаўшы пасьля работнікам сельсавету.

У аповесьці „Ліпы" паказана, як на вёсцы сіламі і імкненьнямі дэмобілізаванага чырвонаармейца Агея пачынаюць вырастаць новыя парасткі культуры: хата-чытальня, пачынае організоўвацца коопэратыў, Агей дапамагае сястры выбрацца з ціны замужняга прыгнёту, пры дапамозе гарадзкога рабочага выганяецца кулак і шкурнік з сельсавету. Парасткі новага ўваходзяць і ў вясковы быт (вясельле без папа).

Апавяданьне „Ілька" цікавае тым, што ў ім паказана цыганскае жыцьцё, жыцьцё брадзячага народу, які, нарэшце, пачынае шукаць сабе выйсьця ў тым, каб стварыць сабе чалавечыя ўмовы жыцьця, асеўшы на зямлі.

Тэматычна, як мы бачым, усе гэтыя творы адлюстроўваюць процэс росту новага на вёсцы, процэс культурнага росту і перамаганьня патрыярхальнай дзікасьці вёскі.Зразумела, што ў параўнаньні з ранейшымі творамі зборнік „Крыніца" узводзіць Васіля Каваля на ідэёва вышэйшую ступень.

Аднак, агульныя рысы творчага мэтоду Васіля Каваля, якія яскрава праяўляюцца ўжо ў першым пэрыодзе яго творчасьці, гэта—наданьне нейкай містычнай сілы зямлі, абагатварэньне і ідэалізацыя мужыка, лірычная казачнасьць, абстрактнасьць, адцягненасьць, пасыўна-сузіральныя адносіны да жыцьця—усё тое, што стварае асновы творчасьці Васіля Каваля—і ў гэтым зборніку даюць значныя ідэёвыя правалы. І ў аповесьці „Ліпы" яны зводзяцца да прытупленьня клясавых супярэчнасьцяй на вёсцы (яскрава клясавага разьмежаваньня паміж рознымі соцыяльнымі групоўкамі на вёсцы ў „Ліпах" няма, тым больш не паказана і клясавае змаганьне). Маецца так сама, як і ў ранейшых творах Васіля Каваля, ідэалізацыя ўласьніцкіх інстынктаў і імкненьняў селяніна. Гэта асабліва выяўляецца ў такіх вобразах, як стары Нікан, бацька Агея, і ў Карнея. У Нікана, які зьяўляецца працягам і разьвіцьцём такіх вобразаў, як дзед Лявон з апавяданьня „Сяльчане" („Як вясну гукалі") і дзед Піліп са зборніку „На загонах",—такая-ж, як і ў гэтых старых, прырасьць да зямлі. Зямля, свая ўласнасьць, свой рубель—для яго ўсё:

„Нікан не адзін раз судзіўся з-за зямлі з суседзямі, нават ішоў супроць земскага за кавалак зямлі чуць не да сьмерці біўся. Капейка да капейкі складаў грошы, хаваючы пра чорны дзень; усё гэта хаваў у старую замусоленую кніжку, замыкаў у стары сундук і кожны месяц пералічваў іх, а калі адзін раз ня ўгледзеў ды забыўся на вакне новенькі рубель і меншы сын забраў сабе, Нікан біў яго і вышаў з хаты, пакуль не адышло сэрца".

Нікан зьяўляецца вобразам моцнага селяніна. І вось Каваль гэтаму вобразу нічога супроцьставіць ня змог, мастацкай мовай ня змог разбурыць гэтых Ніканавых ідэалаў, больш таго, пісьменьнік ідэалізуе сам такі-ж вобраз моцнага гаспадара ў асобе Карнея.

Гэрой аповесьці „Ліпы", прадстаўнік новага на вёсцы, Агей, які зьяўляецца працягам і далейшым разьвіцьцём вобразу вясковага актывіста Зьмітрака Канцавога („Сяльчане") і ідзе праз Алісея Сімчанку („Ноч"), таксама знаходзіцца ў палоне ўласьніцкіх ідэалаў Карнея. І ў аповесьці „Ліпы" выключная ідэалізацыя селяніна-ўласьніка прыводзіць да таго, што проблема кіруючае ролі рабочых гораду ў перабудове вёскі разьвязваецца няправільна (былы рабочы Сьцяпан ніяк ня змог „прырасьці да зямлі" і, пакінуўшы кіруючую работу ў сельсавеце на вёсцы, вярнуўся на завод). Для ўстаноўчага пэрыоду гэта таксама было няправільным вырашэньнем пытаньня, а між тым у наш час, у рэконструкцыйны пэрыод, калі сотні і тысячы рабочых накіроўваюцца ў колгасы і кіруюць гэтым колгасным рухам на вёсцы, правільнае мастацкае разьвязваньне гэтай проблемы мае выключнае значэньне.

Тыя-ж асновы, пра якія гаварылася раней у творчасьці Каваля, сказаліся ў апавяданьні „Ілька", агулам надзвычайна высокім па сваёй мастацкай вартасьці,—у тым менавіта, што выключны, амаль адзіны, шлях цыган, у разуменьні пісьменьніка, гэта ўзяцца за апрацоўку зямлі.

„... Пайшоў Ілька ў вялікі горад за зямлёю... А пакуль прынёс яе—цяжкую і непадатлівую—сьнілі цыганы аб чорназёме і буйным хлебе на залатым коласе"...

Тут сказалася якраз гэтая выключная ідэалізацыя ў Каваля „Сілы Зямлі".

У Каваля мы часта сустракаем лірычна-казачныя творы і нават у эпічных творах частыя лірычныя адступленьні. Гэтая лірычнасьць і казачнасьць у Васіля Каваля часамі носіць абстрактны характар. Васіль Каваль у такіх лірычных творах, як вершы ў прозе „Жыцьцё і сонца" („На загонах") глыбока па-мастацку адчувае прыроду, жыцьцё і пераламляе гэтае сваё ўспрыяцьце праз вобразы народнай творчасьці.

„Простыя станы—беланогія бярозкі. Скручаны ўверсе зялёныя пальцы іх з белымі пярсьцёнкамі, чуць расквітнелымі; прыхарошаны маладухі ў блакітна-саматканай намётцы...

„Бярозкі мае—думы мае".
„Што мне да бярозак да тых кудравых"
„Што мне ў бацькавай хаце могуць яны прашумець".
„А бярозкі шумяць, думы гоняць. І ў шуме—гаворцы іх—радасьць мая."

Але гэтая лірычнасьць і казачнасьць вельмі часта прымушае Каваля захапляцца старой, часамі убогай, вёскай, знаходзіцца ў палоне яе.

Такія лірычныя, а вельмі часта пасыўна-сузіральныя, адносіны да жыцьця сказаліся і ў апавяданьні „За долю", „Ілька", „У супратках".

У апавяданьні „Ілька", ня гледзячы на тое, што мы маем уздым цыган—на шуканьне новага, мы ня маем рэальных вынікаў гэтага шуканьня.

Вялікімі крокамі наперад у далейшым ідэёвым росьце творчасьці Каваля зьяўляюцца два творы пісьменьніка—гэта „Сіняя восень" і „Ма-

ладосьць". (Да рэчы, творы гэтыя нельгя лічыць закончанымі, яны зьяўляюцца толькі эскізамі да вялікіх твораў). Трэба ўлічваць і тое, што творы гэтыя напісаны яшчэ ў пачатку 1929 г.

Тыя аграмадныя эканомічныя і палітычныя зрухі, якія пачаліся ў Савецкай Беларусі ў тыя часы, вялізарны ўздым энтузыязму рабочых мас на індустрыялізацыю краіны, унядрэньне соцыялістычных форм у сельскую гаспадарку, пры далейшым абвастрэньні клясавага змаганьня—усё гэтае паставіла і перад Васілём Кавалём задачу больш поўнага і глыбокага адлюстроўваньня клясавага змаганьня на вёсцы, калі пісьменьнік хоча ісьці з асноўнымі масамі сялянства, якое кіруецца пролетар'ятам, і быць у авангардзе гэтых мас сялянства па шляху іх да соцыялізму.

Самае каштоўнае, што вылучае гэтыя творы Васіля Каваля з ліку ранейшых,—гэта больш поўны паказ клясавай дыфэрэнцыяцыі вёскі, паказ клясавага антагонізму паміж батрацтвам і кулацтвам („Сіняя восень") і паміж бядняцкімі масамі сялянства і тым-жа кулацтвам („Маладосьць").

Мікола Вугнач, „бязбацькавіч" і парабак, і кулак Сымон Латута вось асноўныя два вобразы, якія ў першую чаргу яскрава вызначаюцца ў аповесьці „Сіняя восень".

Мікола Вугнач, які праслужыў каля чатырох год у Латуты, захацеў, замест таго, каб жыць пад эксплёатацыяй і прыгнётам кулака, пайсьці шукаць сабе шчасьця. Ён, як і большасьць вясковых гэрояў Васіля Каваля, любіць зямлю, зьвязаны з ёю, але сваёй ён ня мае і здабыць ня можа:

Чужая зямля! Чужыя коні! А дзе мая зямля? Дзе я радзіўся? Каго вінаваціць? Эх, ты сам вінен, што радзіўся.

Івось гэты эксплёатуемы батрак, які мог-бы ўладаць сваім уласным кавалкам зямлі, апрацоўваць яго (і які ён-бы жадаў мець), прымушаны, ашуканы сваім гаспадаром, пайсьці ў горад шукаць нанава шчасьця.

Але паказальна тое ў гэтай аповесьці, што агульныя рысы пасывізму ў творчасьці Васіля Каваля выступаюць выразна і ў гэтай аповесьці.

Паказваючы процілежнасьць інтэрэсаў батрацтва і кулацтва, клясавы антагонізм паміж імі, Васіль Каваль батрака Міколу надзяліў бязвольнасьцю і пасыўнасьцю.

Мікола ня толькі ня змог застацца на вёсцы, каб, змагаючыся з кулацтвам, будаваць сабе лепшае жыцьцё, ён тады нават, калі кулак не заплаціў яму за работу, толькі і адказаў:

— „Эх, вы людзі, а яшчэ багатыры..."

І, захаваўшы крыўду і злосьць глыбока ў сэрцы, пайшоў у далёкі сьвет шукаць сабе шчасьця, шукаць сабе права „быць чалавекам". З куском сала, лустай хлеба, якую дала яму на дарогу бедная і зусім чужая яму жанчына і за якое „ніцма хацелася ўпасьці Міколу, цалаваць рукі чужой матцы", пайшоў ён шукаць навукі, на рабфак.

І яшчэ больш небясьпечны характар пасывізм гэты прымае ў надрукаванай частцы аповесьці „Маладосьць".

Паказана тут вёска ў пэрыод імпэрыялістычнай вайны з яе страшэннай нэндзай, дзікасьцю, беспрасьветнасьцю.

Васіль Каваль пробуе разьвязаць біолёгічную трагэдыю селяніна, якую прыносіць гэтаму селяніну вайна.

Фізычна здаровыя людзі, якія могуць варочаць зямлю, успахаць яе, прымусіць раджаць ураджаі, гінуць на фронце, або пакалечаныя варочаюцца дамоў. І тады не яны асільваюць зямлю, а зямля асільвае іх:

„З франтоў мужыкі атрымлівалі ня радасныя весткі: адны „наказалі доўга жыць", пахаваныя далёка ад радзімы; другія пакалечаныя, але прыдуць да хаты і будуць ня

людзьмі, а „скіліма“, бо мала хто з іх пойдзе расістымі раніцамі з плугам ці з касою, і толькі трэція, шчаслівыя, прыдуць здольнымі да працы. Таму і старая маці, якая-небудзь цётка Агата, пахіліць галаву, падапрэ шчаку праваю рукою і заплача ў голас, седзячы ў нядзелю на прызьбе. Успомніць пра свайго чорнабровага сына, якому падшукала ўжо маладуху. Жыў-бы сын на зямлі, варочаў-бы плугам аблогі, расьціў ядранае жыта, ці гадаваў-бы дзяцей. А ён ні за што, ні пра што можа памірае на чужыне.

Васіль Каваль, як і яго селянін, не разумее соцыяльнага характару вайны; для пісьменьніка, як і для яго селяніна, гэта ў першую чаргу трагэдыя біолёгічная: пакалечаныя фізычна, разьбітыя сяляне, яны ня могуць аўладаць зямлёю, і таму зямля ўладае імі. Выступае вядомая ўжо нам з ранейшай творчасьці Каваля „Сіла Зямлі“.

„—Галоўнае—гэта зямля... Каб яе пабольш нам“... —гаварылі між сабой мужыкі, на розныя лады абзываючы яе.

Сілы, якая была ў гэтай зямлі, Захар яшчэ не разумеў. Адчуваў, што ёсьць нейкая сіла, напэўна, страшная, нездарма за яе біліся, судзіліся і забівалі адзін аднаго“...

...І вось зямля, якое ня змог цяпер мужык распахаць, прымусіць раджаць ўраджаі, сваю „Сілу“ выяўляла па-свойму.

Зямля „шчодра вырошчвала палын“.

„Ай, як палыном пахне, каб на яе немач!“

Рысы пасывізму, як мы ўжо казалі, у гэтым творы Васіля Каваля выступаюць найбольш акрэсьлена.

Васіль Каваль бачыць прыдушанае і падаткамі і прыгнётам сялянства. Чуе жахлівую роспач і плач на вёсцы і бязьсільны гэтае перайначыць. Ён бачыць пакутную гаротніцу-жанчыну Домну, Захараву маці, бачыць яе мэтафізычна, глядзіць на яе застыглымі вачыма, і Домна ніяк ня можа вырвацца з гэтага пакутнага жыцьця; сам пісьменьнік нічым ёй ня можа дапамагчы.

Пісьменьнік бачыць нават гострую процілежнасьць інтэрэсаў бядняцкіх мас сялянства і кулацтва, і ён баіцца нават тых клясавых сутычак, якія адбываюцца на вёсцы.

Больш таго, гэтыя клясавыя сутычкі, якія адбіваюцца паміж бядняцкімі масамі сялянства і кулацтвам, пісьменьнік успрыймае як нейкі непатрэбны анархізм, як „злосьць у людзей“, што ідзе ад вайны. Ён ня можа зразумець клясавы характар гэтай „злосьці“.

Пісьменьнік бачыць, як Мікіта Хадун лае цара за вайну. Андрэй Холад, які быў на заводзе, кажа, што гэта цар і памешчыкі зрабілі вайну. Пісьменьнік бачыць, як Андрона-рэволюцыянэра сагналі ў Сібір, як Аніська Зямец, паспрабаваўшы з голаду ўкрасьці збожжа ў кулака, і пасьля таго, як яго злавілі і моцна зьбілі, да пазьдзекваласа кулаччо, падпаліў гумно гэтага кулака, і г. д. і г. д.

І пісьменьніку здаецца, што гэта ўсё мужыкі адзін на аднаго ад злосьці, што пароджана вайной, кідаюцца. Каваля самога пужае гэты анархізм. Ціхая прыгнечаная вёска, з яе сумнымі і мэлёдычнымі песьнямі, часамі моцна трымае пісьменьніка і нават робіцца бліжэй яму. Гэтыя-ж рысы мы бачым на працягу ўсяго творчага шляху пісьменьніка. І яны, гэтыя рысы пасывізму, якія яскрава вызначаюцца ў апошніх творах, тлумачацца ідэалістычнымі зрывамі пісьменьніка.

У аповесьці „Маладосьць“ Каваль стварыў вобраз, які таксама цягаціцца гэтай „непатрэбнай“ злосьцю сялянства; які амаль што па-талстоўску прапаведуе міралюбіе, і думкі якога да пэўнай ступені супадаюць з думкамі аўтара. Гэта стары Заюхна, які навучае малога Захарку:

„Быў я, голуб ты мой шызы, быў маладым, вясёлым... Ну, я чалавек ня злы, часам шуры-буры, хачу раззлавацца, а ня ўмею. У мяне характар, як у малога. А людзі ёсьць злыя, братка мой. Толькі мне наплявацъ. Я і птушку люблю, і зьвера, чаму-ж ня любіць чалавека".

І вось гэты „чалавекалюб„ ганьбіць людзей за тое, што „народ цяпер пайшоў злы"... падпальвае адзін аднаго, забівае. Ён так сама, як і Васіль Каваль, у гэтым і ў некаторых сваіх мінулых творах, глядзіць на гаротнае жыцьцё бедных мас сялянства і любіць адначасова гэтае гаротнае жыцьцё, ня будучы яшчэ ў сілах паказаць яму шляхі да лепшага.

Заюхна нават захапляецца, калі чуе, як Домна плача па нябожчыку-сыну:

„—А-ай, як плача твая маці! Як слаўна плача! Пайду паслухаю".

Гэтыя рысы „чалавекалюбія", што выразіліся ў творы „Маладосьць" В. Каваля ёсьць рысы ўплыву буржуазнага гуманізму, перавальскога тыпу на творчасьць пісьменьніка.

І гэта, бязумоўна, зьніжае мастацкую вышыню „Маладосьць", якая зьяўляецца ўсё-ж самай выдатнай па сваёй сьмеласьці і паўнаце вобразаў сярод твораў В. Каваля.

Некаторыя псыхолёгічныя моманты перажываньяў вясковай жанчыны Домны пераданы з надзвычайным мастэрствам. Вось адзін з такіх прыкладаў глыбокага веданьня пісьменьнікам складанасьці і шматаковасьці псыхолёгічных адчуваньняў Домны, якая пасьля таго, як радзіла пры жніве, на полі, змучаная, слабая зварочалася да дому:

„І быў ад гэтага ў яе боль, і была пакута, і бяз слоў сьпявала душа, і цяжка было ісьці да хаты, але яна ведала, што ідзе не адна, і гэта ўсьцішала боль, пакуты, якія можа перанесьці толькі маці".

Усе мастацка формальныя кампаненты творчасьці Васіля Каваля, як композыцыя, мова, мэтафоры, параўнаньні, эпітэты-і іншыя, - цалкам адпавядаюць ідэёваму зьместу яго творчасьці. Яны падкрэсьліваюць, што Каваль, які агулам імкнецца адлюстраваць і выявіць вядучыя пачаткі вёскі да новага, да соцыялістычных форм землякарыстаньня,—сам яшчэ знаходзіцца ў палоне старога, і з лёгкімі адценьнямі суму адносіцца да разбурэньня патрыярхальшчыны старой вёскі.

Тут і композыцыйная павольнасьць у разьвіцьі дзей. Вобразы Васіля Каваля прыкаваны да „Сілы Зямлі", да „свайго загону". Тут самыя кволыя і шчырыя словы, ўжытыя для „ўмаўленьня" Зямлі і „парадзіхі-вясны". Вось некаторыя з гэтых вобразаў: Зямля параўноўваецца з „золотам", з параненымі грудзьмі", з „целам", з „пухам лебядзінным". Зямля пахне „Вясною, усім тым, што дае сьвету „шырокім жытнёва-сінім прасторам". Зямля нават адухатвараецца: „Ня скажа зямля праўды, а хоць і скажа, не зразумееш ты. Галасы разьбягаюцца паверх халоднай зямлі, усё слухаюць,што скажа, якую думку падасьць голасам карміцелька— хлебная маці зямля" і г. д. і г. д.

Усё гэта паказвае, што В. Каваль знаходзіцца ў коле абмежаванага сьветапогляду, уласьніцкай псыхікі, с якой ён ня здолеў яшчэ выйсьці, перамагчы, перабудаваць свой сьветапогляд. „Сіла зямлі" трымае пісьменьніка, не дае яму магчымасьці ўзьняцца вышэй сьветапогляду, абмяжаванага сваёй палоскай—уласьніка селяніна, надаць сваёй творчасьці актыўны характар, якая-б садзейнічала процэсу пераробкі сялянскіх мас на соцыялістычны лад. Усё гэтае не дае магчымасьці пісьменьніку ўбачыць і мастацкі выявіць кіруючую ролю рабочае клясы, комуністычнае партыі сялянствам убачыць саюз рабочае клясы з сялянствам як аснову для сапраўднага

шчасьця мільённых мас сялянства, пісьменьнікам якога ва ўмовах аднаўленчага пэрыоду зьяўляецца В. Каваль.

Зразумела, што гэты этап творчасьці Каваля пройдзены. Аднак, гэты пройдзены этап у творчасьці Васіля Каваля адлюстроўвае у зусім нядаўнае і асобныя моманты гэтага нядаўняга мінулага нашай вёскі, і ў гэтым таксама яго цікавасьць і каштоўнасьць нават для сучаснага савецкага чытача.

Рэконструкцыйны пэрыод, шпаркі рост на вёсцы колектыўных гаспадарак, суровае клясавае змаганьне, ліквідацыя апошняй эксплёататарскай клясы паставіла перад сялянскай літаратурай (а як вышэйшы этап гэтай сялянскай літаратурнай —колгасна-пролетарскімі пісьменьнікамі) нашай краіны новыя найглыбейшыя па свайму значэньню і найшырэйшыя па свайму аб'ему задачы, задачы адлюстроўваньня ня толькі процэсу перамаганьня ўласьніцкай істоты селяніна і пераходу да колектыўнай гаспадаркі, а і адлюстроўваньня псыхікі новае соцыяльнае катэгорыі сучаснай вёскі псыхікі колгасьніка, які зьяўляецца апорай пролетарыяту на вёсцы. У адпаведнасьці з гэтымі задачамі сялянская (колгасна-пролетарская) літаратура перабудоўваецца.

Васіль Каваль далёка яшчэ ня справіўся з гэтай перабудовай, яго творчасьць адстала ад задач, проблем і патрэб рэконструкцыйнага пэрыоду.

Ягоныя творчыя асновы, частковая ідэалізацыя ўласьніцка-патрыярхальных інстынктаў селяніна, лірычна-казачнае захапленьне старой саламянай вёскі абмежаванасьць сьветапогляду затрымліваюць пісьменьніка ад пераключэньня на рэйкі паказу соцыялістычнае рэконструкцыі вёскі і разгорнутага клясавага змаганьня.

Толькі ў перамаганьні ідэалістычных рыс сваей творчасьці ў пераключэньні на поўны паказ клясавага змаганьня на вёсцы і нараджэньні ў процэсе гэтага клясавага змаганьня новых соцыялістычных гаспадарак Васіль Каваль стане сапраўды колгасным пісьменьнікам і будзе саюзьнікам, апорай пролетарыяту ў літаратуры.

БІБЛІОГРАФІЯ

„Беллачаф“

Так завецца першы літаратурна-мастацкі зборнік Беларускага „Лачаф'а“.

Пад вонкавай сьціпласьцю зборніка хаваецца добры, сапраўды лачафаўскі зьмест яго. Беларускія лачафаўцы далі нядрэнны паказчык таго, у які бок павінна кіраваща творчасьць лачафаўцаў, якую літаратурную продукцыю павінна даваць маладая, якая яшчэ расьце, арганізацыя.

На другім баку тытульнага ліста ёсьць кароценькая заўвага рэдакцыі, што гэта першы зборнік маладых, выключна армейскіх пісьменьнікаў, і што большасьць, якія ўвайшлі ў гэты зборнік твораў, ёсьць першая іх праца. Заўвага гэтая паказвае, што ў Беларусі растуць нядрэнныя чырвонаармейскія пісьменьніцкія кадры, і ідуць яны па правільнаму творчаму шляху. Пачынаючыя таварышы даюць шэраг невялікіх апавяданьняў, нарысаў, штрыховак, якія адбіваюць чырвонаармейскае сягоньня і ўчора, якія зазіраюць у заўтра, і чапляюць актуальныя пытаньні баявога і палітычнага росту Чырвонай арміі і абароны краіны цалкам. У гэтым вялікі плюс зборніку.

Два асноўных лейт-мотывы звучаць у зборніку, у кожным амаль яго творы: першы—„ударнымі, баявымі тэмпамі будуем, вучымся, замацоўваемся; другі—„мы на варце, мы заўсёды гатовы абараніць краіну, порах трымаем сухім і шаблі вострымі, нечакана нас не застанеш“.

У зборніку, як у добрым люстры, адбіваецца і пяцігодка, і трэці, рашаючы, з бурнымі тэмпамі ўдарніцтва і соцспаборніцтва, і конкрэтная барацьба за чырвонаармейскі прамфінплян' за „промфінплян“ соцыялізму ў шырокім сэнсе гэтага слова.

Можна ўбачыць у гэтым люстры яшчэ і вось што: Беларусь—аванпосг нашай абароны, якая датыкаецца славутым вэрсальскім „бар'ерам“. Відавочна, ёй давядзецца адчуць на сабе першыя наскокі душыцеляў соцыялізму. Гэта добра ведаюць беларускія лачафаўцы. Творчасьць іх моцна б'е па гэтым пытаньні. Завастраючы на вайсковай небясьпецы, на прызыве да варты заходніх меж. І яшчэ адно патрэбна падкрэсьліць: творчасьць гэта надзвычайна інтэрнацыянальная. Яна мае арыентыроўку на міжнародную солідарнасьць, на сусьветную рэволюцыю.

У гэтых адносінах характэрна поэзія зборніку. Тут амаль няма вершаў. Тут усё—заклік і баявыя маршы, якія мобілізуюць волю да барацьбы, да перамогі.

Нас ня спужае люты вораг,
гатовы ў новы мы паход,
сухім заўжды трымаем порах,
і мы мацнеем з году ў год.

піша тав. М. Чарот у сваёй „Чырвонаармейскай“, абяцаючы ў чым бы то ні было дайсьці ў свой час да фашыстаў усяго сьвету“.

Па-баявому настроены і Пятрусь Броўка ў сваім закліку—маршы „Клімэнт Ефрэмавіч“. Ён кідае зірк у мінулае, у дні вялікіх перамог, калі:

Чорнае мора кідалася чортам,
а коньнікі крылі
і ў бога і ў чорта...

ўсёжткі забраяі няпрыступны Перакоп, і заклікае на гэтым мінулым вучыцца барацьбе і перамогам у будучых бойках за нашы заваёвы, за нашу зямлю, за нашы законы, бо гэтыя

Законы намі пісаны
і шабляй
і крывёй...

іх таму ўжо нікому не адабраць у нас:

І зноў як толькі стрэламі
граніцы зазьвіняць—
скажы Клімэнт Яфрэмавіч,—
мы сядзем на каня,

каб прайсьці „скрозь весь сусьвет“, скрозь хвалі і агні жорсткіх крывавых боек—да комунізму.

Далей ідзе „Паходны марш“ Шушкевіча. Як і першыя два, ён заклікае да пільнасьці, каб быць на пагатове ня толькі для абароны меж Саюзу.

Але, Шушкевіч ведае, што барацьба за Саветы ва ўсім сьвеце будзе жорсткай і крывавай, што вораг будзе бязьлітасным, што ён ліхарадкава рыхтуецца да апошняга рашучага бою.
Пагэтаму:

Бо кожны дзень
нам сьлед кладзе
Да сонца над
сусьветам.
І пойдзе сьвет
за намі ўсьлед,
за намі
за саветы

Гэта гучыць у Шушкевіча пераканальна і моцна—як і моцны ў огуле ўвесь яго марш, сапраўды баявы, інтэрнацыянальны лачафаўскі марш. Беларускія таварышы далі нядрэнныя прыклады баявой, якая натхняе поэзіі пролетарыяту. Яна нядрэнная і з вонкавай, мастацкай якасьці, ня гледзячы на літаратурную маладосьць аўтараў. Прывядзём пачатак „Паходнага марша" Шушкевіча:

Сьмялей, гарніст,
сьмялей. гарніст,
сьмялей іграй
трывогу!
Напорней крок,
чырвоны полк,
бо наш ня дрэмле
вораг.

Гэтага ворага, які ня сьпіць, Шушкевіч не баіцца, бо ён ня сьпіць сам і ведае, што ня сьпяць мільёны. Няхай ваююць з-за мяжы „на нас ваўкі штодзённа", сягоньня ў гэтых мільёнаў вартаўніком „наш правадыр Будзённы", а заўтра будзе вартаўніком яшчэ хто-небудзь з тых, што ў дні грамадзянскай вайны добра выявілі сваю здольнасьць „вартаваць" на чале ўзброеных мільёнаў. Пагэтаму

... І хай рука
варожых зграй
кране спакой
краіны,—
адважных рой
адважна ў бой
магутнай хваляй
хлыне.

Такі-ж, прыкладна, і „Мой марш" т. Ліхадзіеўскага. Беларускія лачафаўцы ведаюць, што ім патрэбны баявы марш, больш чым верш, чым песьня; яны стаяць на адказьнейшых баявых пастох—баявых для абароны і наступу. Пра наступ не забывае і Ліхадзіеўскі:

Слухай. таварыш!
зважай!
Вінтоўку прачысьці, пратры...
Марш на сусьветны пажар!
Раз! Два! Тры!

Такім чынам, заклікаюпы да абароны меж Саюзу, Ліхадзіеўскі не забываецца аб будучым „сусьветным пажары", які ён, вядома, зьбіраецца ня тушыць, а распаляць.

Толькі два творы поэзіі зборніку не чапляюць інтэрнацыянальнай проблемы Чырвонай арміі: „Марш" Янкі Бобрыка і „Пра шаблю" А. Шчарбакова:

Зацокалі капыты—
і ціш ня ціш...
Атрад па дарозе
імчыцца, ляціць.

на ліквідацыю атраду банды. Янка Бобрык у сваім надзвычайна зробленым гучным „маршы" таксама кажа аб заўсёднай гатоўнасьці да бою коннага атрада, які ў глухую ноч, па загаду камдзіва, сеў на каня і ўдосьветак ужо „выканаў" свой баявы загад. Але ў ім слабей адчуваецца эмоцыянальная зарадка аўтара. „Марш" не заклікае, а толькі констатуе об'ектыўны факт з боку. У „Маршы" ўвага аўтара згрупавана на цішыні і нейкіх адарваных, абстрактпых коньніках.

І коньнік свайго засядлау
каня...
У алюр па дарозе пайшла
цішыня...
І ноч праглынула, узяла
цішыня,
коньнікаў ў шлёмах на бой павяла
ў гэткую пару яна.

У гэтым і недахоп марша, што коньнікаў у бойку павяла цішыня, але ня што іншае.

Так-жа „нявінна" гучыць і „Пра шаблю" Шчарбакова. Ён сьпявае песьню пра сваю шаблю, якая бачыла многа і „эфэс твой паходы скрывілі набок." На клінку шаблі—сьляды сутычак, гэты клінок яшчэ востры, і аўтар кажа, што

... Мы разам з табою
пад грукат і скогат
памчымся ў бойку,

але што менавіта бачыла шабля, у якіх пмходах скрывіўся яе эфэс, сьляды якіх боек засталіся на яе клінку, аўтар ня кажа. У які бой ён паімчыцца са сваёю шабляй, для чаго трымае вострым яе клінок, таксама ня відаць. У яго шабля—у огуле шабля, але ня шабля ў руках чырвонага барацьбіта, перад якім стаяць пэўныя клясавыя задачы, клясавыя бойкі, а ня бойкі ў огуле.

Гэтыя дзьве рэчы некалькі паслабляюць агульны баявы інтэрнацыянальны тон поэзіі зборніку, хаця самі па сабе яны нядрэнныя.

Затое, гэты маленькі „прарыўчык" зазасланяе прыгожы, клясава-насычаны верш Янкі Гуцева „Шынель". Дэмобілізаваны чырвонаармеец даўно вышаў з свайго палку

але ён не адчувае сябе зусім дэмобілізаваным, адарваным ад палку. Полк ён лічыць сваім, ведае і памятае ў ім сваё месца і ў кожны момант гатоў заняць яго, бо

... пад шэрым, пад маім шынэлем
гарыць запал армейскі, баявы...

Пад вобразам гэтай шынэлі аўтар разумее баявую гатоўнасць тых, якія выйшлі з арміі чырвонаармейцаў, якія, калі ўзяліся за плуг, за трактар, азіраюцца і на вінтоўку: бо з-заду прытаіўся і гатовіцца скочыць хітры польскі пан.

Бо мой шынэль—панам трывога,
Бо мой шынэль—суровы напамін,.
Дык помніць хай, запіша вораг
Наш радавы армейскі грозны „чын"...

папярэджвае ён гэтага пана.

Гэтую шэрую чырвонаармейскую шынэль, пад якой „гарыць парыў армейскі баявы", Гуцеў ня лічыць манопольнай прыналежнасьцю толькі нашага чырвонаармейца. Шынэль гэта—ўогуле чырвонаармейская, яе будуць апранаць і пад ёю загарыцца рэволюцыйны баявы ўздым у сэрцах мільёнаў Гэнрыхаў, Жанаў, Славэкаў і Джонаў. якія ўжо разгрызаюць капіталістычны цяжар, рвуць яго і разарвуць.

Калі вораг захоча крыві
Калі ліхі пачуе гоман куль,
Маю шынэль апрануць
Прага і Парыж,
і Лівэрпуль.

Такі зьмест поэзіі. Усе яны зусім аўладалі творчымі вышынямі вершаскладаньня, але ў іх няма і „скідачкі на беднасьць", як гэта часта ў такіх выпадках здараецца. Тут усё—ня ніжэй сярэдняга творчага ўзроўню. Іншыя рэчы—вышэй яго і напісаны прыгожай мастацкай мовай. Характэрна асабліваесьць гэтай поэзіі: моцная рэволюцыйная зарадка, інтэрнацыяналізм, маладая бадзёрасьць, упэўненасьць у сваей сіле, разам з гэтым—усьведамленьне напружанасьці становішча, заклік быць узброенымі, быць на варце, яшчэ больш рыхтавацца да адпору, да бойкі.

Таксама мэтава накіравана, чотка і проза зборніку. Амаль уся яна дыхае сягоньняшнім чырвонаармейскім днём. У ёй адбіта тое, чым жыве, на што хварэе Чырвоная армія сягоньня, якія пытаньні яе хвалююць. Сярод нарысаў і апавяданьняў няма выпадковых, непатрэбных рэчаў. Ёсьць месца і для грамадзянскай вайны, і для дальняўсходняй армії і калхознаму будаўніцтву, але цэнтр цяжару перанесены на сягоньня, на паказ чырвонаармейскіх будняў, якія, у огуле кажучы, так зараз значны, што называць іх буднямі ці будзе правільна. Яны занадта гэроічны.

П. Буйвалінскі маленькім апавяданьнем „Дэлегат" дае добрую ілюстрацыю таго, як выкоўваецца новы чалавек у сьценах чырвонай казармы. Малады чырвонаармеец Шэін—лепшы ўдарнік батарэі, але ён мала пісьменны, ён толькі нядаўна тут, у батарэі, ліквідаваў сваю няпісьменнасьць. А яго раптам выбіраюць дэлегатам на зьлёт ударнікаў, даручаюць адказны даклад. Як тут не правалiць, ня „сесьці ў галёшу"? Нават конспэкту дакладу Шэін ня можа скласьці: ён яшчэ выводзіць „курыныя" каракулі. Але дапамагаюць таварышы, моральна падтрымлівае палкавая грамадзкасьць, намагаецца і сам Шэін, і даклад на зьлёце праходзіць добра. Падрыхтоўка да першага выступленьня і самае выступленьне аўтарам пададзены жыва і пераканаўча, правільна паказаны першыя крокі маладога ўдарніка на грамадзкай лесьніцы. І разам з тым, як бы выпадкова, пададзены разгорнуты паказ ударніцтва ў артпалку, якое ў апавяданьні зьяўляецца, як бы звычайным, штодзённым фонам, на якім разгортваецца сюжэт. Спэцыяльна пра ўдарніцтва ў апавяданьні не гаворыцца, але яно само выпірае адусюль.

А. Шчарбакоў у кароценькіх накідах „Пляма" і „Сягоньня" падае жывыя, канкрэтныя малюнкі баявой вучобы. У першым ён накідае некалькі рысак пра нязвычайныя адносіны да захаваньня зброі чырвонаармейскае грамадзкасьці. У другім Шчарбаковым паказаны артылерыстыя за вучобай. Маладняк вывучае тэхніку сваёй зброі. Звычайныя цёмныя заняткі каля гарматы, каля тэлефону, але гэта ня проста вучоба, але бой за аўладаньне тэхнікай, клапатлівая, любоўная вазьня з мэханізмамі, падцягваньне тых, якія адстаюць, „шэфства" мацнейшых над слабейшымі. І тут праца ідзе „на вялікі". Адносіны байцоў да вучобы, тэмпы—усюды адчуваецца тая напружанасьць, з якой замацоўвае сягоньня сваю баявую моц Чырвоная армія.

Не мінавалі ў зборніку і колхознага будаўніцтва.

Пра гэта ў нас так многа пішуць цяпер, што ў пачынальнікаў—ды ня толькі ў пачынальнікаў—выпрацаваўся нейкі штамп калхознай тэмы, асабліва ў чырвонаармейскім паказе яе. Штамп гэты адчуваецца і ў апавяданьні С. Богуша „Наказ выканаў". Дэмобілізаваны чырвонаармеец едзе ў сваю вёску і організуе там колгас, выконваючы наказ таварышоў і політкіраўнікоў. Але ўсё робіцца як бы па заказу: колгас нараджаецца па камандзе, без барацьбы і цяжкасьцяй, дзякуючы асабліваесьці гэроя. Кулакоў зусім ня відаць, у вёсцы ідылічная благадаць, мір і адзінадушша. У такі колгас дрэнна верыць. Апавяданьне, ня дрэнна напісанае, але празьмеру падлакіравана, мала праўды і непераканаўчае.

Затое добра апавяданьне Платона Галавача „Кара“ У ім--ні ценю шаблёна. Арыгінальнасьць і сьвежасьць падачы матар'ялу падкупаюць сваёй цяплынёю, праўдаю. Тут колгасная тэма дадзена ў акружэньні раду момантаў, якія характарызуюць Чырвоную армію: паказан тып політрука, у якім відзен больш таварыш, чым начальнік, калі рэч ідзе пра пытаньні грамадзкага парадку. Ясна паказана высокая сьвядомасьць і выхаваўчае значэньне чырвонаармейскага асяродзьдзя, кругавая парука ў ёй, моцная самадысцыпліна. Няма штампа і ў паказе вёскі—родных гэроя і кулака. Пра апошняга нічога ня сказана. Няма нават слова „кулак“, але сапраўдны кулак і яго шкодная праца зразу адчуваецца ў суседзе Макары. Асабліва добра пададзены бацька гэроя, тыповы серадняк з усімі ўласьцівымі яму рысамі. Апавяданьне Галавача зьяўляецца найбольш значным—з боку формы і зьместу—творам у зборніку.

Крыху хужэй апавяданьне В. Сташэўскага „На зары вясны“ Бандыты забіваюць у вёсцы політрука, што знаходзіцца там разам з военкомдзіва. Невядома, калі адбываюцца гэтыя падзеі: у грамадзянскую вайну, ці зараз, чаму і для чаго ваенкомдзіў і політрук трапілі ў сяло. Апавяданьне незразумелае. Не дапрацавана яно і ў соцыяльных адносінах—не дадзены паказ клясавых сіл, якія дзейнічаюць у вёсцы, а таму і забойства цолітрука ёсьць выпадковасьць.

І. Барашка ў апавяданьні „Пяць дзён“ дае малюнак высокага гэроізму батальёну Чырвонай арміі, які прабраўся ўначы па непраходных балотах у тыл белых і захапіў іх умацаваную позыцыю. Але гэтае добрае ў огуле апавяданьне псуе невялікая дэталь: камандзір брыгады, калі даведаўся пра гэтую пасьпяховую опэрацыю, заплакаў, расчуліўся і абняў комбата. Такі „прыток“ пачуцьця ўласьцівы толькі сантымэнтальнаму царскаму генэралу, а не баявому комбрыгу Чырвонай арміі, у якога не хапіла-б сьлёз „оплаківаць“ кожную гэроічную опэрацыю сваіх частак. Ды й тугі нашы камбрыгі на сьлёзы: ня ўмеюць плакаць.

Добрае апавяданьне А. Вольнага „Прыехалі“, у якім ён падае малюнак гэроічнай барацьбы дальняўсходняй арміі. Два рускіх офіцэры – белагвардзейцы едуць у лодцы праз Сунгары на разьведку Савецкага берагу. Але лодка іх пад'яжджае да берагу ня носам, а кармой: разьведчык—чырвонаармеец, які даведаўся пра намеры белых, няпрыкметна плыве за лодкай белых, прывязвае да кармы вяроўку і з таварышамі няпрыкметна падцягвае лодку туды, куды трэба. Падача матар'ялу пераконвае ў праўдзівасьці такога „экзотычнага“ эпізоду і сьціпла, але моцна, малюе гэроізм і здагадлівасьць чырвонаармейцаў-разьведчыкаў.

Проза зборніка таксама стаіць, у сваёй большасьці, на значным мастацкім узроўні.

Разам з вялікімі дасягненьнямі зборнік ўсёжткі мае і значныя недахопы. Няма ніводнага літаратурнага ці політычнага артыкула, няма ні слова пра ЛАЧАФ і яго задачы. Акрамя падачы добра апрацаванага матар'ялу, зборнік павінен быў быць папулярызатарам ЛАЧАФ'у і яго ідэі, весьці прапаганду гэтых ідэй у масы. Гэтага зборнік не зрабіў. Політычная значнасьць ЛАЧАФ'у змазана. Трэба спадзявацца, што ў другім зборніку Беларускі ЛАЧАФ запоўніць гэты прабел.

А. Бабуноў

Матэ Залка—„У гасьцёх у бесьсьмяротных“

Гэта нарыс вядомага вэнгэрскага пісьменьніка, які быў камандыраваны Лачаф для зьбіраньня матэрыялу да 10-годзьдзя ўзяцьця Крыму і разгрому Ўрангеля. Яго мэтай зьяўлялася падарожжа на Перакоп, каб убачыць усе тыя месцы, дзе ў 20 годзе адбываліся гэтыя бойкі, рашучая апошняя схватка з белымі ўрангелеўскімі бандамі. Матэ Залка дае апісаньні гэаых месц, уваскрашаючы ўсе гэроічныя падзеі ў 20 годзе на Перакопе, апавядае і аб тых абставінах, у якіх адбываліся гэтыя падзеі, тая ці іншая бойка, напр. аб Кахоўскім пляцдарме і яго значэньні, аб начной атацы ля Серагоз, аб наступленьні на Вялікі вал і, урэшце, аб гэроічным наступленьні праз Сіваш, калі чырвонаармейцы рашуча, адважна, ня гледзячы на цяжкія ўмовы, на паводку, якая пагражала ззаду, на ураганны агонь, які іх сустрэў з боку ворага, ня гледзячы на тую найноўшую тэхніку, якая была ў белых, здолелі адкінуць іх з гэтага так добра ўмацаванага месца і скінудь іх у мора.

Матэ Залка падкрэсьлівае вялізарнейшае значэньне палітыкаморальнага стану арміі, тое, што толькі разуменьне сваіх задач кожным чырвонаармейцам, усьведамленьне таго, за што ён змагаецца, далі магчымасьць Чырвонай арміі перамагчы лепш ўзброеную, падтрымліваемую капіталістычнымі дзяржавамі белую армію.

Ён расказвае, як добра былі ўмацаваліся белыя, як кожная паўвыспачка, кожны курганок, кожная пярэспа—сапраўдная, добра абдуманая крэпасьць, якія выгодныя былі ў іх позыцыі. Але ён не абыякавы, беспартыйны гісторык, яго падыход да гэтых падзей глыбока-партыйны. Ён ня толькі сам захапляецца гэроізмам Чырвонай арміі, але прымушае захапляцца і чытача. Гэтаму спрыяе яшчэ і тое, што ў нарыс устаўлены ўспаміны, уражаньні сьведкаў і ўдзельнікаў наступленьня на Перакоп.

Ён ведае, чаму перамагла Чырвоная армія, ён піша: „І вось скрыжоўваюцца шпагі двух сьветаў, генэральскія задумы двух армій. Адна армія мела тэхніку, традыцыю, панцырную дысцыпліну і ўсё ў мінулым. Другая армія мела рэвалюцыйную волю і ўсё ў будучым“. Яшчэ больш яскрава мы бачым яго адносіны да перакопскіх гэрояў у наступнай вынятцы: „І я пабываў у дзьвюх войнах, бачыў 6 франтоў, але быў зьдзіўлены... зьдзіулены рашучасьцю тых, што павялі, харобрасьцю тых, якія ішлі і бралі гэтае старадаўняе страшыдла (вал), апранутае ў броню сучасных агнявых сродкаў. Гэта мог зрабіць толькі бальшавіцкі штаб, які меў моральную сілу павесьці масу на такі вялікі ўчынак“.

Але ён не адрывае таго, што было калісьці, ад таго, што адбываецца ў сучасны момант, тыя падзеі, якія адбываліся 10 гадоў таму назад, у той-жа час для яго шчыльна зьвязаныя з сучаснасьцю. Ён ня ўздыхае аб тым, што вось калісь-то была романтыка грамадзянскай вайны, калі ўсе гарэлі энтузыязмам, як робіць Джэк Алтаузен у „Безусом энтузиасте“. Ён бачыць шчыльную сувязь паміж сёньняшнім днём і днём учарашнім, ён ведае, што той энтузыязм пераключыўся на новы фронт. Ён піша: „Ударнікі перамогі, продкі тых ударных брыгад, якія ў сучасны момант ідуць у атаку працы, на фронце нагэтулькі-ж гэроічным, як быў і гэты, які расьцілаецца зараз ціхамірна пад нашымі нагамі“. Але ён ведае і тое, што гэты сёньняшні фронт ёсьць у той-жа час і працяг таго фронту, што без гэроічных перакопскіх падзей мы-б зараз не змаглі так пасьпяхова змагацца на фронце пабудовы соцыялізму. Гэта ўвесь час падкрэсьліваецца пісьменьнікам. Так, напр., яму паказываюць тое месца, дзе загінуў малады чырвоны камандзір т. Юшкевіч. На гэтым месцы стаяць стагі. „Гэй, хлопчык, чые стагі?—пытаю я.

— Комуны Сталіна нумар восем.—Мне гэты просты адказ здаецца глыбока значным. Месца, на якім загінуў адважны з адважных, месца гэтае цяпер належыць комуне нумар восем імя Сталіна. Таварыш Юшкевіч, ты няздарма аддаў сваю маладую кроў!“.

Прысьвячаючы большую частку свайго нарысу падзеям, якія адбываліся 10 гадоў назад, даючы падрабязнае апісаньне розных наступленьняў, манэўраў, прыёмаў абароны ў белых, розных загадаў кіраўніцтва сьмелых правадыроў, глыбока аддадзеных сваёй справе, ён у той-жа час, апісваючы сваё падарожжа, часта спыняецца на апісаньні комун, колгасаў і саўгасаў, якія сустракаюцца на яго шляху, цікавіцца іх жыцьцём і імкнецца па магчымасьці ім дапамагчы. Так ён піша мэмуарную заціску намесьніку наркомземляробства т. Яжову і т. Гамарніку адносна цяжкага становішча, якое стварылася па прычыне няўраджаю ў Чаплінскім раёне і адносна недахопу ў рабочай сіле ў тых раёнах каля Перакопу, дзе ўраджай быў вельмі добры, і тут-жа высоўвае свае канкрэтныя прапановы.

Першая частка гэтага нарысу, аб якой мы ўвесь час гаварылі і якая прысьвячана Перакопскім падзеям носіць назву „Пра былую армію“. Матэ Залка тут падкрэсьлівае вялікае выхаваўчае значэньне вывучэньня гісторыі перакопаўскіх падзей і высоўвае цэлы рад прапаноў аб стварэньні гісторычна-экскурсійнай базы на месцы гэтых падзей. Другая частка, значна меншая, чымся пер-

шая, носіць назву „Пра жывую армію“ і прысьвячана апісаньню манэўраў Чырвонай арміі каля Балты.

Гэты нарыс зьяўляецца іменна баявым нарысам, які праводзіць увесь час наступныя ідэі, якія і аб'яднаюць гэтыя дзьве часткі. Гэтыя асноўныя думкі выражаныя праз словы самога Матэ Залкі. Гэта па-першае, „Калі нам і ў далейшым будзе ўдавацца карыстацца „благами мира“, то мы павінны памятаць, што гэтым мы абавязаны іменна тым, хто грудзьмі сваімі праклаў нам дарогу ў Крым і крывёю сваёю заліў неабсяжныя стэпы поўдня і вузкія пярэсмыкі Перакопу і Сівашу“. Па-другое,

“... я называю арміі, дывізіі і брыгады паўднёвага фронту продкамі нашых ударных брыгад цэхаў, заводаў, колгасаў і саўгасаў; і, па-трэцяе, ён, перадаючы сваё ўражаньне ад манэўраў, якія ён наглядаў, піша: „Мы, наэлектрызаваныя чытаньнем дакумантаў тых гэроічных дзён, прышлі да вываду, што сёньняшняя зьмена той арміі, якая ўзяла Перакоп, вэрта вялікай годнасьці „перакопаўцаў“.

Кніжачка гэтая карысная і мае вялікае значэньне ў справе выхаваньня чырвонаармейца, заражаючы энтузыязмам мінулага змаганьня, паказваючы, што энтузыязм сучаснага будаўніцтва-гэта той агульны энтузыязм працоўных, які зьяўляецца і ў змаганьні і ў працы. Яна падыходзіць да „бібліотэкі чырвонаармейца“, для якой яна выдадзена. Зараз некалькі слоў па адрасу БДВ. Трэба адзначыць, па-першае, што пераклад зроблены ня вельмі ўдала, іншы раз такой дубовай мовай, што гэта, бязумоўна, адбіваецца на ўспрыйманьні чытачом гэтага твору.

Трэба больш уважліва ставіцца да выданьня кніжак, асабліва масавых.

Ю. Д.

Зіна Бандарына. „Веснацьвет".

Кніжка вершаў Бандарынай „Веснацьвет", выдадзеная ў 31 г., падзелена на 3 разьдзелы. Першы з іх складаецца з вершаў з грамадзкімі матывамі, калі можна ўжыць гэты тэрмін, другі—асабістая лірыка, 3-ці, які па ідэёвым зьмесьце блізкі да першага, прысьвячаны сібірскім уражаньням аўтара. З першага-ж вершу „Будучыня наша" мы даведваемся. што аўтарам гэтай кніжкі зьяўляецца комсамолка. Гэта прымушае нас, бязумоўна, патрабаваць ад поэта актуальнай тэматыкі, акрэсьленасьці сьветапогляду, адпаведнай вышыні ідэёвага зьместу, разуменьня тых задач, якія стаяць перад нашай грамадзкасьцю і ў прыватнасьці перад комсамолам. Ад комсамольскага поэта мы павінны патрабаваць глыбокага падыходу да зьяў, разуменьня дыялектыкі нашага разьвіцьця. Ці адпавядае поэзія Бандарынай усім гэтым запатрабаваньням? На вялікі жаль, прыдзецца сцьвярджаць зусім адваротнае. На вялікі жаль таму, што у нас яшчэ занадта мала комсамольскіх поэтаў, якія-б у сваёй творчасьці адбівалі-б сучаснае жыцьцё і змаганьне комсамолу.

Калі паглядзім толькі на назвы вершаў цершага разьдзелу, дык на першы погляд можа здацца, што тэматыка вельмі актуальная. Напр. „З падшэфнай вёскі", „Жанадзелу Беларусі", „Комсамол Беларусі", „На заводзе", „Комсамол у паходзе" і г. д. Але, чытаючы іх, адразу-ж атрымліваецца ўражаньне, што аўтар зьлізае па паверхні зьяў, што яна ня можа пранікнуць глыбей і ўразумець дыялектыку гэтых зьяў, іх унутраныя супярэчнасьці, змаганьне якіх і дае магчымасьць разьвівацца гэтым зьявам. Гета магчыма дасьць цэлым радам прыкладаў. Возьмем першы верш „Будучыня наша", „Каласы вітаюць комсамолку", а яна ім весела адказвае: „Любыя—крычу я—ў комсамоле

„Сёньня сьвята мая і вясны,
Крыж паставілі ўчора над нядоляй,
Бач—сягоньня далі зацьвілі"...

Такія-ж агульныя словы, такую-ж неакрэсьленасьць, не конкрэтнасьць мы зноходзім і ў іншых вершах, напр. „Жанаддзелу Беларусі".

„У жанаддзелу сёньня
Словы—бліскавіцы.
Для краіны роднай
Будзем вянок віці".

Мусіць, калі-б у гэтым была задача нашых жанаддзелаў, дык, напэўна, іх ня варта было-б і організаваць. Ці ў вершы „Комсамол у паходзе" мы чытаем наступнае:

„Знаю толькі, кожны з нас
Захаваў у сэрцы
Плякат сонечны—вясна
Ганьбу паняверцы".

Бязумоўна, мы далёкія ад таго, каб ня ганьбіць пэсымізм. Але мы лічым, што „плякат сонечны—вясна" ці імкненьне „сокалам лунаць"—гэта ёсьць, мала сказаць павярхоўнасьць, але апашленьне тых ідэалаў, на карысьць якіх змагаецца і якімі жыве комсамол. У вялікім вершы „Комсамол Беларусі" Бандарына імкнецца прасачыць усю працу Беларускага комсамолу за 10 год, пачынаючы з 17-га году. Яна піша і аб змаганьні на фронце, і аб тым, што комсамол узяўся за будаўніцтва, і аб сьмерці Леніна і г. д. і тут-жа самая павярхоўнасьць і агульныя словы.

„Комсамол
на новы
фронт!
Зьезды
пяты і
шосты
сьведкамі.
Комсамолец
ня даў
маху;
Ворага
пугнуў
слаўцом
меткім.
Рэволюцыйнай тэорыяй
творчы
ўздым
адзначыў".

Вось гэта і ёсьць увесь паварот комсамолу на новы фронт. Ці калі яна піша аб тым, што Ленін пакінуў комсамолу свае заветы, дык гэта таксама разумеецца зусім ня так, як комсамолец павінен іх разумець. І тут мы сустракаемся з надзвычайнай павярхоўнасьцю, няўменьнем уразумець рэчы ва ўсім іх значэньні. Зусім не па-комсамольску формулюе Бандарына задачы комсамолу.

„Покліч
у адказе
Пярсьцёнкам
зьвіўся.
Ленін
заветы
пакінуў...
Дыхнула
лета—
Палкаю
смагай,
Лілеяй—
красу
сьветласьць.
Увесь комсамол
за справай—

Будуе
краіну
Саветаў!
За варштатам,
за плугам,
За кнігай
узрастае
зьмена
зьмене"
Ці далей: „Красуняй-
вясной
зацьвітае
краіна,—
На поплавах
родных рунеюць
усходы,
І гімны
нязьлічныя
новаму,
роднаму,—
Крышталяцца
ў закліках
буйных
заводаў".

Гэта найбольш конкрэтныя месцы, больш аб працы нічога ня знойдзем.

Такім чынам у яе комсамольскіх вершах мы знаходзім шмат пекных слоў, шмат выклікаў і клічнікаў, але мы ня маем таго, што мы павінны мець, гэта акрэсьленасьці ідэй, чоткага разуменьня гэтых ідэй, якія-б звалі не наогул „гэй наперад", а да працы і выкананьня тых конкрэтных задач, якія высоўвае перад намі сучаснасьць. А кніжка-ж выдадзена ў 31 г.—яна павінна была-б гучэць мотывамі сёньняшняга дню. У вершы-адказе Кляшторнаму яна сама прызнаецца, што „так цяжка быць сугучным будаўніцтву". Яна, праўда, тут-жа гаворыць, што нельга аднак быць і далёкім ад яго, але мы на працягу ўсяе кніжкі не знаходзім чотка-сформуляванага адказу на тое, якім павінен быць усё-ж поэт, які лічыць сябе прадстаўніком „комсамольскай вясны".

У яе ёсьць вершы „На заводзе", але цікава, што адзінае ўражаньне ад заводу гэта... фабрычны дым.

„Я калісьці шнур палёў любіла,
А сягоньня вабіць фабрык дым".

Таксама, калі ў вершы „На зломе дзён", яна імкнецца давесьці, што Беларусь робіцца індустрыяльнай краінай, яна знаходзіць толькі такія словы. „Ці ты ня бачыла, ці ты ня чула—фабрычны дым ахутаў родны край" і рад іншых падобных прыкладаў.

Піша яшчэ і пра вёску. Але цікава, што і тут тая-ж самая павярхоўнасьць, нават неразуменьне таго, што зараз адбываецца на вёсцы, неразуменьне ўсёй складанасьці тых абставін, у якіх праходзіць процэс перабудовы яе. Па-першае, атрымліваецца што амаль адзінай дапамогай вёсцы ад гораду зьяўляецца... пасылка попелу.

„Сонца, дружа, раскажы,
Як чырвоная сталіца
Песьціць попелам у палёх
Залатое жыта"

(Комсамол у паходзе)

Больш конкрэтнай працы комсамолу мы тут ня бачым. Наогул, як было вышэй сказана, па Бандарынай тыя процэсы, якія зараз адбываюцца ў вёсцы, праходзяць вельмі лёгка, без усялякага змаганьня. Досыць аўтару правесьці адзін сход—і ўсё гатова; усе робяць так, як яна прапануе. „Народ гарланіць", бо ён цёмны, а калі давесьці яму, дык адразу-ж усё добра. („З падшэфнай вёскі", „Перамога" і г. д.). Так настаўніцы Галіне, без усялякай дапамогі з боку грамадзкасьці, толькі дзякуючы сваёй юнацкай энэргіі, удаецца стварыць у вёсцы „зямны рай".

„Праз месяц у Чанах інспэктура
Дзівілася: „Што ды Як?!"
І чуткі ў кожным завулку:
Бач—усіх маладосьць перамагла.
. . . . . .
І першыя радыё-гудкі...
„Бы цуд, быццам голас з нябёс
Даждаліся нашыя ўнукі.
Ні кпінаў над лёсам, ні сьлёз"...
Гамоняць на прызьбе старыя,
а моладзь сьпяшае ў нардом".

Такім чынам мы тут ня бачым ні таго што перабудова вёскі адбываецца ва ўмовах жорсткага клясавага змаганьня, як з боку клясавага ворага, так і ўнутраных супярэчнасьцяй паміж „дзьвюма душамі" па выразу Леніна, душою працоўнага і дробнага ўласьніка ў самім селяніне. Усе гэтыя складаныя процэсы, клясавае змаганьне для Бандарынай ня існуюць. Вось такое спрашчэньне, такі опортуністычны „оптымізм", такія ўранастроі робяць функцыю гэтых вершаў шкоднаю, бо яны даюць няправільнае, правае ўспрыйманьне рачаіснасьці.

Такім чынам мы бачым, што тыя вершы, якія па сваей тэматыцы прэтэндуюць на назву „комсамольскіх", заключаюць у сабе толькі агульныя словы і па сваім ідэёвые зьмесьце гэтай назьве не адпавядаюць.

Тое, што комсамольскія настроі і імкненьні не зьяўляюцца глыбокімі ў Бандарынай, пацьвярджаецца яшчэ больш вершмі другога разьдзелу. Гэты разьдзел, які прысьвячаны асабістай лірыцы, амаль зусім адсрваны ад першага. Тут мы знаходзім і русалак, і тугу, і роспач, і адчай і г. д.

Была яна шчасьлівай, але
„Нечакана наўкол узрасьлі вы,
Сівыя травы маей тугі".

Мы бачым, што ў супярэчнасьці з тым, што яна піша ў комсамольскіх вершах, ёй нават і жыць ня хочацца, бо ўва ўсіх па-

рознаму хварэюць душы", а таму „даволі жыць, бо адзьвінела і радасьць зорная, як белая сьвяча".

Шмат у якіх вершах мы знаходзім гэты пэсымізм, які сьведчыць, што вельмі надуманай і абстрактнай зьяўляецца радасьць у вершах папярэдняга разьдзелу. Мы наглядаем амаль поўны адрыў асабістага ад грамадзкага. Праўда, у некаторых вершах яна быццам імкнецца вырашыць гэтае пытаньне, але наколькі гэта вырашэньне конкрэтна, жыцьцёва можна бачыць з наступнага вершу „Над возерам"

„Дзяўчына варожыць над возерам
сонным,
Лясун выплываючы вабіць у вір:
„Там сьцішна, спакойна, палацы
з крышталяў,
І радасьць заўсёды красуе вясной,
Вянкі заплятаюць русалкі з лілеяў
І скачуць, сьпяваюць вясёлай гутмой"...

Але ў такіх казачных абставінах дзяўчына ўсё плача і яе цягне „бяздонная багна,

І белыя рукі зьвівае, пяе
Калісьці над возерам сінім кахала".

Але вось выхад:

„І хтосьці шаптаў ёй: „бяскрылая
птушка,
Няўжо наша эра варожа табе?!
І ростані роспач хтось выкрасьліў
туты
І думку закінуў у жыцьця кругабег"

І далей таксама агульныя словы, як агульна пяе яна і аб камсамоле, і аб ударнай брыгадзе і г. д.

Цікава, што ацэнку сваёй ідэалёгіі яна сама дае ў „Credo"

Сёньня, учора і заўтра
Адчыняю „Новыя Амэрыкі"
І віхрастай, жывой дзікаркай
Вачыма ў тэорыях бегаю"

Вось у гэтым і ўсё гора, бо тэорыі гэта не такая рэч, у якіх магчыма павярхоўна вачыма бегаць. Над паглыбленьнем сьветапогляду трэба ўпарта працаваць. А пакуль ні ў якім разе нельга лічыць поэзію Бандарынай сапраўды комсамольскай, нашай, бо толькі той зможа быць комсамольскім пісьменьнікам, хто ўладае пролетарскай ідэалёгіяй, мэтодам дыялектычнага матэрыялізму. Бясспрэчна ў гэтым зборніку ёсьць некалькі ня дрэнных вершаў, як „У тайзе", „Росквіт" „У школе", але яны губляюцца ў зборніку.

З. Бандарына ўладае мастацкай тэхнікай, нярэдка трапляюцца досыць удалыя параўнаньні, мэтафоры, рытмы, некаторыя вершы досыць гучныя і вобразныя... але яе поэзія ёсьць яскравы прыклад таго, як адсутнасьць акрэсьленых ідэй, г. ё. нявысокасьць ідэёвага зьместу, нявыразнасьць, павярхоўнасьць сьветапогляду, няўменьне глыбока ўразумець процэсы сёньняшня а дню і падрыхтоўку заўтрашняга, пазбаўляюць яе вершы і пэўнай мастацкай вартасьці.

Ю. Дворкіна

ХРОНІКА

БССР.

Алесь Звонак друкуе у БДЗВ зборнік вершаў „На лінію агня".

У Віцебск выяжджала брыгада пісьменнікаў Бел'АПП'у ў складзе Александровіча, Хведаровіча, Ліхадзіеўскага, Барашкі і Красьнеўскага. Мэтай паездкі брытады зьяўлялася правядзеньне на буйнейшых прадпрыемствах і па клюбах гораду шэрагу літаратурных вечароў. Гэта работа ўвязвалася з задачамі правядзеньня ленінскай нацыянальнай політыкі партыі, з выкананьнем пастановы ЦК і ЦКК КП(б)Б аб рабоце Віцебскай організацыі і праводзілася пад знакам закліку рабочых-ударнікаў ў літаратуру.

У першы дзень прыезду пісьменьнікі былі горача спатканы рабочымі фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі", дзе было наладжана літаратурнае выступленьне. Брыгада атрымала шмат запрашэньняў ад фабрык і заводаў для азнаямленьня з дасягненьнямі ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну.

Пасьля паўтарамесячнага падарожжа па Сярэдняй Азіі у Менск зьвярнуліся ўдзельнікі інтэрнацыянальнай брыгады пісьменнікаў—Іл. Барашка, М. Хведаровіч і П. Глебка.

Платон Галавач пераапрацаваў для II выданьня аповесьць „Спалох на загонах". „Спалох на загонах" выходзіць у перакладзе на расійскую мову.

Вышла з друку кніга вершаў і поэм Андрэя Александровіча. У кнізе сабраны выбраныя творы за дзесяцігодзьдзе творчасьці поэта (1921—1931 г.).

Кузьма Чорны напісаў вялікую аповесьць „Бацькаўшчына". Аповесьць выходзіць з друку асобнай кніжкай.

Беларуская сэкцыя Маскоўскай асоцыяцыі пролетарскіх пісьменьнікаў распачынае выданьне двухмесячнай літаратурнай часопісі. Часопісь будзе выдавацца ў Маскве.

Іл. Барашка працуе над кнігай нарысаў пра Савецкі Узьбекістан Выходзіць з друку кніга новых апавяданьняў „Комунар".

Менская асоцыяцыя пралетарскіх пісьменьнікаў заключыла з Менскім комсамолам соцыялістычны дагавор, паводле якога комсамол павінен разгарнуць роботу па організацыі пролетарскага літаратурнага руху на прадпрыемствах гораду Менску.

С. Ліхадзіеўскі здае трэцюю кніжку вершаў (1931 г.) пад назвай „Маё поўнакроўнае". Друкуецца масавым выданьнем кніжка колгаснай поэзіі „Крывавыя зьнічкі на сьнезе".

Вышла з друку кніга апавяданьняў Цімоха Зарэчнага—„Маладосьць„.

МенАПП устанавіў штодзённыя дзяжурства ў доме пісьменнікаў для консультацыі твораў рабочых-ударнікаў.

Да кастрычнікавых сьвят у доме пісьменьніка рыхтуецца выстаўка—„Пісьменьнік і соцыялістычнае будаўніцтва„. Выстаўка будзе паказваць работу пісьменьніцкіх брыгад на прадпрыемствах БССР і СССР.

Вышла з друку кніга выбранных апавяданьняў Міхася Лынькова.

Вышаў з друку другі том поўнага збору твораў Цішкі Гартнага.

Выходзіць з друку кніжка пародый Старобінскага на сучасных беларускіх поэтаў „Ха!".

Уласюк (Антановіч заканчвае аповесьць „Смерць Агаты".

Юрка Лявонны напісаў, у парадку паказу гэрояў пяцігодкі, невялікую поэму—„Брыгадзір Марцін Байдылевіч".

БДВ прыняты да друку зборнік выбраных вершаў Уладзімера Хадыкі.

Васіль Шашалевіч працуе над новай п'есай. П'есу гэту законтрактоўвае І БДТ.

У канцы верасьня ў Менскім гарадзкім тэатры распачынаецца новы сэзон Першага Беларускага дзяржаўнага тэатру. Галоўнае месца ў будучых пастаноўках зойміуць „Гута„, „Ярасьць", „Лінія агню"' „Справа гонару", „Мост", „Каменьні на дарозе" і інш.

У апошні час Беларускі дзяржаўны ансамбль народных інструмантаў праводзіў сваю работу за межамі БССР у Маскве, Ленінградзе, Харкаве і інш. мясцох Савецкага саюзу.

Вялікая работа праведзена на Украіне. Першы прыезд ансамблю вельмі ўрачыста сустрэлі рабочыя харькаўскага трактарбуду, якія прасілі ўдзельнікаў ансамблю перадаць рабочым Беларусі, што Трактарбуд будзе пушчан у тэрмін.

Ансамбль народных інструмантаў зрабіў вельмі шмат выступленьняў на прадпрыемствах Донбасу: Сталіна, Даўжанская, Луганск і інш.

Гарнякі ўсесасюзнай качагаркі Донбасу паднесьлі ў падарунак лямпу шахцёра.

У Ленінградзкай фабрыцы Белдзяржкіно „Савецкая Беларусь" прыступлена да вытворчасьці гукавой карціны „Слава сьвету" на тэму аб барацьбе міжнароднага пролетарыяту супроць падрыхтоўкі вайны з СССР.

Фабрыка БДзК канчае агіт-проп. карціну „Сталёвы шлях„ на тэму аб рэканструкцыі транспорту.

Ударная здымачная брыгада № 7 выехала для здымкі ў раён Вініцы, мастацкай карціны „Шчасьце". Тэма—рост рэволюцыйнага руху сялянства Заходняй Беларусі.

Ударная брыгада № 8 прыехала з экспэдыцыі з тарфяных заводаў, дзе адбываліся здымкі школьнага фільму ў 3 х частках „Шкода балот". Тэма—мэліорацыя балот і політэхнізацыя вясковай школы.

Ударная брыгада № 9 прыступіла да работы над мастацкай карцінай „Чэсьць" на тэму аб перавыхаваньні адсталых элемэнтаў рабочай клясы.

РСФСР.

Сэкратарыят ВОАПП склікаў спэцыяльную нараду, прысьвячаную пытаньням падрыхтоўкі і тэрміну скліканьня ўсесаюзнага зьезду яўрэйскіх пролетарскіх пісьменьнікаў. Сэкратарыят заслухаў даклады прадстаўнікоў яўсэкцыі БелАПП тав. Бронштэйна, яўсэкцыі ВУСПП т. Х. Гільдзіна і яўсэкцыі МАПП—тав. Рабіна аб іх рабоце і падрыхтоўцы да зьезду.

На апошнім паседжаньні сэкратарыяту МАПП тав. Паўлюк Шукайла ўнёс шэраг конкрэтных прапаноў аб рэарганізацыі і ўпарадкаваньні работы нацсэкцый, якія дагэтуль існавалі толькі намінальна, не ўцягваючыся ў агульную работу МАПП. Тав. Шукайла прапанаваў скасаваць нацбюро, а кіраўніцтва нацсэкцыямі даручыць непасрэдна сэкратарыяту МАПП, які павінен вызначыць аднаго з сэкратароў, усклаўшы на яго пэрсанальную адказнасьць за работу нацсэкцый. Райбюро МАПП у сваёй штодзённай рабоце павінны аддаваць больш увагі нацыянальнай літаратуры. Творчая і ідэолёгічная накіраванасьць работы нацсэкцый павінны быць уважліва вывучаны шляхам арганізацыі творчага агляду.

Міжрабпомфільм склаў з тав. Вайянам Куцюр'е ўмову на сцэнарый для поўнамэтражнага гукавога фільму на тэму аб рэволюцыйным вопыце і памылках Парыскай Комуны. Рэжысэрам пастаноўкі назначаецца В. Хвёдараў, які заканчвае гукавы фільм „Мертвый дом" у расійскім і нямецкім варыянтах.

Ударная група па гукавой карціне „Друзья совести" вытворчасьці Межрабпомфільм скончыла ўсе вызначаныя паводле пляну здымкі ў экспэдыцыі на Донбасе раней тэрміну. Гэтымі днямі група выехала ў Кіеў для натурных здымак „баёў у Руры".

Сэктар мастацтваў Наркамасьветы заслухаў даклад Усекопромсаюзу аб арганізацыі коопэрацыйнага музычна-відовішчнага аб'яднаньня. Аднэй з асноўных задач аб'яднаньня зьяўляецца выпуск патаненых і высокаякасных інструмантаў і выраб тэатральнага абсталяваньня—ад электромэханічнага да грыму ўключна.

Улічваючы неабходнасьць разгарнуць магутную сетку відовішчных прадпрыемстваў, якія маглі-б ахапіць увесь Саюз аб'яднаньне прапанавала Наркомасьветы проект аб адчыненьні на сродкі Усекоопромсаюзу шэрагу музычных і тэатральных школ, у якіх будуць рыхтавацца новыя мастацкія кадры, а таксама адкрыцьцё новых станцыянарных тэатраў, работнікі якіх павінны быць аб'яднаны на коопэрацыйных пачатках.

29 верасьня споўніўся год са дня аб'явіцьця РАПП сумесна з УсеЦСПС закліку ўдарнікаў у пролетарскую літаратуру.

Толькі нядаўна пленум праўленьня РАПП падвёў вынікі першаму этапу закліку рабочых ударнікаў. Яны гавораць самі за сябе. Ударнік ужо стаў цэнтральнай фігурай літаратурнага руху; за кошт ударніка рух расьце і ўглыбкі, і ў шыркі. На шмат сотняў выросьлі рапаўскія арганізацыі, новым зьмесцам напоўнілася іх работа. Заклік ударнікаў даў новы, рашаючы разгон барацьбе за пролетарскае літаратурнае асяродзьдзе, за новы тып пісьменьніка.

Прыход ударнікаў у РАПП і РОПКП таксама азначае рост творчых кадраў пролетарскай і пролетарска-колгаснай літаратуры—выхоўваецца пісьменьнік, непарыўна зьвязаны з справаю сваёй клясы.

Значэньне закліку ўдарнікаў, такім чынам, вялізарнае. Яно выходзіць за літаратурныя межы, бо ён, заклік, „абумоўлены значнымі посьпехамі культурнай рэволюцыі, якія набываюць пад ленінскім кіраўніцтвам партыі ўсё больш шырокі разгон у нашай краіне". (З рэзолюцыі пленуму праўленьня РАПП па дакладу т. Кіршона).

„Издательство писателей в Ленинграде" прыступіла да выданьня сэрыі кніг па гісторыі грамадзянскай вайны. Другая масавая сэрыя кніг. якія выпускае выдавецтва—гэта бібліотэка для пачынаючага чытача, на чале рэдакцыі якой стаіць М. Чумадрын.

Паводле заданьня сэкратарыяту РАПП група пролетарскіх драматургаў—В. Кіршон, А. Афінагенаў, Ю. Лебедзінскі—працуюць над складаньнем спэцыяльнага „дакумэнту па тэатру", які павінен зьявіцца програмнай установкай РАПП у нытаньнях

тэатру і творчай тэатральнай практыкі. У кастрычніку распрацаваная дэкларацыя будзе абмяркована на паседжаньні сэкратарыяту РАПП.

● Памяшканьне клюбу фэдэрацыі савецкіх пісьменьнікаў не задавальняе патрэбы організацыі і шырокіх мас рабочых-ударнікаў, закліканых у літаратуру. Зараз пасталёена пытаньне аб пабудове ў Маскве (па прыкладу Ленінграду) комбінату, палацу культуры. Пытаньне аб пабудове комбінату будзе разглядацца ВсеПСПС.

● У Ленінград выяжджаў Максім Горкі. У тэатры ЛАПП імя Горкага адбылася сустрэча. У гутарцы прынялі ўдзел т. Авербах, Лебядзінскі і інш.

Горкім была склікана нарада Ленінградзкіх пісьменьнікаў па пытаньню выданьня гісторыі грамадзянскай вайны. Ленінградзкаму Вялікаму Драматычнаму Тэатру Горкі перадаў для пастаноўкі сваю новую п'есу „Егор Булычев".

23 верасьня Максім Горкі выступіў у Выбаргскім доме культуры на сходзе працаўнікоў выдавецтваў, пісьменьнікаў рабкораў і рабочых-ударнікаў.

● Праўленьне ВССП прызнала неабходным выдаць зборнік творчай дыскусіі саюзу пісьменьнікаў і зборнік крытычных артыкулаў па конкрэтных творах пісьменьнікаў—членаў ВССП. Апрача дакладу В. Палонскага „Інтуіцыя і творчасьць", у праграму прац творчай дыскусіі ВССП увахо-дзяць даклады: Н. Алеева пра поэзію, К. Зелінскага—„Творчасьць і тэхніка.

УССР.

● Літаратурная грамадзкасьць Савецкай Украіны рыхтуецца да сьвяткаваньня двух юбілеяў--пяцігодзьдзе ўсеукраінскай організацыі комсамольскіх пісьменьнікаў „Маладняк" і пяцігодзьдзя украінскага саюзу пролетарскіх пісьменьнікаў (ВУСПП).

Да пяцігодзьдзя ВУСПП выдавецтва мастацкай літаратуры Украіны („ЛІМ") выпускае шэраг зборнікаў, якія асьвятляюць работу па асобных нацыянальных сэкцый ВУСПП, і вялікую манографію, прысьвячаную разьвіццю літаратуры на Украіне.

Юбілейныя дні будуць праведзены пад знакам барацьбы за далейшую перабудову далейшай работы ВУСПП і „Маладняка", за замацаваньне вынікаў закліку ўдарнікаў у літаратуру і больш рашучы паварот організацый да творчых пытаньняў, да задач аўладаньня дыялектычным матэрыялізмам.

● Асабліва прыемна констатаваць шырокую падрыхтоўку заводзкіх гурткоў ВУСПП да творчае дыскусіі. Сэкратарыятам ВУСПП ужо раздадзены кіраўнікам заводзкіх Вуспаўскіх ячэек адпаведныя тэзісы і літаратура.

Зразумела, дыскусія ня будзе кранацца толькі ўнутрывуспаўскіх творчых пытаньняў.

Проблема перабудаваньня папутніцтва, устанаўленьне больш шчыльнага контакту з пролетарска-колгаснай літаратурай („Плугам"),—усё гэта будзе закранута дыскусіяй. Ня трэба забывацца на тое, што шмат якія папутнікі на Украіне з прычыны адсутнасьці тут „Саюзу савецкіх пісьменьнікаў" прабываюць у становішчы „дзікіх". ВУСПП'у і „Маладняку" павінна належыць ініцыятыва ў арганізацыі распыленых папутніцкіх кадраў і спрыяньні паасобным „папутнікам", што перабудоўваюцца.

● У яўсэкцыі ВУСПП створана першая творчая група „Напоставізм" у складзе таварышоў І. Фэфера, Х. Гільдзіна, А. Абчук і Я, Вявюрка.

● У бліжэйшыя месяцы будзе апублікованы роман Івана Ле—„Інтэграл", прысьвячаны Донбасу. Гэты роман, між іншым, пакажа завод, калісьці апісаны А. І. Купрыным у апавяданьні „Молох".

● Друкуецца роман В. Кузьміча „Турбіны"—пра Днепрабуд. Па сваім ахопе і па колькасьці тэхнолёгічных ведаў ён зьяўляецца сваяасаблівай літаратурнай энцыклёцэдыяй Днепрабуду.

● Ів. Кірленка напісаў роман, прысьвячаны Днепрапятроўскаму заводу.

● Вышаў з друку роман Я. Качуры „Ольга". Зараз пісьменьнік працуе над романам „Адраджэньне"—з жыцьця саўгасаў.

● М. Ірчан працуе над нізкай апавяданьняў з жыцьця Чырвонае армії.

● Выдавецтва пролетарскіх пісьменьнікаў „Гарт" выдае альманах з мастацкіх твораў вуспаўцаў пад назваю „індустрыяльны паход", які будзе адбіваць творчы ўдзел пролетарскіх пісьменьнікаў у барацьбе за пяцігодку, за соцыялістычную індустрыялізацыю. Альманах выйдзе пад рэдакцыяй Івана Мікітэнка.

● Амаль што на працягу месяца ў адэскіх лягерах Чырвонай армії працавала брыгада Укр. ЛАЧАФ'у у складзе т. т. Галушка, Гаска, Нячай, Квітко; у лягеры 80 дывізіі—Іваноў, Ёгансэн, Мар'ямаў; у першай Чырвонаказачай дывізыі—Пацяк, Загрымны,; у 25 Чапаеўскай—Пыліпенка, Клочча, Першамайскі, Бедзік; у 99 дывізіі—Іваноў, Нядоля, Мар'ямаў і 23 дывізіі—Мінко, Ясны.

У канцы ліпеня наведалі Харькаў польскі пролетарскі поэт Рышард Стандэ і нямецкі пролетарскі пісьменьнік Альбэрт Готопп.

Госьці наведалі Днепрабуд, а таксама знаёміліся з соцыялістычным будаўніцтвам сталіцы Украіны.